Хроніка парушэньняў правоў чалавека
ў Віцебскім рэгіёне

# ШЭРАЯ КНІГА

**студзень – снежань**

**2023 года**



Віцебск, 2024

## АГЛЯД ПАРУШЕННЯЎ ПРАВОЎ І СВАБОД У БЕЛАРУСІ ЗА 2023 ГОД

Па выніках 2023 года аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі было адзначана катастрафічнае становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі.

Вынікам крымінальнага пераследу стала наяўнасць у Беларусі на 1 студзеня 2024 года 1 452 палітзняволеных, прызнаных такімі праваабарончай супольнасцю; з іх 168 — жанчыны; 535 палітвязняў — маладзёны. Яшчэ 1 413 чалавек, з іх 339 жанчын, пасля пазбаўлення волі паводле палітычных матываў вызвалены ў сувязі з адбыццём пакарання, зменай меры стрымання, прызначэннем пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі, пасля знаходжання пад вартай, вызваленнем у парадку памілавання.

На канец 2023 года было вядома пра 4 248 асуджаных да розных відаў пакарання паводле палітычна матываваных абвінавачванняў, 910 з гэтай колькасці — жанчыны.

Судамі вынесена не менш за 4 466 адміністрацыйных пастаноў, з іх у 1 822 выпадках накладзены штраф і ў 2 005 выпадках ужыты адміністрацыйны арышт, 38 спраў спынена, вынікі разгляду астатніх спраў невядомыя.

Пры захаванні высокага узроўню крымінальных рэпрэсій стала значна больш спраў паводле абвінавачвання ў стварэнні, кіраўніцтве і ўдзеле ў экстрэмісцкіх фармаваннях, садзейнічанні і фінансаванні экстрэмісцкай дзейнасці. Захавалася вялікая колькасць крымінальных спраў за ўдзел у вулічных пратэстах і выказванні ў сетцы Інтэрнэт.

Палітычных зняволеных утрымоўвалі ў асабліва жорсткіх умовах, пад надзвычай строгім кантролем, на іх накладвалі не прадугледжаныя законам абмежаванні і ў выніку шматлікія палітвязні ў дысцыплінарным парадку былі пазбаўленыя вызначаных згодна з законам пасылак, перадач, у тым ліку лекавых, спатканняў з роднымі, жонкамі і мужамі, адвакатамі; ліставанне палітвязняў адвольна абмежаванае. Палітзняволеных накіроўвалі на прымусовую малааплатную працу.

Асаблівасцю 2023 года стала змяшчэнне некаторых палітвязняў у поўную ізаляцыю — у становішча інкамунікада. Не менш як 29 палітвязням, шасцярым (у тым ліку дзвюм жанчынам) з іх двойчы, працягвалі тэрміны пазбаўлення волі.

Вельмі цяжка пераносілі пазбаўленне волі людзі з інваліднасцю, хранічнымі захворваннямі, пажылыя людзі, часкова ім стваралі невыносныя ўмовы без уліку іх уразлівага становішча.

Пасля выхаду на волю па адбыцці пакарання палітзняволеныя траплялі пад строгі кантроль, які выходзіў за межы звычайнага нагляду за вызваленымі асуджанымі; правы асуджаных дадаткова абмяжоўваюцца наступствамі ўключэння ў пералік асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці.

Суды працягвалі функцыянаваць у якасці інструмента рэпрэсій у дачыненні да фігурантаў палітычна матываваных адміністрацыйных, крымінальных і грамадзянскіх спраў. Грамадска-палітычны сектар скарачаўся ў выніку ліквідацыі арганізацый ці прымусу да самаліквідацыі, а таксама з-за іншых рэпрэсіўных мер.

Працягваўся пераслед за мірнае выказванне меркаванняў, пераслед пад выглядам барацьбы з тэрарызмам і экстрэмізмам. З пераследам сутыкнуліся журналісты, супрацоўнікі СМІ і блогеры.

Катаванні і забароненае абыходжанне заставаліся для карных органаў інструментам ціску і запалохвання. Не было выпадкаў расследавання і прыцягнення да адказнасці асобаў, вінаватых у шырокамаштабных катаваннях і іншых грубых парушэннях правоў чалавека ў жніўні 2020 года і ў наступных гадах, на нацыянальным узроўні.

Улады парушалі права на жыццё: палітзняволеныя Алесь Пушкін і Мікалай Клімовіч памёрлі ў няволі ў выніку неаказання медыцынскай дапамогі.

Заканадаўча пашыралася сфера ўжывання смяротнага пакарання і быў вынесены новы смяротны прысуд.

**Усе, што адбывалась у мінулым годзе у Віцебскай вобласці было адлюстрананнем працэсаў, якія працякалі ў палітычнай і грамадскай сферах ў межах Беларусі.**

**Дадзенае выданне, ў храналагічным парадку, прадстаўляе чытачам факты парушэння правоў чалавека ў 2023 годзе ў Віцебскім рэгіёне.**

## Факты парушэньняў грамадзянскіх і палітычных правоў

## Студзень

**02.01.2023**

Паводле меркавання праваабаронцаў і ягоных сяброў, віцебскі арт-менеджэр і музыка асуджаны да чарговага адміністрацыйнага арышту. Булаўскага трымаюць у ІЧУ, які цяпер знаходзіцца на тэрыторыі СІЗА-2, яму не ўдалося сустрэцца з адвакатам, а ў брата не прынялі для яго перадачу. Уладзімір Булаўскі знаходзіцца ў няволі з 14-га снежня мінулага году.

Па звестках ягоных блізкіх, віцебскага актывіста чакалі на волі 1-га студзеня. Але сустрэча не адбылася. Падрабязнасці, за што ён быў асуджаны ў сярэдзіне снежня, застаюцца не вядомымі. Аднак ёсць звесткі, што 30-га снежня Уладзіміра Булаўскага вазілі з ІЧУ ў аддзел міліцыі Кастрычніцкага раёну, найверагодней, для складання чарговага пратакола. У гэты дзень брат спрабаваў перадаць арыштаванаму перадачу, але яе не ўзялі, маўляў, у ІЧУ такога няма. Аднак увечары таго ж дня яго зноўку прывезлі ў ізалятар.

14-га снежня Уладзімір Булаўскі трапіў за краты пасля затрымання трох асобаў, звязаных з дзейнасцю гастрапаба ROK'I PUB. Заснавальнікі ўстановы Ілля Кульман і Павел Пятрунін, а сталы наведнік установы Дзмітрый Ларкоў былі асуджаны да 15-ці сутак арышту паводле арт. 19.11 КаАП за рэпосты так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. Яны ўжо выйшлі на волю. Магчыма, Уладзіміра Булаўскага першы раз таксама асудзілі па гэтым артыкуле.

Цягам 2022г. яго некалькі разоў судзілі па адміністрацыйных справах – у лютым (15 сутак арышту паводле арт. 24.23 КаАП)), у ліпені (30 сутак арышту паводле арт. 24.23 КаАП), а ў снежні, падобна, ён быў асуджаны двойчы.

**04.01.2023**



У чарговым лісце да жонкі, Марыны Адамовіч, палітвязень напісаў з глыбоцкай калоніі №23, што яму не аддаюць лісты з волі. Пра гэта спадарыня Марына паведаміла ў Фэйсбуку, і тут жа ў каментарах азваліся людзі, якія пісалі да Мікалая Статкевіча. Адказу яны не атрымлі, дый лісты з паштоўкамі ад сяброў ды знаёмых таксама не трапілі да зняволенага. «Лістоў ад іншых людзей няма, відавочна, іх не прапусцяць. Але падзякуй ад мяне усіх, хто спрабаваў павіншаваць мяне, хто маліўся за нас. Мае калядныя віншаванні ўсім ім. А таксама каляднае пажаданне людзям нашай і суседніх краін – «Міра і волі!»–цытуе жонка ліст ад Мікалая Статкевіча.

Гэтага ліста Марыне Адамовіч давялося чакаць досыць працяглы час, бо палітвязень з 20.12 па 29.12 знаходзіўся ў ШІЗА. Пасля пераводу ў Глыбокае, з 23 чэрвеня 2022г., яго кідалі ў ШІЗА больш як 20 разоў, і ці не палову часу, адбытага у калоніі, ён быў вымушаны правесці ў цеснай камеры штрафнога ізалятара. Адміністрацыя калоніі амаль адразу ж паставіла зняволенага апазіцыйнага палітыка на ўлік як «асобу, схільную да экстрэмізму», і шукае любыя падставы, каб пакараць яго найбольш сувора.

Мікалай Статкевіч быў затрыманы 31 траўня 2020г. Апазіцыянера прызналі вінаватым паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэкса («Арганізацыя масавых беспарадкаў»), і 14 снежня 2021г. ён быў асуджаны да 14 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах асаблівага рэжыму.

**05.01.2023**

5 студзеня былі вынесены прысуды актывістам беларускіх незалежных прафсаюзаў. Васіля Бераснева, лідара аршанскай філіі незалежнага прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП), выканаўцу абавязкаў старшыні прафсаюза РЭП, а таксама Генадзя Фядыніча, былога кіраўніка незалежнага прафсаюза РЭП. і Вацлава Арэшку, актывіста прафсаюза РЭП абвінавацілі ў закліках да мер абмежавальнага характару, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь (ч. 3 арт. 361 Крымінальнага кодэкса), распальванні іншай сацыяльнай варожасці (ч. 3 арт 130), стварэнні экстрэмісцкага фарміравання альбо ўдзеле ў ім (ч.1 і ч. 3 арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса). Працэс у Мінскім гарадскім судзе праходзіў у закрытым рэжыме, працэс вяла суддзя Анастасія Папко, дзяржабвінаваўцам выступаў пракурор Раман Бізюк. Выраку прафсаюзным актывістам грамадскасць чакала 27 снежня, аднак суддзя заявіла, што па наноў адкрытых абставінах суд над актывістамі пераносіцца. Што гэта былі за абставіны, і якую ролю яны адыгралі ў вынясенні прысуду, застаецца не зразумелым.

Усе трое асуджаных былі затрыманы 19 красавіка 2022 года і змешчаны ў СІЗА КДБ. Пазней зняволеных перавялі ў СІЗА-1. Беларускія абаронцы абвясцілі іх палітвязнямі.
22 студзеня Васілю Берасневу мае споўніцца 73 гады. За кратамі ў яго істотна пагоршылася здароўе – актывіст скардзіўся на болі ў адзінай нырцы (другая была выдалена з прычыны анкалагічнага захворвання ) і на высокі ціск.
Гэта чалавек, якога вельмі добра ведаюць на Аршаншчыне. У 1980-я гады ён быў дырэктарам сельскагаспадарчай вучэльні ў Высокім (мястэчка пад Воршай) і нават кіраўніком Аршанскага райсавету. Аднак пасля таго, як да ўлады прыйшоў Аляксандр Лукашэнка, Бераснеў пакінуў дзяржаўныя пасады і прыйшоў у дэмакратычны рух. З 2016-га году ён кіраваў аршанскай прафсаюзнай суполкай РЭП, якая дзейнічала на тэрыторыі Дубровенскага, Талачынскага і Сенненскага раёнаў Віцебскай вобласці. Юрыдычная служба прафсаюзу дапамагала ў вырашэнні праблем з працаўладкаваннем, незаконнымі звальненнямі, нявыплатамі заробкаў, іншымі працоўнымі спрэчкамі. Апрача працы ў прафсаюзе, Васіль Бераснеў займаўся праваабарончай дзейнасцю. У Аршанскім рэгіёне ён быў прадстаўніком Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб’яднання «Беларускі Хельсінкскі камітэт», якое, па рашэнні Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь, было ліквідаванае 30 верасня 2021 году.

**07.01.2023**



Вячаслаў Сліжыкаў быў паранены ў Наваполацку 10 жніўня 2020 года, у другі дзень народных пратэстаў супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў. Як апавядаў сам мужчына, «дзве [гранаты] пруляцелі мне пад ногі. Пасля другога ўдару зразумеў, што не магу стаяць на дзвюх нагах, не было сіл. На адной назе пачаў адскокваць у бок тратуара. Дабраўшыся, лёг на траву. Мяне падабралі людзі, занеслі ў пад'езд і выклікалі хуткую», — расказваў ён.
У больніцы Вячаслава дапытвалі як сведку масавых беспарадкаў, а потым склалі пратакол аб удзеле ў мітынгу.
Пасля больніцы ён працягнуў лячэнне дома. Яму дапамагалі людзі з ініцыятыў салідарнасці. Дзякуючы ім, ён з’ездзіў у Менск на абследаванне. Яны ж прапанавалі рэабілітацыю ў Латвіі. Яго перавезлі туды 5 верасня. Там зрабілі аперацыю і дасталі аскепак гранаты памерам большы за перапялінае яйка. Пасля спатрэбілася яшчэ адна аперацыя, бо, як выявілася, быў перабіты яшчэ і нерв у назе.
У Латвіі на рэабілітацыі Вячаслаў меў прабыць месяц, але з-за небяспекі арышту вырашыў застацца на чужыне. Разам са сваёй дзяўчынай жыў у лагеры бежанцаў.
На радзіме Вячаслаў працаваў на «Нафтане».
Вячаслаў пісаў скаргі на сілавікоў. У адказах гаварылася, што ўсе дакументы далучаныя да агульнай крымінальнай справы, але што гэта за справа, яму дазнацца не ўдалося.
У Латвіі Вячаслаў працаваў грузчыкам. Слабасць і прыступы болю адносіў на наступствы ранення, пра свае праблемы з сэрцам не ведаў, ніяк не абследаваўся.
Маральна яму на чужыне было цяжка, прыжыцца на новым месцы ён не змог. «Апошні час у яго здараліся нервовыя зрывы», — адзначае яго сябар, з якім пагаварыла «Наша Ніва».
Памёр Вячаслаў 29 снежня, прычынай стала сардэчная недастатковасць.
Незадоўга да скону ён і сябар атрымалі дазвол на працаўладкаванне ў Германіі і 5 студзеня збіраліся разам туды ехаць рабіць у кампаніі, якая ставіць сонечныя батарэі.
Ад першага шлюбу ў Вячаслава засталося трое непаўналетніх дзяцей. Яго цела перадалі родным у Беларусь, 5 студзеня яго пахавалі.
«Яго дзяўчына не можа вярнуцца ў Беларусь, бо там ёй пагражае крымінальны пераслед. Усё, што яна магла, яна зрабіла для Вячаслава. Ёй цяпер цяжка. У бальніцы была пад кропельніцай», — расказаў сябар памерлага. Ён і сам моцна пацярпеў у 2020-м: у ізалятары яму пашкодзілі хрыбет і вуха, таксама давялося рабіць у Латвіі аперацыю.
Такая няпростая доля гэтага пакалення.
«Гэта непазбежна, як закон прыроды: Жыць не будуць вечна ворагі народу» — гэтыя радкі з Лявона Вольскага стаяць эпіграфам у старонцы Сліжыкава Укантакце, у іншых сацыяльных сетках ён хіба што не прысутнічаў. Аднак стала так, што ён сышоў раней за сваіх ворагаў, і маладым.

**09.01.2023**

23 снежня мінулага году суд Чашніцкага раёну прызнаў «экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыяй» суполку «Докшицы Live» сацыяльнай сеткі «ВКонтакте». Докшыцкая раённая газета «Родныя вытокі», спасылаючыся на пракурора раёну Алега Несцяронка, піша, што «у дачыненні да стваральнікаў, адміністратараў, актыўных удзельнікаў, якія займаліся рэпостамі і іншай папулярызацыяй рэсурсу, будуць уздымацца пытанні аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці».

Паводле логікі, законы не маюць зваротнай сілы, і таму любыя дзеянні ў гэтай суполцы да 23.12.2022г., пакуль яна не была прызнана «экстрэмісцкай», не могуць расцэньвацца як парушэнне заканадаўства. Але ў Беларусі, дзе «іншым разам не да законаў», былі ўжо сотні прыкладаў таго, як людзей каралі за рэпосты, зробленыя яшчэ задоўга да прызнання пэўных крыніц «экстрэмісцкімі» інфармацыйнымі рэсурсамі. Прадстаўнік Докшыцкай пракуратуры і «раёнка» гэта пацвердзілі.
Рэдакцыя газеты нагадвае мясцовым жыхарам, што яшчэ раней у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкай прадукцыі былі ўнесеныя Telegram-суполкі «Докшицы для жизни!» и «Begoml». І таму рэкамендуе адпісацца ад гэтых рэсурсаў, «каб не стаць выпадковым распаўсюднікам забароненай інфармацыі».
Што да суполкі «Докшицы Live», то паводле краязнаўцы Канстанціна Шыталя, гэта пераважна мясцовая «барахолка», дзе размяшчаюцца аб’явы ад карыстальнікаў, водгукі на працу крамаў, допісы пра розныя здарэнні і гэтак далей. Спадар Шыталь, да прыкладу, іншы раз публікаваў там краязнаўчыя нарысы, а значыць, быў «актыўным удзельнікам», паводле класіфікацыі пракуратуры. На падставе такога свайго «статусу» ён адкаментаваў артыкул, напісаўшы «Прывітанне з Беластоку», бо ўжо некалькі гадоў ён вымушана жыве ў Польшчы.
Аднак рэдакцыя сайта «раёнкі» вырашыла схаваць ягонае імя і прозвішча, добра вядомыя ў рэгіёне. Каментар апынуўся надрукаваным пад прыдуманым супрацоўнікамі псеўданімам «беглый белорус». І да яго ўжо з’явіўся пагрозлівы адказ: «Не спяшайцеся радавацца».

**14.01.2023**
У Гомельскім абласным судзе з 9 лістапада ў закрытым рэжыме праходзіць суд па справе «Рабочага Руху», фігурантамі якой з'яўляюцца адразу дзесяць палітзняволеных, сярод якіх — Аляксандр Капшуль, былы юрысконсульт «Нафтана».
Капшуля затрымалі 25 верасня 2021 года на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і перадалі супрацоўнікам КДБ Беларусі, якія таемна вывезлі яго ў Мінск.
З 31 снежня Аляксандр абвясціў галадоўку супраць парушэння заканадаўства падчас яго ўтрымання ў гомельскім СІЗА. Галадоўка працягваецца 14 дзён, пры гэтым першыя некалькі дзён ён трымаў сухую галадоўку.
Яго абвінавачваюць у здрадзе дзяржаве, а таксама па шэрагу іншых артыкулаў Крымінальнага кодэкса. Палітвязням пагражае да 15 гадоў зняволення.

**16.01.2023**

Прысуд агучыў 5 снежня 2022 года суддзя Яўген Буруноў, які ў закрытым рэжыме асудзіў палітвязня Дзмітрыя Каханоўскага па ч. 3 арт. 352 («Неправамернае завалоданне камп'ютарнай інфармацыяй»), ч. 3 арт. 130 ("Распальванне іншай сацыяльнай варожасці або варожасці"), ч. 3 арт. 203-1 («Незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных») Крымінальнага кодэкса. На пачатку студзеня палітвязень быў этапаваны ў Наваполацкую ПК №1.
Зміцер быў змешчаны ў СІЗА-1, на пачатку лістапада 2022 года, адкуль яго перавезлі ў Віцебскі абласны СІЗА-2.
Паводле абвінавачання, мужчына нібыта «здабываў з базы асабістыя дадзеныя сілавікоў, дзяржслужачых, суддзяў». Следства сцвярджае, што ўсяго было 46 падобных эпізодаў.
На пачатку бягучага года Камітэт дзяржаўнай бяспекі ўнёс палітвязня ў спіс «асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці».
Да крымінальнага пераследу Каханоўскі працаваў інжынерам-сістэматэхнікам Магілёўскага аддзялення "Белтэлекама". Ён быў затрыманы на працоўным месцы і быў арыштаваны 28 кастрычніка 2021 года. Мужчына жанаты і зараз без бацькоўскай апекі засталося малалетняе дзіця.

**16.01.2023**
За 12 месяцаў 2022 года судамі Віцебскай вобласці былі прызнаны 99 інфармацыйных рэсурсаў, якія на думку ўладаў распаўсюджваюць экстрэмісцкія матэрыялы. За гэты час у рэпрэсіях супраць свабоды распаўсюджвання інфармацыі ў сетцы Інтэрнэт прынялі ўдзел суддзі 22 раённых судоў рэгіёна. У параўнанні з 2021 годам, колькасць матэрыялаў прызнаных экстрэмісцкімі засталіся на адным і тым жа ўзроўні.
Так, суд Кастрычніцкага раёну Віцебска прыняў 17 рашэнняў, суд Чыгуначнага раёну вынес 11 рашэнняў, а суддзі суду Першамайскага раёну зрабіў гэта тры разы. Агулам, гарадскія суды прызналі “экстрэмісцкімі” 48 інфармацыйных крыніц.
Калі казаць пра раённыя суды Віцебскай вобласці, якія прынялі 51 рашэння у дачыненні да 53 ТК.

Суд Полацкага раёна прызнаў экстрэмісцкімі матэрыяламі на 8 рэсурсах, г. Новаполацка - 4, а суды, Чашніцкага, Лепельскага, Аршанскага, Ушацкага і Гарадоцкага раёнаў на трох.
Па два рэсурса празвналі "небяспечнымі" суды Расонскага, Ліёзненскага, Талачынскага, Сенінскага, Верхнедзвінскага, Ушацкага, Міёрскага, Шаркоўшчынкага, Шумілінскага, Докшыцкага раёнаў. Суды Дубровенскага, Віцебскага, Браслаўскага і Глыбоцкага раёнаў – па адным.
Ва ўсіх выпадках суды скарысталіся правам неадкладнага выканання сваіх рашэнняў, паколькі, на думку суддзяў, прамаруджванне ў выкананні рашэння можа прывесці да значнай шкоды для дзяржавы або зрабіць немагчымым самое выкананне.
Ініцыятарамі прыняцця судамі рашэнняў па прызнанні матэрыялаў экстрэмісцкімі былі 7 упраўленне (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь або органы пракуратуры.

**17.01.2023**



Рашэннем суда Расонскага раёна Віцебскай вобласці 14 кастрычніка 2022 года відэаролік "КСЕНДЗ БАРОК - пра Лукашэнку і сатану, Папу Рымскага і пакаянне, свабоду і смерць", размешчаны на Yout з назвай "Жыццё-маліна", прызнаны экстрэмісцкім матэрыялам.
Цяпер да рэсурса абмежаваны доступ згодна з патрабаваннямі артыкула 314 Грамадзянска-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Інфармацыйны відэаматэрыял з'явіўся ў інтэрнэце 29 студзеня 2022 г. і за год ён набраў 176 тыс. праглядаў.
Падчас паўтарагадзіннай размовы журналіст Дробказёраў змог раскрыць для беларусаў яркую неардынарную асобу ксяндза Барка.
Падчас сустрэчы суразмоўцы паразмаўлялі пра ўзброены супраціў рэжыму, Лукашэнку, апазіцыйнага дзеяча Пракоп'ева.
Святар прадставіў сваю пазіцыю і раскрыў таямніцы аб тым, чаму зараз крута быць беларусам, чаму Папа Рымскі нічога не сказаў пра Беларусь і калі царква і касцёл сталі абслугоўваць рэжым.
Таксама ксёндз Барок расказаў пра суд над ім, ад'езд з Беларусі, колькі зарабляе ксёндз у Беларусі і пра што ён марыць.

**17.01.2023**
Пра чарговае пагаршэнне здароўя і максімальна кепскія умовы ўтрымання палітычнага дзеяча Мікалая Статкевіча паведаміла ў фэйсбуку ягоная жонка Марына Адамовіч.
«Ужо некалькі разоў пасля выпіскі з медчасткі бралі кроў з пальца на аналіз. Як я разумею, застаецца завышанай СОЭ. Сёння рабілі «кантрольную» флюараграфію, у тым ліку асобны здымак правага лёгкага.
Звычайная тут сітуацыя — адна «рука» неўзабаве пасля хваробы саджае ў ШІЗА, а потым у камеру з мокрым ад столі да нізу кутам, а другая лякуе ад наступстваў. І піша даведкі, што магу быць у ШІЗА» — з ліста Мікалая ад 05.01.23.
А я то гадала, навошта было яго пасля хваробы пераводзіць у іншую камеру? Верагодна, старая не адпавядала высокім стандартам гэтай установы. Ды і сем сантыметраў нечага вартыя ж.
Зараз Мікалай ізноў у ШІЗА», — напісала Марыя Адамовіч.
66-гадовы Мікалай Статкевіч асуджаны на 14 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, тэрмін адбывае ў глыбоцкай калоніі ў адзіночнай камеры.

**18.01.2023**
У нядзелю на гэтым тыдні аршанскі праваабронца і прафсаюзны дзеяч Васіль Берасneў адзначыць Дзень народзінаў. 22 студзеня яму споўніцца 73 гады. Традыцыйна на гэты дзень Беаснеў збіраў калегаў па грамадскай дзейнасці, але ж зараз ён у зняволенні.
Берасneў быў затрыманы 19 красавіка 2022 года ў межах крымінальнай справы. Мужчыну змясцілі ў СІЗА і прад'явілі абвінавачванні.
У Васіля значна пагоршылася здароўе ў СІЗА, ён пакутуе ад боляў у адзінай нырцы.
У Мінгарсудзе 25 лістапада 2022 г. распачаўся суд над прафсаюзнымі лідарамі. Васіля Берасneва абвінавацілі ў закліках да мер абмежавальнага характару, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь (ч. 3 арт. 361 КК), распальванні іншай сацыяльнай варожасці (ч. 3 арт. 130 КК), стварэнні экстрэмісцкага фарміравання альбо ўдзеле ў ім (ч. 1 і ч. 3 арт. 361-1 КК). Суддзя Анастасія Папко пасля прапановы пракурора Рамана Бізюка зрабіла разгляд справы закрытым.
5 студзеня 2023 г. быў вынесены прысуд: актывістаў беларускіх незалежных прафсаюзаў прызналі вінаватымі. Па сукупнасці пакаранняў Анастасія Папко прызначыла Васілю Берасневу дзевяць гадоў

пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.
Пакуль разглядаецца апеляцыйная скарга на прысуд, ён будзе знаходзіцца ў СІЗА на вуліцы Валадарскага.

**19.01.2023**

Кастрычніцкім судзе Віцебска 19 снежня 2022 года асудзілі Дзяніса Хаўханава паводле ч. 1 арт. 368 (Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Сняжана Кіндзеева асудзіла Дзяніса на адзін год і два месяца пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыма. Дзяніс мае групу інваліднасці па слыху, таму ў працэсе ўдзельнічаў перакладчык з мовы жэстаў.
Дзяніса абвінавацілі ў тым, што ён са свайго мабільнага тэлефона пад пастом у тэлеграм-канале пакінуў каментары. Суд іх палічыў, як "негатыўна ацэньваючыя, прыніжаючыя аўтарытэт, гонар і годнасць Лукашэнкі". У матэрыялах справы падаецца ідэнтыфікацыйны нумар яго тэлеграм-анаўнта і абаненцкі нумар.
Сведкам па справе выступаў супрацоўнік ГУБАЗ, які выявіў, што Дзяніс пад псеўданімам пакінуў каментары ў Telegram. Таксама сведкам на працэсе выступіў аднакурснік Дзяніса, які паведаміў, што "чуў неаднаразова ад яго негатыўныя выказванні на адрас Лукашэнкі. Таксама бачыў, як Хаўханаў у месенджары Тэлеграм праглядаў ролікі, якія крытыкуюць Лукашэнку".
Мабільны аператар МТС прадставіў следству дадзеныя, паводле якіх абаненцкі нумар Дзяніса ў інкрымінаваны час працаваў па месцы яго жыхарства.
Пад час "апошняга слова" мужчына цалкам прызнаў сваю віну і раскаяўся ў здзейсненым.
З Дзяніса спагналі на карысць фінупраўлення Віцебскага гарвыканкама 246 рублёў за прызначанага яму адваката.

**23.01.2023**



Наваполацкая папраўчая калонія № 1, якая месціцца паміж "Нафтанам" і "Палімірам", лічыцца адной з самых жорсткіх папраўчых установаў у Беларусі. Згодна з інфармацыяй, у калоніі налічваецца мінімум 70 палітвязняў. Сярод іх былы кіраўнік "Белгазпрамбанка" и кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі асуджаны Віктар Бабарыка.
Пасля этапавання ў наваполацкую калонію альтарнатыўны кандыдат на пасаду кіраўніка дзяржавы Бабарыка, працаваў укладчыкам хлебабулачных вырабаў. Ён увесь час мусіў знаходзіцца ў пякарні — у памяшканні практычна без вентыляцыі, з тэмпературай плюс 30.
У лістападзе мінулага года стала вядома, што цяпер палітвязень выпальвае драўняны вугаль. Поўны дзевяцігадзінавы працоўны дзень шэсць дзён на тыдзень ён знаходзіцца на дварэ, без доступа да побытавага памяшкання, дзе была б магчымасць сагрэцца падчас змены. Вядома, што Віктар мае медыцынскія супрацьпаказанні для такога кшталту прац.
За Бабарыкам заўсёды ўзмоцнены кантроль. Як правіла, дзе ён працуе, там ставяць вельмі шмат камер, дзеля таго, каб ён не пакідаў працоўнае месца не паводле часу. Таксама Бабарыку паставили прафілактычны ўлік як "схільнага да захопу закладнікаў, праявы агрэсіі і нападу на адміністрацыю".
Праз тое, што ён ножыкам пакінуў драпіны на падваконні, калі рэзаў сала. Гэта ўбачылі пазаштатныя супрацоўнікі адміністрацыі (стукачы), пабеглі ў штаб і даклалі пра гэта супрацоўнікам адміністрацыі калоні]. На гэтай падставе палітвязню "павесілі" такі прафулік.
Экс-банкір, былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі Бабарыка быў асуджаны на 14 гадоў зняволення па абвінавачванні згодна арт. 235 Крымінальнага кодэкса — Легалізацыя ("адмыванне") сродкаў, атрыманых злачынным шляхам і арт. 430 Крымінальнага кодэкса — Атрыманне хабару. Зараз ён адбывае пакаранне ў Новаполоцкай ПК №1 у выгадзе пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

**24.01.2023**

Уладзімір Булаўскі быў затрыманы ў Віцебску 14 снежня мінулага года і мусіў вызваліцца пасля «сутак» 1 студзеня, але на волю так і не выйшаў. Хутчэй усяго улады ставяць у віну Булаўскаму тое, што ён размесціў у сацсетках фота са жнівеньскіх маршаў у Віцебску, якія адбываліся цягам 2020 года.
З вялікай верагоднасцю можна казаць аб тым, што следчыя ворганы падазраваюць Ўладзіміра у арганізацыі групавых дзеянняў, груба парушаючых грамадскі парадак і спалучаных з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады, г.зн. першую частку артыкула 342 Крымінальнага кодэкса. Па гэтым артыкуле можна пазбавіцца волі, па максімуме, да 4 гадоў.
Цягам мінулага года мужчына правёў у ІЧУ 45 сутак адміністратыўнага арышту.

**24.01.2023**
Некалькі дзён таму ён быў затрыманы, на Ігара Дземідовіча склалі пратакол за парушэнне адміністрацыйнага артыкула 19.11 – за рэпосты з так званых «экстрэмісцкіх» інтэрнэт-рэсурсаў. Пакуль ён на волі, але чакае на позву ў суд.
У Шаркаўшчыне спадар Ігар вядомы як свядомы прыхільнік беларускай мовы, якой карыстаецца і ў побыце, і на працы: некалькі год адпрацаваўшы настаўнікам, ён пераехаў у Менск і стаў кіроўцам таксі, перыядычна здзіўляючы пасажыраў беларускай гаворкай. Праз любоў да беларушчыны, якой ён ніколі не хаваў, Ігар Дземідовіч не раз станавіўся героем матэрыялаў незалежных СМІ.
Зрэшты, пісала пра яго і шаркаўшчынская «раёнка», калі ў 2018-м годзе ён вярнуўся з Менску і заснаваў у райцэнтры курсы «Мова нанова». Паведамляючы пра цікавыя заняткі, мясцовыя журналісты нават не бянтэжыліся згадваць словы Рыгора Барадуліна, працытаваныя Ігарам Дземідовічам: «Быць Беларусам – гэта значыць свайго ні гуку не забыць, усё чужое перайначыць, каб Беларусі вечнай быць!» У межах курсаў праводзіліся сустрэчы з краязнаўцамі і літаратарамі, праходзілі прэзентацыі кніг мясцовых аўтараў.
Калі курсы «Мова нанова» былі ліквідаваныя ў 2020-м годзе, Ігар Дземідовіч падпаў пад увагу міліцыі, бо не хаваў сваёй грамадзянскай пазіцыі. Ён неаднаразова падкрэсліваў, што не варта скардзіцца на навакольнае жыццё, а трэба рабіць яго лепшым праз уласныя высілкі.

**24.01.2023**

Грамадскага актывіста з Шаркоўшчыны Ігара Дземідовіча такім штрафам пакарала 24 студзеня суддзя Аксана Табола.
Аватарка тая была ў фэйсбуку яшчэ ў 2020 годзе, але, як сказалі міліцыянты, тут тэрміну даўніны няма. Пратакол на Ігара Дземідовіча складалі шаркоўшчынскія міліцыянты па загадзе з Віцебска тыдзень таму. Там створаная група сілавікоў, якая вышуквае так званы экстрэмізм у інтэрнэце ўвогуле і ў сацсетках людзей. Вядома, перш за ўсё ў людзей з актыўнай пазіцыяй.
Міліцыянты падчас складання пратаколу забралі ў актывіста тэлефон і сказалі, што аддадуць яго толькі пасля аплаты штрафу, які прызнача суд.
Падтрымаць актывіста ў суд прыйшлі некалькі чалавек, яны збіраюцца дапамагчы актывісту з выплатай штрафу, бо ён занадта вялікі для аднаго чалавека за такую дробязь.
Ігар Дземідовіч раней працаваў настаўнікам гісторыі на Шаркоўшчыне. Некаторы час быў таксістам у Менску. Пазней вярнуўся ў Шаркоўшчыну, арганізаваў там курсы "Мова нанова", якія восенню 2020 года давялося закрыць.

**25.01.2023**
Аршанскі міжраённы аддзел Следчага камітэту распачаў крымінальную справу супраць 26-гадовага хлопца, які зняў на відэа эшалон вайсковай тэхнікі. Пасля таго, як гэтае відэа з’явілася ў інтэрнэце, жыхара Оршы затрымалі за садзеянне экстрэмісцкай дзейнасці, і паводле ч.1 арт.361-4 Крымінальнага Кодэксу яму пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі. Пра гэты інцыдэнт, не называючы імя фігуранта крымінальнай справы, паведаміла дзяржаўная віцебская гарадская газета «Віцьбічы», надрукаваўшы нататку афіцыйнай прадстаўніцы УСК па Віцебскай вобласці Аксаны Лазько.
Фармальна, любыя цягнікі, у тым ліку з вайсковай тэхнікай, здымаць не забаронена. Аднак аршанца абвінавацілі за факт адпраўкі відэа на «экстрэмісцкі» інтэрнэт-рэсурс. Відавочна, што тэкст, размешчаны на сайце дзяржаўнай «Аршанскай газеты», мае на мэце зусім не інфармаванне чытачоў: хутчэй наадварот, бо інфармацыю аб перасоўванні вайскоўцаў і тэхнікі у Беларусі прыхоўваюць . Хутчэй артыкул разлічаны на запалохванне гараджан, якім яшчэ да суду паведамляюць пра патэнцыйнае жорсткае пакаранне затрыманага аршанца.
Сутнасць ягонай правіны выкладаецца трафарэтна: маўляў, хлопец прызнаўся, што быў падпісаны на розныя «экстрэмісцкія Telegram-каналы», дзе бачыў падобныя здымкі. І калі ён сам убачыў перасоўванні вайсковай тэхнікі ў раёне станцыі «Орша-Цэнтральная», то зняў відэа і адправіў яго «экстрэмістам».
Вобраз затрыманага хлопца прадстаўніца УСК імкнецца намаляваць у выключна негатыўным святле, згадаўшы, што ён не мае афіцыйнага працаўладкавання, а ў мінулым быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за крадзеж. Гэтыя падрабязнасці павінны стварыць у чытачоў ураджанне, што здымаць вайсковую тэхніку на відэа, каб пераслаць яго ў «экстрэмісцкія Telegram-каналы» можа толькі чалавек з «сумнёўнай біяграфіяй».
Паказальна, што прадстаўніца УСК не канкрэтызуе, у якім напрамку рухаўся эшалон з вайсковай

тэхнікай і ці былі гэта мясцовыя манеўры або перанакіраванне ўзбраення для ўдзелу ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Украіны.
Што да падобных затрыманняў за здымкі вайсковай тэхнікі, то яны здараюцца перыядычна. Прыкладам, улетку мінулага году у садзеянні экстрэмізму быў абвінавачаны 33-гадовы жыхар Калінкавічаў, які даслаў у Telegram-каналы паведамленні з відэа - і фотаздымкамі тэхнікі, транспартных сродкаў і згадкамі пра маршруты руху ваенізаваных падраздзяленняў па вуліцах і аўтамабільных дарогах Гомельскай вобласці.

**26.01.2023**



Адна з пачынальніц беларускага дэмакратычнага руху на Віцебшчыне ў 1990-я гады, актывістка з Верхнядзвінску мае ўжо пенсійны ўзрост і не дужа моцнае здароўе. Але Наваполацкі гарадскі суд у асобе Зінаіды Балаболавай у лістападзе-снежні 2022г. аштрафаваў жанчыну на 20 базавых велічынь і двойчы запар прысудзіў жанчыне арышты па 10 сутак за рэпосты матэрыялаў з так званых «экстрэмісцкіх «інтэрнэт-рэсурсаў.
Здароўе Валянціны Болбат істотна пагоршылася ва ўмовах Наваполацкага цэнтру ізаляцыі правапарушальнікаў, і ў сярэдзіне снежня мінулага году яе нават датэрмінова выпусцілі на волю. Але ўжо 11 студзеня гэтага году яе выклікалі ў Верхнядзвінскі РАУС і перадалі загад з’явіцца ў міліцыю ў Наваполацку. Там яе адразу ж затрымалі і зноўку накіравалі ў ЦІП – «дабыць» трое сутак «неадседжанага арышту».
13 студзеня, калі яна знаходзілася за кратамі, над актывісткай адбыўся чарговы, ужо чацвёрты суд, цяпер паводле арт. 24.23 КаАП. Тая самая суддзя Зінаіда Балаболава зноўку прызнала Валянціну Болбат вінаватай і аштрафавала ўжо на 100 базавых велічынь. Агульная сума штрафаў, прысуджаных верхнядзвінскай грамадскай актывістцы, складае больш за 4 тысячы рублёў (120 базавых велічыняў). Для пенсіянеркі гэта «завоблачная» сума, і, апроч фінансавых праблем, спадарыні Валянціне аніяк не ўдаецца паправіць здароўе. Яна скардзіцца на боль у сэрцы, высокі ціск і моцную прастуду, якую «падхапіла» у ЦІПе.
Да ўсяго, з 11 па 13 студзеня, калі яе накіравалі «даседжваць» не адбытыя «суткі», актывістка трымала галадоўку на знак пратэсту супраць несправядлівых абвінавачванняў. Паводле Валянціны Болбат, яе асудзілі да апошняга вялікага штрафу за размяшчэнне на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках малюнкаў з Сеціва, якія суд расцаніў як атрыбутыку несанкцыянаванага пікетавання.

**26.01.2023**
Палітвязень Ігар Лосік, былы адміністратар тэлеграм-канала «Беларусь головного мозга», адбывае пакаранне ў наваполацкай ПК №1. Ён быў асуджаны да 15 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (Арганізацыя масавых беспарадкаў) і арт. 130 Крымінальнага кодэкса (Распальванне варожасці ці варажнечы).
Ягоная жонка Дар’я таксама зняволеная: пасля затрымання ў кастрычніку мінулага году, сёлета 19 студзеня яе асудзілі да 2-х гадоў пазбаўлення волі за «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці» (арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса). Чатырохгадовую дачку сямейнай пары пакуль што выхоўваюць бацькі Ігара і Дар’і.
Палітзняволеныя муж і жонка доўгі час не мелі магчымасці для ліставання паміж сабой. Пасля абвяшчэння прысуду жонцы адміністрацыя наваполацкай калоніі дала дазвол на ліставанне Ігару Лосіку, але дасланыя Дар’і допісы пакуль застаюцца без адказу. Пакуль невядома, ці дазволілі жанчыне ліставацца з мужам. Дар’я Лосік пакуль знаходзіцца ў берасцейскім СІЗА.
Яна цалкам прызнала сваю віну, калі ёй было прад’яўлена абвінавачанне за інтэрв’ю тэлеканалу «Белсат», які быў прызнаны ўладамі «экстрэмісцкім фармаваннем». Паводле матэрыялаў крымінальнай справы, Дар’я «пазіцыянавала сябе як жонку палітвязня, а таксама дала асабістую негатыўную адзнаку дзяржаўным органам, да кампетэнцыі якіх аднесена ажыццяўленне крымінальнага пераследу і правасуддзя. Пры гэтым паведаміла, што яе муж не здзяйсняў крымінальных дзеянняў і асуджаны незаконна. Заклікала сваякоў іншых асуджаных узяць з яе прыклад».

**26.01.2023**
Беларуская праваабарончая супольнасць выступіла з чарговай заявай аб прызнанні шэрагу асуджаных палітычнымі зняволенымі. Сярод іх былы супрацоўнік УУС Уладзіслаў Аўчыннікаў, асуджаны да двух з паловай год калоніі, і былы работнік «Белтэлекаму» Цімафей Галубко, асуджаны да трох гадоў «хіміі». Былы «сілавік» Аўчыннікаў пакуль знаходзіцца ў Віцебскім СІЗА -2, а 20-гадовы Галубко, унесены ў пералік грамадзян Беларусі, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія маюць

дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці, ужо адбывае тэрмін пакарання ў Магілёўскай ПУАТ №43.
Цімафей Галубко быў затрыманы ў пачатку чэрвеня 2022 г. Паводле звестак ГУБАЗ, хлопец удзельнічаў у акцыях пратэсту ў жніўні 2020 года, зарэгістраваўся ў чат-боце «Перамога», а таксама выкарыстаў спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, каб рассылаць спам на нумары міліцыі. Цімафея асудзілі паводле арт. 130 Крымінальнага кодэкса РБ (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці іншай сацыяльнай варожасці ці варожасці), прычым першапачатковым выракам суду было 3 гады так званай «хатняй хіміі». Аднак гэты прысуд быў апратэставаны пракурорам і Вярхоўным судом, у выніку чаго і было прынята рашэнне аб змене пакарання на абмежаванне волі з накіраваннем у ПУАТ. Працэс у Віцебскім абласным судзе праходзіў у закрытым рэжыме, з 22 снежня 2022 г. Цімафей Галубко пачаў адбываць пакаранне ў ПУАТ №43.Адміністрацыя ўстановы ўключыла яго ў спіс асобаў, схільных да тэрарызму, і забараніла грашовыя пераводы.
Былога супрацоўніка УУС Віцебскага аблвыканкама Уладзіслава Аўчыннікава асудзілі ў Кастрычніцкім райсудзе ў пачатку снежня 2022г. Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, са снежня 2021г. па травень 2022 г. ён збіраў у базах дадзеных МУС інфармацыю аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных, якую потым «распаўсюджваў у месэнджары Telegram». Мужчыну прызналі вінаватым паводле ч. 1 арт. 352 (Неправамоцнае авалоданне камп’ютарнай інфармацыяй), ч. 2 арт. 424 (Злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Сняжана Кіндзеева прызначыла Уладзіславу 2 гады і 6 месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму і штраф 300 базавых велічыняў.
Беларуская праваабарончай супольнасць лічыць, што дадзеныя выпадкі крымінальнага пераследу маюць палітычныя падставы. І што судовыя рашэнні прынятыя паводле палітычных матываў, парушаюць падставовыя прынцыпы справядлівага правасуддзя. «У чарговы раз падкрэсліваем, што характар дзеянняў абвінавачаных быў вынікам сістэматычных шырока распаўсюджаных парушэнняў правоў чалавека, адсутнасці магчымасці свабоднага выказвання меркавання», – гаворыцца ў заяве аб прызнанні палітзняволенымі Уладзіслава Аўчыннікава, Цімафея Галубко і яшчэ 7 чалавек.

**28.01.2023**



53-гадовага палітвязня з вёскі Сітцы Докшыцкага раёна судзілі ў закрытым рэжыме ў Віцебску за каментары ў сацыяльных сетках і намер паехаць ва Украіну ваяваць. Судовае пасяджэнне вёў суддзя Яўген Буруноў. Суд над палітвязням пачаўся яшчэ 4 лістапада, пасля быў перапынак на псіхічную экспертызу. Акрамя калоніі 4.5 гады, яму прысудзілі каля 7.000 рублёў штрафу. Трэба зазначыць, што пракурор прасіў 6 гадоў калоніі.
Абвінавачванні яму былі прад’яўленыя па 5 артыкулах:
арт. 369 Крымінальнага кодэкса - Абраза прадстаўніка ўлады; арт. 368 Крымінальнага кодэкса - Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; арт. 130 Крымінальнага кодэкса - Распальванне варожасці ці варожасці; арт. 367 Крымінальнага кодэкса — Паклёп у дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; арт. 361-3 Крымінальнага кодэкса - Удзел або падрыхтоўка да ўдзелу грамадзяніна Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі замежнай дзяржавы ў ваенных дзеяннях без упаўнаважвання дзяржавы.
Сяргей Грыбовіч быў затрыманы 13 сакавіка 2022 года на сваім месцы працы ў Падсвіллі Глыбоцкага раёна. У той час яму былі прад’яўленыя два артыкулы Крымінальнага кодэкса: 130 КК (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці іншай сацыяльнай варожасці) і 361-3 КК (Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фарміраванні або ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, вярбоўка або падрыхтоўка асоб да такога ўдзелу).
У "пакаяльным відэа" мужчына распавядаў тады, што запоўніў анкету ў Telegram, каб паехаць ваяваць ва Украіну супраць расейскіх войскаў. Да суда палітвязень знаходзіўся ў СІЗА-2.

**29.01.2023**

Калі ў 2021 г. на Віцебшчыне паводле арт.19.11 КаАП было асуджана 58 чалавек, то цягам 2022г. – 232 чалавекі. Такія дадзеныя прыводзіць Віцебская абласная пракуратура. Пракурор Антон Васілевіч падкрэслівае, што падставай для адміністрацыйнай справы можа быць не толькі перадрук нейкага тэксту або відэа з крыніцы, занесенай у Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, але нават «лайк» пад рэпостам. Работнік пракуратуры расцэньвае такія «віды публічнага адабрэння» як намер распаўсюдзіць інфармацыю для больш шырокага кола асобаў, бо рэакцыі карыстальнікаў павялічваюць ахоп аўдыторыі ў сацыяльных сетках.
Антон Васілевіч раіць бацькам пільна сачыць за старонкамі сваіх дзяцей у сацыяльных сетках, каб своечасова правесці прафілактычную гутарку і выдаліць «шкодны» кантэнт. Пры гэтым пракурор

супакойвае дарослых, што найчасцей падлеткі не маюць глыбокіх «дэструктыўных» перакананняў, а передрукоўваюць матэрыялы з «экстрэмісцкіх» рэсурсаў проста для прыцягнення да сябе ўвагі.
Пры гэтым супрацоўнік пракуратуры вынайшаў вельмі арыгінальны спосаб вызначаць, ці з'яўляецца той ці іншы матэрыял «небяспечным» з кропкі гледжання заканадаўства, і падзяліўся ўласным вынаходніцтвам праз абласную газету «Витебские вести». Паводле Антона Васілевіча, зусім не абавязкова звярацца з афіцыйным спісам экстрэмісцкіх матэрыялаў, размешчаным на сайце МУС. Маўляў, дастаткова «уключыць логіку і розум» ды прааналізаваць, ці ўтрымлівае тэкст або відэа інфармацыю, якая «абражае Беларусь, кіраўніцтва краіны, супрацоўнікаў праваахоўных органаў».
З такім падыходам у «экстрэмісцкія матэрыялы» можна смела запісваць любы крытычны матэрыял, які ўскрывае недахопы ў жыцці краіны. У тым ліку артыкулы дзяржаўных СМІ, калі яны хоць і рэдка, але асмельваюцца раскрытыкаваць працу транспарту, камунальнай гаспадаркі ці АПК.

**29.01.2023**



Андрэй Мельнікаў правёў маленства ў Оршы, потым пераехаў у Гомель, ён вельмі часта вандрue па Беларусі, ладзіць канцэрты і сустрэчы. У мінулы чацвер з ім знікла сувязь, і родныя былі вымушаны напісаць заяву ў міліцыю пра знікненне чалавека. Урэшце ім паведамілі, што Андрэй Мельнікаў знаходзіцца ў ІЧУ Мінскага раёну, што ён нібыта затрыманы за хуліганства і будзе пад вартай да 5 лютага.
Андрэй Мельнікаў вядомы як аўтар і выканаўца аўтарскай песні, ён выпусціў больш за 2 дзясяткі альбомаў на тэму нацыянальнага адраджэння і жыцця ў постсавецкіх рэаліях. Таксама яго ведаюць як журналіста і літаратара, а яшчэ – як заснавальніка фестываляў беларускай аўтарскай песні «Талькаўскі фэст» і «Аршанская бітва», прысвечанага перамозе войска ВКЛ над Маскоўскім войскам у 1514г.
Фэст праводзіўся ў мясцінах, дзе адбывалася сярэднявечная бітва, вядомая як «Бітва пад Оршай». З 2008г. імпрэза апынулася пад забаронай, міліцыя пачала затрымліваць арганізатараў музычнага фестывалю, выканаўцаў з гітарамі і іхных слухачоў. Аднак, нягледзячы на рэпрэсіі, традыцыя аршанскага фэсту жыве, на бераг рэчкі Крапівенкі ў пачатку верасня штогод прыязджаюць людзі, каб пакланіцца крыжу, усталяванаму ў памяць пра загінулых ваяроў, і паспяваць песні хаця б для вузкага кола слухачоў.

## Люты

**02.02.2023**
Блогер Аляксандар Кабанаў распавёў, як адбывае пакаранне Віктар Бабарыка пакаранне ў наваполацкай папраўчай калоніі №1. Пра гэта піша “Радыё Свабода”.
Блогеру не пашчасціла кантактаваць з былым кандыдатам на пост кіраўніка дзяржавы. Гэта немагчыма, калі адбываеш тэрмін зняволення ў розных атрадах.
На прамзоне таксама магчымасьці пакантаваць няма. У калоніі ўсе ведаюць, што кантакты з Бабарыкам канчаюцца штрафным ізалятары. Вакол Бабарыкі створаны вакуўм, мноства «стукачоў», якія сочаць, каб да яго ніхто не падыходзіў.
Віктар Дзмітрыевіч сам ня лезе ні да кога, ходзіць сам па сабе. Імкнецца нават ні з кім не вітацца, каб іх не падставіць. Таму палітыка і палітвязня паставілі на адну з самых цяжкіх работ — вугаль.
Бабарыка віны не прызнае, на яго ідзе ціск. Але з ім не размаўляюць ня толькі вязьні, але і адміністрацыя. Ці гэта ўнутраная пастанова, ці яна самі баяцца. Кабанаў размаўляў зь некаторымі, пытаўся, чаму не гаворыце з Бабарыкам.
«А раптам ён заўтра стане прэзыдэнтам, ну яго нафіг. Хто ведае, як павернецца. Раптам мы ў Расею ўступім, а ў яго там Мілер, ён становіцца буйным чыноўнікам і нам не паздаровіцца».

**03.02.2023**



Васіль Берасняў, праваабаронца і лідар аршанскай філіі незалежнага прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП), выканаўца абавязкаў старшыні прафсаюзу РЭП, асуджаны да да 9 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, нечакана знік з Менскага СІЗА. У гэтай установе ён мусіў знаходзіцца пасля суду, пакуль ідзе час абскарджання прысуду і пакуль не будзе прынята рашэнне наконт месца адбыцця пакарання. Праз колькі дзён праваабаронцы высветлілі, што 73-гадовага палітвязня перавялі ў Магілёў.
Прычына пераводу палягала ў тым, што СІЗА ў г.Менску перапоўнены, а гэта сведчыць пра

надзвычайную актыўнасць сілавікоў у пошуках апанентаў дзейнай улады. Дарэчы, высветлілася, што разам з Васілём Берасневым у Магілёўскі СІЗА быў пераведзены і былы кіраўнік незалежнага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці Генадзь Фядыніч.
5 студзеня Бераснева прызналі вінаватым у закліках да мер абмежавальнага характару, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь (ч. 3 арт. 361 Крымінальнага кодэксу), распальванні іншай сацыяльнай варожасці (ч. 3 арт 130), стварэнні экстрэмісцкага фарміравання альбо ўдзеле ў ім (ч.1 і ч. 3 арт. 361-1 Крымінальнага кодэксу). Генадзь Фядыніч быў таксама асуджаны да 9 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму паводле такіх самых артыкулаў Крымінальнага Кодэксу.
Васіля Бераснева і Генадзя Фядыніча затрымалі 19 красавіка 2022 г., разам з імі быў затрыманы палітолаг і грамадскі дзеяч, актывіст прафсаюзу РЭП Вячаслаў Арэшка. Паводле рашэння суду, дзе разбіраліся справы ўсіх трох прафсаюзных актывістаў, Арэшку належыць адбыць 8 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Цяпер ён па-ранейшаму знаходзіцца ў Менскім СІЗА.

**03.02.2023**
2 лютага была затрымана і асуджана на на 15 сутак жыхарка Воршы Алена Мірашнічэнка.
Жанчына з'яўляецца вядомая ў Оршы зааабаронца. Ініцыятыва «Хвосцікі» ў якой удзельнічае Алена, штомесяц дапамагае дзясяткам бадзяжных жывёлаў. Пару дзён таму ёй даслалі павестку з пазнакай, што супраць яе распачата адмінсітрацыйная справа па арт. 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях.
Згодна гэтага артыкула 34-гадовую Алену асудзілі на 15 сутак адміністратыўнага арышта. На думку міліцыянтаў і суда Мірашнічэнка правяла ў двары аднаго з дамоў забаўляльна-адукацыйную сустрэчу з жыхарамі дома, каб патлумачыць як правільна абыходзіцца з бадзяжнымі жывёламі.

**03.02.2023**
У судзе Першамайскага раёна Віцебска 19 студзеня асудзілі 47-гадовага Васіля Троцкага паводле арт. 391 (Абраза суддзі ці народнага засядацеля), арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Андрэй Андрушэнка прызначыў Васілю адзін год і два месяцы пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму і штраф 1110 рублёў.
Васіля затрымлівалі спачатку с 9 па 10 лістапада 2021 года. 14 лістапада 2022 года мужчыну зноў затрымалі і змясцілі пад варту. Яму паставілі ў віну абразу некалькіх прадстаўнікоў улады. Васіль, знаходзячыся ў Расіі, у 2020 і 2021 гадах пакінуў у сацсетцы “Аднакласнікі” абразлівыя каментары.
Пацярпелымі выступілі пяць дзяржслужачых: М. Фацееў, інспектар міліцыі АУС Дубровенскага райвыканкама С. Пучкоў, операўпаўнаважаны аддзялення аховы правапарадку і прафілактыкі АУС Дубровенскага райвыканкама Кухараў, намесніца старшыні камісіі па справах непаўнагадовых І. Труцько, суддзя суда Дубровенскага раёну І. Катаеў.
Толькі Міхаіл Фацееў з’явіўся на пасяджэнне. Зараз ён працуе юрысконсультам “Бярэзінскага біясфернага запаведніка”. У 2020 годзе з’яўляўся пракурорам Дубровенскага раёну.
У межах грамадзянскага пазову з Троцкага спагналі кампенсацыю маральнай шкоды на карысць Міхаіла Фацеева памерам 500 рублёў.

**06.02.2023**
Сталі вядомыя падрабязнасці пра затрыманне Андрэя Мельнікава – журналіста і барда, заснавальніка фэсту «Аршанская бітва», забароненага ўладамі. 5 лютага ён выйшаў на волю і распавёў, што яго затрымалі 26 лютага пасля выкліку ў пастарунак. Там яго пазнаёмілі з пратаколам, складзеным паводле арт. 19.11 КаАП і адразу ж узялі пад варту. Калі Мельнікаў перастаў выходзіць на сувязь, сваякі, занепакоеныя ягоным лёсам, звярнуліся ў міліцыю. І толькі праз тры дні ім паведамілі, што спадар Андрэй знаходзіцца ў ІЧУ, але – нібыта за хуліганства.
Насамрэч вядомага барда асудзілі на 10 сутак за рэпост з аднаго з так званых «экстрэмісцкіх рэсурсаў» на старонку ў сацыяльнай сетцы «Одноклассники». Выйшаўшы на волю, Андрэй Мельнікаў падзякаваў усім, хто хваляваўся за яго, праз Фэйсбук.
Мельнікава часта называюць менавіта «аршанскім бардам», бо ў Оршы ён правёў дзяцінства і маладосць, менавіта там запісаў свае першыя альбомы пра падтрымцы мясцовых актывістаў, а потым пераехаў у Гомель. Разам з аршанскім гісторыкам Юркам Копцікам бард Андрэй Мельнікаў заснаваў фестываль беларускай аўтарскай песні «Аршанская бітва». Ён штогод праходзіць пад Оршай у першыя выходныя верасня, бо прысвечаны славутай бітве, якая адбылася 8 верасня 1514г. Тады войска ВКЛ перамагло ўтрая большае войска Маскоўскага княства.
У першыя гады беларускай незалежнасці фэст быў вельмі папулярны, на яго з’язджаліся сотні людзей, а Мельнікава і Копціка дагэтуль паўжартам, але з павагай называюць «бацькам і маці фэсту». Аднак

гістарычная праўда пра беларускую вайсковую перамогу падалася шкоднай у справе памкнення дзяржаўных уладаў наладзіць цесныя стасункі з Расеяй, і фэст забаранілі. Арганізатараў і ўдзельнікаў некалькі год запар затрымлівалі за спробы сабрацца на гістарычным Крапівенскім полі, і фэст вымушана перайшоў «у падполле». Але Андрэй Мельнікаў імкнецца штогод у першыя вераснёўскія дні наведаць Аршаншчыну і выступіць у вузкім коле слухачоў.

**06.02.2023**
Беларуская праваабарончая супольнасць выступіла з чарговай заявай з нагоды прызнання палітычнымі зняволенымі яшчэ 20-ці чалавек. Сярод іх вядомы ў Віцебску арт-менеджар і музыка Уладзімір Булаўскі, якога затрымалі 14 снежня. Спачатку меркавалася, што затрыманне адбылося па адміністрацыйнай справе паводле артыкула арт. 24.23 КаАП за наяўнасць на старонках у сацыяльных сетках фотаздымкаў з пратэстаў 2020г. Праваабаронцы даведаліся, што за гэта Булаўскі быў асуджаны да 15 сутак арышту, але ў пачатку студзеня на волю ён так і не выйшаў.



Паводле апошніх звестак, супраць Уладзіміра Булаўскага распачалі крымінальную справу па ч. 1 артыкула 342 Крымінальнага кодэкса, яго падазраюць у арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, і вядзецца якраз пра падзеі 2020 года.
Пераслед Уладзіміра Булаўскага працягваўся некалькі апошніх гадоў. Толькі цягам мінулага году ён быў вымушаны правесці ў ІЧУ 45 сутак адміністратыўных арыштаў.
Цяпер палітвязня ўтрымліваюць у віцебскім СІЗА, і тыдзень таму ў яго памёр бацька. Развітацца з ім Уладзіміру Булаўскаму не дазволілі.

**07.02.2023**
Як паведамляе Віцебскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, па выніках праверак па навядзенні парадку на зямлі ў Віцебскай вобласці было выяўлена больш за 15,8 тыс. парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства.
Супрацоўнікі прыроднаахоўных інспекцый выдалі каля 5,3 тыс. прадпісанняў, прыкладна 9,8 тыс. рэкамендацый і 888 інфармацыйных лістоў для ліквідацыі гэтых недахопаў. Таксама былі складзеныя 352 пратаколы на суму 185 тысяч беларускіх рублёў. Як адзначылі ў абласным камітэце, было вынесенае 641 папярэджанне адказным асобам.
Асноўныя правапарушэнні, якія былі выяўленыя прыродаахоўнымі інспекцыямі Віцебскай вобласці, - гэта абыходжанне з адкідамі (35 адсоткаў; парушэнні ў сферы водакарыстання (19 адсоткаў); аховы атмасфернага паветра (9 адсоткаў); парушэнні заканадаўства ў раслінным свеце (5 адсоткаў) ды іншыя.
Як адзначаюць у ведамстве, у выніку выдадзеных прадпісанняў і рэкамендацый былі ліквідаваныя 98-99 адсоткаў парушэнняў.
Паводле аблкамітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, на першае паўгоддзе 2023 года ў план праверак уключаны 53 суб'екты гаспадарання.

**09.02.2023**
У Полацку 8 лютага пачаўся суд па аднаўленні на працы былога дырэктара “Полацк-Шкловалакно”. Звольнены генеральны дырэктар Раман Блізнёў падаў заяву ў суд на аднаўленне на пасаду дырэктара “Полацк-Шкловалакно”.
Ён быў затрыманы на рабочым месцы 28 лістапада 2022 года. Кабінет быў зачынены да сямі гадзін вечара, там праходзіў вобшук. Тады затрыманне і ўсе тыя падзеі звязвалі з кампаніяй, якая пастаўляла сыравіну ў Расею. Ён знаходзіўся ў віцебскім ІЧУ, а выконваў абавязкі генеральнага дырэктара Віктар Каток.
Але, як казалі ў той час працаўнікі завода, дырэктара маглі і “падставіць”, у яго была павага з боку работнікаў.
Раману Блізнёву 44 гады. Ён з дынастыі работнікаў "Полацк-шкловалакно". Там працавалі яго бацька і маці, а зараз - жонка і старэйшы брат. На завод "Полацк-шкловалакно" ён прыйшоў рабочым. Спачатку быў аператарам атрымання бесперапыннага шкловалакна. Затым скончыў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт.
Паступова Блізнёў дарос да галоўнага інжынера. На гэтай пасадзе ён быў 10 гадоў, а з 2015-га года стаў першым намеснікам генеральнага дырэктара. А з траўня 2021 года - генеральным.
Блізнёў таксама быў лаўрэатам прэміі "Чалавек года Віцебшчыны-2021" у намінацыі "Прамысловасць, гандаль і паслугі, фінансавая дзейнасць, малы і сярэдні бізнес".

Прадпрыемства "Полацк-Шкловалакно" лічыцца адным з найбуйнейшых вытворцаў шкловалакна і матэрыялаў з яго. Там працуе каля 3 500 чалавек.

**09.02.2023**



У Гомельскім абласным судзе з 9 лістапада ў закрытым рэжыме праходзіць суд па справе "Рабочага Руху", фігурантамі якой з'яўляюцца адразу дзесяць палітзняволеных, сярод якіх — Аляксандр Капшуль. Усіх абвінавачваюць у здрадзе дзяржаве, а таксама па шэрагу іншых артыкулаў Крымінальнага кодэкса. Палітвязням пагражае да 15 гадоў зняволення. З 31 снежня Аляксандр абвясціў галадоўку супраць парушэння заканадаўства падчас яго ўтрымання ў гомельскім СІЗА. Галадоўка працягваецца 41 дзень, пры гэтым першыя некалькі дзён ён не піў нават вады. Ён быў затрыманы 25 верасня 2021 года на тэрыторыі РФ і перадалі супрацоўнікам КДБ Беларусі. Паведамлялася, што ў яго была зламаная нага і пашкоджаная рука.

**10.02.2023**

Суполка Укантакце «Докшыцы лайф» прызнана экстрэмісцкай. Такое рашэнне прыняў суд Чашніцкага раёна яшчэ 23 снежня 2022 года.
Але цяпер пракурор раёна Алег Несцяронак паведаміў праз докшыцкую раённую газету “Родныя вытокі” , што ў дачыненні да стваральнікаў, адміністратараў, актыўных удзельнікаў, якія займаліся рэпостамі і іншай папулярызацыяй рэсурсу, будуць узнімацца пытанні аб адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці.
Нагадаем, раней была ўнесена ў рэспубліканскі спіс так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў прадукцыя Telegram-груп "Докшыцы для жыцця!" і "Begoml".
Улады праз “раёнку” раяць дакшыччанам адпісацца ад гэтых рэсурсаў, каб не стаць выпадковым распаўсюджвальнікам забароненай імі ж інфармацыі.

**11.02.2023**

Затрыманне адбылося 9-га лютага пасляператрусу ў кватэры, дзе Вячаслаў Лазараў прапісаны. Там жыве ягоная маці-пенсіянерка, у яе на вачах сына кінулі на падлогу, заламалі рукі за спіну, а потым, не даўшы толкам апрануцца, павялі ў міліцэйскую машыну. З кватэры забралі мабільныя тэлефоны, а таксама маленькую відэакамеру. Маці патлумачылі, што Вячаслава павязуць на допыт у следчы камітэт, але дахаты ў той дзень ён так і не вярнуўся.
Пазней стала вядома, штоператрус правялі таксама і па месцы прапіскі ягонай жонкі, таксама забралі мабільныя тэлефоны і ноўтбук. Жонка распавяла праваабаронцам, што ў пастанове наператрус паспела прачытаць, нібыта супраць Вячаслава Лазарава распачата крымінальная справа.
У чым канкрэтна яго вінавацяць, пакуль застаецца не вядомым. На дадзены момант вядома, што Лазарава ўтрымліваюць у віцебскім ІЧУ.
Ператрусы ў Вячаслава Лазарава праводзіліся і раней. Пад увагу сілавых структураў ён упершыню трапіў у 2018г, калі яго асудзілі і пакаралі штрафам ч. 2 арт. 22.9 КаАП за «незаконны выраб прадукцыі СМІ». Праз год паводле такога самага абвінавачання яго зноўку аштрафавалі, а ў 2020-м годзе суд скасаваў супраць Лазарава адміністрацыйную справу, распачатую за нібыта супрацоўніцтва без акрэдытацыі з замежным сродкам масавай інфармацыі. Спачатку суддзя Кастрычніцкага райсуду Ілля Белавус накіраваў дакументы на дапрацоўку ў міліцыю, потым справу перадалі суддзі Мікалаю Атрахімовічу, які і скасаваў яе, не знайшоўшы доказаў правапарушэння.
Вячаслаў Лазараў шмат гадоў працаваў відэаапэратарам – як на гарадскіх тэлеканалах, так і ў прыватным парадку, здымаючы розныя гарадскія падзеі для ўласнага архіва. Быў некалькі разоў затрыманы падчас восеньскіх пратэстных падзеяў 2020-га году, але яго неўзабаве адпускалі без аніякіх наступстваў.

**11.02.2023**



Жыхар Воршы 43-гадовы палітвязень Андрэй Рускіх, якога расейская паліцыя затрымала ў маі 2022 года ў Санкт-Пецярбургу, будзе знаходіцца ў СІЗА №2 Віцебска пакуль пройдуць следства і судовы разгляд ягонай крымінальнай справы. Улады вінавацяць Андрэя ў абразе А. Лукашэнкі (артыкул 368 КК Беларусі) і «распальванне варожасці» (артыкул 130 КК Беларусі).

1 сакавіка 2022 года Аршанскі міжраённы аддзел Следчага камітэта вынес пастанову аб прыцягненні Рускіх у якасці абвінавачанага па справе аб абразе Лукашэнкі. 7 красавіка з'явілася пастанова аб прыцягненні яго ў гэтай якасці ўжо па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса.

Затрыманы псіхолаг быў 28 мая 2022 года на вакзале ў Санкт-Пецярбургу, куды прыехаў для сустрэчы са сваёй дзяўчынай. Яго адправілі пад варту.

Але Андрэй віну не прызнаў і накіраваў хадайніцтва аб прадастаўленні яму часовага прытулку на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, аднак адказу не атрымаў.

20 снежня мінулага года Санкт-Пецярбургскі гарадскі суд пастанавіў экстрадаваць псіхолага ў Беларусь. Цяпер ён знаходзіцца ў віцебскім СІЗА.

Рускіх — псіхолаг-сэксолаг, псіхатэрапеўт, аўтар кнігі «Дакучлівыя думкі, страхі і ВСД. Як вярнуць паўнавартаснае жыццё». Да снежня 2021-га ён жыў у Оршы, а пасля пераехаў у расійскі горад Уладзімір. Праваабарончая арганізацыя “Мемарыял” палічыла, што пазбаўленне Андрэя Рускіх свабоды незаконным і палітычна матываваным, накіраваным на ўтрыманне ўлады суб'ектамі ўладных паўнамоцтваў, а самога Рускіх – палітычным зняволеным.

**13.02.2023**

Калісьці былы юрысконсульт «Нафтана» Аляксандр Капшуль дапамагаў прадпрыемству выйграваць спрэчкі з іншымі кампаніямі, цяпер жа ён абвінавачваецца ў здрадзе дзяржаве — за дапамогу завадчанам. Паўтара месяца таму ён абвясціў галадоўку ў ізалятары. Расказваем гісторыю актывіста, якога пасля ўцёкаў «вяртаў» КДБ. Пра гэта піша “Наша ніва”.

Таемна з Расіі вывезлі ў Мінск

44-гадовы Аляксандр Капшуль абвясціў галадоўку 31 снежня. Ён патрабуе ад адміністрацыі вязніцы выканання ўсіх нормаў і правілаў утрымання зняволеных.

«Галадоўка праходзіць пад наглядам дактароў, — кажа паплечнік актывіста Павел. — Каб падтрымліваць жыццядзейнасць арганізма Аляксандр прымае глюкозу і згушчонку. Ад іншай ежы адмаўляецца. Заяўляе, што будзе дабівацца свайго».

У турму Аляксандр Капшуль трапіў за ўдзел у пратэстах і за прафсаюзную дзейнасць. Яго і яшчэ дзевяцярых актывістаў абвінавачваюць «у здрадзе дзяржаве», «стварэнні і ўдзеле ў экстрэмісцкім фармаванні», а таксама ў шэрагу іншых «злачынстваў». Ім пагражае да 15 гадоў зняволення. Усе фігуранты прызнаныя праваабарончай супольнасцю палітвязнямі.

Крымінальную справу ад 9 лістапада 2022 года на закрытым працэсе разглядае Гомельскі абласны суд.

Аляксандра Капшуля затрымалі 25 верасня 2021 года на расійска-ўкраінскай мяжы. Пасля яго перадалі КДБ Беларусі, які вывез яго ў Мінск.

З Расіі Аляксандр Капшуль спадзяваўся праврвацца ў Польшчу. Разлічваў, што расійская паліцыя і спецслужбы не стануць яго затрымліваць. «Ён саманадзейна ўзяў білет на самалёт да Варшавы і збіраўся з маскоўскага аэрапорта вылецець у Польшчу, — расказвае Павел. — Едучы цягніком у Расіі, падчас праверкі дакументаў ён зразумеў, што яго будуць затрымліваць на найбліжэйшай станцыі. Здолеў у тамбуры адчыніць дзверы і выскачыў на хаду з вагона. Зламаў нагу, вывіхнуў руку, але добрыя людзі аказалі яму дапамогу і завезлі да расійска-ўкраінскай мяжы». Аляксандра затрымалі на памежным пераходзе пры праверцы дакументаў. «Ён ні ў якіх базах не фігураваў. Мы высвятлялі гэта па сваіх каналах, але яго там чакалі, — даводзіць Павел. — Пераходзіць афіцыйна мяжу было неразумна, але іншага выйсця не было, пагатоў са зламанай нагой, пашкоджанай рукой. Яго трымалі на мяжы, пакуль не прыехалі супрацоўнікі КДБ. Ніякіх судовых пастаноў аб экстрадыцыі не было. Проста незаконна вывезлі з Расіі ў Беларусь».

Па словах Паўла, пра затрыманне Аляксандра стала вядома з крыніц, якія падтрымлівалі сувязь з ім падчас яго знаходжання ў Расіі.

За тры дні да затрымання супрацоўнікі КДБ падчас вобшуку на лецішчы ў Капшуля знайшлі старыя патроны. Як заяўляецца ў тэлеграм-канале «Рабочы рух», іх падкінулі спецслужбоўцы. Сярод артыкулаў абвінавачвання ў Капшуля значацца і «незаконныя дзеянні з агнястрэльнай зброяй, боепрыпасамі і выбуховымі рэчывамі».

20 гадоў адпрацаваў на наваполацкім «Нафтане»

На «Нафтане» Аляксандр Капшуль адпрацаваў 20 гадоў. У лютым 2021 года быў звольнены фармальна за прагулы.

Ён выпускнік факультэта міжнародных адносін БДУ. Ва ўнiверсітэце вучыўся па мэтавым накіраванні завода «Палімір», структурнага падраздзялення «Нафтана».

На «Паліміры» шмат гадоў працаваў бацька Капшуля, спачатку эканамістам, а затым начальнікам аховы. Са сваёй жонкай Аляксандр пазнаёміўся таксама на прадпрыемстве.

У іх двое сыноў-падлеткаў. Павел характарызуе сябра як сур’ёзнага, мэтанакіраванага, але з выдатным пачуццем гумару чалавека.

«Ён цудоўны суразмоўца. Умее расслабляцца. Ведаю, што бавіў час, наведваючы лазню. З дзецьмі гойсаў на роварах. Казаў, што робіць усё для будучыні сваіх дзяцей. Каб яны маглі жыць у нармальнай краіне, калі выходзяць на вуліцу, каб іх не арыштавалі, не збілі, не пасадзілі», — падкрэслівае Павел.

Сам Аляксандр казаў, што аддаваў перавагу быць з сям'ёй, калі меў вольны час. Штопятніцу разам яны праглядалі новы фільм.

Аляксандр шмат высілкаў уклаў у будаўніцтва лецішча, дзе з сям'ёю адпачываў у выхадныя. Любіў вэндзіць рыбу і мяса. Хадзіў з дзецьмі на возера, у басейн. Важдаўся з тэхнікай: машынай і камп’ютарам.

Бараніў інтарэсы дзяржаўнага бізнэсу ў спрэчках з працоўнымі

Да падзей 2020 года Аляксандр Капшуль бараніў інтарэсы прадпрыемства ў судовых справах са звольненымі працаўнікамі.

«У асноўным іскі падаюць людзі, звольненыя «па артыкуле». Але ніводнай такой справы прадпрыемства не прайграла», — казаў ён.

Аляксандр Капшуль бараніў інтарэсы «Нафтана» ў спрэчках з іншымі прадпрыемствамі.

«Аднойчы мы амаль восем месяцаў судзіліся з будаўнічай арганізацыяй. Пасля падпісання акта здачы-прыёмкі выкананых работ выявіліся, можна сказаць, схаваныя дэфекты, — расказваў ён у 2017 годзе. — У выніку выйгралі, атрымаўшы права не плаціць за гэту работу. Гэта было гадоў дзесяць таму, сума ўгоды складала каля 75 млн рублёў».

Калега Аляксандра па праваабарончай дзейнасці Святлана адзначае, што «ён пасля 2020 года перастроіўся і стаў абараняць правы працоўных».

«Аляксандр не мог прыняць парушэнняў правоў работнікаў, якія дапускаліся дзяржавай і дзяржаўнымі прадпрыемствамі, — кажа яна. — Ён бараніў працоўных, як юрыст, у рамках прававога поля — нацыянальнага і міжнароднага. Гэтыя законныя дзеянні ў тым ліку сталі падставай для пераследу яго дзяржавай. Аляксандр не змяніўся ў турме, яго не зламалі, і ён працягвае змагацца за свае правы, падае скаргі».

Падзеі 2020 года называў «прававым бясчынствам»

Да пратэстаў 2020 года Павел і Аляксандр не былі знаёмыя, хоць і працавалі на «Нафтане». У Аляксандра быў кабінет у будынку заводскага ўпраўлення, а Павел быў заняты на самой вытворчасці.

Абодва выступалі на мітынгах. Пасля ўдзельнікі збіраліся абмяркоўваць далейшы ход пратэснага руху, і на такіх сходках мужчыны пасябравалі.

«У краіне чыніўся гвалт, людзей збівалі, і працоўныя выйшлі супраць несправядлівасці. Аляксандр быў абураны тым, што адбывалася. Выказваў сваю пазіцыю кіраўніцтву прадпрыемства, спрачаўся з чальцамі выбарчых камісій, з якім быў знаёмы па працы», — расказвае Павел.

У 2020 годзе Аляксандр стаў сябрам Беларускага незалежнага прафсаюза. У ім бараніў працоўных ад ціску наймальніка і дзяржаўнага прафсаюза, які заяўляў, што па-за палітыкай, але садзейнічаў звальненню работнікаў.

«Ён прафесійны, дасведчаны юрыст, хаця яго спецыфіка не працоўнае заканадаўства, а міжнародныя адносіны. Сваю пазіцыю ў судах даводзіў аргументавана, з фактамі парушэння заканадаўства. Супрацьлеглы бок, пазіцыю прадстаўнікоў прадпрыемства, пракуророў, якія часам прысутнічалі на працэсах, разносіў ушчэнт», — адзначае Павел.

Аляксандр Капшуль у пачатку снежня 2020 года далучыўся да агульнанацыянальнай стачкі. Праз 2,5 месяца, у лютым 2021 года, яго звольнілі.

«Ён, як іншыя работнікі прадпрыемства, напісаў заяву і не выходзіў на працу, — даводзіць Пётр. — Як і ўсіх страйкоўцаў, фармальна яго звольнілі за прагулы».

Аляксандр Капшуль падзеі 2020 года называў «прававым бясчынствам».

Ён заяўляў, што законы змяняюцца не для абароны правоў народа як адзінай крыніцы ўлады, а для яго падаўлення. Даводзіў, што кіраўніцтва «Нафтана» ціснe на работнікаў за іх грамадзянскую пазіцыю і прафсаюзную прыналежнасць.

**13.02.2023**



Анархіста Яўгена Рубашку, які родам з Глыбокага, і якога ў красавіку 2022 года асудзілі да пяці гадоў пазбаўлення волі, змясціла ў памяшканне камернага тыпу (ПКТ) на месяц. Ён адбывае сваё пакаранне ў бабруйскай калоніі № 2. Да гэтага хлопца тройчы змяшчалі ў ШІЗА на 10, 7 і 7 сутак за надуманыя парушэнні правілаў унутранага распарадку.

Палітвязень быў затрыманы 29 ліпеня 2021 года ў Менску. Тады ў яго кватэры сілавікі зладзілі ператрус, а самаго Яўгена пры затрыманні збілі. Патрабуючы доступу да тэлефона і камп'ютара, хлопцу нацягвалі нават на галаву пакет, і ён ледзь не задыхнуўся. Яму было прад'яўлена абвінавачванне па арт. 342 Крымінальнага кодэкса (Групавыя дзеянні, што груба парушаюць грамадскі парадак). Пасля яму разам з іншымі анархістамі (Аляксандрам Бяловым і Арцёмамі Салаўямі) былі прад'яўленыя новыя абвінавачванні па ч. 3 арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса — удзел у экстрэмісцкім фармаванні.

Судовы працэс па іх справе быў закрытым і адбыўся 22 красавіка 2022 года. Суд прызнаў чатырох анархістаў вінаватымі паводле ч. 1 арт. 342 КК і ч. 3 арт. 361-1 КК і прысудзіў Яўгену Рубашку, Аляксандру Бялову, Арцёму Дзмітрыевічу Салаўю — па пяць гадоў калоніі, Арцёму Сяргеевічу Салаўю — 4,5 года калоніі.

На пачатку Яўгена Рубашку з СІЗА-1 этапавалі ў турму № 4. У канцы ліпеня 2022 года палітвязня перавялі ў ПК № 2 г. Бабруйска. У жніўні 2022 г. МУС унёс палітвязня ў "Пералік грамадзян, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці".

Падтрымаць палітвязня можна лістамі і паштоўкамі салідарнасці: ПК № 2. 213800, г. Бабруйск, вул. Сікорскага, 1, Яўгену Аляксандравічу Рубашку.

**14.02.2023**

У бягучым годзе, судовыя ўлады Віцебскага рэгіёну працягнулі прымаць рэпрэсіўныя пастановы ў дачыненні да грамадзян, якія выказвалі свае думкі ў сацыяльных сетках і тэлеграм-каналах. За студзень месяц 15 чалавек былі падвергнуты рознымі відамі адміністрацыйных санкцый, а менавіта арыштамі, штрафамі і прымусовымі працамі.

Судамі Віцебскай вобласці ў студзені 2023 года прыняты як мінімум 5 пастаноў у рамках артыкула 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў ) Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб Адміністрацыйных Правапарушэннях.

Так, 15 сутак даў Наваполацкі суд мясцоваму жыхару за размяшчэнне на сваёй старонцы ў Фэйсбуку сцяга Украіны з тэкстам «Слава Украіне героям слава» і фотавыявы з БЧБ сімволікай і гербам «Пагоня».

За смайлікі ў выглядзе трох бчб-сэрцайкаў, размешчаныя ў цік-току (накшталт ў ім) каштавалі жыхарцы Лепеля трое сутак утрымання пад вартай.

Мужчыну з Віцебска суддзя суда Першамайскага раёна Міхаіл Юрчанка за пратэстную сімволіку ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» пакараў 15 суткамі арышту і дадаў яшчэ 7 сутак за тую ж графіку ў інстаграме.

Той жа суддзя прыняў рашэнне аб пакаранні 15 суткамі арышту віцебляніну за бчб-сцяг і герб Пагоню, якія ён размясціў у інтэрнеце ў 2017-2018 гадах, праўда, у 2020-м ён зноў іх выстаўляў.

Статыстыка за студзень 2023 года па артыкуле 19.11 (Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуе такую дзейнасць) КаАП РБ былі прыцягнутыя да адказнасці 10 жыхароў рэгіёну. Па адным чалавеку ў Верхнядзвінску, Наваполацку, Полацку, Ліёзна, Віцебску і Россонах. У Лепеле і Паставах былі пакараныя па два чалавекі.

Судамі да адміністрацыйнага арышту былі прыцягнутыя сем чалавек у суме 55 сутак, штрафам па 740 рублёў кожнаму, былі пакараныя двое жыхароў вобласці, адзін чалавек быў асуджаны да 60 гадзін грамадскіх работ.

**15.02.2023**



Камітэт дзяржаўнай бяспекі абнавіў спіс "асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці". У пералік быў залічаны жыхар Докшыцаў палітвязень Сяргей Грыбовіч, асуджаны за намер паехаць ваяваць ва Украіну супраць расейскіх войскаў. Ён стаў 267-мым беларусам, якіх улады лічаць "тэрарыстамі".
Сяргей Грыбовіч з Віцебшчыны. Ён быў затрыманы на пачатку сакавіка 2022 года паводле двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: 130 КК (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці) і 361-3 КК (Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фарміраванні або ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, вярбоўка або падрыхтоўка асоб да такога ўдзелу).
У "пакаяльным відэа" мужчына заявіў, што запоўніў анкету ў Telegram, каб паехаць ваяваць ва Украіну супраць расійскіх войскаў. Яго змясцілі ў віцебскае СІЗА-2.
У Віцебскім абласным судзе 4 лістапада 2022 г. пачаўся разгляд крымінальнай справы палітвязня. Грыбовічу ў выніку выставілі абвінавачванні паводле арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады), ч. 1 арт. 130 (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці), ч. 1 і ч. 2 арт. 367 (паклёп у дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), ч. 1 і ч. 2 арт. 368 (абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), ч. 1 арт. 361-3 (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання альбо ўдзел у ім). Грыбовіча накіравалі на псіхіятрычную экспертызу.
27 студзеня 2023 г. суддзя Віцебскага абласнога суда Яўген Бурunoў прызнаў палітвязня вінаватым і пакараў яго зняволеннем на тэрмін чатыры з паловай гады ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму, а таксама штрафам у памеры 7 000 рублёў.

**16.02.2023**
Іх затрымалі за фота з пратэстаў у Мінску. На ім яны стаяць на дарозе падчас акцыі пратэсту ў 2020 годзе.
Крымінальная справа паводле ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя або актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак) разглядаецца сёння, 18 лютага, у судзе Партызанскага раёна Мінска. На лаве падсудных — Дзмітрый Плешавеня, Людміла Цыбульская, Юрый Дзіковіч і Сяргей Ляўко. Іх справу разглядае суддзя Міхаіл Макарэвіч.
Грамадскіх актывістаў затрымаў ГУБАЗіК у Паставах у лістападзе мінулага года. Але затрыманыя не ўсе, бо частка актывістаў з Паставаў, якая таксама ёсць на фота, з'ехала яшчэ падчас першай хвалі палітычнай міграцыі. Такім чынам улады зачышчаюць усіх нязгодных з дзеяннямі рэжыму Лукашэнкі, нават у маленькіх гарадах.

**16.02.2023**
Суддзя Віцебскага абласнога суда Яўген Буруноў 16 лютага вынес прысуд медыку Аляксею Аляксейчыку, згодна якога асуджаны прывядзе у калоніі 2,5 годы ва ўмовах агульнага рэжыму. Мужчыну прызналі вінаватым у рамках ч. 3 арт. 361 (Заклікі да мер абмежавальнага характару (санкцый), іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь) КК. Судовы працэс праходзіў у закрытым рэжыме.
Вядома, што Аляксей Аляксейчык больш за 20 гадоў працаваў урачом-трансплантолагам у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры дзіцячай анкалогіі і гематалогіі. Ён лічыцца адным з лепшых спецыялістаў цэнтра, які правёў мноства аперацый па перасадцы касцявога мозгу.
Аляксея затрымалі 5 кастрычніка 2022 года пасля таго, як вясной таго ж года супрацоўнікі МУС атрымалі доступ да ўнутранага чату медработнікаў цэнтра. У чаце лекары абмяркоўвалі палітычную абстаноўку ў Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія прайшлі ў жніўні 2020 года і адкрыта выступілі супраць гвалту супраць удзельнікаў пратэстаў.

**17.02.2023**
У Гомелі 17 лютага абвясцілі прысуд дзесяці абвінавачаным па крымінальнай справе «Рабочага руху». Сярод іх былы юрысконсульт «Нафтана» Аляксандр Капшуль, дапамагаў прадпрыемству выйграваць спрэчкі з іншымі кампаніямі, цяпер жа ён абвінавачваецца ў здрадзе дзяржаве — за дапамогу завадчанам. Паўтара месяца ён трымаў галадоўку ў ізалятары.
«Рабочы рух» — аб'яднанне рабочых, якія былі не згодныя з тым, што адбываецца ў краіне. Людзі былі гатовыя адкрыта выказвацца і адстойваць сваю пазіцыю.
21 верасня 2021 года прызналі экстрэмісцкай арганізацыяй і «Рабочы рух». Адразу прайшла хваля

затрыманняў: актывістаў хапалі і ў Беларусі, і ў Расіі. Некаторых людзей затрымлівалі яшчэ з 17 верасня, да афіцыйнага прызнання руху «экстрэмісцкім». Працаваў КДБ.
У справе налічвалася 38 тамоў, у тым ліку сакрэтны. Суд доўжыўся тры месяцы, праходзіў з 9 лістапада, большая частка працэсу праходзіла ў закрытым рэжыме. Абвінавачаныя адмовіліся даваць паказанні.

**18.02.2023**



Суд над імі адбыўся ў Мінску. Пастаўчан судзілі паводле ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя або актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак). Іх справу разглядаў суддзя Міхаіл Макарэвіч.
Самы вялікі тэрмін "хатняй хіміі" прысудзілі Юрыю Дзіковічу – 3 гады, Дзмітрыю Плешавені і Сяргею Ляўко далі па 2.6 гады, Людміле Цыбульскай – 2.3 гады.
Нагадаем, раней сілавікі ўбачылі ў інтэрнэце здымак, дзе пастаўчане стаяць на дарозе падчас акцыі пратэсту ў 2020 годзе ў Мінску. Іх затрымліваў ГУБАЗіК у Паставах у лістападзе мінулага года.

**18.02.2023**
У Гомельскім абласным судзе абвясцілі вырак абвінавачаным па крымінальнай справе «Рабочага руху» – 10-ці прадстаўнікам прадпрыемстваў «Нафтан», «Гродна Азот», БМЗ, «Атлант», беларускай чыгункі. Сярод асуджаных – былыя юрысконсульты ААТ «Нафтан» Аляксандр Капшуль і Ігар Мінц. Абодвух прызналі вінаватымі ў «здрадзе дзяржаве» і «стварэнні экстрэмісцкага фармавання і ўдзеле ў ім». Ігар Мінц, як і астатнія 9 фігурантаў справы, не прызнаў у гэтым сваёй віны. Суддзя Аляксандр Піскуноў асудзіў Мінца да 12 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.
Крымінальная справа супраць удзельнікаў «Рабочага руху» – аб'яднання працоўных, якія былі не згодныя з тым, што адбываецца ў краіне, была распачатая ўвосень 2021г. Пасля таго, як 21 верасня 2021 г. гэтую арганізацыю прызналі экстрэмісцкай, па ўсёй краіне пачаліся затрыманні
Ігар Мінц быў затрыманы ў Наваполацку 23 верасня 2021г., за дзень да таго ў яго дома правялі ператрус. Некаторы час Мінца трымалі ў менскім СІЗА КДБ, пазней перавялі ў гомельскі СІЗА разам з іншымі падазраванымі. Усе 10 фігурантаў гэтай крымінальнай справы былі прызнаныя беларускай праваабарончай супольнасцю палітычнымі зняволенымі.
Суд над над удзельнікамі «Рабочага руху» распачаўся яшчэ 9 лістапада мінулага году, большая частка працэсу праходзіла ў закрытым рэжыме. Крымінальная справа складалася з 38 тамоў, у тым ліку сакрэтных. Паводле судовага выраку, апроч 12-гадовага зняволення навапалачаніну Ігару Мінцу належыць выплаціць штраф памерам 100 базавых велічыняў. Іншыя ўдзельнікі «Рабочага руху» таксама асуджаны да пазбаўлення волі – на тэрміны ад 11 да 15 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

**19.02.2023**



Бізнэсмен з Полацка і «яго шасцёра памагатых» падазраюцца ва ўхіленні ад выплаты падаткаў і легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, паведаміў Камітэт дзяржкантролю. Захараў не аднойчы дазваляў сабе публічную крытыку беларускіх уладаў, у тым ліку і палітыку Александра Лукашэнка.
Накладзены арышт на маёмасць падазраваных — 68 аб'ектаў нерухомасці плошчай больш за 107 тыс. кв. м агульным коштам не менш як 92 млн еўра, у тым ліку 24 гандлёвыя цэнтры, катэджы, кватэры, аўтамабілі «люксавага сегмента». Захараў валодаў гандлёвым домам « Стралец », гандлёвымі цэнтрамі ў Мінску, Полацку, Наваполацку, Гродна, Віцебску, Магілёве, Бабруйску.
У наступны час прадпрымальнік і фігурант крымінальнай справы знаходзіцца «недзе на берагах Персідскага заліва». У канцы мінулага года з'явілася інфармацыя, што Захараў распрадае сваю маёмасць. Захараў заўсёды меў актыўную грамадзянскую пазіцыю і падтрымліваў тых, хто "быў патрыётам Полацка". Для прыкладу, ён у 2013 годзе падтрымаў жыхароў Полацка, якія выступілі супраць забудовы прывакзальнай плошчы мінскімі дэвелаперам Андрэем Балабіным і ретейлером Ігарам Чарняўскім.
У верасні 2020 года Захараў дазволіў падвергнуць крытыкі палітыку Лукашэнкі ў дачыненні да прыватнага бізнесу. Пра гэта ён сказаў расійскаму выданню Лента.РУ. Ён сказаў наступнае: "У многіх беларускіх бізнесменаў ёсць адчуванне, што яны разам з уладай жывуць у розных сусветаў. Лукашэнка неяк сказаў, што яго мара — «паціснуць руку апошняму прадпрымальніку краіны», а нас называе

«блыхамі ». Гэта ненармальна! Пры гэтым, згодны, весці бізнэс у Беларусі не складаней, чым у Расіі".

**22.02.2023**

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні прынялі праект закона "Аб змене кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці". Таксама, дэпутаты ўхвалілі смяротнае пакаранне за здраду дзяржаве для службовых асоб і вайскоўцаў, а паводле аналогіі з расійскім заканадаўствам уводзіцца пакаранне за дыскрэдытацыю войска. Праваабаронцы лічуць, што такім чынам улады працягваюць змагацца з самымі малымі праявамі нелаяльнасці і іншадумства.

На сайце Палаты Прадстаўнікоў сцвярджаецца, што "ў мэтах аказання стрымліваючага ўздзеяння на дэструктыўныя элементы, а таксама дэманстрацыі рашучай барацьбы са здрадай дзяржаве" праектам Закона прапануецца занясенне змен у санкцыю часткі 2 артыкула 356 КК, якія прадугледжваюць магчымасць ужывання выключнай меры пакарання ў выглядзе смяротнага пакарання за здраду дзяржаве, здзейсненую службовай асобай, што займае дзяржаўную пасаду, ці асобай, на якую распаўсюджваецца статус вайскоўца.

У артыкул 369-1 КК уносяць дадатак у мэтах вызначэння адказнасці за распаўсюд свядома непраўдзівых звестак, якія дыскрэдытуюць Узброеныя Сілы, іншыя войскі і вайсковыя фармаванні, ваенізаваныя арганізацыі Рэспублікі Беларусь.

"Увядзенне такой прававой нормы будзе з'яўляцца дзейснай прэвентыўнай мерай распаўсюду свядома непраўдзівай неадпаведнай рэчаіснасці інфармацыі пра беларускае войска і іншыя «сілавыя структуры»", — лічуць дэпутаты.

Прапануецца ўвесці ў Крымінальны кодэкс артыкул "Прапаганда тэрарызму" і "Парушэнне патрабаванняў па абароне дзяржсакрэтаў", "бо вызначэнне крымінальнай адказнасці за прапаганду тэрарызму будзе спрыяць прадухіленню распаўсюду інфармацыі, якая рэабілітуе тэрарызм, і недапушчэнню прызнання практыкі і ідэалогіі тэрарызму як правільных і годных падтрымкі мадэляў паводзін".

Штраф за злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, грамадскай бяспекі, бяспекі руху, здароўя насельніцтва і дзяржавы павялічваецца да максімальных 50 тысяч базавых велічынь, цяпер гэта 1 850 000 рублёў (каля 621 тысячы еўра).

Чалавека, якога падазраюць у здрадзе дзяржаве, змове з мэтай захопу ўлады, шпіянажы, тэрарызме ці дыверсіі, змогуць затрымліваць паводле падазрэння на тэрмін да 10 сутак, а абвінавачванне выстаўляць на працягу 20 сутак. На думку дэпутатаў, "гэта выклікана тым, што часцяком па гэтых складах злачынстваў, акрамя працэсуальнага замацавання доказаў, на пачатковай стадыі актыўна праводзяцца аператыўна-следчыя камбінацыі, на правядзенне якіх 72 гадзінаў затрымання бывае недастаткова".

Улады лічуць, што прыняцце праекта Закона дазволіць больш дзейсна рэалізоўваць комплекс захадаў, скіраваных на выяўленне і процідзеянне экстрэмісцкім і тэрарыстычным структурам, а таксама спробам замежных спецслужбаў і арганізацый залучыць беларускіх грамадзян у дзейнасць, накіраваную на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь.

На думку праваабаронцаў, новыя нормы ставяць пад пагрозу выкананне міжнародных абавязальніцтваў Беларусі ў галіне правоў чалавека, закранаюць права на жыццё і свабоду выказвання меркаванняў.

**24.02.2023**



Па інфармацыі праваабаронцаў, у віцебскую калонію №3 Алеся Папковіча перавялі яшчэ да разгляду апеляцыйнай скаргі, і на той момант яго прысуд яшчэ не ўступіў у законную сілу. Палітвязня асудзілі 5 снежня 2022 г. у судзе Заводскага раёну Менску. Суддзя Дзмітрый Астапенка прызначыў хлопцу два гады зняволення ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. І ўжо ў студзені Алесь Папковіч апынуўся ў «Віцьбе-3», прычым адразу ў памяшканне камернага тыпу. Па выніку разгляду апеляцыі, хлопца перавялі на каранцін у той самай калоніі, бо прысуд пакінуты без зменаў. Агулам у віцебскай ПК №3 ўтрымліваюцца 90 палітзняволеных.

Алеся Папковіча разам з малодшым братам Янам затрымалі 2 верасня мінулага года ў Менску. Вядома, што браты планавалі з’ехаць у Польшчу, аднак за дзень да ад’езду былі затрыманыя сілавікамі, якія прыйшлі зператрусам па месцы жыхарства Яна Папковіча. Падчас затрымання Яна моцна збілі, а Алесь быў затрыманы, бо на той момант зайшоў да брата ў кватэру.

Абодвух братоў абвінавацілі паводле арт. 342 Крымінальнага Кодэксу (актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак), Яна Папковіча – яшчэ й паводле арт. 361-3

Крымінальнага кодэксу («Удзел ці падрыхтоўка грамадзяніна Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі замежнай дзяржавы ў ваенных дзеяннях без упаўнаважання дзяржавы»).
Доказам супраць Алеся Папковіча сталі фотаздымкі з пратэстаў, знойдзеныя ў тэлефоне, дзе ён з братам і ягонай жонкай стаяць на праезнай частцы. Ян Папковіч пакуль не асуджаны, яго ўтрымліваюць у менскім СІЗА №1.

**24.02.2023**
Мужчына чакае суда за каментары ў сеціве Інтэрнэт паводле абвінавачвання ў распальванні сацыяльнай варожасці і абразе А. Лукашэнкі па арт. 130 і 368 КК узяты пад варту і ўтрымоўваецца на працягу доўгага тэрміна ў Віцебскім абласным СІЗА №2. Заява праваабарончых арганізацый змешчына тут.
Прадстаўнікі праваабарончай супольнасці Беларусі, адзначаюць, што прыцягненне да крымінальнай адказнасці за распальванне іншай сацыяльнай варожасці або варажнечы (арт. 130 КК) следствам і судамі селектыўна і дыскрымінацыйна ўжываецца выключна дзеля абароны інстытутаў улады. Прычым вылучэнне прадстаўнікоў улады, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, вайскоўцаў і г. д. у якасці сацыяльных груп, якія падпадаюць пад абарону ў гэтым кантэксце, праваабаронцы лічуць неабгрунтаваным.
Жыхар Воршы 43-гадовы палітвязень Андрэй Рускіх, якога расейская паліцыя затрымала ў маі 2022 года ў Санкт-Пецярбургу, будзе знаходіцца ў СІЗА №2 Віцебска пакуль пройдуць следства і судовы разгляд ягонай крымінальнай справы. Улады вінавацяць Андрэя ў абразе А. Лукашэнкі (артыкул 368 КК Беларусі) і «распальванне варожасці» (артыкул 130 КК Беларусі).
1 сакавіка 2022 года Аршанскі міжраённы аддзел Следчага камітэта вынес пастанову аб прыцягненні Рускіх у якасці абвінавачанага па справе аб абразе Лукашэнкі. 7 красавіка з'явілася пастанова аб прыцягненні яго ў гэтай якасці ўжо па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса.
Затрыманы псіхолаг быў 28 мая 2022 года на вакзале ў Санкт-Пецярбургу, куды прыехаў для сустрэчы са сваёй дзяўчынай. Яго адправілі пад варту.
Але Андрэй віну не прызнаў і накіраваў хадайніцтва аб прадастаўленні яму часовага прытулку на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, аднак адказу не атрымаў.
20 снежня мінулага года Санкт-Пецярбургскі гарадскі суд пастанавіў экстрадаваць псіхолага ў Беларусь. Цяпер ён знаходзіцца ў віцебскім СІЗА.
Рускіх — псіхолаг-сэксолаг, псіхатэрапеўт, аўтар кнігі «Дакучлівыя думкі, страхі і ВСД. Як вярнуць паўнавартаснае жыццё». Да снежня 2021-га ён жыў у Оршы, а пасля пераехаў у расійскі горад Ўладзімір. Праваабарончая арганізацыя “Мемарыял” палічыла, што пазбаўленне Андрэя Рускіх свабоды незаконным і палітычна матываваным, накіраваным на ўтрыманне ўлады суб'ектамі ўладных паўнамоцтваў, а самога Рускіх – палітычным зняволеным. Падтрымаць арыштаванага можна шляхам адпраўкі лістоў або паштовак на адрас: Віцебскі абласны следчы ізалятар №2, вул. Гагарына 2, 210026, Віцебск, Рускіх Андрэю Ўладзіміравічу.

**25.02.2023**
Групу ў «ВКонтакте» з назвай «Алкоголики Шумилино» дадалі ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Дарма шукаць падтэксту ў назве групы, апелюючы да вядомага выказвання пра “наркаманаў і прастытутак” - удзельнікаў пратэстаў 2020г. У групе, зарэгістраванай у 2014 года, усяго 88 чальцоў, а певедамленні й насамрэч у сваёй большыні прысвечаны “алкагольнай тэме. Таксама тут сустракаюцца абвесткі пра згубленыя ці знойдзеныя рэчы, анонсы канцэртаў, запрашэнні наведаць новую цырульню і гд. Што ж “экстрэмісцкага” было заўважана ў шумілінскай групе, раз МУС вырашыла дадаць яе ў сумнавядомы спіс?
Падобна, справа ўсяго ў адзіным допісе, апублікаваным сёлета ў траўні. Там згаданы Сяргей Ціханоўскі, і ёсць спасылка на мясцовы тэлеграм-канал.
Шумілінскі раённы суд залічыў “алкголікаў” у “экстрэмісты” 15 лютага. Але ў групе дагэтуль размяшчаюцца аб’явы: падобна, іх аўтары не ведаюць, што пішуць у “асяродак экстрэмістаў ”.

**27.02.2023**



Па рашэнні наваполацкай суддзі Вольгі Баліка палітзняволенага пінчука Алега Рубца ў чэрвені 2022 года перавялі на тры гады з калоніі ў следчую турму № 8 г. Жодзіна. У калоніі яго рэгулярга змяшчалі ў ШІЗА, а таксама ўтрымлівалі ў ПКТ.
Паводле ягоных бацькоў, два з паловай месяцы ад Алега не было ні лістоў, ні званкоў. Цяпер высветлілася, што яго на 60 закідвалі ў штрафны ізалятар.
26 лютага хлопцу споўнілася 21 год. Лісты да яго амаль не даходзяць, але заклікаем павіншаваць яго тэлеграмай.
Нагадаем, Алега затрымалі 10 жніўня 2020 года за ўдзел у масавых беспарадках у ноч з 9 на 10 жніўня ў Пінску (ч. 2 арт. 293 КК). Пры затрыманні быў моцна збіты. 30 красавіка Рубцу прысудзілі 5,5 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

**27.02.2023**
Жыхар Новалолацка Капшуль спыніў галадоўку 20 лютага. Стан яго здароўя здавальняючы, але мужчына дужа схуднеў. Галадоўкай, якую абвясціў 31 снежня, Аляксандр Капшуль дамагаўся ад адміністрацыі следчага ізалятара Гомеля выканання ўсіх нормаў і правілаў утрымання зняволеных.
17 лютага Гомельскі абласны суд прызначыў Аляксандру Капшулю 15 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Яго абвінавацілі ў «здрадзе дзяржаве», «стварэнні і ўдзеле ў экстрэмісцкім фармаванні», а таксама ў «незаконных дзеяннях з агнястрэльнай зброяй, боепрыпасамі і выбуховымі рэчывамі». Сваёй віны Аляксандр не прызнаў і збіраўся абскарджваць вырак.
Былога юрысконсульта наваполацкага «Нафтана» Аляксандра Капшуля асудзілі па справе «Рабочага руху». «Рабочы рух» — аб’яднанне рабочых, якія былі не згодныя з тым, што адбываецца ў краіне, і гатовы былі адкрыта адстойваць сваю пазіцыю.

## Сакавік

**01.03.2023**



Святлану Стукаву, жонку актывіста Свабоднага Прафсаюзу Беларускага Віктара Стукава, затрымалі заўчора проста на працы. У райаддзеле міліцыі на яе склалі два адміністрацыйныя пратаколы – за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне паводле арт 24.23 і за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў паводле ч.2 арт. 19.11. Праўда, вінаватасць жанчыны ў пікетаванні міліцыянты не спадзяваліся давесці, і таму ў суд трапіў толькі адзін пратакол. На думку Віктара Стукава, абвінавачанне жонкі ў распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў беспадстаўнае, і міліцэйскі пераслед ён лічыць помстай за актыўнасць у недзяржаўным прафсаюзе і за выразную грамадзянскую пазіцыю.
Жонка прафсаюзнага актывіста прабыла пад вартай 72 гадзіны, а сёння суддзя суду Полацку і Полацкага раёну Яніна Марцулевіч прызнала Святлану Стукаву вінаватай паводле ч.2 арт. 19.11 КаАП і асудзіла жанчыну да 15 сутак арышту. Падставай для абвінавачання стала наяўнасць падпіскі на старонку BySol у Фэйсбуку. Віктар Стукаў, які быў грамадскім прадстаўніком сваёй жонкі падчас судовага працэсу, спрабаваў давесці, што да распаўсюду наяўнасць падпіскі не мае дачынення, і што жонка ніколі не звязвалася з BySol. Аднак суддзя палічыла, што падпіска захоўвалася ў мэтах распаўсюду звестак пра арганізацыю, прызнаную экстрэмісцкай.
Пратакол, складзены за парушэнне арт. 24.23 КаАП за размяшчэнне ў Фэйсбуку фотаздымка, на якім міліцыянты нібыта разгледзелі бел-чырвона-белую сімволіку, у суд прадстаўлены не быў. Існуе верагоднасць, што гэтую справу перададуць у суд пазней – калі будзе падыходзіць да канца тэрмін арышту Святланы Стукавай.
Менавіта так было зроблена ў дачыненні да Віктара Стукава, калі 12 верасня мінулага году яго затрымалі на полацкім вакзале, проста ў цягніку «Полацк-Масква». Спачатку яго накіравалі адбываць арышт, прысуджаны яшчэ ў 2021-м годзе паводле арт. 19. 11 КаАП за рэпост матэрыялаў з інфармацыйнага рэсурсу, пазней прызнанага экстрэмісцкім. Калі Стукаў ужо быў за кратамі ў ІЧУ, яго асудзілі яшчэ раз – ужо за несанкцыянаванае пікетаванне паводле арт. 24.23 КаАП. Бо ў ягоным тэлефоне супрацоўнікі міліцыі знайшлі здымкі з паслявыбарчых пратэстаў 2020 г.
Для Віктара Стукава гэта было ўжо далёка не першае затрыманне, і не першы арышт. Ён мяркуе, што інтарэс сілавікоў да старонак у сацыяльных сетках ягонай жонкі справакаваны «неабыякавасцю» да ягонай асобы. Найперш таму, што прадстаўнікі СПБ аказваюць прававаю дапамогу грамадзянам, і цяпер землякоў стала не так проста запалохаць ці абысціся з імі незаконным чынам.

**03.03.2023**

Улады палічылі палітвязня Васіля Троцкага як чалавека схільнага да "экстрэмісцкай дзейнасці". Міліцейскія чыноўнікі ўнеслі яго ў рэспубліканскі спіс.

Васілю Троцкаму 47 гадоў. Ён ўраджэнец горада Дуброўна, але з 2015 года жыве ў Расіі. Мае сярэднеспецыяльную адукацыю па спецыялнасці газаэлектразваршчыка. Працаў ў сферы азелянення ў Маскве.

Васіля затрымлівалі спачатку с 9 па 10 лістапада 2021 года. 14 лістапада 2022 года мужчыну зноў затрымалі і змясцілі пад варту. Яму паставілі ў віну абразу некалькіх прадстаўнікоў улады.

У судзе Першамайскага раёна Віцебска 19 студзеня 2023 года яго асудзілі паводле арт. 391 (Абраза суддзі ці народнага засядацеля), арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады) Крымінальнага кодэкса.

Суддзя Андрэй Андрушэнка прызначыў Васілю адзін год і два месяца пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму і штраф 30 базавых велічыняў (1110 рублёў). Дзяржабвінавачанне прадставіла памочніца пракурора Ярошнікава.

В рамках гражданского иска с Василия Троцкого взыскали компенсацию морального вреда в пользу Михаила Александровича Фатеева размером 500 рублей.

**04.03.2023**

Па ініцыятыве Ўпраўлення юстыцыі і па рашэнні Віцебскага абласнога суда з 10 кастрычніка 2022 года знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі Полацкае раённае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Клуб усходніх адзінаборстваў "Павуціна", заснаваны знакамітым спартсменам Яўгенам Цяліцай, які ў 2015 годзе стаў чэмпіёнам свету па кікбокінгу сярод аматараў. Яўген двойчы быў стыпендыятам Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

Грамадская арганізацыя была зарэгістраваная ў жніўні 2014 года і праіснавала крыху больш за 8 гадоў, пасля чаго была прымусова ліквідаваная віцебскімі ўладамі.

За гэты час некалькі сотняў маладых жыхароў Полацка і Наваполацка здолелі асвоіць асновы ўсходніх адзінаборстваў і паўдзельнічаць як у рэгіянальных і рэспубліканскіх спаборніцтвах, так і ў міжнародных турнірах. Заняткі праходзяць пад кіраўніцтвам кваліфікаванага трэнера з вышэйшай педагагічнай адукацыяй, дзеючага чэмпіёна свету і неаднаразовага чэмпіёна Еўропы па кікбоксінгу Яўгена Цяліцы.

У планах кіраўніцтва арганізацыі было адкрыццё залы баявых мастацтваў у п.Баравуха (Полацкі раён) і рэгістрацыя рэспубліканскага грамадскага аб'яднання. Апошняя опцыя дазволіла б арганізоўваць і праводзіць у Наваполацку міжнародныя турніры, чэмпіянаты свету сярод аматараў і прафесіяналаў. Але ліквідацыя клуба ўжо не дазволіць спраўдзіцца грандыёзным планам Яўгена.

**05.03.2023**




Адмоўны адказ з Аршанскага раённага выканаўчага камітэта атрымалі больш за сотні жыхароў вобласць, якія падпісалі петыцыю №5527 у якой яны прасілі замяніць частку надпісаў з рускай мовы на беларускую. Надпіс зрабілі ўлады на мемарыяльнай дошке прысвечанай пісьменніку У. Караткевічу, якая была ўстаноўлена ў лістападзе мінулага года на будынку сярэдняй школе № 3 г. Оршы.

Падпісанты зварота апелявалі да артыкула №2 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры грамадскія адносіны ў сферы культуры грунтуюцца на аснове прынцыпа прыярытэта развіцця беларускай нацыянальнай культуры і прызнання беларускай мовы адным з фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту, а таксама артыкула №8 напрамкамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры з'яўляюцца: захаванне, развіццё, распаўсюджванне і (або) папулярызацыя беларускай нацыянальнай культуры і мовы.

«Улічваючы неацэнны ўклад вялікага беларускага пісьменніка ў развіццё беларускай мовы і культуры, а таксама беларускае закадаўства просім замяніць мову мемарыяльнай дошкі на беларускую-мову пісьменніка” – акрэслілі свае патрабаванні да ўладаў неабывакавыя жыхары Віцебскага рэгіёна.

Каб не мяняць мову на мемарыяльнай дошкі, улады прад'явілі наступныя аргументы.

Яны сцвярджаюць, што сапраўды рашэннем Аршанскага раённага выканаўчага камітэта ад 23 чэрвеня 2022 года ДУА ”Сярэдняя школа № 3 г. Оршы“ было прысвоена імя знакамітага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР Караткевіча Уладзіміра Сямёнавіча.

А 25 лістапада 2022 года у дзяржаўнай, вышэйзгаданай, навучальнай установе адукацыі адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае адкрыццю памятнай дошкі ў гонар пісьменніка Караткевіча.

Чыноўнікі не адмаўляюцца ад таго, што памятная дошка складаецца з дзвюх частак.

На першай частцы дошкі размешчаны партрэт пісьменніка і тлумачальны надпіс на рускай мове. Другая частка – урывак з верша У.С. Караткевіча ”У дняпроўскіх хвалях, бы ў калысцы...“ на беларускай

мове.
І гэта яны зрабілі наўмысна, бо Караткевіч пісаў свае творы як на рускай, так і беларускай мовах.
“У гады студэнцтва з 1949 па 1954 год (філалагічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі) пісьменнікам былі напісаны творы на рускай мове (аповесць ”Предыстория“, апавяданні ”Скрипка поёт“, ”Клён“, ”Руки“ і іншыя, верш ”Тут будет канал“). Пасля заканчэння ўніверсітэта з 1954 па 1958 год Караткевіч выкладаў рускую мову і літаратуру” - падмацавалі выканкамаўцы сваю пазіцыю фактамі з біяграфіі пісьменніка.
Таксама важкім аргументам з’яўляецца той факт, што адукацыйны працэс у дзяржаўнай установе адукацыі ”Сярэдняя школа № 3 г. Оршы імя У. Караткевіча“ ажыццяўляецца на рускай мове.
Так як, згодна артыкулу 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца беларуская і руская мовы, таму, на думку намесніка старшыні Аршанскага райвыканкама Ўладзіміра Калачова “замена дошкі на будынку ўстановы адукацыі з’яўляецца немэтазгоднай”.

**06.03.2023**

Суддзя Віцебскага абласнога суда Ірына Смалякова 20 лютага 2023 года разгледзела пратэст гарадскога пракурора на пастанову ад 10 лютага ў дачыненні да вайскоўца Аляксандра Цяляка, які нібыта распаўсюджваў у сацыяльных сетках "экстрэмісцкія матэрыялы". Было ўстаноўлена, што, суддзя суда Кастрычніцкага раёна Віцебска Уладзімір Царыкаў няправільна прымяніў нормы дзеючага адміністрацыйнага закона. На гэтай падставе, вышэйстаячым судом было зменена рашэнне арыштаваць Цяляка на 13 сутак, але пастановіў пакараць яго штрафам у памеры 1110 рублёў.
Суддзя Смалякова ўстанавіла, што Цяляк прызнаны ніжэйстаячым судом вінаватым у захоўванні з мэтай распаўсюджвання ў сацыяльнай сетцы «Instagram» у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Вінаватасць вайсковец у здзяйсненні разумнага яму правапарушэння, на думку суддзяў, даказаная матэрыяламі справы і ў пратэсце пракуратурай не аспрэчвалася.
У пратаколе пазначана, пра тое, што 7 лютага 2023 года супрацоўнік міліцыі АУС адміністрацыі Кастрычніцкага раёна выявіў факт знаходжання ў сацыяльнай сетцы «Instagram» на асабістай інтэрнэт-старонцы правапарушальніка інфармацыйнай прадукцыі інтэрнэт-старонкі «BELSAT» і яе лагатып, а таксама інфармацыйнай прадукцыі супольнасці «Наша Ніва».
Інфармацыйная прадукцыя размешчана карыстальнікам у дадзеным запісе і захоўвалася на момант яе выяўлення ў адкрытым доступе для пэўнай групы асоб.
Такім чынам, суды прыйшлі да высновы аб тым, што вінаватасці Аляксандра ў здзяйсненні правапарушэння, прадугледжанага ч.2 арт.19. 11 КаАП, цалкам даказанай. Разам з тым, пастанова суддзі Царыкава падлягае змене.
У сілу арт. 4.5 КаАП асобы, на якіх распаўсюджваецца статус вайскоўца, нясуць адказнасць за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў на агульных падставах. Пры гэтым на такіх асоб не могуць быць накладзеныя адміністрацыйныя спагнанні ў выглядзе грамадскіх работ і адміністрацыйнага арышту.
З улікам выкладзенага, суддзя Смалякова пастанавіла замяніць накладзенае на вайскоўца Цяляка адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на прадугледжанае дадзенай прававой нормай адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу.

**06.03.2023**

Інфармацыя аб затрыманні старшыні Свабоднага прафсаюза Беларускага СПБ Мікалая Шараха з’явілася ў Фэйсбуку Асацыяцыі “Салідарнасць”. Магчыма, заўтра з раніцы, ў Полацкім раёным судзе, 07 сакавіка, яго будуць судзіць па ч. 2 арт. 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць).



Па словах відавочцаў, ён быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі ў сябе дома ў Полацку а 15:30 і дастаўлены ў мясцовы РАЎС. Пасля працэсуальных працэдур, міліцыянты далі Міколе патэліць жонцы, якой ён паведаміў пра тое, што ўлады яго вінавацяць за падпіску на "Байсол" і нібыта, пераследваюць па загадзе мясцовага КДБ.
У мінулым годзе яго неаднаразова затрымлівалі, садзілі на суткі, але пасля адпускалі. Таксама раней сілавікі праводзілі ў яго дома вобшук.

**07.03.2023**

У Полацку 7 сакавіка асудзілі прафсаюзнага лідара, старшыню Свабоднага прафсаюза Беларускага СПБ Мікалая Шараха. Яго судзілі за распаўсюд так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў паводле часткі 2 артыкула 19. 11 КаАП (за падпіску ў "Фэйсбуку" на "Байпол" і "Байхелп"). Судовае пасяджэнне праходзіла ў судзе горада Полацка і Полацкага раёна.

Нягледзячы на тое, што Мікалай Шарах выдаліў "Фэйсбук " яшчэ чатыры месяцы таму, але скрыншот з падпіскай на так званыя экстрэмісцкія каналы ў судзе былі прадстаўленыя за 9 лютага 2023 года. У судзе таксама паведамілі, што ўжо 2 сакавіка ў інтэрнэце нічога не было. І хоць адвакат Мікалая Шараха звяртаў на гэта ўвагу, але суддзя Раіса Штуро ўсё адно прысудзіла яму 15 сутак.

Падтрымаць Мікалая Шараха падчас суда прыйшлі яго сябры і калегі. Адбываць пакаранне прафсаюзны лідар будзе хутчэй за ўсё ў Наваполацкім ЦІПе, дзе зараз адбываюць пакаранне іншыя затрыманыя жыхары Полацка і Наваполацка па такіх жа падобных справах.

Нагадаем, старшыню Свабоднага прафсаюза Беларускага СПБ Мікалая Шараха затрымалі ўчора, 6 сакавіка, полацкія міліцыянты ў яго дома ў Полацку а 15:30 па заданні КДБ.

Таксама ў мінулым годзе яго неаднаразова затрымлівалі, садзілі на суткі, але пасля адпускалі. Раней сілавікі праводзілі ў яго дома і вобшук.

**07.03.2023**



Як высветлілася, у 2022 годзе на аўкцыён выстаўлялі лоты ад яшчэ аднаго палітвязня - Віктара Бабарыкі. Размова аб аптычным прыцэле і дзелях у статутным фондзе кампаній. Пры гэтым на некаторых лотах хоць і быў пазначаны завінавачаным банкір, але належалі яны, як вынікае з абвестак, ягонаму сыну Эдуарду.

Нагадаем, раней у 2021-м з малатка сышоў арыштаваны аўтамабіль Ford Fiesta Віктара Бабарыкі.

Як на аўкцыён тройчы выстаўлялі аптычны прыцэл.

Праз інтэрнэт-пляцоўку "БелЮрЗабеспячэнні" акрамя Ford Fiesta (яго ў выніку прадалі на таргах у 2021 годзе, пра гэта пісалі многія СМІ) Віктара Бабарыкі рэалізавалі таксама аптычны прыцэл Victory V8 з драпінамі на корпусе. На таргі яго ў 2022 годзе выстаўлялі тройчы.

Першы раз прыцэл прадавалі летась у ліпені. Пачатковы кошт лота складаў 1 400 рублёў. У таргах узялі ўдзел восем чалавек, перамог удзельнік, які прапанаваў суму 5 306 рублёў. Аднак аўкцыён прызналі несапраўдным, бо пераможца не аплаціў пакупку.

Другі раз аўкцыён прайшоў у верасні 2022 года, пачатковую цану на прыцэл знізілі да 1 120 рублёў. У аўкцыёне ўзялі ўдзел сем чалавек, перамагла стаўка 4 599,40 рубля. Але як і першы раз, лот не аплацілі, аўкцыён не адбыўся.

Трэці раз прыцэл прадавалі летась у лістападзе. У таргах узялі ўдзел 11 чалавек. Лот уцанілі да 840 рублёў, яго прадалі за 3 918,6 рубля, на гэты раз прыцэл аплацілі. Нагадаем, што 59-гадовы Віктар Бабарыка гэта банкір і грамадскі дзеяч, прэтэндэнт у кандыдаты на пасаду прэзідэнта быў асуджаны на 14 гадоў за легалізацыя ("адмыванне") сродкаў, атрыманых злачынным шляхам і атрыманне хабару. Ён адбывае пакаранне новаполацкай папраўчай калоніі №1 ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

**09.03.2023**

У яе ўключылі тых, хто не змог пацвердзіць занятасць за кастрычнік-снежань 2022 года. У Віцебскай вобласці, гэта каля 25-30 тыс. чалавек, якія не занятыя ў стварэнні рэгіянальнага валавога прадукту.

Каб не трапіць у яе з пачатку сакавіка, трэба было да 21 студзеня пацвердзіць эканамічную занятасць. Гэта можна зрабіць праз камісію па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці. З 20 лютага па 1 сакавіка база абнаўлялася, дадзеныя з яе было недаступныя для прагляду.

З тых, хто апынуўся ў базе і ў каго ёсць ва ўласнасці жыллё, будуць па эканамічна абгрунтаваных тарыфах спаганяць аплату за газазабеспячэнне, ацяпленне і гарачую ваду. Асабліва адчувальнымі будуць плацёжкі за апошнія дзве паслугі, для «дармаедаў» яны прыкладна ў пяць раз даражэй.

Што тычыцца аплаты ЖКП па» дармаедскіх " тарыфах, то тут адзін з асноўных момантаў — трапіў уласнік жылля ў базу не занятых у эканоміцы ці не. Калі ўласнік у базе не занятых у эканоміцы, то аплачваць спажытыя паслугі па эканамічна абгрунтаваных тарыфах будзе не толькі ён, але і ўсе астатнія зарэгістраваныя ў жыллё, якія таксама трапілі ў базу.

Да прыкладу, у кватэры зарэгістраваныя пяць чалавек. Уласнік лічыцца занятым у эканоміцы, а ўсе астатнія члены сям'і — не. У такім выпадку ўсе плацяць за ЖКП па льготных тарыфах. Але калі ўла-

дальнік кватэры таксама трапляе ў» дармаеды", то паводле эканамічна абгрунтаваных тарыфаў давядзецца разлічвацца ўсім не занятым у эканоміцы з гэтай сям'і.

**10.03.2023**
Адпаведнае рашэнне 6 сакавіка прыняў суд Кастрычніцкага раёну Віцебску. У той самы дзень берасцейскі суд Ленінскага раёну прызнаў «экстрэмісцкай» інфармацыйнай прадукцыяй праваабарончы сайт «Берасцейская вясна».
Летась у спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў трапіў і рэгіянальны сайт «Віцебская вясна», створаны мясцовымі праваабаронцамі і журналістамі дзеля таго, каб пашыраць сярод жыхароў Віцебшчыны аб’ектыўную і поўную інфармацыю, датычную найперш да тэмы правоў чалавека – як грамадзянскіх і палітычных, гэтак і сацыяльных, эканамічных, культурных.
Разам з інтэрнэт-старонкай у спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў былі занесены аднайменныя старонкі ў сацыяльных сетках «Одноклассники» і Facebook. Рашэнне пра гэта 27 студзеня 2022г. было прынята судом Чыгуначнага раёну Гомеля.
За рэпосты матэрыялаў з так званых «экстрэмісцкіх» крыніц у заканадаўства сучаснай Беларусі прадугледжана адміністрацыйнае пакаранне ў выглядзе штрафу або арышту. Практыка апошняга часу паказвае, што грамадзян могуць пакараць нават за падпіску на «экстрэмісцкую» старонку ў сацыяльных сетках – гэта ўжо расцэньваецца як намер да распаўсюду.

**10.03.2023**

Як стала вядома, Суд Кастрычніцкага раёна горада Віцебска 17 лютага асудзіў Кірыла Джэмігу з Паставаў на 11 сутак арышту па адміністрацыйнай справе па частцы 2 артыкула 19.11 (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуючай такую). Згодна з пастановай суда, было ўстаноўлена, што ён захоўваў інфармацыю ў “Тэлеграме”, якая ўключаная ў так званы спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў з мэтай распаўсюджвання нявызначанаму колу асобаў.
Падчас суду Кірыл Джэміга прызнаў сваю віну, раскаяўся ў зробленым, раней не меў адміністрацыйных прысудаў, але суд усё адно прысудзіў яму 11 сутак, праўда без канфіскацыі мабільнага тэлефона.
Малады чалавек падаваў скаргу на пастанову Кастрычніцкага суда г. Віцебска. Суддзя Віцебскага абласнога суда Ірына Смалякова разгледзела яе 20 лютага, але пакінула прысуд без зменаў, а скаргу без задавальнення.
Кірыл Джэміга працаваў у службе МЧС, але з-за пратэставых поглядаў яму не працягнулі працоўны кантракт.

**10.03.2023**
Пра гэта Павел даведаўся праз тры месяцы, пасля таго, як яно, 01 снежня 2022 года, было выдзеленага ў асобную вытворчасць Галоўным упраўленнем па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі Цэнтральнага апарата Следчага камітэта па ч.2 арт. 342 (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) КК РБ. У выпадку, калі справа будзе разгледжаная ў судзе, Паўлу Ісакавічу пагражае пакаранне ў выглядзе арышту да трох месяцаў або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.
"Мне не зразумела, чаму праз амаль два гады пасля правядзенняператрусу, Следчы камітэт разрадзіўся нейкай крымінальнай справай, падазраючы мяне ў навучанні ці іншай падрыхтоўцы асоб для ўдзелу ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, а роўна ў фінансаванні або іншым матэрыяльным забеспячэнні такой дзейнасці» - пракаментаваў сумнаю “навіну” праваабаронца.
Намеснік начальніка УСК па Віцебскай вобласьці Андрэй Гушча паведаміў Левінаву, што следчы, які вядзе крымінальную справу, вынес пастанову аб прызнаньні праваабаронцы па названай крымінальнай справе падазраваным. На маёмасць, якая была канфіскаваная падчасператрусу ў Віцебску 16 лютага 2021 года следствам накладзены арышт. Пры гэтым да цяперашняга часу працэсуальны статус не зменены, мера стрымання не абіралася. Аб'ём іншых працэсуальных дзеянняў будзе вызначаны па выніках першага допыту.
Знакаміты беларускі праваабаронца лічыць, што ў сваёй дзейнасці не пераступаў нормы заканадаўства і Статута РПГА «Беларускага Хельсінкскага камітэта», ліквідаванага Вярхоўным судом у верасні 2021 года.

Гэтак жа Левінаў нагадаў Віцебскім уладам пра той выпадак, калі яны нібыта не змаглі знайсці тых зламысьнікаў, якія летам 2019 года спрабавалі зладзіць замах на ягонае жыццё і здароўе шляхам надрэзу тармазнога шланга ў аўтамабілі, які належыць яму.
"Не шукаюць, бо, мабыць баяцца знайсці саміх сябе!"- высунуў праваабаронца публічнае падазрэнне ў дачыненні да бяздзейнасці нявызначанага кола работнікаў следчых органаў Віцебска.

**12.03.2023**
У пачатку сакавіка ў Глыбоцкім гарадскім доме культуры адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае 60-годдзю з дня ўтварэння Глыбоцкіх электрычных сетак. А ўжо праз некалькі дзён пасля гэтага ў арганізацыі пачаліся чысткі па палітычных матывах. Там былі звольненыя людзі не толькі за тое, што хадзілі на акцыі, але і за тое, што ставілі подпісы падчас мінулай прэзідэнцкай кампаніі не за Лукашэнку, за тое, што дапамагалі фінансава тым, каго ўлады незаконна штрафавалі, ды і ўвогуле за салідарнасць з іншымі беларусамі і нелаяльнасць да цяперашняй улады ў Беларусі.
І хоць раней, некалькі месяцаў таму, у кожную арганізацыю Глыбокага сілавікі перадалі спісы непажаданых, якія налічвалі дзясяткі чалавек у кожнай, кіраўнікі прадпрыемстваў не спяшаліся звальняць людзей, а часам нават за іх уступаліся. Тады былі звольненыя адзінкі. Але зараз паступіла такое ўказанне ў канторы і асабіста ідэолагам на прадпрыемствах, што калі не пачнуцца большыя звальненні, то іх саміх прыбяруць з працы.
На яшчэ адным вялікім глыбоцкім прадпрыемстве Малочна-кансервавым камбінаце масавых звальненняў няма. Але людзям, якія былі ў так званых спісах, па сканчэнні кантракта проста яго не працягваюць. То-бок звальненні атрымліваюцца паступовыя. Да таго ж пачало развівацца стукацтва, калі адны работнікі пачынаюць даносіць на іншых проста таму, што знаходзяцца ў дрэнных стасунках ці хочуць каго пасунуць па працы.
Вядома, што цяперашняя сістэма стварыла такія ўмовы, што зараз амаль усе клапоцяцца ў першую чаргу толькі пра сябе і пра свой сямейны дабрабыт, таму і пачаліся чысткі. Не шкадуюць нікога - ні жанчын, якія гадуюць адны дзяцей без мужа, ні шматдзетных бацькоў. Як кажуць глыбачане, калі ты дзе “засвяціўся”, то ты – першы кандыдат на звальненне. Ідэолагі ж сцвярджаюць: у гэтай сістэме ты працаваць ужо не можаш.
Людзі такія звальненні паміж сабой пачалі называць “чорны білет”, бо кажуць што пасля гэтага будзе вельмі складана кудысьці ўладкавацца ў Беларусі на добрую працу.
Звальняюць у Віцебскай вобласці так званых “нядобранадзейных людзей” і ламаюць іх лёсы ва ўсіх гарадах і мястэчках, але каб у такой вялікай колькасці, як у “Глыбоцкіх электрычных сетках”, пакуль гэта першы вядомы такі выпадак.

**12.03.2023**

У нядзелю, 12 сакавіка, дамоў да Андрэя Букі завіталі мясцовыя міліцыянты Маліноўскі і Някрасаў і прынеслі пастанову праператрус.
Нагодай дляператрусу стала аватарка актывіста ў сацыяльнай сетцы “Фэйсбук” з нацыянальным бел-чырвона-белым сцягам, якая была ў сетцы яшчэ ў 2022 годзе.
Міліцыянты забралі ў грамадскага актывіста і журналіста ноўтбук. Падчас ператрусу сілавікі паводзілі сябе карэктна.

**14.03.2023**
Вярхоўны суд 06 сакавіка 2023 прыняў рашэнне ліквідаваць Беларускую грамадскую арганізацыю "Асацыяцыя алерголагаў і клінічных імунолагаў". Ініцыятарам ліквідацыі медычнай арганізацыі выступіла ўпраўленне па пытаннях некамерцыйных арганізацый Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Офіс арганізацыі знаходзіўся ў Віцебску і асноўнымі заснавальнікамі і сябрамі з'яўляліся, ў асноўным, работнікі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.
БГА "Асацыяцыя алерголагаў і клінічных імунолагаў” з'яўлялася недзяржаўнай грамадскай арганізацыяй і аб'ядноўвала на добраахвотных пачатках беларускіх алерголагаў і імунолагаў.
Асацыяцыя была заснавана ў 1998 годзе, старшынём якой быў прафесар, доктар медыцынскіх навук Дзмітрый Новікаў, а сакратаром -дацэнт Аксана Ішчанка, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры клінічнай імуналогіі і алергалогіі з курсам ФПК і ПК.
З 2013 года яна была інтэграваная ў Сусветную арганізацыю алергіі (WAO).
Члены арганізацыі распрацоўвалі і ўкаранялі ў практыку новыя метады дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі алергічных захворванняў, імунадэфіцытаў і іншых відаў імунапаталогіі. Сярод сяброў арганізацыі былі высокі прафесіяналы, якія працавалі у медыцыне. Толькі ў кіраўніцтве Асацыяцыі працавала восем прафесараў і пяць дацэнтаў.

За 25 гадоў існавання віцебскія медыкі, якія праявілі грамадзянскую свядомасць, правялі некалькі сотняў мерапрыемстваў, звязаных з прапагандай перадавых метадаў лячэння алергій і імунадэфіцытаў, у тым ліку і міжнароднага ўзроўню.

**14.03.2023**
Затрыманне Вячаслава адбылося месяц таму, 9 лютага, на наступны дзень пасля прыезду з Польшчы. Спачатку Лазарава павезлі ў Следчы камітэт, і амаль суткі следчыя на казалі родным дзе журналіст знаходзіцца, што з ім адбываецца. У Вячаслава на волі засталася маці- пенсіянерка і маленькая дачка. Цяпер яго ўтрымліваюць у Віцебскім абласным следчым ізалятары.
Улады ўжо выставілі абвінавачванії журналісту. Яму інкрымінуецца здзяйсненне злачынства, якое кваліфікуецца паводле ч. 1 арт. 361-4 (Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці) КК. Пачатку следчых дзеянняў паслужыла выяўленая "сілавікамі" фатаграфія ў сацыяльных сетках прызнаных "экстрэмісцкімі матэрыяламі", аўтарам якой нібыта быў Лазараў.
У выпадку, калі следства здолее знайсці доказы для суда, то Вячаславу можа пагражаць пазбаўленне волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

**15.03.2023**

Праваабаронцам стала вядома, што на актывіста незалежнага СПБ склалі два адміністрацыйныя пратаколы. Адзін з іх, найверагодней, па 24.23 КаАП – за фотаздымкі, размешчаныя ў сацыяльных сетках. Другі, магчыма, за падпіску на BySol– паводле ч.2 артыкула 19.11 КаАП. Паводле гэтага ж артыкула за падпіску на ByPol і ByHelp тыдзень таму быў затрыманы і асуджаны  жыхар Полацку, сябар і калега Віктара Стукава, старшыня Свабоднага прафсаюзу Беларускага Мікалай Шарах. Цяпер ён адбывае 15-суткавы арышт.
На 15 сутак 1 сакавіка была асуджана і жонка Віктара Стукава. Яе таксама асудзілі за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў: так суд кваліфікаваў наяўнасць падпіскі на BySol у сацыяльных сетках. Спадар Стукаў быў дапушчаны на судовы працэс сваёй жонкі ў якасці афіцыйнага прадстаўніка, і ён тлумачыў суду, што звесткі пра падпіску Святлана Стукава не карысталася – што яна была зроблена чыста намінальна.
У якасці прадстаўніка Віктар Стукаў некалькі разоў адведваў жонку ў полацкім ІЧУ.
У верасні-кастрычніку 2022г. Стукаў адбыў 30 сутак за кратамі. На 15 сутак яго асудзілі яшчэ ў 2021г. за рэпост артыкула з сайта вядомага тэлеканала, пазней прызнанага экстрэмісцкім. Аднак судовага рашэння Стукаў на рукі не атрымліваў і пакарання не адбыў. Яшчэ 15 сутак яму «дадалі»за фотаздымкі з пратэстаў 2020 г., якія знайшлі ў сацыяльных сетках. Суд вырашыў, што такім чынам Стукаў праводзіў у інтэрнэце несанкцыянаваную акцыю.

**15.03.2023**
Пра гэта распавяла жанчына, якая сядзела разам з Вольгай. Яна кажа, што была ўражаная стойкасцю Вольгі Ялцэвіч. Паводле слоў былой палітзняволенай, у берасцейскім СІЗА Воля некалькі разоў трымала галадоўку на знак пратэсту супраць цяжкіх умоў. З-за гэтага яе садзілі ў карцар. А потым увогуле пасадзілі ў падвальнае памяшканне. Яно выглядала як камера, але фактычна — падвал. Воля правяла ў ім каля 50 сутак. Умовы там жудасныя: толькі халодная вада, вельмі вільготна. Там нават печыва або вафлі немагчыма было есці, бо ўсе прадукты адразу ж рабіліся вільготнымі. Праз гэта ў Волі вельмі пагоршылася здароўе. Але яна трымаецца.
Зараз Вольга Ялцэвіч знаходзіцца ў гомельскай жаночай калоніі.
Нагадаем, Вольга Ялцэвіч была затрыманая 16 снежня 2021 года, суд Маскоўскага раёна Брэста ў ліпені асудзіў жыхарку Докшыцаў за "фінансаванне пратэстнай дзейнасці" (ч. 2 арт. 342 КК). Суддзя Яўген Брэган прызнаў Ялцэвіч вінаватай і пакараў яе пазбаўленнем волі ў калоніі агульнага рэжыму тэрмінам на два гады.
Згодна з матэрыяламі следства, Вольга Ялцэвіч сумесна з іншымі асобамі з 13 жніўня па 19 снежня 2020 года нібыта аплочвала сумы накладзеных на правапарушальнікаў грашовых спагнанняў, паслугі адвакатаў, дзяржаўную пошліну за падачу скаргаў, аказанне іншай матэрыяльнай дапамогі ўдзельнікам несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў, а таксама зрабіла пералік сродкаў у кошт пакрыцця шкоды, нанесенай дзяржаве супрацьпраўнымі дзеяннямі.
МУС у лістападзе 2022 г. дадала палітзняволеную ў спіс "асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці".

**15.03.2023**

У адпаведным спісе МУС з’явілася згадка пра тое, што 9 сакавіка суд Маладзечанскага раёну прызнаў экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыяй відэаролік да песні «Чэрці», размешчаны на YouTube.com. Год таму, 24 лютага, суд Маладзечанскага раёну прызнаў экстрэмісцкім артыкул пра гэтую песню, надрукаваны ў мясцовай недзяржаўнай «Рэгіянальнай газеце». Аўтарам словаў і музыкі з’яўляецца Ігар Палынскі – жыхар Полацку, які цяпер вымушана знаходзіцца ў эміграцыі.

«Я напісаў песню яшчэ ў 2015 годзе. Калі пісаў, то згадваў выбары 2010-га і той трэш, які адбываўся пасля іх. Пэўны час песня існавала толькі ў канцэртных акустычных запісах, а ў пачатку 2020 году, дарэчы, я спяваў яе на Радыё Сталіца ў прамым эфіры. У чэрвені 2020-га мы вырашылі яе запісаць «у электрычнасці», бо «верыць у лёс Беларусі шчаслівы» (радок з песні – аўт.) – на той момант (ды і цяпер) было супервостра і важна. Але я не мог нават падумаць, што песня стане прароцкай, а «чэрці» неўзабаве акажуцца не ў галаве, а на беларускіх вуліцах – у шлемах, з дубінкамі, шчытамі і практычна поўнай адсутнасцю чагосьці чалавечага… На мяжы жніўня і верасня мы зрабілі: здымкі і мантаж зрабілі за суткі, усё з нулявым бюджэтам. Прэм’ера адбылася 29 верасня 2020 году. Гэта была першая спроба «Sumarok» у відэа», – расказаў Ігар Палынскі.

У кліп былі ўключаныя кадры, знятыя падчас пратэстаў у Маладзечне – туды Ігар Палынскі пераехаў з Полацку, і ў іншых гарадах. А таксама перадвыбарчыя мітынгі з удзелам Святланы Ціханоўскай, Марыі Калеснікавай і Веранікі Цапкала. Але год таму гэта не выклікала ніякіх прэтэнзій, і «экстрэмісцкім» прызналі толькі артыкул пра песню, а не сам твор.

Цяперашнюю навіну пра ўключэнне і відэакліпа ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў аўтар песні ўспрыняў з гумарам. «Здзейснілася, і кліп Гурт Sumarok на песню «Чэрці» прызналі экстрэмісцкім. Кліп быў так сабе, але песня, здаецца, неблагая», – напісаў Ігар Палынскі ў Фэйсбуку.

**15.03.2023**

По рашэнні старшыні суда Сенненскага раёна суддзі Іны Досавай, лабарант аднаго прадпрыемстваў Сянно за здзек над дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь (арт.370 КК Рэспублікі Беларусь) быў пакараны абмежаваннем волі тэрмінам на 1 год 6 месяцаў без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Прысуд быў агучаны 25 студзеня і ўступіў у сілу.




Пасля 11 гадзін вечара малады чалавек ішоў з дому ў бар і па дарозе на мясцовай канторы райспажыўтаварыства ўбачыў чырвона-зялёны сцяг. Ён падскочыў, каб сарваць сцяг, але з першага разу гэта не ўдалося-сцяг вісеў досыць высока. Таму прыйшлося падскокваць яшчэ раз. Другі раз быў занадта паспяховым і акрамя самога палотнішча ўніз паляцелі і часткі канструкцыі, да якой сцяг быў прымацаваны.

У выніку гэтых дзеянняў С. прычыніў маёмасную шкоду філіялу Віцебскага абласнога спажывецкага таварыства на суму на агульную суму 39 рублёў 85 капеек, пасля чаго з месца здзяйснення злачынства ўцёк.

Да суда, шкоду, прычыненую сваімі дзеяннямі, падсудны кампенсаваў у поўным аб'ёме,а ў зробленым чыстасардэчна раскайваецца.

Тым не менш суд прызнаў жыхара Сянно вінаватым у здзеку над дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь і на падставе арт.370 КК Рэспублікі Беларусь прызначыў яму пакаранне ў выглядзе “хатняй хіміі”.

**15.03.2023**

Віцебскія гарадскія актывісты з петыцыяй звярнуліся да кіраўніцтва горада і ў пракуратуру з просьбай да выканаць замену перыльнай агароджы моста ім. Блахіна ў г. Віцебску. На думку жыхароў агароджу падвергнулася карозіі, таму яго эксплуатацыя стала траўманебяспечнай і патэнцыйна здольнай прывесці да тэхнагеннай катастрофы.

Дзевяць месяцаў актывісты ставяць перад уладамі пытанне аб рэканструяванні моста.

І не на пустым месцы. У іх ёсць вынікі абследавання пуцеправода «БелдарНДІ» у якім запісана, што існая перыльная агароджа вычарпала свой рэсурс.

У кастрычніку 2022 года актывісты атрымалі адказы з Віцебскага гарадскога выканкама з прызнаннем існавання праблемы. Аднак чыноўнікі паведамілі, што мэтавае бюджэтнае фінансаванне на праектаванне і выкананне работ па замене перыльнага агароджы моста ім. Блахіна ў 2022 г. не прадугледжана. Але паабяцалі, што гэтае пытанне будзе разгледжанае дадаткова пры фармаванні бюджэту на 2023 год.

Аднак у бягучым годзе жыхары Віцебска не ўбачылі актыўнасці ўладаў і западозрылі чыноўнікаў у зацягванне тэрмінаў у рэагаванні органаў выканаўчай улады на аварыйны стан перыльнай агароджы.

Г. зн. рамонтныя работы не пачаты, бо гарадскі бюджэт не мае неабходных грашовых сродкаў на рамонт моста.
Тым самым "бацькі" горада парушаюць арт. 43 Закона"Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь". Згодна з гэтым артыкулам, выканкамы базавага ўзроўню ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, забяспечваюць добраўпарадкаванне адпаведнай тэрыторыі.
Таксама, згодна з п. 9 правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў, зацверджаных пастановай урада ад 28.11.2012 №1087, «спецыялізаваныя арганізацыі па змесце вулічна-дарожнай сеткі ў межах межаў абслугоўвання ажыццяўляюць у адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў мерапрыемствы па змесце (эксплуатацыі) і рамонце мастоў».
У петыцыі вылучаныя да ўладаў пяць патрабаванняў, у ліку якіх закласці ў план бюджэту на 2023 год артыкул выдаткаў на замену перыльнай агароджы, а таксама выявіць і пакараць чыноўнікаў вінаватых у валакіце.

**16.03.2023**
Суд адбыўся 15 сакавіка, у той самы дзень з-пад арышту выйшла на волю жонка актывіста Святлана Стукава. Яе звінавацілі ў распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў за наяўнасць падпіска на BySol у Фэйсбуку, і жанчына 15 сутак адбыла за кратамі. Цяпер суддзя Сяргей Бясецкі паводле ч.2 арт. 19.11 КаАП асудзіў да 15 сутак арышту і Віктара Стукава. Сямейную пару судзілі ў судзе Полацку і Полацкага раёну.



Вядома, што Віктар Стукаў быў прадстаўніком на судовым працэсе ў жонкі, і даводзіў суду, што асабіста падпісаў яе на BySol, і жанчына падпіскай ніяк не карысталася. Пасля таго, як Святлану Стукаву асудзілі, ён некалькі разоў адведваў яе за кратамі як прадстаўнік, прызнаны судом.
Віктара Стукава затрымалі ў апошні дзень зняволення жонкі. Яшчэ да пачатку судовага працэсу над ёй Стукаў казаў праваабаронцам, што лічыць пераслед жонкі помстай яму асабіста. Як прадстаўнік СПБ разам з іншымі сябрамі незалежнага прафсаюзу ён кансультаваў працоўных Полацка і рэгіёну па пытаннях пытаннях працаўладкавання, адносінаў з працадаўцамі, выкрываў парушэнні працоўнага заканадаўства на мясцовых прадпрыемствах.
Што істотна, за кратамі цяпер знаходзіцца і Мікалай Шарах – старшыня Свабоднага прафсаюзу Беларускага, таксама жыхар Полацку. Яго таксама звінавацілі паводле ч.2 арт. 19.11 КаАП (Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць) за падпіскі на ByPol і ByHelp. 7 сакавіка суддзя суду Полацку і Полацкага раёну Раіса Штуро прысудзіла яму 15 сутак арышту.

**16.03.2023**
Адпаведнае рашэнне 14 сакавіка прыняў суд Маладзечанскага раёну. 9 сакавіка той жа суд прызнаў экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыяй відэаролік да песні «Чэрці», размешчаны на YouTube.com.
Аўтарам тэксту і музыкі таксама з'яўляецца Ігар Палынскі – жыхар Полацку, які ў 2019 годзе пераехаў у Маладзечна, а цяпер знаходзіцца ў вымушанай эміграцыі. Летась Маладзечанскі раённы суд прызнаў экстрэмісцкім матэрыялам артыкул пра выхад відэакліпа да песні «Чэрці», надрукаваны мясцовай недзяржаўнай «Рэгіянальнай газеце».
З гэтай газетай Ігар Палынскі супрацоўнічаў, калі жыў у Маладзечне. Да ад'езду з Полацку ён працаваў на полацкім тэлеканале «Саммит+ТВ». Тамсама, у Полацку, яшчэ ў 2009 годзе ён стварыў гурт «Sumarok», які хутка набыў папулярнасць у рэгіёне.
У відэакліпе да песні «Чэрці», выканай гуртом «Sumarok», выкарыстаны кадры, знятыя падчас пратэстаў 2020г. Найхутчэй, гэта і з'яўляецца прычынай, чаму відэаролік прызналі экстрэмісцкім.
На старонцы ў ВК, якая мае амаль 1300 сяброў, Ігар Палынскі публікаваў уласныя вершы і фотаздымкі. Таксама тым былі змешчаны і звесткі пра прызнанне відэакліпа да песні «Чэрці» экстрэмісцкім. А таксама працытавана паведамленне пра гэта на сайце Генеральнай пракуратуры.

**16.03.2023**
15 сакавіка сілавікі правялі дома ў спадара Гаравога ператрус, потым завезлі ў пастарунак, дзе склалі адміністрацыйны пратакол паводле ч.2 арт.19.11. Актывіста, сябра ЦРК БСДП, вінавацяць у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў праз сацыяльныя сеткі.
Папярэдні ператрус у Леаніда Гаравога сілавікі праводзілі ў лістападзе, калі па Віцебшчыне пракацілася хваля ціску на прыхільнікаў руху «За Свабоду». Што спадзяваліся знайсці ў спадара Гаравога

гэтым разам – невядома. Мінулую ноч ён правёў за кратамі.
Праваабаронцы падкрэсліваюць, што Леанід Гаравы мае праблемы са здароўем. Калі ў 2020-м годзе ён быў затрыманы на тры дні і асуджаны нібыта за спробу правядзення несанкцыянаванага пікетавання, ён трапіў у лякарню ў крытычным стане. Праз адсутнасць неабходных лекаў у яго здарылася гіпаглікемічная кома, а потым адбыўся інсульт.
Леанід Гаравы, настаўнік матэматыкі паводле адукацыі, працаваў дырэктарам вясковай школы і быў вымушаны сысці з пасады пад ціскам за сваю грамадскую дзейнасць. Ён адзін з найстарэйшых актывістаў Гарадоччыны, які спрыяў развіццю грамадскага руху і незалежных СМІ ў рэгіёне.

**16.03.2023**



У лютым у Віцебску па даносу "неабыякавага грамадзяніна" затрымалі мясцовага жыхара Антона — нібыта ён выкрыкваў "неанацысцкія лозунгі".
У выніку супрацоўнікі міліцыі на яго склалі пратакол паводле арт. 24.23 КаАП за тое, што малады чалавекн у пад'ездзе дома правёў пікетаванне, выказваючы грамадска-палітычныя і асабістыя інтарэсы, а таксама пратэст супраць нападу Расіі на Украіну, і выкрыкваў пратэсныя лозунгі ў пад'ездзе дома. Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Міхаіл Юрчанка прызнаў Антона вінаватым і асудзіў хлопца на 15 сутак арышту.
На судзе Антон віну не прызнаў і пацвердзіў, што падчас гутаркі з невядомым чалавекам, які жыве ў кватэры, на ўваходных дзвярах якой была размешчана выява сцяга Расіі, выкрыкваў лозунгі, якія выкарыстоўваюцца ўкраінцамі падчас вайны. Ён адзначыў, што не лічыць гэтыя лозунгі неанацысцкімі. А таксама заявіў, што выказваў іх, бо супраць вайны. Доказам яго віны стала нібыта размешчаная ў сацсетках "нацысцкая сімволіка".

**16.03.2023**
Аляксандра Шарабайку затрымалі 13 сакавіка і прысудзілі 10 сутак арышту. Падчас затрымання ў фітнес-трэнера і ягонай жонкі сілавікі забралі тэлефоны.
Паводле знаёмых Аляксандра, на яго быццам бы акрамя адміністрацыйнай справы за рэпосты хочуць яшчэ распачаць крымінальную справу за абразу Лукашэнкі.
Перадачы ў родных міліцыянты для зняволенага не прынялі.
Аляксандр Шарабайка – вядомы грамадскі актывіст у Глыбокім, які ўдзельнічаў у акцыях пратэсту, яго некалькі разоў улады садзілі на суткі, давалі штрафы і рабілі ў яго дома ператрусы.
У ліпені 2021 яго затрымлівалі на трое сутак быццам па падазрэнні ў злачынстве. Тады падставай для затрымання стала заведзеная крымінальная справы па частцы 1 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці або розні) за відэаролік у тэлеграм-канале “Глубокое для жизни”. Яго размясціў чалавек пад нікам “Zmagar BNR”.

**16.03.2023**
16 сакавіка адбыўся суд над журналістам і грамадскім актывістам з Шаркаўшчыны Андрэем Букам. Яго судзілі паводле артыкула 19.10 (Прапаганда або публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі або атрыбутыкі) КаАП за аватарку ў сацыяльнай сетцы “Фэйсбук” з нацыянальным бел-чырвона-белым сцягам, якая была ў сетцы яшчэ ў 2020 годзе.
Суд Шаркаўшчынскага раёна ў асобе суддзі Аксаны Таболы пакараў журналіста штрафам у памеры 30 базавых велічыняў, што складае 1110 рублёў.
Нагадаем, 12 сакавіка ў Андрэя Букі мясцовыя міліцыянты Маліноўскі і Някрасаў правялі ператрус. Падчас ператрусу сілавікі забралі ў грамадскага актывіста і журналіста ноўтбук.

**17.03.2023**
Здзеклівай выглядае і прадмова да чатырох так званых «пакаяльных» відэа: «Праваахоўнікі Віцебшчыны працягваюць дапамагаць тым, хто яшчэ не вызначыўся са сваёй палітычнай пазіцыяй, знайсці выйсце і рэабілітавацца (раскаяцца). Змагары, запомніце раз і назаўсёды, ніхто не застанецца незаўважаным, усіх вылічым, да ўсіх прыйдзем у госці. Калі да вас яшчэ не пастукаліся, гэта не значыць, што пра вас забылі».
«Пакаяльныя» відэа нагадваюць словы Аляксандра Лукашэнкі пра тое, што ахвотныя вярнуцца з-за мяжы, так званыя «беглыя», павінны стаць на радзіме яшчэ больш шчырымі «ябацькамі», чым цяперашнія прыхільнікі дзяржаўнай улады. У гэтай стылістыцы і знятыя відэаролікі. Прыкладам, у Дзмітрыя Каралькова на грудзях начэплена чырвона-зялёная стужка з кветкамі яблыні – якраз такія раздаюць

гандляркам і касіркам напярэдадні 9 траўня або 3 ліпеня. Хлопец кажа пра тое, што браў удзел у пратэстах 2020г., быў падпісаны на дэструктыўныя каналы і старонкі ў сацыяльных сетках, пакідаў там каментары.
Аповед Яраслава Пачопкі зняты на фоне дзяржаўнага сцяга. Мужчына распавядае, што працуе начальнікам цэха на прыватным прадпрыемстве, і што аднойчы ён пералічыў 20 даляраў у BySol.
На іншыя відэазапісы крэатыву, па ўсім відаць, не хапіла. І Дзмітрыя Смуенку здымалі ўжо проста на шэрым фоне. Ён прызнаецца, што быў удзельнікам пратэстаў і пакараны за гэта. Таксама хлопец кажа, што быў падпісаны на сацыяльныя сеткі і Telegram-каналы, «забароненыя ў Рэспубліцы Беларусь». І цяпер раіць усім адпісацца ад такіх рэсурсаў, «каб не было праблемаў, звязаных з законам».
На апошнім відэа жыхары Віцебску могуць пазнаць лекара-стаматолага Уладзіміра Балясава. Ён звяртаецца да сваіх пацыентаў і незнаёмых людзей, кажучы, што браў удзел у акцыях пратэсту і «асвятляў сітуацыю, як я тады яе разумеў». Далей ён кажа, што не хоча з’язжаць з Беларусі, і шчыра ўсцешаны тым, што ў краіне няма вайны. Заклікае ўсіх устрымлівацца ад каментароў у інтэрнэце і працаваць над тым, каб беларускае грамадства аб’ядналася, і не было варажнечы.
Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што ніхто з герояў відэаролікаў не апраўдваецца за ўдзел у пратэстах 2020-га году – усе чацвёра гавораць толькі аб тым, што шкадуюць пра свае дзеянні ў інтэрнэце, прычым падкрэслена звяртаюцца да патэнцыйных гледачоў, каб тыя былі больш абачлівымі, што да «забароненых» суполак і Telegram-каналаў.

**17.03.2023**
Суд Глыбоцкага раёна 20 снежня 2022 года ў асобе суддзі Андрэя Тарасевіча асудзіў Аляксея Азарку паводле арт. 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады). Яму прысудзілі два гады «хатняй хіміі» і штраф 60 базавых велічыняў (1920 рублёў).



Аляксея асудзілі за абразлівыя каментары ў тэлеграм-канале на адрас двух прадстаўнікоў улады. Меру стрымання абвінавачанаму мужчыну тады замянілі з узяцця пад варту на падпіску аб нявыездзе і належных паводзінах, якую збіраліся адмяніць пасля ўступлення прысуду ў законную сілу. Яго вызвалілі з-пад варты ў залі суда. Арыштаваную маёмасць абвінавачанага Глыбоцкі суд пакінуў пад арыштам.
Але пасля апеляцыйнага пратэсту пракурора Глыбоцкага раёна Ігара Валынца 7 сакавіка Віцебскі абласны суд адмяніў рашэнне суда Глыбоцкага раёна і змяніў Аляксею два гады «хатняй хіміі» на два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму і штраф 60 базавых велічыняў (1920 рублёў).
Паводле апеляцыйнага вызначэння Віцебскага абласнога суда, так званыя злачынствы здзейснены са значным прамежкам у часе паміж імі, што сведчыць аб асобе павышанай сацыяльнай рызыкі абвінавачанага і яго непахіснай, супрацьпраўнай пазіцыі да дзеючай улады.
Там адзначаецца, што змест абразлівых каментароў на адрас прадстаўнікоў улады ў адкрытым доступе стаў даступны для прагляду значнай колькасці гараджан. І ў грамадзян быццам склалася негатыўнае і няпраўдзівае ўяўленне пра работу так званых праваахоўнікаў.
“Сваімі злачыннымі дзеяннямі А. не толькі прынізіў аўтарытэт, гонар і годнасць асобы прадстаўнікоў улады ў сувязі з выкананнем імі службовых абавязкаў, але і падарваў прэстыж той кіраўнічай дзейнасці ў дзяржаве, якую ажыццяўлялі ўказаныя прадстаўнікі ўлады”, - гаворыцца ў апеляцыйным вызначэнні Віцебскага абласнога суда.
Такім чынам Аляксею Азарку ўзмацнілі прысуд, і замест двух гадоў «хатняй хіміі» ён атрымаў два гады калоніі.

**18.03.2023**
Пра Аляксея Каранькова СМІ пісалі яшчэ ў 2020 годзе, тады суддзя прыехала да яго дадому, каб выпісаць штраф за ўдзел у менскім шэсці. Цяпер жа маладога чалавека пакаралі паводле ч. 2 арт. 19.11 (распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуе такую дзейнасць) КаАП. Суд прайшоў яшчэ ў мінулым месяцы і вынікам якога стала прынятая пастанова аб штрафаванні інваліда на 370 рублёў.
Сапраўды, 16 лютага 2023 года суддзя суда Аршанскага раёна і Оршы разгледзеўшы ў адкрытым судовым пасяджэнні справу аб адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным ч. 2 арт. 19. 11 КаАП Рэспублікі Беларусь, устанавіла факт таго, што у перыяд часу з 20.12.2022 па 25.01.2023, «правапарушальнік» знаходзячыся ў неўстаноўленым месцы, з выкарыстаннем мабільны тэлефон дадаў да сябе на старонку, а менавіта наўмысна публічна размясціў з мэтай распаўсюджвання ў агульнадаступным адкрытым доступе інфармацыйную прадукцыю ў выглядзе публікацый з лагатыпам "STOP

LUKA", і "Гродзенская вобласць перамена$ў$!", уключаных у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Аднак у судовым пасяджэнні Аляксей сваю віну не прызнаў, але быў пакараны штрафам у памеры 10 б.в.

**18.03.2023**
Учора, 17 сакавіка ў судзе Першамайскага раёна Віцебска была разгледжана адміністратыўная справа стаматолага Уладзіміра Балясава, заснавальніка ТДА "Стом-цэнтр", члена савета гарадской Асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў.
Судзілі стаматолага паводле ч. 2 арт. 19.11 (Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуе такую дзейнасць) КаАП Рэспублікі Беларусь. Разглядзеў справу судзя суду Першамайскага раёна Віцебска Андрэй Андрушэнка. Вынік працэсу — Уладзіміру далі штраф 1110 рублёў, а ягонай жонкі прысудзілі таксама штраф, але ў памеры 740 рублёў.

**18.03.2023**

За апошнія дні ў “паўночнай сталіцы" адбыліся затрыманне як мінімум чатырох журналістаў. У дачыненні да іх былі праведзены актыўныя следчыя мерапрыемствы на прадмет распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў у рамках ч. 2 арт.19.11 КаАП, а таксама і ч. 4 арт. 361 (Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці), крымінальнага закона.
Раніцай, 17 сакавіка быў затрыманы віцебскі журналіст глоўны рэдактар сайта "Народныя навіны Віцебска" Сяргей Серабро. У яго дома прайшоўператрус, канфіскаваная тэхніка. Затым ён быў дастаўлены ў бліжэйшы пастарунак. Але праз некалькі гадзін яго адпусцілі.
У той жа дзень з ператрусамі прыйшлі да былых журналістаў-фрылансераў Алены Сцяпанавай і Віталя Скрыля. Сілавікі ў іх таксама шукалі рэчавыя доказы іх “супрацьпраўнай дзейнасці”. Затым журналістаў дапыталі, пасля чаго яны былі адпушчаныя на волю. А жуналістку Вікторыю Дашкевіч затрымалі да суда, які пройдзе ў панядзелак, 20 сакавіка.
У вынікў неадкладных аператыўных дзеянняў работнікі міліцыі забралі ўсе гаджэты, якія належаць журналістам, з мэтай перадаць электронныя прылады спецыялістамі ў галіне IT-тэхналогій, для праверкі наяўнасці ў іх звестак аб датычнасці былых работнікаў СМІ да “супрацьпраўнай дзейнасці”.

**19.03.2023**
Як стала вядома, яшчэ напярэдадні 8 сакавіка ў Глыбокім пачаліся так званыя жэстачайшыя зачысткі нелаяльных да ўлады людзей. За лайкі, падабайкі і рэпосты ў сацсетках былі затрыманыя некалькі чалавек і асуджаныя на суткі. Некаторыя з іх сядзяць да гэтай пары. Вядома, гэтых людзей звольнілі, сярод іх былі і работнікі Глыбоцкіх электрычных сетак.
Але сілавікам гэтага было мала і за тыдзень да Дня Волі ГУБАЗіК і АМАП зноў зрабіў жорсткія зачысткі на Віцебшчыне. Не абмінула гэта і глыбачан. У горадзе сілавікі працавалі як мінімум тры дні, і на гэты раз затрымалі шмат жанчын. Кагосьці выводзілі з дому, а кагосьці забіралі з працы ў кайданках на вачах у іншых работнікаў.
Сілавікі рабілі ператрусы, забіралі камп’ютары, ноўтбукі, тэлефоны ды іншую тэхніку. З некаторымі запісвалі пакаяльныя відэа і адпускалі, а кагосьці садзілі на суткі, штрафавалі, на некаторых нават завялі крымінальныя справы. Вядома, што крымінальную справу збіраліся завесці і на жыхара Глыбокага, фітнес-трэнера Аляксандра Шарабайку за абразу Лукашэнкі.
Затрымліваючы жанчын, сілавікі прымянялі кайданкі і часам выводзілі іх у позе ластаўкі, не шкадуючы нават хворых на анкалогію. Але, праўда, некаторым жанчына пасля прапаноўвалі абраць суткі ці штраф на выбар.
Штрафы даюць розных памераў – ад 20 да 100 базавых велічыняў, у залежнасці ад наяўнаясці дзяцей, прыбытку, бізнесу ды іншых крытэраў.
Для тых, каго пасадзілі на суткі, ад родных не прымаюць перадачы і падчас сну забіраюць у людзей матрацы. Раней такога не назіралася ў невялікіх гарадах. Відаць, далі такую каманду зверху. Таксама забралі на суткі столькі народу, што не ўсе змясціліся ў Глыбоцкі ІЧУ, таму прыйшлося частку адвезці ў суседнія раёны.
Сярод затрыманых шмат настаўнікаў ці былых настаўнікаў.
Таксама не абмінулі зачысткі і самы бедны пасёлак у Віцебскай вобласці – Шаркаўшчыну. Там таксама былі ператрусы, штрафы і затрыманні.
Затрымалі настаўнікаў за ўдзел у акцыях пратэсту, прынамсі вядома пра сям’ю Барыса і Ніны Лонскіх,

якіх вельмі паважаюць у раёне і лічаць добрымі людзьмі і настаўнікамі. З імі таксама былі запісаныя пакаяльныя відэа.
Таксама вядома пра ператрусы і затрыманні ў Докшыцах. Затрымалі Таццяну Дорц і Вераніку Суднікові. На Таццяну склалі пратакол па артыкуле 24.23 КаАП за малюнкі ў сацсетках, яна ў ІЧУ да суда ў панядзелак, 20 сакавіка. Пра Вераніку Суднікові пакуль нічога невядома.
Таксама вядома і пра звальненні людзей, якіх улады лічаць нелаяльнымі ці якія дзесьці "засвяціліся", і на Лепельшчыне.
Людзей выклікаюць і ў КДБ за данаты праз фэйсбук. Сілавікі паказалі відэа з Яраславам Пачопкам з Глыбокага, які кажа, што прыйшоў з павінай за тое, што восенню 2020 года заданаціў у фонд BYSOL. Сілавікі настойліва прапануюць напісаць людзям яўку з павіннай за фінансаванне так званай экстрэмісцкай дзейнасці і пералічыць кудысьці грошы ў пяцікратным ці нават дзесяцікратным памеры (рахунак дзіцячага дома ці на іншыя рахункі, якія ім укажуць). Такім чынам Следчы камітэт абяцае актывістам не заводзіць на іх крымінальныя справы.

**20.03.2023**



Ігар Лосік у ШІЗА наваполацкай калоніі доўгі час трымаў галадоўку, а пасля парэзаў сабе рукі і шыю. Ігара выратавалі і адправілі ў медсанчастку. Адміністрацыя калоніі доўга хавала ад грамадскасці гэты надзвычайны факт.
Ігар родам з Баранавічаў. Адвучыўся на настаўніка замежных моў у Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце, але па спецыяльнасці не працаваў — яму выдалі свабодны дыплом, бо не змаглі размеркаваць па месцы жыхарства.
25 чэрвеня 2020 года ў доме ў Баранавічах, дзе жыве Ігар Лосік з сям'ёй, прайшоў вобшук і затрыманне па крымінальнай справе па арт. 342 Крымінальнага кодэксу. Але потым ягоныя дзеянні было перакваліфікавана Новае на п. 13 ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса — "падрыхтоўка да ўдзелу ў масавых беспарадках". У знак пратэсту Ігар Лосік абвясціў бестэрміновую галадоўку.
14 снежня 2021 суд прызнаў вінаватым у здзяйсненні злачынстваў паводле ч. 1 арт. 293 КК і ч. 3 арт. 130 КК і прызначыць 15 гадоў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.
У чэрвені 2022 года Ігар быў этапаваны з СІЗА-3 у наваполацкую ПК № 1. Тым часам КДБ унёс Ігара ў спіс асобаў, "датычных да тэрарыстычнай дзейнасці".

**21.03.2023**
Як стала вядома, трэцяга сакавіка суддзя Суда Глыбоцкага раёна Андрэй Тарасевіч разгледзеў адміністрацыйную справу прадпрымальніка з Глыбокага Юрыя Татарыновіча і прысудзў яму штраф памерам 70 базавых велічыняў, што складае 2590 рублёў.
Мужчыну судзілі па адміністрацыйнай справе паводле часткі 1 арт.24.23 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў). Быццам ён без атрымання адпаведнага дазволу Глыбоцкага райвыканкама правёў адзіночнае пікетаванне з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў. А выявілася гэта ў тым, што ён, знаходзячыся ў сябе дома пры дапамозе мабільнага тэлефона размясціў сваё фота ў сацыяльнай сетцы "Фэйсбук", якое суправаджалася графічнай выявай двухкалора - сцяга Украіны і герба "Пагоня". Таксама на старонцы была публікацыя з выявай бел-чырвона-белага палотнішча. Падчас судовага пасяджэння Юрый Татарыновіч віну не прызнаў.

**22.03.2023**
Цягам некалькіх дзён запар аршанская міліцыя праводзіла ператрусы і затрымлівала людзей за пасты ў сацыяльных сетках. У выніку рэйду яны залавілі як мінімум 12 чалавек у Воршы, і аднаго жыхара Сянно. Усім затрыманым мужчынам аршанскія суддзі прызначылі пакаранне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту ад 10 да 15 сутак, а кожную жанчыну штрафавалі аднолькава на 1850 рублёў.
Вядома, што першым, хто трапіў пад рэпрэсіі, быў аршанец сябра аргкамітэта па стварэнні сацыял-дэмакратычнай партыі "Грамада" Аляксандр Школьнікаў. Пазней з'явілася інфармацыя пра яго затрыманне і ператрус у яго кватэры. Аляксандр інвалід па зроку, аднак да суда міліцыянты адправілі яго ў ізалятар часовага ўтрымання. Суд арыштаваў Школьнікава мінімум на 10 сутак.

**23.03.2023**



Суд Наваполацка 8 лютага прызнаў выкладчыка Полацкага дзяржуніверсітэта Аляксандра Камка вінаватым у правядзенні пікету, і пастанавіў падвергнуць адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 3700 рублёў.
У судовым пасяджэнні было ўстаноўлена, што Аляксандр Мікалаевіч без атрымання дазволу мясцовых уладаў прыняў удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве – пікетаванні, шляхам апублікавання ў вольным доступе ў сацыяльнай сетцы «Facebook» свайго фота з выявай сцяга Украіны і БЧБ сімволікі, з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных, асабістых і іншых інтарэсаў.
«Правапарушальнік» у судовым пасяджэнні віну не прызнаў. Але пры гэтым не адмаўляў таго, што размясціў у «Facebook» сваю фатаграфію са сцягам Украіны і БЧБ сімволікай, з мэтай дэманстрацыі сваёй пазіцыі з нагоды пачатку вайны ва Украіне, аднак паказаў, што не пераследваў мэты праводзіць пікетаванне.
Аднак суддзя вывучыўшы матэрыялы справы прыйшла да высновы, што фотаздымак размешчаны выкладчыкам універсітэта ў СС з мэтай прыцягнення ўвагі іншых грамадзян да падзе ва Украіне.
Ацаніўшы доказы, суддзя палічыла даказанай віна Аляксандра Камка у здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага ч. 1 арт. 24. 23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) падвергла яго адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 100 базавых велічынь.

**24.03.2023**
Паведамленні пра звольненых на гэтай падставе паступаюць ад работнікаў розных гарадскіх прадпрыемстваў. Абсалютна розныя і пасады, якія займалі ўжо звольненыя – ад прыбіральшчыцы да начальніка цэха. Ад людзей не хаваюць, што «паступіў загад разабрацца». Апраўданняў пра тое, што ўлетку 2020года Віктар Бабарыка абвясціў збор подпісаў за свае вылучэнне на цалкам законных падставах, ніхто не слухае.
Падчас збору подпісаў за вылучэнне ўдзельнікаў мінулай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі людзі пакідалі свае пашпартныя дадзеныя, па якіх іх цяпер расшукваюць.
Для адміністрацый прадпрыемстваў распараджэнні на звальненне работнікаў дадаюць праблемаў: міністэрствы патрабуюць выканання запланаваных аб’емаў працы, але здзейсніць гэта замінаюць «цякучка», якая набірае абароты, і дэфіцыт кваліфікаваных кадраў.
Масавыя звальненні за падтрымку Віктара Бабарыкі ў 2020-м годзе распачаліся больш як праз два гады пасля завяршэння электаральнай кампаніі. Прэтэндэнт на ўдзел у выбарах Віктар Бабарыка быў затрыманы 18 чэрвеня 2020 г. разам з сынам Эдуардам, калі накіроўваўся ў ЦВК для здачы сабраных подпісаў. Затрыманне праводзіў Дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю.
У судзе Маскоўскага раёну Мінска 6 ліпеня 2021 г. банкір і грамадскі дзеяч, прэтэндэнт у кандыдаты на пасаду прэзідэнта Віктар Бабарыка быў прызнаны вінаватым паводле арт. 235 Крымінальнага кодэксу – Легалізацыя («адмыванне») сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, і арт. 430 Крымінальнага кодэксу – Атрыманне хабару. Свае віны не прызнаў. Суддзя Вярхоўнага суда Ігар Любавіцкі пакараў яго 14 гадамі калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.
Віктар Бабарыка адбывае пакаранне ў Наваполацкай ПК1. У траўні 2022 г. Камітэт ААН зарэгістраваў скаргу ад імя Віктара Бабарыкі. У звароце юрысты просяць прызнаць парушэнні правоў палітзняволенага (як мінімум 11), а таксама абавязкі дзяржавы вызваліць яго і ліквідаваць наступствы неправамернага асуджэння.

**24.03.2023**
Леанід Гаравы быў затрыманы 15 сакавіка пасля праведзенага ў яго дома перетрусу. 16 сакавіка над ім адбыўся суд, актывіста прызналі вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў. Падчас суду Гаравому стала кепска, у суд выклікалі хуткую дапамогу. Аднак на рашэнне суду гэта не паўплывала: Леаніда Гаравога асудзілі на 15 сутак.
Праваабаронцам стала вядома, што пад арыштам знаходзіцца і сын спадара Леаніда, таксама сябар БСДП, Аляксей Гаравы. Яго затрымалі разам з жонкай яшчэ 20 лютага ў Мінску, па месцы жыхарства, дома правялі перетрус. Пазней жонку адпусцілі, а Аляксея Гаравога двойчы запар асудзілі за «непадпарадкаванне патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі».
Леанід Гаравы – вядомы на Віцебшчыне актывіст, адзін з даўніх прадстаўнікоў грамадскага сектару Гарадоччыны. Паводле адукацыі ен настаўнік матэматыкі, шмат год адпрацаваў дырэктарам школы ў весцы Вархі Гарадоцкага раену, але быў вымушаны звольніцца пад ціскам за грамадскую дзейнасць.

Яго не аднойчы затрымлівалі і каралі штрафамі і «суткамі». Затрыманне ў 2020-м годзе ледзь не скончылася трагічна: яго пакінулі пад вартай на тры дні без неабходных лекаў, і на фоне гіпаглікемічнай комы ў Леаніда Гаравога здарыўся інсульт, наступствы якога не прайшлі і дагэтуль.

**24.03.2023**




16 сакавіка 2023 году пракуратура Рэспублікі Беларусь зацвердзіла абвінавачанне ў дачыненні да палітзняволенай Яны Пінчук у канчатковай рэдакцыі і накіравала крымінальную справу на разгляд у Мінскі гарадскі суд. Разгляд прызначаны на 10 красавіка 2023 года.

У канчатковай рэдакцыі абвінаваўчага заключэння ў абвінавачанні ў дачыненні да Яны былі пашыраныя. Як вынікае з карткі справы на афіцыйным сайце Мінскага гарадскога суда, Яне ставяцца ў віну абвінавачанні па ч. 1 артыкула 290-4 і ч. 3 артыкула 293 КК РБ, якія не згадваліся ў матэрыялах крымінальнай справы да выдачы і, як следства, не разглядаліся падчас экстрадыцыйнай праверкі ў Расійскай Федэрацыі. Такім чынам, Беларусь парушыла свае ўласныя пісьмовыя гарантыі аб тым, што Яна не будзе прыцягнутая да крымінальнай адказнасці або падвергнутая пакаранню за ўчыненае ёю да выдачы злачынства, за якое яна не была выдадзена, і тым самым парушае патрабаванні Канвенцыі аб прававой дапамозе 1993 года.

У сувязі з гэтым учора яе адвакатка Марыя Бяляева паведаміла аб гэтым Генпракуратуры Расіі і ўказала ёй на неабходнасць, сярод іншага, запатрабаваць ад Беларусі выканання дадзеных ёю пісьмовых гарантый, адмовіцца ад абвінавачанняў і спыніць крымінальныя справы па палажэннях, не прадугледжаных пастановай аб выдачы.

Нагадаем, Яну Пінчук затрымалі ў Санкт-Пецярбурзе ў лістападзе 2021 года ў сувязі з абвяшчэннем у вышук у Беларусі па падазрэнні ў адміністраванні пратэстнага тэлеграм-канала. 29 сакавіка 2022 года Генеральная пракуратура Расіі вынесла пастанову аб задавальненні запыту аб выдачы ў краіну прыналежнасці для прыцягнення да крымінальнай адказнасці па ч. 3 арт. 130, ч. 3 арт. 361, ч. 1 арт. 361-1 і ч. 2 арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

У пастанове таксама ўказваецца, што Генпракуратурай Беларусі, як кампетэнтным органам у пытаннях выдачы, у дачыненні да Яны дадзены дастатковыя гарантыі захавання яе правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Сярод іншага, гарантавалася, што «Пінчук Я.У. не будзе прыцягнута да крымінальнай адказнасці або пакарана за ўчыненае ёю да выдачы злачынства, за якое яна не была выдадзена, і пасля заканчэння крымінальнага пераследу або судовага разбору, а ў выпадку вынясення абвінаваўчага прыгавору — пасля адбыцця пакарання зможа свабодна пакінуць тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, а таксама не будзе выслана, перададзена або выдадзена трэцяй дзяржаве без згоды Расійскай Федэрацыі».

Аналагічныя патрабаванні да выдачы прад'яўляюцца таксама п. 3 ч 3. арт. 462 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Расіі і артыкулам 66 Канвенцыі аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах 1993 года.

**25.03.2023**

Суддзя суда Расонскага раёна Рада Доміч 16 сакавіка разгледзела адміністрацыйную справу ў дачыненні да электраманцёра філіяла Полацкія электрасеткі «Расонскі раён электрычных сетак" Міхаіла Зянькова. Суддзя прызнала яго вінаватым у правядзенні не дазволенага мясцовымі ўладамі пікета і на падставе ч.1 арт.24. 23 КаАП падвергла яго пакаранню ў выглядзе арышту тэрмінам на 10 сутак.

Для прыняцця такога рашэння суддзі Доміч было дастаткова рапарту міліцыянта, у якім паведамлялася пра тое, што ён падчас маніторынгу сеткі Інтэрнэт у тэлеграм-канале «Наваполацк I Полацк 97%» выявіў фота, на якім быў намаляваны БЧБ сцяг, размешчаны на вышцы. У ходзе праверкі ён усталяваў, што дадзены малюнак размясціў 30 кастрычніка 2020 года карыстальнік Зянькоў.

Мужчына ў судовым пасяджэнні віну ў здзяйсненні правапарушэння прызнаў і растлумачыў, што ў кастрычніку 2020 года размясціў у тэлеграм дзве фатаграфіі на якіх намаляваная вышка рабочай электрастанцыі з бел-чырвона-белым сцягам на вяршыні. Дадзеныя фатаграфіі рабіў сам у жніўні 2020 года і размясціў у тэлеграм-канале, каб паказаць салідарнасць і дачыненне да падзей, якія адбываліся. Беручы пад увагу рапарт і пасіненні “правапарушальніка”, суддзя прыйшла да высновы, што Міхаіл вінаваты ў правядзенні несанкцыянаваным уладамі пікетавання і пакарала электраманцёра адміністрацыйным дзесяцісуткавым арыштам.

**26.03.2023**

Праз раённую газету «Патрыет» начальнік аддзялення аховы правапарадку і прафілактыкі Вушацкага РАУС Аляксей Антуновіч нагадвае чытачам, што крымінальную адказнасць цягне за сабой падпіска на экстрэмісцкія каналы і чаты, якія маюць статус экстрэмісцкага фарміравання. Санкцыя адпаведнага артыкула (361-1) КК прадугледжвае да сямі гадоў пазбаўлення волі. Таму супрацоўнік МУС раіць перагледзець свае падпіскі і выдаліць «ненадзейныя». І хаця ў пачатку артыкула жыхароў Вушаччыны страшаць і адміністрацыйнымі пакараннямі з падпіску на каналы з экстрэмісцкімі матэрыяламі, спадар Антуновіч ніжэй тлумачыць, што толькі за падпіску «пакуль не караюць».




Але інтэрнэт- карыстальнік можа быць прыцягнуты да адказнасці, калі аказвае падтрымку ў папулярызацыі канала, інакш кажучы, рэпосціць матэрыялы, пералічвае грошы, «залівае» туды інфармацыю. У якасці спагнання для фізічнай асобы ў такім разе прадугледжаны штраф ад 10 да 30 базавых велічынь, грамадскія работы ці адміністрацыйны арышт, да індывідуальнага прадпрымальніка сума штрафу павялічваецца да 50-100 базавых, юрыдычнай асобы – 100-500. Ва ўсіх выпадках можа быць таксама канфіскаваны прылады і сродкі здзяйснення названага парушэння.

Са спісам матэрыялаў, прызнаных у Беларусі экстрэмісцкімі, можна азнаёміцца ў асобным раздзеле сайта Міністэрства ўнутраных спраў, піша «раёнка». Дарэчы, у гэтым спісе няма ніводнага ўласна Вушацкага інтэрнэт-рэсурса. Таму запалохванні пакараннямі маюць самы агульны змест.

**27.03.2023**

Міёрскі раённы выканаўчы камітэт вырашыў вызначыць пералік аб'ектаў Мёрскага раёна для адбыцця асуджанымі пакарання ў выглядзе грамадскіх работ. Рашэнне прынята на падставе арт. 178 Крымінальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Сваё рашэнне выканкам узгадніў з аддзелам унутраных спраў і мясцовай крымінальна-выканаўчай інспекцыяй. Можна меркаваць, што ўлады рыхтуюцца часцей ужываць пакаранні ў выглядзе грамадскіх работ, каб фармальна законным чынам прымяняць прымусовую працу ў мясцовай эканоміцы.

У пералік уваходзіць 22 прадпрыемствы і ўстановы, размешчаныя ў межах Міёрскага раёна. Кіраўнікі 16 суб'ектаў гаспадарання на добраахвотнай аснове далі згоду на эксплуатацыю працы асуджаных.

Права эксплуатаваць працу падвергнутых крымінальнаму пакаранню ў выглядзе грамадскіх работ атрымалі аддзел унутраных спраў Міёрскага раённага выканаўчага камітэта, усе 14 сельскагаспадарчых арганізацыях і 7 прадпрыемстваў розных формаў дзяржаўнай уласнасці.

А менавіта: філіял «Міёрскі ККЗ» ААТ "Полацкі камбінат хлебапрадуктаў», ПУП «Міёрскі мясакамбінат», Міёрская вытворчасць філіяла Полацкі хлебазавод ААТ «Віцебскхлебпрам», унітарнае прадпрыемства ЖКГ Міёрскага раёна, камунальнае ўнітарнае прадпрыемства меліярацыйных сістэм «Міёрскае ПМС», камунальнае ўнітарнае прадпрыемства меліярацыйных сістэм «Язненскае ПМС», дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Дзісненскі лясгас».

Цяпер справа за судом Миёрскага раёна, каб ён выносіў прысуды, якія будуць спрыяць масаваму прыцягненню грамадзян да прымусовых работ у дзяржаўных установах і арганізацыях.

**27.03.2023**

Па звестках праваабаронцаў, крымінальная справа распачатая адразу па некалькіх артыкулах. Падставамі маглі стацца звесткі, знойдзеныя ў ягоным тэлефоне, які сілавікі забралі падчас затрымання 13 сакавіка. Тэлефон быў забраны і ў жонкі Аляксандра Шарабайкі. У ноч з 24 на 25 сакавіка, пасля адбыцця 10-суткавага арышту, вядомага ў Глыбокім трэнера і бодзібілдэра перавялі ў віцебскі СІЗА-2.

Сваякам Аляксандра Шарабайкі належыць аплаціць 166 рублеў за ўтрыманне ў ІЧУ. Следства па крымінальнай справе распачалося некалькі дзен таму, Шарабайку вінавацяць, верагодна, у тым ліку і за абразу Аляксандра Лукашэнкі. Пад увагу сілавых структураў глыбоцкі актывіст трапіў пасля падзеяў 2020-га году. Яго некалькі разоў судзілі па адміністрацыйных артыкулах за ўдзел у мірных пратэстах і за вывешаны на доме бел-чырвона-белы сцяг. У 2021-м годзе ен быў затрыманы на трое сутак за «распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці або розні» – за відэаролік у тэлеграм-канале «Глубокое для жизни», размешчаны ананімнай асобай пад непазнавальным нікам. Але тады крымінальную справу ўласна супраць Шарабайкі не распачалі.

**27.03.2023**



Прызнанне «экстрэмісцкімі» прыватных старонак у сацыяльных сетках здараецца ўсё часцей. Што суды расцэньваюць як экстрэмізм, калі чытаюць асабістыя допісы або разглядаюць фотаздымкі? Менавіта з-за апошніх старонку Міхаіла Ерафеева суд і прызнаў «экстрэмісцкай» – падобна, суддзяў уразіла колькасць выяваў Пагоні і бел-чырвона-белых сцягоў.

Міхаіл Ерафееў або, як ен просіць, каб яго назвалі, Міхась, браў удзел у мірных пратэстах 2020 году. Пра гэта таксама сведчаць шматлікія фота ў Фэйсбуку. А яшчэ там можна ўбачыць плакаты супраць вайны ва Украіне, здымкі з акцый салідарнасці ў Варшаве, і пад дзясятак фотаздымкаў з бел-чырвона-белым сцягам у розных лакацыях. Па якім прынцыпе дзейнічалі сілавікі, каб адшукаць старонку гэтага чалавека, сказаць цяжка. Ен не папулярны блогер, і ў Фэйсбуку ў яго не так шмат сяброў, каб казаць пра нейкую «агітацыйную небяспеку». Выглядае на тое, што ў міліцыі маглі быць намеры асудзіць Міхаіла Ерафеева за ўдзел у пратэстных акцыях, але зрабіць гэта немагчыма, бо мужчына пакінуў Беларусь. З тае ж прычыны няма сэнсу распачынаць супраць уладальніка старонкі адміністрацыйную справу – пакараць яго арыштам ці штрафам усе адно не атрымаецца. Таму адзінае, што застаецца, – гэта абвясціць старонку «экстрэмісцкай», каб наведнікі асцерагаліся на ей нешта «лайкаць» або каментаваць. Зрэшты, Міхась Ерафееў ужо не першы ў Віцебску чалавек, чыю старонку ў Фэйсбуку прызналі «экстрэмісцкай». Упершыню гэта здарылася з віцяблянінам Сяргеем Сясіцкім. Але тады ўвагу сілавікоў прыцягнулі не столькі выявы, фотаздымкі або рэпосты з «экстрэмісцкіх» інтэрнэт-рэсурсаў, колькі выказванні аўтара старонкі пра палітычныя падзеі ў Беларусі і ў свеце.

**27.03.2023**

Суд Верхнядзвінскага раёна ў асобе Таццяны Куклінай асудзіў Наталлю Валынец па частцы 2 артыкула 24.23 КаАП (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў).

Ёй прысудзілі штраф за налепку герба “Пагоня” на машыне. Жанчына прыехала на працу ў выканкам, дзе яна працуе галоўным спецыялістам у аддзеле адукацыі, на бацькавай машыне. А на ёй быў налеплены герб “Пагоня”.

На гэта не маглі не звярнуць увагу сілавыя структуры, прыехалі міліцыянты і машыну забралі ў міліцыю. Гаспадару аўтамабіля не далі ніякіх дакументаў. Больш за месяц машына была ў міліцыі. Сілавікі не аддавалі яе гаспадару і казалі, што на машыне нібыта перабіты він-код. Не дзейнічаў нават аргумент, што машына куплена ў салоне і ўсе патрэбныя паперы на яе ёсць у гаспадара. Былі выкліканыя эксперты з Віцебска. Пасля гэтага машыну аддалі.

Нягледзячы на тое, што Наталля Валынец - удава, яна гадуе дваіх дзяцей, сын вучыцца на платным, яе збіраюцца звольніць з працы ў аддзеле адукацыі за гэты інцыдэнт. Як кажуць знаёмыя з гэтай гісторыяй, проста прыйшла каманда зверху.

Наталля Валынец абскарджвала пастанову Верхнядзвінскага суда ў Віцебскім абласным судзе, але атрымала адмову. Цяпер яна цягам месяца павінна выплаціць яшчэ і штраф.

Да таго вядома яшчэ пра дзве адміністрацыйныя справы ў Верхнядзвінскім раёне, калі людзям прысудзілі штрафы за так званую нелаяльнасць да ўладаў. Вядомаму краязнаўцу і былому вязню канцлагера Антону Бубале прысудзілі 20 базавых і канфіскавалі тэлефон за рэпосты ў сацыяльнай сетцы “Фэйсбук”, а таксама была аштрафаваная Наталля Васіленка на 30 базавых велічыняў.

**28.03.2023**





Калі раней «народным» лічыўся артыкул 23.34 КаАП (пазней 24.23 КаАП), згодна з якім каралі за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, то цяпер самая распаўсюджаная прычына трапіць у суд – гэта ч.2 арт. 19.11. Ужо каторы тыдзень усе раенныя суды Віцебску разбіраюць справы мясцовых жыхароў, затрыманых за падпіскі на «экстрэмісцкія» інтэрнэт-рэсурсы, суполкі і Тэлеграм-каналы. Караюць за гэта ў асноўным «суткамі», рэдка каму прысуджаюць штрафы. Відавочная мэта такога ціску: людзей запалохваюць карнымі захадамі, каб яны «адпісаліся» ад незалежных крыніц інфармацыі, а навіны шукалі ў тэлевізары або ў дзяржаўных СМІ.

Штодня ў кожным раенным судзе разбіраюць ад 2 да 5 справаў, распачатых па ч.2 арт. 19.11. Што да падсудных – то гэта самыя розныя людзі, якія да «палітыкі» або да «апазіцыі» не маюць аніякага дачынення. Прыкладам, 28 сакавіка суд Першамайскага раену разбіраў справы калекцыянера і прад-

прымальніка Канстанціна Буймова, і адмыслоўцы па выпяканню хлеба Віталя Багданава. У судзе Кастрычніцкага раёну датычнымі да распаўсюду экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыі прызналі майстра мастацкага кавальства Дзмітрыя Каралькова і стваральніка сямейнай фотастудыі «Калібры» Аляксандра Вашчанку. Вельмі часта «на сутках» сустракаюцца даўнія знаёмыя, якія не бачылі адзін аднаго гадамі, але сустрэліся ў адной камеры, бо ў іхных тэлефонах знайшлі «экстрэмісцкія» падпіскі. Да слова, «палітычных» асуджаных у віцебскім ІЧУ па-ранейшаму ўтрымліваюць у неспрыяльных умовах: усе яны, у тым ліку і жанчыны, вымушаны спаць на голых жалезных ложках з уключаным па начох святлом. І па-ранейшаму, як гэта было з асуджанымі за ўдзел у мірных пратэстах у 2020-м годзе, разам з «палітычнымі» трымаюць асуджаных за хуліганства або бытавыя правіны, каб справакаваць агрэсію да «вінаватых» у некамфортным утрыманні. Аднак здараецца наадварот: далёкія ад палітычных падзей у краіне людзі пачынаюць шкадаваць тых, хто пацярпеў за « не тыя» падпіскі ў тэлефоне.

**28.03.2023**

Праваабарончая супольнасць прызнала жыхара Віцебску палітвязнем, выступіўшы з адмысловай заявай. У ей падкрэсліваецца, што Вячаслаў Лазараў быў журналістам-фрылансерам, яго неаднаразова затрымлівалі падчас мірных пратэстаў у 2020 г. Цяпер яму прад'яўлены абвінавачанні па частцы 1 артыкула 364-1 Крымінальнага кодэксу (спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці). На думку праваабаронцаў, «празмерна шырокае і расплывістае вызначэнне «экстрэмісцкай дзейнасці», прадугледжанае беларускім заканадаўствам, дазваляе ўладам маніпуляваць фармулёўкамі дзеля неправамернага абмежавання права на інфармацыю, свабоды слова і свабоды асацыяцый.
Вячаслава Лазарава затрымалі 9-га лютага пасля ператрусу ў кватэры, дзе ен прапісаны. На вачах у маці-пенсіянеркі сына кінулі на падлогу, заламалі рукі за спіну, а потым, не даўшы толкам апрануцца, павялі ў міліцэйскую машыну. З кватэры забралі мабільныя тэлефоны і асабістыя рэчы, у тым ліку дакументы і грошы, якія Вячаслаў адкладаў на аперацыю для маці ( яна мае інваліднасць, кепска перасоўваецца). У якасці відэааператара Лазараў працаваў на розных тэлеканалах, у тым ліку на дзяржаўнай тэлевізіі. Быў некалькі разоў асуджаны і аштрафаваны па адміністрацыйным артыкуле 22.9 (да 2020г.) за «парушэнне парадку вырабу і распаўсюду інфармацыйнай прадукцыі ». Вячаслаў Лазараў мае маленькую дачку, якой няма і году, але апошнім часам жыў асобна, бо сямейнае жыцце не склалася. Прыкладна за месяц да затрымання ен распаўсюдзіў у Фэйсбуку адкрыты ліст, што не выключае пераследу з боку сілавікоў «з падачы» жонкі, якая нібыта пагражала яму, што «збірае кампрамат»і хвалілася «знаемствамі ў КДБ». «З 2021 году назіраецца масавая практыка адвольнага прызнання «экстрэмісцкімі матэрыяламі» публікацый незалежных СМІ, разам з абвешчаннем беларускіх СМІ «экстрэмісцкімі фармаваннямі». Адной з самых абуральных формаў пераследу з’яўляецца прыцягненне журналістаў да крымінальнай адказнасці ў звязку з удзелам у экстрэмісцкім фармаванні ці садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці», – пішуць у адпаведнай заяве праваабаронцы. Менавіта гэтую акалічнасць яны лічаць падставовай, што да затрымання віцябляніна Вячаслава Лазарава, а таксама жыхара Мінску Паўла Падабеда – таксама відэааператара, які супрацоўнічаў з незалежнымі СМІ. Праваабаронцы лічаць, што дзеянні ў дачыненні да Паўла Падабеда і Вячаслава Лазарава з’яўляюцца працягам мэтанакіраванай палітыкі ўладаў па абмежаванні распаўсюду непадцэнзурнай інфармацыі ў краіне і працягам наступу на свабоду слова.

**30.03.2023**



Затрыманыя працуюць у полацкай музейнай сістэме – Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку. У іх ліку – былая дырэктарка Тамара Джумантаева, кандыдатка культуралогіі, кандыдат філасофскіх навук Ігар Бортнік, шэраговыя супрацоўнікі, экскурсаводы і нават электрык. Найверагодней, усіх затрымалі «за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» – паводле ч.2 артыкула 19.11 КаАП. Масавае затрыманне такога маштабу – першае ў горадзе, які традыцыйна лічыцца «гістарычнай Меккай». Яго праводзілі супрацоўнікі Полацкага гарадского аддзела ўнутраных спраў.

Сваей неабыякавасцю да захавальнікаў і папулярызатараў гістарычнай спадчыны полацкія міліцыянты «праславіліся» і ў 2021 годзе, калі полацкія экаскурсаводы ўзяліся праводзіць нядзельныя пешыя тэматычныя туры па горадзе. Кожны раз, калі праводзілася экскурсія, за групай ішла пара міліцыянтаў у поўнай экіпіроўцы. Прычым яны не толькі суправаджалі ўдзельнікаў экскурсіі, але і здымалі іх на відэа. Колькасць міліцыянтаў паступова павялічвалася, і аднойчы дасягнула максімуму: 22 экскурсанта перасоўваліся ў суправаджэнні 10-ці міліцыянтаў.

Паводле праўладных тэлеграм-каналаў, "зачыстка" у Полацку ідзе ўжо другі тыдзень. Спярша яна была прымеркавана да 25 сакавіка: напярэдадні Дня волі міліцыя затрымала за "распаўсюд экстрэмістскіх матэрыялаў" некалькі чалавек, прадэманстраваўшы з імі "пакаяльныя відэа". Але затрыманні працягваюцца і далей.

**30.03.2023**
Праваабарончая супольнасць прызнала палітычным зняволеным 27-гадовага жыхара Оршы, якога вінавацяць у садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці паводле ч. 1 арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса. Санкцыя гэтага артыкула прадугледжвае максімальнае пакаранне ў выглядзе шасці гадоў пазбаўлення волі. 30 сакавіка ў Віцебскім абласным судзе над Яраславам Казакевічам распачаўся суд. Працэс у закрытым рэжыме вядзе Галіна Бондал.
Паводле абвінавачання, 8 снежня 2022г. Яраслаў Казакевіч на чыгуначным вакзале станцыі «Орша-Цэнтральная» з выкарыстаннем мабільнага тэлефона Samsung Galaxy вырабіў відэафайл, на якім быў зафіксаваны эшалон з расейскай ваеннай тэхнікай. Потым, знаходзячыся ў вагоне цягніка рэгіянальных ліній, ен даслаў гэты відэафайл у Telegram-канал, інфармацыйная прадукцыя якога раней была прызнана судом экстрэмісцкімі матэрыяламі. На наступны дзень Яраслаў Казакевіч быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і асуджаны судом Оршы і Аршанскага раёну да 15 сутак арышту «за выраб і распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» (арт. 19. 11 КаАП). На волю ён болей не выйшаў. Падчас допыту ў Аршанскім міжраённым аддзеле Следчага камітэту Казакевіч засведчыў, што быў падпісаны на розныя Telegram-каналы, у тым ліку прызнаныя «экстрэмісцкімі». Там ен бачыў публікацыі з падобнымі відэа і фатаграфіямі. Таму, калі заўважыў вайсковую тэхніку, зняў яе на мабільны тэлефон і адправіў відэа ў адзін з Telegram-каналаў. Са снежня мінулага году Яраслава Казакевіча ўтрымліваюць у віцебскім СІЗА-2.

**31.03.2023**
Адбыліся суды над затрыманымі 29 сакавіка супрацоўнікамі полацкай музейнай сістэмы. Былой дырэктарцы Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Тамары Джумантаевай, фатографу Кірылу Смалякову і электрыку ўстановы (прозвішча ўдакладняецца) прысудзілі па 15 сутак арышту «за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў». Іх трымаюць у Полацкім ІЧУ. Асуджаны да такога ж арышту кандыдат філасофскіх навук Ігар Бортнік знаходзіцца ў наваполацкім ЦІПе.
За кратамі застаюцца яшчэ чацьвера чалавек, якіх затрымалі 29 сакавіка: фатограф Ігар Супранёнак, загадчыца рэстаўрацыйных майстэрняў Аксана Шафран, Аксана Козел з Музея ткацтва Паазер'я і Вольга Філімонава з музея Сафійскага сабора. Прычым есць верагоднасць, што Супруненак затрыманы па крымінальнай справе. Апрача згаданых асобаў, 30 сакавіка былі затрыманыя яшчэ некалькі супрацоўнікаў полацкіх музеяў: Вікторыя Бабко з аддзела фондаў, Надзея Язмер з музея Сафійскага сабора і Алена Ходзікава, якая працавала ў гэтым музеі раней, але ўжо звольнілася. Ва ўсіх затрыманых прайшліператрусы, міліцыянты забралі ў іх тэлефоны і аргтэхніку, патлумачыўшы, што будуць шукаць падпіскі і падтрымку «экстрэмісцкіх» інфармацыйных суполак і фарміраванняў.

## Красавік

**01.04.2023**
Затрыманаму ў Глыбокім бодзібілдару Аляксандру Шарабайка следчыя інкрымінуюць крымінальнае злачынства згодна арт. 368 (Абраза Прэзідэнта РБ) Крымінальнага кодэкса РБ. Да гэтага, 13 сакавіка, Аляксандр быў арыштаваны судом да адміністратыўнага арышта на 10 сутак.
У мужчыны і ягонай жонкі Алены міліцыянты забралі тэлефоны для таго, каб прааналізаваць інфармацыю. Пасля выбараў Шарабайку некалькі разоў саджалі на суткі за ўдзел у пратэстах і за белчырвона-белы сцяг на доме. У ліпені 2021 яго затрымлівалі на трое сутак "па падазрэнні ў злачынстве". Каб патрымаць падазраванага можна дасылаць грашовыя пераводы, пасылкі і тэлеграмы на адрас: СІЗА-2, вул. Гагарына, 2, 210026, Віцебск, Шарабайка Аляксандру Міхайлавічу.

**01.04.2023**

31 сакавіка 10 сутак арышту прысудзілі кандыдату філасофскіх навук Ігару Бортніку, старшых навуковых супрацоўнікаў Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка запаведніка запаведніка Касцючэнку і Шыбко асудзілі на 15 сутак. 30 сакавіка ў судзе Полацку і Полацкага раёну 15 сутак арышту прысудзілі былой супрацоўніцы музея-запаведніка запаведніка Алене Ходзікавай.



Паводле інфармацыі праваабаронцаў, затрыманні полацкіх музейных супрацоўнікаў і навукоўцаў адбыліся 29 і 30 сакавіка. Усяго за два дні затрымалі 11 чалавек. Імаверна, іх звінавацілі ў распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў (арт. 19.11 КаАП) за каментары і лайкі ў сацсетках і месэнджарах. У затрыманых прайшліператрусы, міліцыянты забралі ў іх тэлефоны і аргтэхніку.

Першымі 29 сакавіка былі асуджаныя на 15 сутак былая дырэктарка Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, кандыдатка мастацтвазнаўства Тамара Джумантаева, фатограф Кірыл Смалякоў і электрык установы.

Затрыманні музейных супрацоўнікаў і навукоўцаў сталі працягам маштабнай аблавы сілавікоў, якая пачалася ў Полацку яшчэ ў 20-х ліках сакавіка. Напярэдадні Дня Волі. Праўладныя Тэлеграм-каналы апублікавалі некалькі «пакаяльных відэа», на якіх людзі гавораць, што іх затрымалі за падпіскі на так званыя «экстрэмісцкія» інтэрнэт-рэсурсы.

**03.04.2023**

За тры месяцы 2023 года суды Віцебскай вобласці прызналі 32 інфармацыйных рэсурсаў, якія распаўсюджвалі “экстрэмісцкія матэрыялы”. За гэты час у рэпрэсіях супраць свабоды распаўсюджвання інфармацыі ў сетцы Інтэрнэт прынялі ўдзел суддзі 12-ці раённых судоў рэгіёна. Палова ўсіх рашэнняў, то бок 16-ць, прышлося на суд Кастрычніцкага раёну Віцебска.

Суды Чыгуначнага і Першамайскага раёнаў абласнога цэнтра вынеслі адпаведна тры і адно рашэнне. Агулам, гарадскія суды прызналі “экстрэмісцкімі” 21 інфармацыйных крыніц. Калі казаць пра раённыя суды Віцебскай вобласці, якія прынялі 11 рашэнняў.

Так суд Полацкага, Міёрскага і Пастаўскага раёнаў прызналі экстрэмісцкімі матэрыяламі на 2 рэсурсах. Па аднаму рэсурсу празвналі “небяспечнымі” для дзяржавы і грамадства суды Сенінскага, Аршанскага, Верхнедзвінскага, Шумілінскага, Расонскага і Глыбоцкага раёнаў.

Трэба адзначыць, суддзі закрылі ТГ вядомых беларускіх апазіцыянераў, такіх як Дзмітрый Шчыгельскі, ксёндз Барок, Андрэй Павук і Ганна Федаронак.

Ва ўсіх выпадках суды скарысталіся правам неадкладнага выканання сваіх рашэнняў, паколькі, на думку суддзяў, прамаруджванне ў выкананні рашэння можа прывесці да значнай шкоды для дзяржавы або зрабіць немагчымым самое выкананне.

Ініцыятарамі прыняцця судамі рашэнняў па прызнанні матэрыялаў экстрэмісцкімі былі Сёмае упраўленне (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь або органы пракуратуры.

**03.04.2023**



Юрый Гладчук, рэдактар спецпраектаў аўтамабільнага парталу «Аўтабізнэс», у снежні мінулага году быў асуджаны да двух з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму паводле арт. 342 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) і арт. 368 Крымінальнага кодэксу (Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). У Наваполацкую калонію яго этапавалі напрыканцы сакавіка.

Гладчук быў затрыманы 16 чэрвеня 2022 года пасля вобшукаў. Адначасова была затрымана і супрацоўніца таго ж аўтамабільнага парталу Юлія Мудрэўская. Пазней абодвух перавялі ў СІЗА-1 у межах крымінальнай справы. У верасні 2022г. Мудрэўскую прызналі вінаватай за ўдзел у акцыях пратэсту 2020 г. і асудзілі на паўтара гады калоніі. Яна ўжо адбывае гэты тэрмін у гомельскай жаночай калоніі № 4.

Што да Юрыя Гладчука, то ў Мінскім гарадскім судзе 28 лютага адбыўся разгляд апеляцыйнай скаргі палітвязня. На першапачатковае судовае рашэнне гэта не паўплывала.

У Наваполацкай ПК 1 зараз утрымліваюць 87 палітвязняў, сярод іх палітык, экс-удзельнік мінулай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі Віктар Бабарыка і ўраджэнец Віцебску, журналіст-фрылансер Радые Свабода Андрэй Кузнечык.

**05.04.2023**
Рабочага па абслугоўванні будынкаў Віцебскага аблвыканкаму Андрэя Шмая трымаюць у СІЗА-2. Ён трапіў туды паводле абвінавачвання па артыкуле 358-1 Крымінальнага кодэксу – «агентурная дзейнасць». Падставай стала перапіска з братам у мэсэнджары Signal. Брат затрыманага, Руслан Шмай, служыць у чарнігаўскім упраўленні «Поўнач» маёрам, намеснікам камандзіра па аператыўных пытаннях.
У фільме АНТ пра тэракт у Мачулішчах і сетку СБУ ў Беларусі гаворыцца, нібыта Андрэй Шмай на просьбу малодшага брата рэгулярна адпраўляў інфармацыю пра сітуацыю ў аблвыканкаме – структуру будынкаў і ўнутраную дзейнасць. У фільме таксама сцвярджаецца, што перапіска была зашыфраванай, хаця Андрэй Шмай тлумачыць, што проста выдаляў паведамленні, калі іх збіралася шмат. Затрымалі Андрэя Шмая пасля працы 19 студзеня. Доўгі час сям’я не ведала, што з ім здарылася, і толькі праз два тыдні жонцы Андрэя патэлефанавалі з органаў. Чалавек, які назваўся следчым, папрасіў перадаць дакументы Андрэя. Больш ніякіх падрабязнасцяў ён не паведаміў. Затрыманы Андрэй Шмай – былы вайсковец, з 2006 па 2013 г. Служыў на беларуска-ўкраінскай мяжы інспектарам пункта пропуску «Ярылавічы». Потым пераехаў у Віцебск, уладкаваўся рабочым па комплексным абслугоўванні і рамонце будынкаў і збудаванняў –- выконваў розныя работы, звязаныя з падтрыманнем матэрыяльнай часткі ўстановы (абслугоўванне электрыкі, сантэхнікі і іншыя бягучыя работы, якія не патрабуюць высокай кваліфікацыі). Андрэй Шмай і ягоная жонка нарадзіліся ў Чарнігаве, але даўно жывуць у Беларусі. Жонка мае беларускае грамадзянства. Сын вучыцца ў сярэдняй школе.

**05.04.2023**
Глыбоцкага фітнес-трэнера і бодзібілдара Аляксандра Шарабайку затрымалі 13 сакавіка ў Глыбокім разам з жонкай Аленай. Затрымліваў Аляксандра Полацкі АМАП сумесна з глыбоцкай міліцыяй і невядомымі людзьмі ў цывільным адзенні, якія не прадставіліся.
Спачатку суддзя Глыбоцкага суда Андрэй Тарасевіч асудзіў Аляксандра Шарабайку на 10 сутак, а яго жонцы Алене прызначыў штраф 50 базавых (1850 беларускіх рублёў) па ч. 1 артыкула 24.23 КаАП. Аляксандра судзілі за каментары і лайкі, а Алену за фотаздымак з бел-чырвона-белым сцягам, які вісеў у іх на доме, у сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі”. Гэты здымак жанчына запосціла яшчэ задоўга да сумнавядомага 2020 года, бо нацыянальны сцяг на іх доме вісеў да гэтага шмат гадоў. Суддзя Андрэй Тарасевіч расцаніў гэта як адзіночны пікет без дазволу Глыбоцкага райвыканкама і пакараў жанчыну штрафам.
Алена Шарабайка ў дзень затрымання правяла разам з непаўнагадовай дачкой у міліцыі пяць гадзін, яе туды завёз участковы міліцыянт Уладзімір Казяк, а адпусцілі іх толькі ўвечары. А мужа жанчыны - Аляксандра Шарабайку - пасля 10 сутак адсідкі ў Глыбоцкім ІЧУ з 24 на 25 сакавіка этапавалі ў Віцебскі СІЗА-2.
Там яму прад’яўляюць абвінавачванне па частцы 1 артыкула 368 КаАП – абраза Аляксандра Лукашэнкі. Як аказалася, у Аляксандра засталося шмат нявыдаленай інфармацыі з яго каментарамі ў мабільным тэлефоне. Падчас затрымання сям’і Шарабайкаў у доме быў праведзены ператрус, і сілавікі забралі ўсе мабільныя тэлефоны. У тым ліку жонкі і дачкі.
Сям’я Аляксандра хацела наняць для Аляксандра адваката ў Віцебску, але ўсе яны адмовіліся, тлумачачы гэта тым, што баяцца і не жадаюць брацца за так званыя палітычныя справы. А глыбоцкія адвакаты так і сказалі, што гэта будуць выкінутыя грошы, бо па такіх справах нічога дамагчыся нельга. Таму жонка Алена пагадзілася на дзяржаўнага адваката.
Справу адкрылі, але пакуль з фітнес-трэнерам не вядуцца ніякія працэсуальныя дзеянні. У жонкі з ім яшчэ не было сустрэчаў, але перадачы для Аляксандра прымалі.
Зараз Аляксандр Шарабайка і сям’я мае патрэбу ў дапамозе і салідарнасці.
Падтрымаць Аляксандра грашовымі пераводамі, пасылкамі, тэлеграмамі можна па адрасе: СІЗА-2. Гагарына, 2, 210026, Віцебск, Шарабайка Аляксандр Міхайлавіч

**05.04.2023**
У спіс «экстрэмісцкіх матэрыялаў», складзены МУС, трапіў відэакліп да песні «2020» ураджэнца Полацку Ігара Палынскага. Ён вымушана жыве ў замежжы, а ў Беларусі тым часам толькі на працягу сакавіка былі прызнаныя «экстрэмісцкімі» ягоная старонка ВКонтакте і відэакліп да песні «Чэрці» ягонага аўтарства, выкананай полацкім гуртом «Sumarok» – яго таксама стварыў Ігар Палынскі.



У відэакліпе выкарыстаны кадры відэахронікі паслявыбарчых мірных пратэстаў супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Што да самой песні, то, паводле Ігара Палынскага, гэта прысвячэнне « усім творцам, якія не змаглі маўчаць – і апынуліся за кратамі», усім палітычным дзеячам, «пазбаўленым волі за любоў да Беларусі», «усім, хто спазнаў адміністратыўны і крымінальны пераслед за тое, што асмеліўся мець пазіцыю», «хто праз пагрозы быў вымушаны з’ехаць за мяжу і не мае магчымасці вярнуцца дамоў, але імкнецца наблізіць перамогу здаровага сэнсу ў Беларусі», прысвячэнне «журналістам, якія аказваюцца за кратамі проста таму, што робяць сваю работу, і ўсім медыя, хто ад 9 жніўня застаецца на баку дабра» і «рэквіем па Аляксандру Тарайкоўскаму, Мікіту Крыўцову, Раману Бандарэнку і ўсім загінулым падчас пратэстаў у Беларусі».

Ігар Палынскі кажа, што да 2020-га году натхнёна пісаў песні пра каханне і любоў, але пасля 2020г. гэта стала немагчымым: «апынулася пад забаронай любоў да сваёй краіны і яе жыхароў, імкненне да праўды і шчырасці, да міру без умоў і запужванняў» Таму песня «2020» – гэта яшчэ і «ода беларусам», якія не пабаяліся выйсці за праўду: «медыкам, рабочым «Гродна- Азоту» і іншых заводаў, спартсменам, акцёрам, блогерам, валанцёрам і ўсім беларусам, якія не апускаюць рукі».

**06.04.2023**

Беларуская праваабарончая супольнасць выступіла з заявай аб прызнанні яшчэ 17 чалавек палітычнымі зняволенымі. Сярод іх аршанец Віталь Рыжанскі, асуджаны да двух гадоў пазбаўлення волі па арт. 367 Крымінальнага кодэксу (Паклёп у дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь).

Віталь Рыжанскі быў затрыманы ў кастрычніку мінулага году, 10 студзеня над ім распачаўся суд, які праходзіў у закрытым рэжыме. Пасля абвяшчэння выраку мужчына чакае размеркавання ў папраўчую ўстанову ў віцебскім СІЗА-2.

Праваабаронцы лічаць пераслед і пазбаўленне волі Віталя палітычна матываваным, звязаным з мірнай рэалізацыяй выказвання меркавання. І патрабуюць вызвалення палітычных зняволеных.

**06.04.2023**

У Беларусі стала на 17 палітзняволеных больш, сярод іх двое глыбачанаў – Аляксандр Шарабайка і Аляксей Азарка.

Нагадаем, Аляксандр Шарабайка – вядомы фітнес-трэнер і бодзібілдар у Глыбокім быў затрыманы сёлета 13 сакавіка, адседзеў 10 сутак за лайкі і каментары ў сацыяльных сетках. А пасля на яго завялі крымінальную справу за абразу Аляксандра Лукашэнкі і этапавалі ў СІЗА -2 у Віцебск. Следчыя дзеянні пакуль з ім не праводзіліся.

Аляксея Азарку суд Глыбоцкага раёна 20 снежня 2022 года асудзіў паводле артыкула 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады). Мужчыну асудзілі за абразлівыя каментары ў тэлеграм-канале на адрас двух прадстаўнікоў улады. Спачатку яму прысудзілі два гады «хатняй хіміі» і штраф 60 базавых велічыняў (1920 рублёў).

Але пасля апеляцыйнага пратэсту пракурора Глыбоцкага раёна Ігара Валынца, якога, дарэчы, нядаўна звольнілі з гэтай пасады (магчыма, з-за грубага парушэння правілаў дарожнага руху), 7 сакавіка Віцебскі абласны суд адмяніў рашэнне суда Глыбоцкага раёна і змяніў Аляксею Азарку два гады «хатняй хіміі» на два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму і штраф 60 базавых велічыняў (1920 рублёў).

Цяпер у Беларусі налічваецца 1487 палітычных вязняў.

**06.04.2023**

Жонка зняволенага палітыка, Марына Адамовіч, напісала на сваёй старонцы ў Фэйсбуку, што ўжо 56 дзён не атрымлівае ад яго лістоў. Раней сувязь перарывалася, калі Мікалая Статкевіча каралі знаходжаннем у ШІЗА. Аднак цяпер жонка палітвязня не атрымлівае адказаў нават на лісты да адміністрацыі Глыбоцкай ПК 13, у якіх пытаецца, што здарылася з мужам.



«56 дзён я нічога не ведаю пра Мікалая Статкевіча Ні-чо-га. Усё напісанае падае ў цёмную задушлівую прорву. Ні гука, ні шавялення паветра. На маё афіцыйныя звароты адказу таксама няма. Верагодна, адзіны «закон», які дзейнічае, гэта -«іногда не до законов, » – піша Марына Адамовіч. Сябры ў Фэйсбуку падтрымліваюць жанчыну і спадзяюцца, што адсутнасць лістоў – гэта звыклы ціск на палітвязня і яго родных, а не прыкмета чагосьці кепскага.

У Глыбоцкай калоніі «Беразвечча» Мікалай Статкевіч адбывае тэрмін зняволення, прысуджаны па ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя масавых беспарадкаў). Паводле рашэння суду ад 14 снежня 2021г. ён асуджаны да 14 гадоў зняволення ў калоніі асаблівага рэжыму. У Глыбокае Мікалай

Статкевіч быў этапаваны ў чэрвені 2022г. Адміністрацыя папраўчай установы адразу паставіла яго на ўлік як схільнага да экстрэмізму, а ў ліпені пазбавіла рэжымнай перадачы і змясціла на 8 сутак у ШІЗА.5 жніўня 2022 г. Міколу змясцілі на паўгода ў адзіночную камеру, а ў верасні – у ШІЗА. 4 лістапада МУС уключыла палітвязня ў »Пералік асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці». У тым жа лістападзе 2022 г. палітвязень захварэў на пнеўманію і яго змясцілі ў лякарню. Ледзве акрыяўшы ад хваробы, летась у снежні чарговы раз трапіў у ШІЗА. Сёлета ў пачатку сакавіка 2023 г. жонка палітвязня паведаміла праваабаронцам, што ёсць затрымка ў ліставанні, і што да Мікалая Статкевіча не дапусцілі адваката.

**07.04.2023**

Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Міхаіл Юрчанка 27 сакавіка за захоўванне з мэтай распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі ў глабальнай кампутарнай сеткі «Інтэрнэт», уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, падвергнуў пакарання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту тэрмінам на 10 сутак віцебскага прадпрымальніка Канстанціна Буймова.
Справа была разгледжана без удзелу Канстанціна, хоць пра дзень і месца судовага паседжання ён быў апавешчаны належным чынам. Тым самым суддзя Юрчанка парушыў права «правапарушальніка» на абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў.
Сама справа была разгледжана судом аднабакова і не поўна, так як былі даследаваны толькі доказы, якія змяшчаюцца ў матэрыялах справы, якія былі дасланыя ў суд з аддзела ўнутраных спраў Першамайскага раёна Віцебска.
І гэтых доказаў было дастаткова, каб кваліфікаваць дзеянні Канстанціна Уладзіміравіча па ч.2 арт.19.11 КаАП як захоўванне з мэтай распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Вынікам судовага разбору стала пастанова суддзі падвергнуць Буйманова адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на тэрмін 10 сутак з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння, без канфіскацыі прыладаў і сродкаў здзяйснення праваvога правіны.

**08.04.2023**



Улады працягваюць яго ўтрымліваць у няволі, не гледзячы на тое, што Ігар мае сур'ёзныя праблемы са здароўем.
Былы выкладчык Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а пасля супрацоўнік Музея беларускага кнігадрукавання быў затрыманы падчас аблавы ў Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, пад якую патрапілі амаль два дзясяткі чалавек.
Людзей затрымлівалі мэтанакіравана па спісах і адрасах. Сярод іншых, пад рэпрэсіі патрапіла кіраўніцтва чатырох музеяў, якія ўваходзяць у склад Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка. Адначасова затрыманні вяліся сярод гармадска-палітычна актыўных людзей Наваполацка.

**08.04.2023**

Суддзя суда Аршанскага раёна і Оршы Юлія Вяршыніна 24 сакавіка за распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў у сацыяльнай сетцы Facebook аштрафавала на 925 рублёў начальніка аховы працы і прамысловай бяспекі РУП Віцебскай філіі «Аршанская ЦЭЦ» Кацярыну Паўтарацкую.
Рашэнне суддзя грунтуецца на матэрыялах адміністрацыйнай справы, якая паступіла ў суд з Аршанскага аддзялення міліцыі.
У міліцэйскім пратаколе паведамлялася, што правапарушальніца з выкарыстаннем прыналежнага ёй мабільнага тэлефона ў глабальнай кампутарнай сетцы Інтэрнэт, у СС Facebook у сваім акаўнце захоўвала ў адчыненым доступе з мэтай распаўсюджвання інфармацыйную прадукцыю, якая занесеная ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Нягледзячы на змякчальныя абставіны - наяўнасць на ўтрыманні малалетняга дзіцяці і прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці ўпершыню, суддзя Вяршыніна пакарала Паўтарацкую штрафам у памеры 25 б.в., у межах санкцыі прадугледжаных ч.2 арт.19.11 (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі , якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць) КаАП Рэспублікі Беларусь.

**08.04.2023**

Пра тое, што такую інфармацыю агучыў міліцыянт, які прыходзіў да яе дадому 10 красавіка, паведаміла ў Фэйсбуку жыхарка Віцебску Тамара Ільіна. У студзені 2021 года яе затрымалі ў прыгарадным

Шпілёўскім лесе разам з яшчэ шасцю жанчынамі і абвінавацілі ў несанкцыянаваным пікетаванні. Спадарыні выйшлі папрактыкавацца ў скандынаўскай хадзе, але апынуліся ў пастарунку. Іх 8 гадзінаў трымалі пад вартай без ежы і магчымасці прыняць лекі, нягледзячы на тое, што палова затрыманых віцяблянак была ўжо ў пенсійным веку... Пасля гэтага выпадку пенсіянерка Тамара Ільіна трапіла ў нейкі «спіс», паводле якога міліцыянты ладзяць свае рэйды.

«Супрацоўнік міліцыі сказаў, што тэрмін даўніны правапарушэння прайшоў, але я ў іх на ўліку. На пытанне, на якой падставе, адказаў «па законе». Па якім, так і не агучыў», -- напісала спадарыня Тамара.

Пра візіты міліцыянтаў у Фэйсбуку распавядаюць і іншыя жыхары Віцебску. Некаторым з іх ўручылі позвы на прафілактычную гутарку ў пракуратуру. Некаторых распытвалі, чым яны займаюцца, дзе працуюць, за якія сродкі жывуць, хто пражывае ў кватэры разам з імі.

Супрацоўнікі міліцыі падчас наведванняў часта называюць сябе ўчастковымі, хаця людзі адзначаюць, што раней такіх службоўцаў на сваіх участках не сустракалі. Працуючы па адмысловых «спісах», яны часта агучваюць памылковую інфармацыю, якая, імаверна, захоўваецца ў РАУСах. Так, вядомы гарадскі актывіст Максім Жукаў распавёў у Фэйсбуку, што міліцыянт прыгадваў яму артыкул 19.10 КаАП (Прапаганда або публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюд нацысцкай атрыбутыкі), хаця ні ў чым падобным актывіст не быў абвінавачаны. Але быў асуджаны паводле 23.34 КаАП у жніўні 2020г.

«Прымусіў яго паправіць пратакол, ён у сваю чаргу папярэдзіў мяне аб супрацьпраўных дзеяннях і хуценька збег. 10 красавіка а 14:15 сустрэча з пракурорам», -- напісаў Максім Жукаў.

**09.04.2023**

Вярхоўны суд 9 лютага прыняў рашэнне ліквідаваць грамадскае аб'яднанне "Беларуская ветэрынарная асацыяцыя". Ініцыятарамі знішчэння чарговай недзяржаўнай некамерцыйнай структуры сталі чыноўнікі з Упраўлення па пытаннях некамерцыйных арганізацый Міністэрства юстыцыі.

Арганізацыя, у якую ўваходзіла больш за паўтары тысячы айчынных ветэрынараў, праіснавала ў статусе зарэгістраванай ГА без малога 29 гадоў. З 1995 года яна была прынята ў якасці паўнапраўнага члена Сусветнай ветэрынарнай асацыяцыі.

Узначальваў асацыяцыю доктар ветэрынарных навук, прафесар, загадчык кафедры эпізааталогіі Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны Ўладзімір Максімовіч.

Ветэрынарная арганізацыя аб'ядноўвала па сваёй краіне ветэрынарных спецыялістаў, кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і ветэрынарных арганізацый, камерцыйных структур, вучоных і выкладчыкаў ветэрынарных дысцыплін ВНУ і ССНУ, НДІ, студэнтаў і навучэнцаў.

У Мінску, абласных і раённых гарадах былі створаны дзясяткі пярвічныя арганізацыі БелВА, якія прымалі актыўны ўдзел у рабоце ГА, аказвалі пасільную матэрыяльную дапамогу для стварэння спецыяльнага фонду і правядзення розных мерапрыемствах, у тым ліку і для правядзення ў канцы 90-х Першага Ветэрынарнага кангрэса Рэспублікі Беларусь.

**10.04.2023**



Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 27 сакавіка пакарала буйнымі штрафамі беспрацоўную Тамару Масленік і швачку Людмілу Лазоўскую адпаведна на 740 і 555 рублёў. Падставай для такога рашэння сталі пратаколы, якія паступілі ў суд з РАУС Міёрскага райвыканкама.

Паводле матэрыялаў адміністрацыйнай справы Масленік выкарыстоўваючы сетку Інтэрнэт, у сваім асабістым профілі, адкрытым для агляду неабмежаванага кола асоб, у сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” размясціла і захоўвала з мэтай распаўсюджвання інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

На падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП суддзя Яскевіч пастанавіла аштрафаваць Масленік на 740 руб. За тыя самыя дзеянні тая ж суддзя аштрафавала Лазоўскую на суму, роўную 555 руб.

Суд пастанавіў вярнуць пакараным жанчынам мабільныя тэлефоны, якія былі забраныя падчас агляду месцаў здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння.

**10.04.2023**

Былога работніка мытні і актывіста Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Грамада", які паходзіць з Дуброўна Віцебскай вобласці Мікалая Куляшова затрымалі ў верасні 2022 года.

У фільме АНТ Мікалая Куляшова называлі "правадыром" для палітвязняў пры перасячэнні беларуска-літоўскай мяжы. Таксама гаворыцца, што ён супрацоўнічаў з некамерцыйнай арганізацыяй "Дапамога", якая дзейнічае ў Літве і дапамагае палітычным уцекачам.

Сама ж "Дапамога" была прызнаная "экстрэмісцкім фармаваннем" па рашэнні КДБ 12 кастрычніка 2022 года. У спіс уключылі прозвішчы палітзняволеных Аніту Бакуновіч і Мікалая Куляшова.
Мікалая судзілі паводле чатырох артыкулах Крымінальнага кодэкса: ч. 1 арт. 14 і ч. 3 арт. 371 (замах на наўмыснае незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы, здзейснены арганізаванай групай), ч. 3 арт. 361-1 КК (удзел у экстрэмісцкім фармаванні), арт. 378 (крадзеж асабістых дакументаў) і ч. 1 арт. 14 і ч. 2 арт. 380 (замах на падробку і выраб або збыт падробленых дакументаў). Суддзя яму прызначыў пяць гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

**10.04.2023**
Кандыдата філасофскіх навук асудзілі другі раз запар: 8 красавіка ён меўся выйсці на волю пасля першага арышту, прысуджанага паводле арт. 19.11 КаАП (распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў), але так і не выйшаў з-за кратаў. Паводле звестках праваабаронцаў, другі арышт яму прысуджаны за так званае пікетаванне ў інтэрнэце – за «аватаркі» у сацыяльных сетках. Суд Полацку і Полацкага раёну асудзіў яго на 13 сутак.
Былы выкладчык Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту, а пасля супрацоўнік Музею беларускага кнігадрукавання Ігар Бортнік быў затрыманы 29 сакавіка ў ліку больш як дзясятка супрацоўнікаў Полацкага гісторыка-культурнага музею-запаведніка. Дома ў Ігара Бортніка прайшоўператрус, міліцыянты забралі аргтэхніку.
Суду былі прадстаўлены медычныя дакументы, што навуковец мае сур'ёзныя праблемы са здароўем: Ён перанёс аперацыю па лячэнні міжпазванковай грыжы. Яна была не вельмі ўдалай, і спадар Бортнік не можа працяглы час сядзець альбо стаяць. Суд не прыняў гэта да ўвагі, хаця санкцыі адміністрацыйных артыкулаў дазваляюць абмежавацца штрафам і не змяшчаць не зусім здаровага чалавека ў ІЧУ, дзе ўмовы ўтрымання «палітычных» надзвычай суровыя і часам набліжаныя да незаконных катаванняў.

**12.04.2023**
Такое пакаранне вынесла суддзя суда Віцебскага абласнога суда Галіна Бондал у дачыненні 27-гадовага жыхара Воршы палітвязня Яраслава Казакевіча, абвінавачанага ў садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці паводле ч. 1 арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса.



Згодна з матэрыяламі справы, абвінавачаны ў 8 гадзін 8 снежня 2022 года на чыгуначным вакзале станцыі «Орша-Цэнтральная» з выкарыстаннем мабільнага тэлефона вырабіў відэафайл, на якім быў зафіксаваны эшалон з расійскай ваеннай тэхнікай.
Затым Казакевіч, знаходзячыся ў вагоне цягніка рэгіянальных ліній, распаўсюдзіў праз сетку Інтэрнэт відэаролік у Telegram-канале, інфармацыйная прадукцыя якога раней была прызнана судом экстрэмісцкімі матэрыяламі.
Літаральна на наступны дзень, 9 снежня, Яраслаў быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і судом Аршанскага раёна арыштаваны на 15 сутак за выраб і распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў (арт. 19. 11 КаАП). На волю ён болей не выйшаў.
Падчас допыту ў Аршанскім міжраённым аддзеле Следчага камітэта падазраваны распавёў следчаму, што падпісаны на розныя экстрэмісцкія Telegram-каналы, бачыў публікацыі з падобнымі відэа і фатаграфіямі. Калі заўважыў вайсковую тэхніку, зняў яе на мабільны тэлефон, і ўжо ў цягніку адправіў відэа “экстрэмістам”.
З улікам прадстаўленых дзяржаўным абвінаваўцам доказаў судовая калегія па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду пастанавіла прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін два гады з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

**12.04.2023**
Адпаведнае рашэнне прыняў 11 красавіка Наваполацкі гарадскі суд. Ігар Супранёнак знаходзіцца за кратамі з 29-га сакавіка: яго затрымалі ў той саму дзень, калі сілавікі зладзілі аблаву на супрацоўнікаў Полацкага гісторыка-культурнага музея- запаведніка. У фатографа правяліператрус, забралі мабільны тэлефон. Першыя 15 сутак арышту, пасля якіх ён так і не выйшаў на волю, спадару Супранёнку прысудзілі за распаўсюд так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў.
Праваабаронцы мяркуюць, што другі арышт наваполацкаму фатографу маглі прысудзіць паводле арт. 24.23 КаАП – за аватаркі ў сацыяльных сетках.
Ігар Супранёнак вядомы ў рэгіёне майстар фатаграфіі, фотаздымкамі Полацку і Наваполацку займаўся яшчэ ягоны бацька, таму ў сямейным архіве вельмі шмат каштоўных фотавыяваў Полаччыны. Працы Ігара Супранёнка экспанаваліся на розных фотавыставах, апрача гэтага ён цікавіцца фотатэхнікай і

сабраў вялікую калекцыю фотаапаратаў. Есць у ёй і фотаапарат, якім рабіў здымкі яшчэ ягоны бацька, у мінулым фотакарэспандэнт наваполацкай газеты «Хімік». Фатографу Ігару Супранёнку прысудзілі другі арышт запар, як і супрацоўніку Полацкага гісторыка-культурнага музея- запаведніка, кандыдату філасофскіх навук Ігару Бортніку. 29 сакавіка ён быў асуджаны да 10 сутак арышту паводле артыкула 19.11 КаАП, а 10-га красавіка суд Наваполацку асудзіў яго яшчэ на 13 сутак паводле артыкула 24.23 КаАП (Парушэнне арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў).

**13.04.2023**
Суддзя суда Полацкага раёна і Полацка Віктар Баліка 31 сакавіка на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП аштрафаваў на 1110 рублёў 33-гадовую Кацярыну Шчукіну. У сувязі з тым, што яна беспрацоўная, судзьдзя не зьняў арышт з мабільнага тэлефона Шчукінай накладзены для забесьпячэньня выплаты штрафу.
Згодна з пратаколу, які паступіў з Полацкага РАУС, Шчукіна, выкарыстоўваючы свой тэлефон, размясціла і захоўвала ў адкрытым доступе ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» на асабістай старонцы з назвай «Кацярына Крывец» інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Суддзя Баліка палічыў доказанымі факты таго, што правапарушальніца 18 лютага 2021 года размясціла публікацыю з інтэрнэт-старонкі сацыяльнай сеткі "УКантакце" з назвай "STOP LUKA", а таксама 24 лютага 2022 года ў сацыяльнай сетцы "УКантакце" з назвай "Рух". І расцаніў гэтыя дзеянні як распаўсюджванне інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжаньні Шчукіна сваю віну ў зьдзяйсьненьні адміністрацыйнага правапарушэньня не прызнала, тым не меньш за публікацыі на «экстрэмісцкіх» СМІ палачанка атрымала штраф у 30 б.у.

**14.04.2023**


Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 4 красавіка пастанавіла за распаўсюджванне «экстрэмісцкіх» публікацый у сацыяльнай сетцы Інстаграм падвергнуць адміністрацыйнаму арышту тэрмінам на сем сутак жыхара Міёра Яўгена Бурака, які працуе абвальшчыкам мяса на мясцовым мясакамбінаце.
Згодна з пратаколам, які паступіў у суд з аддзялення міліцыі, Яўген, у асабістым профілі, адкрытым для агляду 306 падпісчыкам, у сацыяльнай сетцы Інстаграм размясціў і захоўваў з мэтай распаўсюджвання інфармацыйную прадукцыю ўключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым пасяджэнні Бурак растлумачыў, што не аспрэчвае факта знаходжання ўказанай у пратаколе інфармацыйнай прадукцыі, аднак названую інфармацыю з мэтай распаўсюджвання не захоўваў і не размяшчаў, падпіску ажыццявіў у 2020 годзе, калі дадзеная інтэрнэт-старонка не была прызнана экстрэмісцкай.
Суддзя Яскевіч, ацаніўшы сабраныя па справе доказы, прыйшла да высновы, што віна правапарушальніка пацвярджаецца тлумачэннямі і пісьмовымі матэрыяламі справы. Г.зн. у дзеяннях Бурака ёсць усе прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага ч.2 арт.19.11 КаАП, а менавіта ў захоўванні з мэтай распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

**14.04.2023**
Юрыя Касцюка для якога гэтае пакаранне ёсць ўжо другі “палітычны” тэрмін. Першы раз яго судзілі за сарваны чырвона-зялёны сцяг. Тады Юрыю далі адзін год "хіміі", але потым змянілі рэжым і накіравалі ў калонію.
У студзені 2022 года Юрый быў вызвалены. А ўжо 15 лютага зноў арыштаваны па іншай справе, праўда, больш чым на адміністратыўку тады "накапаць" не змаглі.
Праз некаторы час пасля другога вызвалення Юрый выехаў у Расію, а ў гэты час на яго завялі новую крымінальную справу. Ён быў затрыманы ў Расіі, доўгі час расейскія ўлады вырашалі ці эстрадаваць Касцюка ў Беларусь, дайшло да таго, што Юрый парэзаў сабе жывот на знак пратэста супраць экстрадыцыі.
У Беларусі палітвязня пачалі судзіць 10 студзеня 2023 г. Справу разглядае суддзя суда Святлана Крэмянеўская.
У судзе стала вядома пра тое, што Юрый дапамагаў іншым палітвязням: папрасіў знаёмых адкрыць

польскую банкаўскую картку, куды атрымліваў грошы ад BYSOL і By_help, якія пасля накіроўваў сваякам палітзняволеных.
Грошы на дапамогу атрымліваў ад "арганізацый, якія пазіцыянавалі сабе як праваабарончыя". Гэтыя дзеянні кваліфікаваныя як садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці паводле ч. 1 арт. 361-4 КК.
13 студзеня 2023 года Юрыя Касцюка прызналі вінаватым і асудзілі да чатырох гадоў зняволення ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

**15.04.2023**
Як стала вядома, падчас так званай зачысткі АМАПам глыбоцкіх актывістаў напрыканцы сакавіка была асуджаная глыбачанка Кіра Кісялёва. Суд над ёй адбыўся 20 сакавіка ў Глыбокім.
Кіру Кісялёву судзіў суддзя Глыбоцкага суда Андрэй Тарасевіч за адміністрацыйнае правапарушэнне па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП за тое, што яна ў сацыяльнай сетцы “Одноклассники” размясціла сюжэт тэлеканала “Белсат”, прадукцыя якога ўключаная ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Згодна пастанове суда, падчас судовага пасяджэння жанчына віну прызнала.
Суддзя Андрэй Тарасевіч пакараў глыбачанку штрафам памерам 25 базавых велічынь, што складае 925 рублёў з часовым арыштам сродка ўчынення названага парушэння - мабільнага тэлефона. Амаль праз месяц тэлефон ёй аддалі.
Кіра Кісялёва падавала скаргу на прысуд Суда Глыбоцкага раёна ў Віцебскі абласны суд, але суддзя Святлана Іванова 9 красавіка яе скаргу не задаволіла і пакінула пастанову Глыбоцкага суда ў сіле. І, як даведалася пазней жанчына, аказваецца яе судзілі па частцы 1 артыкула 24.23 ч. (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў), а не па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюджванне інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, а таксама выраб, выданне, захоўванне або перавозка з мэтай распаўсюджвання такой інфармацыі), як напісана ў пастанове Глыбоцкага суда.
І хоць жанчыну гэта вельмі здзівіла, але ў дадзеным выпадку мала што мяняецца – штраф усё адно трэба выплачваць.

**15.04.2023**
13 красавіка жанчыну аштрафавалі на 1110 рублёў, прызнаўшы вінаватай у распаўсюдзе так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. Нібыта яна ў сацыяльнай сетцы «Одноклассники»у групе «Гісторыя Воршы ў фотаздымках» размясціла «экстрэмісцкія» матэрыялы. За колькі дзён да здарэння Ларыса Станкевіч прасіла дапамогі ў мужа, бо не магла зайсці на сваю старонку ў сацыяльнай сетцы – відавочна, яе ўзламалі... Гісторыю затрымання жонкі і суду над ёй Георгі Станкевіч апісаў на мясцовым рэгіянальным сайце, які ён адмініструе. Канец аповеду скрушны: пасля таго, што давялося перажыць жанчыне ў Бешанковіцкім РАУС, дактары выявілі ў яе праблемы з сэрцам.



Паводле Георгія Станкевіча, затрыманне адбылося 12 красавіка, і ноч перад судом жанчына, якая мае праблемы са здароўем, мусіла правесці пад вартай. Судзілі Ларысу Станкевіч бліжэй да вечара 13 красавіка, аргументаў пра тое, што старонка была ўзламаная, суд не ўлічыў. «Мая жонка – чалавек апалітычны. Яна нават не заходзіць на сайт, які вяду я. У яе сваё кола інтарэсаў», – піша паэт і бард. На думку Георгія Станкевіча, які не хавае сваёй грамадзянскай пазіцыі, пераслед жонкі – гэта помста яму асабіста за працу на сайце, дзе друкуюцца неафіцыйныя навіны рэгіёну. Неўзабаве пасля пачатку вайны ва Украіне спадар Георгі размясціў на сваім рэсурсе антываенны «Зварот да жыхароў Бешанковіцкага раёне», які прыцягнуў увагу міліцыянтаў. «Мая справа закончылася тым, што мяне абвінавацілі ў пікеце пад бел-чырвона-белым сцягам і прысудзілі штраф у памеры 2420 беларускіх рублёў», – прыгадвае Георгі Станкевіч. І зазначае, што іншых прэтэнзій да яго ў сілавікоў быць не можа: «Мяне не могуць абвінаваціць у тым, што я выходзіў на пратэсты супраць фальсіфікацыі выбараў. Я гэта не рабіў аніводнага разу. А таму ўсе наезды магу разглядаць толькі як барацьбу з іншадумствам і як парушэнне нашай Канстытуцыі, якая гарантуе мне свабоду маёй думкі». Тое, што здарылася з ягонай жонкай, Станкевіч лічыць правакацыйнымі захадамі супраць яго самога. І звяртае ўвагу на тыя акалічнасці, якія давялося перажыць 62-гадовай жанчыне: «Яе трымалі ноч у халодным пакоі, дзе пастаянна гарэла святло. Праз дзве ці тры гадзіны распраналі дагала, надзявалі на рукі кайданкі і выводзілі ў калідор для вобшуку. У тых жа кайданках і на ланцугу, як небяспечнага злачынцу яе прывялі ў залу суду». Такое абыходжанне ўразіла нават суддзю Наталлю Рэут, якая загадала міліцыянтам зняць з жанчыны кайданкі, заўважыўшы перавышэнне паўнамоцтваў. Назаўтра пасля суду жанчыну давялося везці ў больніцу, дзе дактары паставілі дыягназ: «падазрэнне на інфаркт»

**15.04.2023**




13 красавіка ў «Панараме» – публіцыстычнай передачы канала «Беларусь 1» быў паказаны сюжэт пад назвай «Как вливают средства на раскачку Беларуси в регионах и за сколько готовы продать Родину?» У якасці адмоўнага героя, «прадстаўніка «старой апазіцыі», гледачам прадставілі Леаніда Гаравога – актывіста з Гарадка, сябра БСДП Грамада і руху «За свабоду». У відэасюжэце былі выкарыстаны здымкі допыту спадара Гаравога, якога затрымалі 15 сакавіка і асудзілі на 15 сутак арышту. Таксама ў «Панараме» паказалі, як спадара Леаніда, ужо сівога чалавека ў пенсійным узросце, двое мажных міліцыянтаў цягнуць у пастарунак.

Пяціхвілінны сюжэт прысвечаны старой тэме «грантаў, якія атрымлівае апазіцыя». Гэта падаецца як адмоўная з'ява, хаця замежныя гранты дзесяцігоддзямі атрымліваюць і дзяржаўныя структуры. Леаніда Гаравога ў «Панараме» выставілі як аматара "зялёных паперак", які на замежныя сродкі займаўся выдавецтвам незалежнай рэгіянальнай прэсы. Прычым сам спадар Гаравы, адказваючы на пытанні сілавікоў пра сваю датычнасць да выдавецкай дзейнасці і знаёмствы з прадстаўнікамі замежных арганізацый, вельмі годна тлумачыць сваю пазіцыю – што падобныя арганізацыі працуюць з людзьмі па ўсім свеце, і што навучальныя семінары, на якія ён быў запрошаны, прысвячаліся праблемам мясцовага самакіравання, а не «падрыўной дзейнасці», у якой яго вінавацяць.

Паколькі ніякай сенсацыі выціснуць з аповедаў актывіста не атрымалася, журналістка Марына Раманоўская дадае ад сябе пра тое, што шматтысячныя гранты ад амерыканскіх фондаў спадар Гаравы атрымліваў «за любоў да замежжа», а грошы атрымліваў у Польшчы. А далей разважае пра прадажнасць апазіцыі, хаця актывіст адкрыта гаворыць падчас допыту: «Я не па грошы ў гэта палез, а дзеля таго, каб у Беларусі паўстала дэмакратыя».

Што да выданняў, пра якія распавядае журналістка дзяржаўнага тэлебачання, то ў відэасюжэце фігуруе інтэрнэт-старонка гарадоцкага выдання «Гасцінец» і неназваныя інтэрнэт-сайты, якія функцыянуюць дзякуючы «знешняй падтрымцы». Сказаць пра іх спадарыні Раманоўскай, уласна, няма чаго, бо «артыкулы там у асноўным пра прыроду і надвор'е, на гістарычную тэматыку», але «не-не, дый праскочыць патрэбная замежным гаспадарам тэма» – дэструктыў, каб ачарніць светлую і паспяховую беларускую рэчаіснасць.

Яшчэ адна асоба, якая згадваецца ў відэасюжэце, – гэта журналіст Яраслаў Іванюк, якога аўтарка аповеду называй «звяном па распіле валюты», і падкрэслівае, што ён «этнічны паляк», і што справаздачы Леаніда Гаравога ён адпраўляў кудысьці, дзе «прасочваецца след польскіх спецслужб», якія імкнуцца «раскачаць Беларусь».

У сюжэце з «Панарамы» фігуруе дакумент, дзе гаворыцца пра суму 56 з лішнім тысяч даляраў, выдатканых на развіццё рэгіянальных сайтаў і газет. Марына Раманоўская робіць высновы – маўляў, калі такія сумы атрымлівае чалавек у райцэнтры, то маштабы падтрымкі апазіцыйнай дзейнасці ў абласных гарадах, а тым больш у Мінску, куды большыя. Зрэшты, гэта ўсяго толькі прыватныя меркаванні аўтаркі відэасюжэту, якая не шкадуе здзеклівых выразаў і інтанацый, распавядаючы пра Леаніда Гаравога. А напрыканцы яшчэ й запалохвае суайчыннікаў, што дадзеныя ўсіх актывістаў вядомыя сілавым структурам, і калі да кагосьці яшчэ не прыйшлі, то «усяму свой час».

**15.04.2023**

Былую дырэктарку Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, а цяпер загадчыцу экспазіцыйнага аддзелу Тамару Джумантаеву затрымалі 29 сакавіка ў ліку іншых музейных супрацоўнікаў, якія трапілі пад міліцэйскі «хапун». У той самы дзень кандыдатку мастацтвазнаўства асудзілі да 15 сутак арышту паводле артыкула 19.11 КаАП за распаўсюд так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў – за перадрук у сацыяльных сетках матэрыялаў з інтэрнэт-рэсурсаў, прызнаных «экстрэмісцкімі». Пакуль жанчына знаходзілася пад вартай, яе звольнілі.

Тамара Джумантаева даведалася пра гэта, калі выйшла з-пад арышту 13 красавіка. У той самы дзень на волю выйшлі яшчэ двое супрацоўнікаў полацкай музейнай сістэмы, якіх са спадарыняй Джумантаевай затрымалі і асудзілі ў адзін дзень.Усяго за 29 і 30 красавіка міліцыянты затрымалі больш за 10 жыхароў Полацку і Наваполацку, якія працавалі ў музеі-запаведніку або супрацоўнічалі з ім. Вядома, што ва ўсіх затрыманых дома былі праведзены ператрусы, у іх забралі аргтэхніку і мабільныя тэлефоны. Двое затрыманых застаюцца зняволенымі і дагэтуль: іх асудзілі па другім разе пасля адбыцца першага прысуджанага арышту. Гэта супрацоўнік музея-запаведніка, навуковец, кандыдат філасоф-

скіх навук Ігар Бортнік (першы арышт 10 сутак, другі 13 сутак) і наваполацкі фатограф Ігар Супранёнак (першы арышт 15 сутак, другі 13 сутак).

**16.04.2023**
20 сакавіка суддзя Глыбоцкага раённага суда Людміла Вашчанка аштрафавала настаўніцу-дэфектолага, маці дваіх непаўнагадовых дзяцей Алену Белую.



Яе судзілі за адміністрацыйнае правапарушэнне, прадугледжаным ч.1 арт.24.23 КаАП (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) – даволі распаўсюджаны артыкул, які прымяняюць зараз улады Беларусі ў дачыненні да прыстойных людзей.
Жанчыну абвінавацілі ў парушэнні парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў без атрымання адпаведнага дазволу Глыбоцкага райвыканкама. Алена быццам правяла адзіночнае пікетаванне з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў, якое выказалася ў тым, што яна размясціла ў сацыяльнай сеткі”Фэйсбук” публікацыі з выявай стужкі бела-чырвона-белага колеру, надпісы: "Дзень Волі", "25 Сакавіка".
На судовае пасяджэнне, паводле звестак з суда, жанчына не з’явілася, але яе ўсё адно судзілі і пакаралі штрафам памерам 70 базавых велічынь, што складае 2590 рублёў.
Алена Белая трапіла пад зачыстку сілавікоў, якая праходзіла ў Глыбокім напрыканцы сакавіка і працягваецца цяпер. Як стала вядома, яе імя ўваходзіла ў так званыя “чорныя спісы”, згодна з якімі цяпер караюць людзей, якія калісьці выказвалі сваю грамадскую пазіцыю і былі нязгодныя з рэпрэсіўнымі дзеяннямі ўлады.
Некаторым людзям з гэтага спісу даюць штрафы, суткі, а некаторых увогуле звальняюць ці нават заводзяць на іх крымінальныя справы. Іншых прымушаюць на працы падчас так званых прафілактычных гутарак пакаяцца за тое, што яны выказвалі адкрыта сваю грамадскую думку ці ўдзельнічалі ў акцыях пратэсту, а пасля ўжо чыноўнікі разам з сілавікамі вырашаюць, пакінуць іх на працы ці не.

**17.04.2023**
Пра гэта стала вядома навінаваму рэсурсу «Позірк» ад крыніцы, якая прасіла не называць сваіх дадзеных. Бортніка і Супранёнка перавялі ў віцебскі следчы ізалятар падчас адбыцця арыштаў, прычым для кожнага з іх гэта быў другі запар арышт, прысуджаны па адміністрацыйных справах. За краты мужчыны трапілі ў выніку міліцэйскага хапуну 29 і 30 сакавіка, калі былі затрыманыя 11 былых і цяперашніх супрацоўнікаў Полацкага музея- запаведніка. Ва ўсіх правяліператрусы, забралі кампутары і мабільныя тэлефоны, а пазней асудзілі па адміністрацыйных справах. Як стала вядома праваабаронцым, загадчыца экспазіцыйнага аддзелу Тамара Джумантаева была звольнена падчас адбыцця прысуджанага арышту.
Ігар Супранёнак, вядомы ў рэгіёне фатограф і краязнаўца, першы раз быў асуджаны да 10 сутак арышту, меркавана, паводле артыкула 19.11 КаАП – за распаўсюд матэрыялаў, прызнаных экстрэмісцкімі. 11 красавіка, не выйшаўшы на волю, ён быў арыштаваны яшчэ на 15 сутак. Па якім артыкуле КаАП яго судзілі, пакуль невядома.
Кандыдат філасофскіх навук Ігар Бортнік таксама першы раз быў асуджаны да 10 сутак арышту, але на волю пасля адбыцця гэтага тэрміну ён не выйшаў. Яго асудзілі другі раз, пакараўшы арыштам яшчэ на 13 сутак. Справы абодвух, і Бортніка, і Супранёнка, разбіраў Наваполацкі гарадскі суд.

**19.04.2023**
Віцебская відэаблогерка Алена Янушкоўская набыла шырокую вядомасць, стварыўшы відэаканал «Настоящая Беларусь», дзе паказвала хібы мясцовага жыцця насуперак «прыгожай карцінцы», якую паказваюць на беларускім тэлебачанні. Паралельна яна стварыла групы ў розных сацыяльных сетках, каб інфармаваць найбольшую колькасць сваіх падпісчыкаў. Цяпер група ў «Одноклассниках» пад назовам «Елена Янушковская НАСТОЯЩАЯ БЕЛАРУСЬ» залічана ў спіс экстрэмісцкіх інфармацыйных матэрыялаў.
Выклаўшы ў інтэрнэт першыя відэазапісы, Алена Янушкоўская запрасіла Аляксандра Лукашэнку прыехаць у сваю вёску Суйкава Віцебскага раёну, чым выклікала захапленне гледачоў. Пазней, падчас апошняй прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, відэаблогерка вяла стрымы са збору подпісаў за незалежных кандыдатаў і з мірных пратэстаў у жніўні-верасні 2020г. За гэта яе неаднаразова судзілі па адміністрацыйных справах і каралі «суткамі» арыштаў, падчас якіх у жанчыны абвастрыліся праблемы са здароўем.

Відэаблогерка была вымушана з“ехаць з Беларусі. У лістападзе 2021г. жанчыну абвясцілі ў вышук, правёўшы некалькі ператрусаў па месцы беларускай рэгістрацыі. Супраць яе распачатая крымінальная справа за абразу Аляксандра Лукашэнкі.

**21.04.2023**



Праваабаронцам не вядома, якое пакаранне прызначыў Ірыне Лесьнічэнка Вушацкі раённы суд, але жанчына спрабуе абскардзіць пастанову суду першый інстанцыі. Пасяджэнне ў Віцебскім абласным судзе прызначана на 3-га траўня. Таксама не вядома, ці пакінулі спадарыню Ірыну на працы: апошнім часам было вельмі шмат прэцэдэнтаў, калі настаўнікаў, асуджаных паводле арт. 19.11 КаАП, неўзабаве змушалі звольніцца «па ўласным жаданні» пад пагрозай звальнення «за прагулы», калі пакараннем быў арышт, або за неадпаведнасць пасадзе настаўніка.

Што да апошняга, то праца настаўніцы Ірыны Уладзіміраўны Леснічэнка заўсёды заслугоўвала толькі станоўчыя водгукі. «За яе плячыма амаль тры дзясяткі вучэбных сезонаў і сотні школьнікаў, якім яна прывівае любоў да роднага слова. Яе навучэнцы паказваюць высокія вынікі на цэнтралізаваным тэсціраванні, становяцца пераможцамі навукова-практычных канферэнцый, конкурсаў даследчых работ. Кожны ўрок Ірыны Уладзіміраўны – у пэўным сэнсе адкрыццё. Яна не абмяжоўваецца “сухім” матэрыялам падручнікаў – заўсёды знаходзіць штосьці цікавае, што развівае культуру, адукаванасць дзяцей, выкарыстоўвае ў рабоце сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі», - так пісала пра настаўніцу вушацкая раённая газета «Патрыёт» з нагоды размяшчэння яе фотаздымка на Раённай дошцы гонару па выніках працы 2019г.

**21.04.2023**

Палітзняволенага анархіста Яўгена Рубашку, які родам з Глыбокага, пераводзяць на турэмны рэжым. Нядаўна адміністрацыя бабруйскай папраўчай калоніі № 2 змясціла Яўгена ў памяшканне камернага тыпу на месяц. Перад гэтым яго тройчы па надуманых прычынах змяшчалі ў ШІЗА. Усяго ён там правёў 24 дні.

19 красавіка ў Бабруску прайшоў суд па замене Яўгену рэжыму ўтрымання і перавод на турэмны рэжым. Рашэнне прыняў суддзя Антон Дудаль.

Нагадаем, Яўгена Рубашку асудзілі да пяці гадоў пазбаўлення волі 22 красавіка 2022 года. Тады суд прызнаў чатырох анархістаў вінаватымі паводле ч. 1 арт. 342 КК (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) і ч. 3 арт. 361-1 КК (стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім) і прызначыў Аляксандру Бялову, Яўгену Рубашку, Арцёму Дзмітрыевічу Салаўю — па пяць гадоў калоніі, Арцёму Сяргеевічу Салаўю — 4,5 года калоніі.

**21.04.2023**

Пра гэта ўскосна сведчаць тыя факты, што ад палітвязняў ужо доўгі час няма лістоў. Ліставанне са штрафнога ізалятару забароненае. Атрымаць пацверджанне гэтага ўдалося толькі наконт Максіма Знака: адміністрацыя калоніі «Віцьба -3» паведаміла ягонай жонцы і адвакатцы Надзеі, што палітвязень насамрэч утрымліваецца ў ШЫЗА. Пра гэта піша "Рыдыё свабода".

Жонцы Мікалая Статкевіча з глыбоцкай калоніі №13 увогуле не адказалі нічога. Няма адказу і з Дэпартаменту выканання пакаранняў. Практычна столькі ж – амаль паўтара месяцы – сям“я не атрымлівае лістоў ад Максіма Знака . Апошні допіс ад яго прыйшоў 9 лютага. 20 лютага родныя атрымалі апошні ліст ад палітзняволенага журналіста Ігара Лосіка. які адбывае пакаранне ў наваполацкай ПК-1.

10 сакавіка да яго не пусцілі адваката, а 15 сакавіка, як стала вядома праваабаронцам, Лосік дэманстратыўна парэзаў сабе лязом руку і шыю. Гэта было зроблена на знак нязгоды з тым, што яму прыгразілі змяшчэннем у ШЫЗА -- нібыта ён адмовіўся "займацца прыборкай памяшкання". Пра здароўе сына і ягоны псіхалагічны стан спрабавалі даведацца бацькі, паехаўшы ў наваполацкую калонію. Але ім сказалі толькі тое, што с Ігарам «усё ў парадку», але за парушэнне рэжыму ён пазбаўлены доўгатэрміновага спаткання, якое планавалася ў канцы сакавіка. 3 красавіка адваката да Ігара Лосіка не пусцілі зноў.

У падобных сітуацыях, калі ад палітвязняў доўгі час няма лістоў, праваабаронцы раяць не хаваць праблему, а патрабаваць адказу ад адміністрацыі па месцы зняволення. Яшчэ адзін адрас, куды можна звярнуцца – гэта Дэпартамент выканання пакаранняў. Разлічваць на хуткі і вычарпальны адказ не даводзіцца, таму ў лістах варта задаваць канкрэтныя пытанні – пра здароўе, настрой, працоўны графік, наяўнасць спагнанняў і г.д.

**22.04.2023**



Суддзя суда Пастаўскага раёна Наталля Максімовіч 4 красавіка, разгледзеўшы справу аб адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным ч.1 арт. 19.11 КаАП, у дачыненні да мясцовага жыхара Андрэя Стабулянца, аштрафавала яго на 740 рублёў і канфіскавала аўтамабіль, у якім, на думку ўладаў, правапарушальнік захоўваў улёткі экстрэмісцкага зместу.

Паводле матэрыялаў справы 16 сакавіка міліцыянты знайшлі ў бардачку аўтамабіля, маркі «Volkswagen Bora», якая належыў Стабулянецу, інфармацыйную прадукцыю, якая прапагандуе экстрэмісцкую дзейнасць, з мэтай далейшага яго распаўсюджвання. А менавіта, 5 улётак якіх прапагандавалася дзейнасць арганізацыі "Нацыянальнае антыкрызіснае ўпраўленне". Гэта апазіцыйная структура якое было ўключана 25 студзеня 2023 года МУС Беларусі ў пералік арганізацый, якія маюць дачыненне да “экстрэмісцкай дзейнасці”.

**22.04.2023**

Ён быў затрыманы ў мінулы чацвер, суд прызнаў пастара Царквы Хрысціян Веры Евангельскай вінаватым паводле арт. 19.11 КаАП за «лайкі» і каментары да матэрыялаў з інтэрнэт-рэсурсаў, прызнаных экстрэмісцкімі. Пра затрыманне пастара распавялі мясцовыя жыхары.

Пастар Аляксандр Зарэцкі быў адным з тых, хто пасля падзеяў жніўня 2020г. падпісаў калектыўны Адкрыты ліст хрысціян Беларусі супраць гвалту. З гэтай нагоды ён меў гутарку Чашніцкім РАУС і ў раённым аддзеле ідэалогіі. 8 ліпеня 2021г. у яго па месцы жыхарства правяліператрус з нагоды крымінальнай справы, у якой ён меў статус сведкі.

У пачатку 2022г. Евангельская царква ў Навалукомлі атрымала ад Дэпартаменту па гуманітарнай дзейнасці адмову наконт рэгістрацыі гуманітарнай дапамогі на суму 25625 шведскіх крон, атрыманай ад дабрачыннай арганізацыі «Осс-Хельпен» (Швецыя). У складзе гуманітарнай дапамогі, дасланай у Навалукомль, былі інвалідныя вазкі, адзенне, абутак, мэбля, посуд для асобаў, якія маюць у гэтым патрэбу. Але дэпартамент запатрабаваў, каб усё гэта было адпраўлена ў зваротным кірунку.

**24.04.2023**

Гэта ўжо трэці арышт запар, прысуджаны Наваполацкім гарадскім судом, дагэтуль Ігар Бортнік ужо адбыў у няволі два арышты за адміністрацыйныя правапарушэнні (10 і 13 сутак). Атрымліваецца, што агулам кандыдат філасофскіх навук мае правесці за кратамі 38 сутак. Выносячы апошнюю пастанову, суд не ўлічыў, што мужчына мае праблемы са здароўем і некалькі дзён таму перанёс у зняволенні гіпертанічны крыз.

Апошні арышт на 15 сутак звязаны з тым, што ў мабітным тэлефоне Бортніка міліцыянты знайшлі падпіскі на тэлеканал «Белсат» і Symbal.by на Youtube. Суд прызнаў яго вінаватым за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў паводле арт. 19.11 КаАП.

Ігара Бортніка ўтрымліваюць у наваполацкім Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў. Вядома, што падчас адбыцця папярэдняга арышту яго на некалькі сутак вазілі ў віцебскі ІЧУ.

Навуковец быў затрыманы 29 сакавіка калі міліцыя цягам двух дзён ладзіла «хапун» у асяродку супрацоўнікаў Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка. Было затрымана больш за 10 чалавек, ва ўсіх правяліператрусы і забралі мабільныя тэлефоны.

**24.04.2023**

Як стала вядома, 11 красавіка суддзя суда Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці Андрэй Тарасевіч разгледзеў адміністрацыйную справу ў дачыненні да Валерыі Васюковіч. Дзяўчыну, якая родам з Докшыц, судзілі па частцы 1 артыкула 24.23 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў).



Валерыю Васюковіч сілавікі забралі з банка, дзе яна працавала, і адвезлі ў пастарунак за тое, што яна ў сацыяльнай сетцы ў “Вконтакце” ў адкрытым доступе размясціла публікацыі з выявай сцяга бел-чырвона-белага колеру з сімвалам “Пагоня” ў выглядзе рыцара з мячом на кані.

На думку суддзі, яна быццам такім чынам правяла адзіночнае пікетаванне з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў без дазволу Докшыцкага райвыканкама.

Згодна з пастановай суда, з рапарта міліцыянта, які маніторыў сацыяльную сетку Валерыі і складаў на дзяўчыну пратакол, вынікае, што да ўсяго на яе старонцы было размешчанае ў свабодным доступе яшчэ і фота, на якім яна знаходзіцца ў кампаніі дзяўчыны і хлопца, пры гэтым хлопец трымае ў руцэ

мабільны тэлефон у чахле, на якім намаляваны бел-чырвона-белы сцяг і сімволіка “Пагоня”. Гэта ёй таксама ставілі ў віну.
Дарэчы, выява герба “Пагоня” не ўключаная ў забаронены спіс, яна нават размешчаная на гербе Віцебскай вобласці і горада Лепеля. А людзей і далей міліцыянты разам з суддзямі прыцягваюць да адказнасці.
Падчас  судовага пасяджэння Валерыя сваю віну не прызнала. Але суддзя Андрэй Тарасевіч палічыў яе вінаватай і прызначыў дзяўчыне трое сутак арышту, якія яна ўжо адбыла.
Пасля гэтых падзеяў, Валерыя Васюковіч усе свае сацыльныя сеткі ў інтэрнэце зрабіла закрытымі.

**25.04.2023**
У 2022 года раённымі судамі Віцебскай вобласці было разгледжана 48,9 тыс. спраў з вынясеннем пастаноў у рамках крымінальных, адміністратыўных і грамадзянскіх законаў. У параўнанні с 2021 годам, колькасць разгледжаных спраў павялічылася на 1 тыс. ці на 2%.
Крымінальныя справы
Суддзямі было разгледжана 3787 крымінальных спраў з вынясеннем прыгавору. Па выніках судовых разбораў асуджана 4121 асоб. Апраўдальныя прыгаворы вынесены ў дачыненні да 3 (0,08%) асоб. Асноўнымі нагодамі для апраўдання, як і ў папярэднія гады, з'явілася адсутнасць у дзеяннях складу злачынства альбо недаказанасць удзелу абвінавачанага ў ягоным здзяйсненні. Выключная мера пакарання і пажыццёвае пазбаўленне волі судамі не прымянялася.
Найбольшая колькасць асоб асуджана за ўчыненне крадзяжоў маёмасці living рознымі спосабамі (1781 асоб або 43,2 %). За злачынствы супраць жыцця і здароўя (286 ці 7,0%), а за преступления против уклада семейных отношений и интересов несовершеннолетних (568 ці 13,8%).
У дачыненні да асуджаных прымяняліся пакаранні: грамадскія працы разоў 561, штраф - 497, пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю - 18, папраўчыя работы - 140, абмежаванне волі - 855, арышт - 678.  Колькасць асуджаных да пазбаўлення волі склала 920 асобы.
Віцебскі абласны суд разгледзеў у апеляцыйным парадку 750 крымінальных спраў. Таксама зведалі змены прыгавораў раённых судоў у апеляцыйным і наглядным парадку ў дачыненні да 91 прыгавораных. Вышэйстаячымі судамі былі адменены прыгаворы раённых і гарадскіх судоў у дачыненні да 11 асоб
Віцебскім абласным судом было разгледжана 117 пракурорскіх пратэстаў, з якіх 111 з іх былі поўнасцю задаволены.
Справы аб адміністрацыйных правапарушэннях
Цягам мінулага года было разгледжана раённымі (гарадскімі) судамі вобласці 25464 спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях.
У агульнай структуры адміністрацыйных правапарушэнняў асноўную масу склалі справы аб такіх правапарушэннях, як: распіццё алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва, спажыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў у грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы або на рабоце ў стане ап'янення - 3621 спраў; дробнае хуліганства - 2678 спраў; дробны крадзеж -1586 спраў.
Колькасць асоб, на якіх раённымі (гарадскімі) судамі накладзены адміністрацыйныя спагнанні, налічваецца 19289 грамадзянамі.
Грашоваму штрафу падвергнута 75% або 14472 прыцягнутых асоб. Адміністратыўнаму арышту падвергнуты - 4375 прыцягнутых асобы або 22,6%. Пры гэтым з агульнай колькасці разгледжаных спраў амаль па 6174 спраў або 32% судамі прымаліся рашэнні аб спыненні вытворчасці па справе.
У сувязі з адсутнасцю ў дзеянні складу адміністрацыйнага правапарушэння судамі спынена 401 спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях, што сведчыць аб неабгрунтаванасці пачатку вядзення адміністрацыйнага працэсу, а таксама захоўваецца невысокім узроўні якасці дасудовай вытворчасці па такіх справах.
Грамадзянскае правасуддзе
У мінулым мінулым годзеі ў суды вобласці паступіла 19725 грамадзянскія справы. Судамі з вынясеннем рашэння разгледжана 14484 грамадзянскіх спраў, з іх з задавальненнем іску разгледжана 13844 або 96 працэнтаў.
З ліку разгледжаных у іскавай вытворчасці грамадзянскіх спраў найбольшую колькасць складаюць справы аб скасаванні шлюбу - 3104. Задавальняльнасць па гэтай катэгорыі склала 99,9 працэнта. За шэсць месяцаў суды разгледзелі 44 грамадзянскія справы аб аднаўленні на працы, з іх з задавальненнем іску 20 ці 45,6%.
Судамі вобласці разгледжаны 1647 грамадзянскіх спраў аб спагнанні аліментаў на ўтрыманне дзяцей. Па гэтай катэгорыі склала 100 працэнтаў зваротаў.

Аб абароне гонару і годнасці грамадзян у судах слухаліся 16 спраў, і задаволена было 5 пазовы.
Праз суды прайшло 1705 спраў аб накіраванні грамадзян у Лячэбна-працоўныя прафілакторыі і былі прыняты рашэнні аб лячэнні ад алкагалізму ці нарказалежнасці 1596 чалавек.
Пастановы аб прымусовай шпіталізацыі былі прыняты судамі ў дачыненні да 84 грамадзяніна, што склала 100%.
У выніку праверкі вышэйстаячымі судамі пераважная большасць рашэнняў па грамадзянскіх справах прызнаны законнымі і абгрунтаванымі. Вышэйстаячымі судамі адменена 63 рашэнні, што складае 0,45% ад агульнай колькасці вынесеных рашэнняў, а таксама 40 рашэнні былі зменены.

**26.04.2023**

Суддзя суда Талачынскага раёна 10 красавіка Наталля Барысавец арыштавала на 7 сутак мясцовую жыхарку Кацярыну Васілеўскую за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у Інтэрнеце. Акрамя таго, суддзя канфіскавала прадмета адміністрацыйнага правапарушэння мабільны тэлефон "iPhone 6S".
У судовым паседжанні Кацярына патлумачыла, што на яе акаўнце ў сацыяльнай сетцы Тэлеграм сапраўды знаходзілася інфармацыя ў выглядзе падпіскі на інтэрнэт-старонку з назвай "NEXTA". Аднак,экстрэмісцкія матэрыялы не распаўсюджвала, падпіску зрабіла падчас пратэстаў 2020 года, і не ведала аб тым, што інфармацыйная прадукцыя была прызнана судом экстрэмісцкай.
Суддзя Барысавец абгрунтавала сваё рашэнне арыштаваць Васілеўскую наяўнасцю ў дзейнай Канстытуцыі арт. 52, якая абавязвае кожнага, хто знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, выконваць яе Канстытуцыю, законы. А невыкананне ўказанага абавязку цягне, у выпадку з Кацярынай, на адміністрацыйную адказнасць.
Праўда суддзя не згадала аб тым, што ў арт. 34 Канстытуцыі гарантуе кожнаму грамадзяніну гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі.

**26.04.2023**

Віцебскі апазіцыянер выйшаў на вуліцу Леніна да так званага “сіняга дому” з плакатам, дзе было напісана “Людзі, памятайце пра Чырнобыль і разважайце пра лёс сваіх дзяцей. Будаўніцтва АЭС у Рэспубліцы Беларусь – вар’яцтва”. Але яшчэ да таго, як ён разгарнуў плакат, да яго падышлі два “амапаўцы”.
Барыс Хамайда распавёў, што меркаваў прастаяць з плакатам у цэнтры Віцебску некалькі гадзін, але не атрымалася:
-Гэтыя амапаўцы адразу звярнуліся да мяне з дзіўным папярэджаньнем : “Барыс Ханонавіч, сыходзьце, у вас сёння выходны дзень!” Які выходны? Я да “сіняга дому” выходжу амаль штодня… Тады яны кажуць: “Мы вас затрымаем”. Пытаюся: “За што гэта? Я ж проста так стаю, нічога не раблю!” Яны адышлі, я дастаў плакат, а хвілін праз 20 тыя хлопцы з’явіліся зноў. Зноў папярэджваюць, што зараз выклічуць машыну… Рабіць няма чаго: я згарнуў плакат. Амапаўцы кажуць: “Заўтра стойце тут з чым хочаце, а на сёння ў нас загад – каб ніякіх “чарнобыльскіх” акцый не было.
Ніводнай акцыі да 25-х угодкаў аварыі ў Чарнобылі на Віцебшчыне сёлета не дазволілі, хаця адпаведныя заявы падавалі мясцовыя актывісты і ў Полацку, і ў Наваполацку, і ў Воршы, і ў Віцебску.
Тым не менш, удзельнікі ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС 26 красавіка традыцыйна збяруцца на малебен каля крыжа на Успенскай горцы ў Віцебску. А прадстаўнікі апазіцыйных партый і рухаў прымуць зварот да ўрадаў Расіі і Беларусі наконт недапушчальнасці будаўніцтва новай АЭС у Астраўцы.

**27.04.2023**

"У цяперашні час Віктар Бабарыка знаходзіцца ў аддзяленні хірургіі, стаянне сярэдняй ступені цяжкасці, вядома, што ў яго пнеўматоракс. Паступіў са слядамі збіванняў, яго нават не пазналі пакуль не ўбачылі прозвішча таго, хто паступіў". Пра гэта паведаміў расейскі інфармацыйны рэсурс BRIEF. Захворванне, пнеўматоракс, ўяўляе сабой паталагічнае назапашванне паветра ў плеўральнай паражніне, якое прыводзіць да парушэння вентыляцыйнай функцыі лёгкіх і газаабмену пры дыханні. Прычынамі пневмоторакса могуць быць: агнястрэльныя і колатыя раненні ў вобласць грудной клеткі; траўмы, механічныя пашкоджанні рэбраў і лёгкіх зачыненага тыпу; ўскладненне пасля пункцыі, катэтара, блакады нерва.



Учора «Рабочы рух» распаўсюдзіў інфармацыю аб тым, што былы кіраўнік Белгазпрамбанка і ўдзельнік выбарчай кампаніі патрапіў у шпіталь.
Віктар Бабарыка зараз у наваполацкай калоніі. Ён быў затрыманы 18 чэрвеня 2020 году. У ліпені 2021

года яму прысудзілі 14 гадоў калоніі - па артыкулах 235 (легалізацыя сродкаў, атрыманых злачынным шляхам) і 430 (атрыманне хабару).
З апавяданняў іншых палітвязняў вядома, што з Бабарыка ім забараняюць размаўляць. Працаваць яго паставілі на выпальванне драўнянага вугалю. Гэтая праца лічыцца адной з самых цяжкіх у калоніі. З 9 лютага аб ім няма інфармацыі.

**28.04.2023**
У спіс «экстрэмісцкіх матэрыялаў», складзены МУС, трапіла старонка «Ігар Вожык Палынскі» ў Twitter, якая належыць ураджэнцу Полацку, музыку і журналісту. Ужо не першы год Ігар Палынскі вымушана жыве ў замежжы, а ў Беларусі тым часам прызнаныя «экстрэмісцкімі» ягоная старонка ВКонтакте і два відэакліпы да песняў, выкананых полацкім гуртом «Sumarok». Палынскі – і стваральнік гэтага гурта, і аўтар музычных твораў.
«Яны прызналі мой Твітар экстрэмісцкім. Яны мяне пачулі», -- такім чынам адрэагаваў музыка і журналіст, даведаўшыся, што 26 красавіка Маладзечанскі суд прыняў адпаведнае рашэнне..
11 красавіка ў інтэрв"ю Польскаму радыё для Беларусі Ігар Палынскі казаў, што найперш яго турбуе не тое, што ягоныя творы практычна сталі забароненымі, -- ён хвалюецца за бяспеку тых, хто пакідаў каментары або ставіў ім «лайкі» на YouTube і ў сацыяльных сетках. Таму такія публікацыі, дзе «засвяціліся» іншыя людзі, ён выдаліў.
У пэўным сэнсе прызнанне нейкіх матэрыялаў «экстрэмісцкімі» нават стымулюе, прызнаецца Ігар: пасля таго, як «экстрэмісцкім» прызналі першы відэакліп да песні «Чэрці», ён запісаў дзясятак новых песень, пакуль што пад гітару, каб працаваць над імі далей ужо цэлым музычным калектывам.
Дарэчы, перш чым дадаць да спісу «экстрэмісцкіх матэрыялаў» відэакліп да песні «Чэрці», «экстрэмісцкім» быў прызнаны нават артыкул пры гэты твор, надрукаваны ў Маладзечанскай «Рэгіянальнай газеце».

**29.04.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч аштрафавала на 740 рублёў мясцовую жыхарку прыбіральшчыцу памяшканняў Вольгу Рынкевіч, якая выхоўвае малалетняга сына. Падставай адміністрацыйнага пакарання стала, на думку ўладаў правядзенне Вольгай пікета ў Інтэрнэце.




Згодна з пратаколам адміністрацыйнага правапарушэння Рынкевіч, без дазволу кіраўніцтва Міёрскага райвыканкама, у асабістым профілі сеткі «Аднакласнікі» ў адкрытым доступе размясціла публікацыю з выявай несанкцыянаванага масавага мерапрыемства з выявай на заднім фоне палотнішчаў бел-чырвона-белых сцягоў. Гэтыю крамолу быў выяўлены супрацоўнікамі мясцовай міліцыі.
Падчас судовага разбору Рынкевіч паведаміла суддзі Яскевіч аб тым, што фатаграфію, як многія з яе знаёмых у 2020 годзе, без усялякіх мэт выставіла ў сацыяльнай сетке і таму, яна не лічыць за сабой віну ў правядзенні несанкцыянаванага пікетавання.
Тым не менш, суддзя Яскевіч палічыла, што Вольга здзейсніла правапарушэнне ў рамках ч.1 арт. 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) КаАП і аштрафавала яе на 20 базавых велічыняў.

## Травень

**01.05.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 17 красавіка пастанавіла арыштаваць на 30 сутак слесара-рамонтніка цэха №729 ААТ «Нафтан», сябра рэгіянальнага веласіпеднага клуба «Верста» Вячаслава Шэфа. Суддзя палічыла даказаным тое, што Вячаслаў распаўсюджваў у сацыяльных сетках "экстрэмісцкія матэрыялы" і правёў віртуальны пікет у інтэрнэце.
Доказам у судзе правапарушэнняў Шэфа сталі знойдзеныя на яго тэлефоне ў СС "Вконтакте" і "Інстаграме", падпіска на суполкі "Мая краіна Беларусь", "Наш край", уключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Таксама мясцовыя міліцыянты выявілі падпіскі на «дэструктыўныя суполкі» - «Кардынацыйную раду» і «Анлайн-платформа Голас».
Таксама падчас агляду старонкі ў сацыяльнай сетцы «Instagram», якая належыла Вячаславу, у раздзеле «Падпіскі» вартавымі парадку былі выяўленыя падпіскі на інфармацыйныя рэсурсы «Zerkalo.io», «Symbal.by», honestpeople.by/Сумленныя людзі», «cbshelp», "Фонд спартыунай салідарнасці", якія ўлады лічаць “экстрэмісцкіх матэрыяламі”. Там жа былі знойдзены фатаграфіі з БЧБ-мітынгу ў Наваполацку, размешчаныя ў сетках яшчэ напрыканцы ліпеня 2020 года.

Усе гэтыя фактычныя дадзеныя паслужылі доказам дэліктных паводзін Вячаслава. І паводле ч.2 арт.19.11 КаАП судзьдзя Балаболава пакарала яго арыштам, тэрмінам на 15 сутак і канфіскавала ў даход дзяржавы мабільны тэлефон «Xiaomi Redmi» і яшчэ на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП, за праведзены пікет без дазволу ўладаў Шэф быў арыштаваны на пятнаццаць сутак.

**02.05.2023**

Сёння сваякі Віктара Бабарыкі спрабавалі трапіць на прыём да кіраўніцтва Дэпартамента выканання пакаранняў МУС, паведамляе штаб Бабарыкі.

Менавіта ў ДВП адказваюць за ўтрыманне і бяспеку зняволеных. На прыёме родныя хацелі даведацца пра месцазнаходжанне і стан здароўя Віктара, а таксама атрымаць магчымасць убачыць яго і пераканацца, што з ім усё добра. Але ў прыёме было адмоўлена.

Сваякі працягнуць дамагацца інфармацыі і сустрэчы з Бабарыкам праз адказныя за гэта органы дзейнай улады, паведамляе штаб. Там просяць усе прысутныя ў Мінску міжнародныя арганізацыі і дыпламатычныя місіі аказаць садзейнічанне ў атрыманні інфармацыі аб стане Віктара Бабарыкі.

**04.05.2023**

Апрача «сутак» або штрафа, прадугледжаных артыкулам 19.11 КаАП, асуджаным за «распаўсюд экстрэмізму» пагражае звальненне – калі яны займаюцца педагагічнай дзейнасцю. Праваабаронцам вядома ўжо пра некалькі дзясяткаў падобных выпадкаў на Віцебшчыне. Спадарыня Наталля ўжо ў пенсійным узросце, але працуе. Пастанову па адміністрацыйнай справе выкладчыцы ВНУ мае вынесці суд Першамайскага раёну Віцебска.

Наталля Тарабука працуе ў тэхналагічным універсітэце з 1994 года, займае пасаду дацэнта, з“яўляецца адной з заснавальніц спецыяльнасці «Камунікатыўны дызайн» у ВДТУ, з“яўляецца адмыслоўцам па вырабу ўпакоўкі, распрацоўцы фірмовага стылю, Сярод выкладчыцкіх дасягненняў Наталлі – падрыхтоўка пераможцаў многіх міжнародных фестываляў па дызайне.

**05.05.2023**



4 траўня ў Докшыцах наўпрост на ўроку спачатку затрымалі Марыну Корду. Яна працуе ў першай школе горада настаўніцай пачатковых класаў. Як паведамляе грамадскі актывіст з Докшыцкага раёна Кастусь Шыталь, жанчыну затрымалі за «лайкі» ў інтэрнэце.

Пасля стала вядома, што быў затрыманы і яе муж Вікенцій Корда, які працаваў раней настаўнікам фізкультуры ў той жа школе, дзе і жонка.

**05.05.2023**

У Віцебскім абласным судзе праходзіць разгляд крымінальнай справы над былым вайскоўцам Валерыем Раманоўскім. Улады абвінавачваюць мужчыну ў здрадзе дзяржаве згодна арт. 356 Крымінальнага кодэкса краіны. Суд пачаўся 12 красавіка і працэс праходзіць пад старшынствам суддзі Яўгена Бурунова, які правёў тры закрытыя пасяджэнні.

У снежні 2022 года тэлеканал «Беларусь-1» выпусціў фільм пра контрразведку КДБ, дзе распавялі пра беларусаў і грамадзян іншых краін, якіх абвінавачваюць у працы на замежныя спецслужбы.

Валерыя Раманоўскага ў фільме назвалі «былым начальнікам службы паветранай разведкі». У фільме тады адзначылі, што Раманоўскаму пагражае да 15 гадоў калоніі, але артыкул, па якім яго абвінавачваюць, не назвалі.

У сюжэце «Беларусь 1» гаворыцца, што падчас службы сваяк з Літвы «звёў» падазраванага з агентамі Дэпартамента дзяржбяспекі краіны. Для іх Раманоўскі фатаграфаваў службовыя дакументы, а аднойчы перадаў спецслужбам звесткі аб будаўніцтве БелАЭС, сцвярджаецца ў фільме.

Падсудны кажа, што сам не заўважыў, як перайшоў гэтую грань. Ён перадавалася інфармацыя, якая мае абмежавальныя штампы «сакрэтна» і «цалкам сакрэтна».

**05.05.2023**

Старшыня суда Глыбоцкага раёна Алена Кот 19 красавіка асудзіла глыбачанку Алу Арэхва на 10 сутак. Жанчыну, якая працуе прадаўцом-кансультантам, судзілі па двух артыкулах - ч. 2 артыкула 19.11 КаАП РБ (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць) і ч. 1 артыкула 24.23 КаАП РБ – парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавых мерапрыемстваў.

Як адзначаецца ў пастанове суда, Ала Арэхва ў сацыяльных сетках “Аднакласнікі” і “Вконтакте” посціла і ставіла лайкі матэрыялаў, якія суды розных гарадоў Беларусі прызналі экстрэмісцкімі, таксама яна паставіла ўпадабайку выяве з нацыянальным бел-чырвона-белым сцягам і каментаром “Свабода”.

Гэтае дзеянне Глыбоцкі суд расцаніў як адзіночнае пікетаванне з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў без дазволу Глыбоцкага райвыканкама. Суддзя Алена Кот спаслалася яшчэ на тое, што старонка жанчыны ў сацыяльных сетках была адкрытая, і публікацыі на ёй былі даступныя для агляду іншым грамадзянам.
Як зазначыла Ала Арэхва ў судзе, у сацыяльнай сетцы "Аднакласнікі" яна лайкнула публікацыю з выявай сцяга бел-чырвона-белага колеру і каментаром "Свабода" паколькі яна ёй спадабалася.
Але жанчына сваю віну падчас суда прызнала.
Суд на падставе ч.2 артыкула 19.11 КаАП пакараў жанчыну адміністрацыйным спагнаннем у выглядзе адміністрацыйнага арышту тэрмінам на 3 сутак з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння. І на падставе ч.1 артыкула 24.23 КаАП падверг адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе адміністрацыйнага арышту тэрмінам на 7 сутак.
Шляхам поўнага складання накладзеных адміністрацыйных спагнанняў Глыбокі суд арыштаваў Алу Арэхву на 10 сутак  і канфіскаваў мабільны тэлефон.

**06.05.2023**



Суддзя суда Сенненскага раёна Іна Досава 31 сакавіка за правядзенне пікету ў інтэрнэце аштрафавала на 74 рублі непаўналетняга выпускніка Сярэдняй школы №2, сябра БРСМ, кандыдата ў майстры спорту па барацьбе ў грэка-рымскім стылі Сцяпана Падрэза. Аднак пастанова была прынята з грубым парушэннем дзейнага заканадаўства і была адменена Старшынёй Віцебскага абласнога суда. У хуткім часе адміністрацыйная справа Падрэза будзе разгледжана раённай камісіяй па справах непаўналетніх, як гэта патрабуе працэсуальны закон.
Згодна з адміністрацыйным пратаколам, Сцяпан адкрытым публічным доступе ў альбоме захоўваў фатаграфіі, размешчаныя выявы БЧБ сцяга, малюнак з надпісам «ЯМЫ97%» выкананы бела-чырвоным кветкамі на чорным фоне, а таксама знойдзены фатаграфіі з БЧБ сцягам і гербам «Пагоня».
На думку суддзі, малады чалавек публічна выказаў свае асабістыя погляды на падзеі грамадска-палітычнага жыцця, ажыццявіўшы тым самым пікетаванне. Дадзенае масавае мерапрыемства ён ажыццявіў у жніўні 2020 года без дазволу мясцовых уладаў. Таму суддзя Досава палічыла факт здзяйснення Падрэзам адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага ч.1 арт. 24.23 КаАП устаноўленым, а яго вінаватасць у здзяйсненні дадзенага адміністрацыйнага правапарушэння даказанай.
Аднак старшыня Віцебскага абласнога суда Аляксандр Федзюкевіч 18 красавіка адмяніў рашэнне суддзі Досавай, бо яно было прынятае з грубым парушэннем патрабаванняў Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях.А менавіта, у адпаведнасці з арт.3.5 ПВКаАП справы аб адміністрацыйных правапарушэннях, учыненых непаўналетнімі, павінна разглядаць камісія па справах непаўналетніх Сенненскага райвыканкама, а не суд.
У бліжэйшы час справа Сцяпана Падрэза будзе разгледжана членамі КСН Сенненскага райвыканкама і верагодней за ўсё яму пакіне пакаранне ранейшым - максімальны штраф для непаўналетніх у памеры 74 рубля.

**06.05.2023**
Па стане на 05 мая ў "Спісе грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці" значацца 66 жыхароў Віцебскай вобласці з 2770 спісачнага складу. Апошнім з паўночнай вобласці Беларусі ў яго быў залічаны кіраўнік незалежнага прафсаюза РЭП, 72-гадовы аршанец, палітвязень Васіль Берасnеў.
Васіль Ціханавіч быў затрыманы 19 красавіка 2022 года ў межах крымінальнай справы. Мужчыну змясцілі ў СІЗА і прад'явілі абвінавачванні.
У Мінгарсудзе 25 лістапада 2022 г. распачаўся суд над прафсаюзнымі лідарамі. Васіля Бераснева абвінавацілі ў закліках да мер абмежавальнага характару, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь (ч. 3 арт. 361 КК), распальванні іншай сацыяльнай варожасці (ч. 3 арт. 130 КК), стварэнні экстрэмісцкага фарміравання альбо ўдзеле ў ім (ч. 1 і ч. 3 арт. 361-1 КК). Суддзя Анастасія Папко пасля прапановы пракурора Рамана Бізюка зрабіла разгляд справы закрытым.
27 снежня чакалася вынясенне прысуду актывістам беларускіх незалежных прафсаюзаў, аднак суддзя Алена Папкова нечакана паведаміла, што па наноў адкрытых абставінах суд над актывістамі пераносіцца, і папрасіла ўсіх пакінуць судовую залу. Прычыны такога рашэння пакуль невядомыя.
5 студзеня 2023 г. быў вынесены прысуд: актывістаў беларускіх незалежных прафсаюзаў прызналі вінаватымі. Па сукупнасці пакаранняў Анастасія Папко прызначыла Васілю Берасневу дзевяць гадоў

пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Неўзабаве палітвязня перавялі з СІЗА-1 у магілёўскую Турму № 4.
Апеляцыйную скаргу на прысуд разглядалі ў Вярхоўным судзе. Судовая калегія пад старшынствам суддзі Пятра Ліструценкі 3 красавіка 2023 г. пастанавіла пакінуць прысуд без зменаў, а скаргі — без задавальнення.

**07.05.2023**
Палітвязень меў інваліднасць II групы па сэрцы. 61-гадовага блогера затрымалі сёлета 28 лютага ў Пінску - адразу пасля судовага пасяджэння, дзе яму прысудзілі 1 год калоніі за абразу Аляксандра Лукашэнкі  - за сатырычны малюнак, які ён размясціў у сацыяльнай сетцы. Клімовіча прызналі вінаватым паводле арт. 368 Крымінальнага кодэксу.
Пад увагу сілавікоў Мікалай Клімовіч трапіў у снежні 2022г.  Яго затрымалі, і трое сутак ён правёў у ІЧУ. Яму стала дрэнна з сэрцам, міліцыянты  вызвалілі яго да суду.  Вырак суду Пінску і Пінскага раёну Клімовіч спрабаваў абскардзіць 21 расавіка 2023г. У Берасцейскім абласным судзе.  Але яго пакінулі без зменаў. Для адбыцця тэрміна Мікалай Клімовіч быў пераведзены ў віцебскую папраўчую калонію № 3.

**09.05.2023**

На падставе прыгавору суда Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці, які ўступіў у законную сілу,  14 красавіка ў спіс датычных да экстрэмісцкай дзейнасці быў уключаны грамадзянін Расійскай федэрацыі, які мае від на жыхарства ў Віцебску прарасійскі палітычны актывіст Пётр Іваноў. Амбасада Расіі, куды ён чатыры разы звяртаўся па консульскую и прававую дапамогу, кінула расіяніна на водкуп беларускім уладам. Работнік пасольства толькі адзін раз наведаў 64-гадовага Іванова, 15 чэрвеня 2022 года, калі той знаходзіўся ў СІЗА. Цяпер Іваноў, у мінулым марскі афіцэр, сябр партыі "Адзіная Расія" адбывае пакаранне ў Магілёве. У 2014 годзе ў Віцебску сумесна з адстаўнымі вайскоўцамі заснаваў і спрабаваў зарэгістраваць міжнародную грамадскую арганізацыю "За сумленную ўладу".
Спачатку Пятра Яўстаф'евіча абвінавачвалі ў тым, што ён незаконна перасек беларуска-расейскую мяжу, пасля таго як вярнуўся ў Віцебск, са Смаленскай вобласці, куды ён па рашэнні выдвараны беларускімі ўладамі.
Падчас следства, абвінавачанне было дапоўнена артыкулам 188 (Паклёп) КК РБ. Па версіі следства, Іваноў у сваіх скаргах публічна бяздоказна абвінаваціў супрацоўнікаў віцебскага СІЗА, якія нібыта здзейснілі ў дачыненні да яго цяжкія службовыя злачынствы.
Асуджаны неаднаразова звяртаўся за абаронай і заступніцтвам да амбасадара РФ у Беларусі Барыса Грызлова з заявамі аб «выдзяленні на тэрыторыі Расіі жылля мне і маім сваякам, падвергнутых антырасейскімі неанацыстамі ў РБ тэрору і рабаванню». Пасля чацвёртага звароту, трэці сакратар расійскага пасольства Максімаў паведаміў Іванову, што перапіска з ім, па пытаннях абароны ад самавольства беларускіх улад, спынена.
У цяперашні час Іваноў адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў магілёўскай папраўчай калоніі №15.

**11.05.2023**
У лютым 2023 года работнікамі міліцыі быў затрыманы Загадчык юрыдычнай кансультацыі Лёзненскага раёна Ігар Сцяпанава. На яго быў складзены адміністрацыйны пратакол па ч. 2 арт. 19.11 (Распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў) КаАП, а адвакату суддзя паставіла ў віну праваапрушальніку лайк на старонцы інтэрнэт-крамы і арыштавала яго на 15 сутак.
А ўжо 6 сакавіка Сцяпанаў быў выключаны з Віцебскай абласной калегіі адвакатаў рашэннем яе рады ў якасці дысцыплінарнага спагнання за «здзяйсненне правіны, якая дыскрэдытуе званне адваката, адвакатуры і несумяшчальнага з адвакацкай дзейнасцю».
Пастанову ўжо былы адвакат абскардзіў у Віцебскім абласным і ў Вярхоўным судах, але рашэньне суда першай інстанцыі гэтыя суды не адмянілі, а скаргу пакінулі без задавальненьня.
15 мая суддзя і намеснік старшыні Савецкага раёна г. Мінска Марыя Ляшкевіч разгледзіць скаргу Ігара Сцяпанава на рашэнне Віцебскай абласной калегіі адвакатаў аб пазбаўленні яго адвакацкай ліцэнзіі.

**11.05.2023**

Таццяну Макляцову, выкладчыцу тэхналагічнага ўніверсітэту, разам з яшчэ некалькімі калегамі затрымалі 29 красавіка. Крыніцы ў Віцебску паведамляюць, што ў той дзень затрымалі ад 6 да 8 чалавек – супрацоўнікаў ВДТУ. Пакуль суд адбыўся толькі над спадарыняй Таццянай. Суддзя Першамайскага райсуду Віцебску Алена Жук прызнала выкладчыцу вінаватай паводле двух артыкулаў – 19.11 КаАП і 24.23 КаАП. Па першым артыкуле на жанчыну склалі два пратаколы – за падпіскі на два так званых экстрэмісцкіх рэсурсы ў Фэйсбуку. Яшчэ адзін пратакол быў складзены за аватарку ў гэтай сацыяльнай сетцы.
На аватарцы была «рамка» са словамі Янкі Купалы «Людзьмі звацца». Міліцыянты выказалі прэтэнзіі да белага і чырвонага колераў выявы. Згодна з судовай пастановай, Таццяна Макляцова такім чынам публічна выказала свае грамадска-палітычныя інтарэсы. Па выніках разгляду ўсіх трох пратаколаў суд пастанавіў прызнаць выкладчыцу вінаватай і спагнаць з яе штраф: у сукупнасці, па двух артыкулах, -- памерам 60 базавых велічынь або 2 200 рублёў.
Калегі распавядаюць, што кагосьці з затрыманых 29 красавіка адпусцілі ў той самы дзень пасля складання пратаколу. «Не пашанцавала» толькі Таццяне Макляцовай і яшчэ адной, 67-гадовай выкладчыцы кафедры дызайну Наталлі Тарабука. Трое сутак жанчыны былі вымушаны правесці ў ІЧУ – а ў Віцебску ў гэтай установе «палітычным» затрыманым не даюць пасцельнай бялізны, катуюць уключаным ноч навылёт святлом і гэтак далей.
Праз 72 гадзіны жанчын адпусцілі, але Наталля Тарабука не змагла трапіць нават на ўласны суд, бо апынулася ў шпіталі. Яна і дагэтуль знаходзіцца на бальнічным. Суд некалькі разоў пераносілі, апошняя прызначаная дата – 13 траўня. Спадарыню Наталлю таксама вінавацяць у распаўсюдзе так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Паводле «Нашай нівы», асудзіць маюць яшчэ загадчыцу кафедры канструявання і тэхналогіі адзення і абутку, кандыдат тэхнічных навук Наталлю Бадзяла і загадчыцу кафедры эканамічнай тэорыі і маркетынгу, доктарку тэхнічных навук Галіну Яшаву.

**12.05.2023**



Так затрымлівалі жыхарку Докшыцаў Таццяну Дорц усяго за адно фота, сардэчкі і быццам непадпарадкаванне міліцыянтам.
Як стала вядома, 4 красавіка суддзя Докшыцкага раённага суда Вячаслаў Елісеенка асудзіў рамесніцу Таццяну Дорц. Жанчыну судзілі па частцы 1 артыкула 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) КаАП і па артыкуле 24.3 КаАП (непадпарадкаванне прадстаўнікам улады).
Па меркаванні суддзя Елісеенка, Таццяна Дорц быццам правяла адзіночны пікет без дазволу Докшыцкага райвыканкама. А выглядала гэта, згодна з пратаколам сілавікоў, наступным чынам – яна ў месэнджары “Інстаграм” размясціла свой фотаздымак на белым фоне з надпісам чырвонага колеру “Жыве!” і выявамі ў адзін шэраг сэрцаў чырвонага колеру, выявы рукі з паднятымі ўверх указальным і сярэднім пальцамі.
Докшыцкія міліцыянты яшчэ абвінавацілі яе ў тым, што яна быццам не падпарадкавалася іх законным патрабаванням, быццам пайшла ні ў тым кірунку, куды яны яе запрасілі. І тады яны прымянілі да жанчыны фізічную сілу і надзелі кайданкі.
Таццяна Дорц сваю віну не прызнала і паведаміла падчас суда, што яна не рабіла ніякага масавага мерапрыемства і не ведае, хто размясціў у Інстаграме на яе адкрытай старонцы такое фота з яе Дня народзінаў. І, як патлумачыла жанчына, яна пры затрыманні не аказвала ніякага супраціву, таму лічыць, што да яе неабаснавана прымянілі фізічную сілу і надзелі кайданкі.
Канешне ж, як ужо заведзена ў Беларусі, ніякія тлумачэнні жанчыны не былі ўлічаныя пры вынясенні пастановы суда. Таму суддзя Вячаслаў Елісеенка па частцы 1 артыкула 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) КаАП  пакараў Таццяну 15 суткамі арышту, а па артыкуле 24.3 КаАП (непадпарадкаванне прадстаўнікам улады) – 10 суткамі. І ў сукупнасці прысудзіў жанчыне 25 сутак, якія яна ўжо адседзела.
Нагадаем, Таццяна Дорц – вядомая ў Докшыцах грамадская актывістка. Яе неаднаразова ўлады каралі суткамі і штрафамі, праводзілі вобшукі. І яна адзіная ў Докшыцах не пабаялася і выйшла на плошчу да райвыканкама з плакатам супраць вайны і ў падтрымку Украіны.

**12.05.2023**
Суддзя Віцебскага абласнога суда Віктар Быстроў 3 траўня прыняў рашэнне аб ліквідацыі фонду «Цэнтр садзейнічання сацыяльна-эканамічнаму развіццю латвійска-літоўска-беларускіх тэрыторый

«Азёрны край». Ініцыятарам і зацікаўленым бокам у ліквідацыі грамадскай арганізацыі стала кіраўніцтва Глыбоцкага выканаўчага камітэта.
Фонд «Азёрны край» быў створаны для таго, каб улады маглі праз яго асвойваць грошы Еўрасаюза. На момант рэалізацыі праектаў фондам кіраваў Міхаіл Арэхаў, які ў пачатку 2010-х гадоў займаў пасаду начальніка аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Глыбоцкага райвыканкама.
Толькі адзін з праектаў, якія фінансаваліся ЕС у Глыбоцкім раёне і ў якім браў удзел фонд «Азёрны край», меў бюджэт 460 000 еўра, пры гэтым унёсак Еўрасаюза складаў 414 869 еўра. У пералічаных мерапрыемствах праекта партнёрамі былі фонд «Азёрны край» на чале з былым чыноўнікам і органы мясцовай улады — райвыканкам і райсавет.
Гэты праект Еўрасаюза працягваў рэалізоўвацца ў Беларусі аж да канца 2021 года. Цяпер жа, выглядае, чыноўнікі ўжо не вераць, што фонд «Азёрны край» некалі яшчэ спатрэбіцца.

**12.05.2023**
Грамадскай актывістцы з Верхнядзвінска прысудзілі чарговыя суткі, на гэты раз 30 сутак. Валянціна Болбат зноў трапіла ў лякарню.



Суд над ёй адбыўся 10 траўня, судовае пасяджэнне вяла суддзя Верхнядзвінскага суда Людміла Каваленка. Валянціну судзілі па двух артыкулах - часткі 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуючай такую дзейнасць) і па часткі 1 артыкула 24.34 (Парушэнне парадку правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі, пікетавання, іншага масавага мерапрыемства). Гэта ўжо пяты суд над грамадскай актывісткай з Верхнядзвінска.
Перад гэтым Валянціна Болбат напісала ў ФБ: “Сябры мае, вандраванні па пакутах працягваюцца – затрыманне, лякарня, чарговыя два пратаколы па сумна вядомых артыкулах: ч.1. арт.24.34 і ч.2. арт. 19.11. Чакаю суда. Засталіся пазыкі яшчэ з мінулых штрафаў, якіх у мяне было 130 базавых і аплата ўтрымання ў ЦІПе Наваполацка. У банку хацела ўзяць крэдыт, адмовілі. Не думала, што амаль у 70 год свайго жыцця, магу аказацца ў такой сітуацыі. Столькі зрабіўшы для раёна, для хворых дзетак, шматдзетных сямей. Пра маю грамадскую працу і працу маіх калег можна пісаць кнігу. А пішуцца міліцэйскія пратаколы. Гэтыя паўгода сталі крытычнымі і для здароўя. Горка... Адчуваю сябе як на паперці”.
Агульная сума штрафаў, прысуджаных грамадскай актывістцы, складае больш за 4 тысячы рублёў.
А да гэтага яшчэ далучыцца аплата яе 30 -суткавага ўтрымання ў ІЧУ. Вось такім чынам улады ціснуць на вядомых актывістаў. Некаторым псуюць здароўе і кідаюць у фінансавую кабалу, але ёсць і горшыя прыклады, як з Вітольдам Ашуркам і Мікалаем Клімовічам, якіх давялі ў калоніях да смерці.
Калі хто хоча дапамагчы Валянціне Болбат у такой сітуацыі, вось яе нумар карткі: 5470 8740 4920 9818, Тэрмін дзеяння 06/24, “Беларусбанк”.

**13.05.2023**
Намесніца дырэктра філіялу «Витебские электрические сети» РУП «Витебскэнерго» па ідэалагічнай і сацыяльнай рабоце Вольга Гарбадзей пубічна заявіла карэспандэнтам навінавай праграмы «Витебский вестник», што з работнікамі, якіх асудзілі да арыштаў або штрафаў за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» (арт.19.11 КаАП) і за «несанкцыянаванае пікетаванне» (арт.24.23), «працоўныя адносіны спынены».
Жанчына заявіла таксама, што «звальненне гэтай катэгорыі працаўнікоў істотнага ўплыву на працоўны працэс не мае» - маўляў, на ДРЭС ёсць дастаткова кваліфікаваных кадраў для забеспячэння бесперабойнага вытворчага працэсу. Статыстыкі ў гэтым пытанні спадарыня Гарбадзей не прыводзіць, а тым часам колькасць звольненых ідзе ўжо на дзясяткі, а некаторыя работнікі Лукомскай ДРЭС сцвярджаюць, што і на сотні. Работнікам прапануюць напісаць заяву «па ўласным жаданні», палохаючы кепскімі наступствамі ў выпадку нязгоды
З апошняга вядома прынамсі пра 5 судоў над працаўнікамі ДРЭС, затрыманымі ў мінулым месяцы. За так званы «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» - за падпіскі на інфармацыйныя рэсурсы, прызнаныя «экстрэмісцкімі» і за «пікетаванне ў інтэрнэце» шляхам размяшчэння выяў з непажаданай для ўладаў сімволікай траім затрыманым прысудзілі па 20 сутак арышту. Адзін з іх асуджаны за фотаздымак, які даўней пераслаў сваёй дзяўчыне, цяпер ужо жонцы. Здымак быў з «экстрэмісцкага рэсурсу», а на ім – выява стала і лаўкі ў белым і чырвоным колерах з Пагоняй...
Яшчэ двое мусяць сплаціць штрафы памерам 1110 і 2590 рублёў. Пад увагу сілавых структураў тра-

пляюць у апошнія месяцы не толькі супрацоўнікі ДРЭС: прыкладам 20 сутак арышту прысудзілі хірургу Сяргею Нарэйку. Не выключана, што ён таксама страціць працу, нягледзячы на тое, што медычных кадраў у раёне востра бракуе. На 15 сутак быў асуджаны пастар Царквы Хрысціян Веры Евангельскай Аляксандр Зарэцкі.

**14.05.2023**
Суддзя суда Аршанскага раёна і г. Оршы Юлія Вяршыніна 5 мая разгледзела ў адкрытым судовым паседжанні справы аб адміністрацыйных правапарушэннях, прадугледжаных ч.1 арт.24.23 і ч.2 арт.19.11 КаАП у дачыненні да мясцовага жыхара Віталя Сытава. І знайшла, што ён цягам двух гадоў бесперапынна праводзіў недазволены ўладамі пікет і распаўсюджваў «экстрэмісцкія» матэрыялы. За гэтыя дзеі суддзя пакарала Віталя арыштам на 15 сутак і канфіскавала тэлефон.
У працэсе суда высветлілася, што Сытоў захоўваў у адкрытым доступе з мэтай распаўсюджвання інфармацыйную прадукцыю інтэрнэт-старонкі з назвай "STOP LUKA", якая ў сакавіку 2022 года была ўключана ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Ён жа, у перыяд часу з лістапада 2020 г. па цяперашні час без дазволу Аршанскага райвыканкама публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных настрояў, прыняў удзел у пікетаванні, што выявілася ў публікацыі ў «Тэлеграм» выявы ў выглядзе палотнішча ў танах бел-чырвона-белага колеру з надпісам «ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ». Для гэтага правапарушэння ён выкарыстоўваў прыналежны яму тэлефон.
Гэтыя звесткі былі зафіксаваны ў рапарце оперупаўнаважанага ГУБАЗіК МУС Рэспублікі Беларусь і перададзены ў суд у выглядзе двух пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**16.05.2023**

Ужо 95 дзён, як Марына Адамовіч не атрымлівае лістоў ад свайго мужы, палітзняволенага палітыка Мікалая Статкевіча. Устурбаваная ягоным лёсам, жанчына дасылала запыты ў Дэпартамент выканання пакаранняў і ў адміністрацыю глыбоцкай калоніі №13, дзе палітвязень адбывае пакаранне – 14 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах асаблівага рэжыму – прысуджанае яму паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя масавых беспарадкаў).
«36 спагнанняў, з іх за 14 - ШІЗА (5 - за апошнія тры месяцы, тэрмін не паведамляюць). Зараз, верагодна, ў ШІЗА таксама, альбо толькі выйшаў. Чарговы раз пакараны знаходжаннем на паўгады ў той самай адзіночцы 1х3 м, аналагу ПКТ у "звычайнай" калоніі. (Мінулыя паўгады расцягнуліся на 9 месяцаў). Гэта значыць, што, калі не ў ШІЗА, гэта значыць кругласуткава ў каменным мяшку з прагулкай у такім жа каменным мяшку паўгадзіны на дзень.
Пазбавілі ўсяго: адзінай пасылкі і спатканняў. Пра тэлефанаванні гаворка нават не ідзе», - Марына Адамовіч цытуе паведамленне, атрыманае з калоніі.
На сваёй старонцы ў Фэйсбуку яна піша таксама, што праблема з ліставаннем засталася нявырашанай. Ёй адказалі, што ёйныя лісты да мужа "апрацоўваюцца ва ўстаноўленыя тэрміны". Гэта значыць, ёсць верагоднасць, што ён іх атрымлівае, хаця не выключана, што не ўсе. А што да лістоў з-за кратаў, то жонцы паведамілі толькі адно: «Перапіска не забаронена». Але куды знікаюць лісты, калі іх няма больш як тры месяцы, Марыне Адамовіч не патлумачылі.
У падобным становішчы апынуліся і сваякі іншых палітзняволеных. Ужо месяц, як няма лістоў ад Паўла Севярынца, распавяла ягоная маці спадарыня Таццяна: «Апошні раз з належныя па законе 10 хвілін размаўляла з ім 25 лютага. Спачатку шэраг сутак ШІЗА, з красавіка- ПКТ, 3 месяцы. Я ўпарта пішу яму штодня».

**16.05.2023**
Суддзя Віцебскага абласнога суда Святлана Іванова 10 траўня пакінула без зменаў пастанову суддзі суда Полацкага раёна і г. Полацка Яны Марцулевіч у дачыненні да начальніцы аддзела прававой і кадравай працы Ірыны Базылёвай. На думку суддзі Івановай, суд першай інстанцыі правільна пакараў правапарушальніцу штрафам у 1110 рублёў за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. Цяпер пастанова набыла моц і Базылёвай давядзецца ўнесці грошы ў рэспубліканскі бюджэт.
Згодна з пратаколам, які паступіў у суд з мясцовага аддзела міліцыі, Базылёва размясціла ў сацыяльнай сетцы Інстаграм інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 2007 г. №513 “Аб парадку вядзення і апублікавання рэспубліканскага спісу экстрымісцкіх матэрыялаў”.
А менавіта ва ўкладцы «вашыя падпіскі» размясціла спасылку на інтэрнэт-старонку сацыяльнай сеткі

і захоўвала ўказаную інфармацыйную прадукцыю да моманту выяўлення супрацоўнікамі Полацкага РАУС. Ад арышту начальніцу аддзела верагодна выратавала тая акалічнасць, што яна выхоўвае малалетняе дзіця.

**18.05.2023**

Суддзя суда Віцебскага раёна Міхаіл Зубеня 26 красавіка прызнаў вінаватай у распаўсюджванні ў сацыяльных сетках экстрэмісцкіх матэрыялаў маці трох малалетніх дзяцей жыхарку аграгарадка Тулава Крысціну Бляеву, і пакараў яе штрафам у памеры 740 рублёў.

Падчас судовага разбору, суддзя высветліў, што Крысціна знаходзячыся ў сябе дома выкарыстоўваючы свой тэлефон у сацыяльнай сетцы Instagram на прыналежнай ёй старонцы захоўвала, “з даты прызнання экстрэмісцкім матэрыялам, з мэтай распаўсюджвання інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, а менавіта: інфармацыйную прадукцыю інтэрнэт-старонкі "ВКантакце" якая рашэннем суда Чыгуначнага. раёна г. Гомеля прызнана экстрэмісцкім матэрыялам”.

На гэтай падставе суддзя Зубеня і кіруючыся ч.2 арт.19.11 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, падвергнуў Бляеву штраф у даход дзяржавы ў памеры 20 базавых велічынь з канфіскацыяй мабільнага тэлефона.

**21.05.2023**

Чатырох дактароў Наваполацкай цэнтральнай гарадской лякарні 20 траўня асудзілі да розных тэрмінаў арышту па адміністрацыйных «палітычных» артыкулах, аднаго медыка пакаралі вялікім штрафам. Справы разглядала суддзя г. Наваполацка Зінаіда Балаболава.

Медыкаў, затрыманых 19 траўня ў Наваполацкай цэнтральнай гарадской лякарні пасля таго, як туды прывозілі на шпіталізацыю палітвязня Віктара Бабарыка.

Хірурга Міхаіла Пачкоўскага і ўролага Паўла Стальмакова арыштавалі на 15 сутак па арт. 19.11 КаАП (распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць).

Загадчыца аддзялення гінекалогіі Ірына Васільева і фельчар хуткай дапамогі Наталля Первененак атрымалі па 10 сутак арышту па арт. 24.23 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў). Вядома, што другую з іх асудзілі за аватарку са сцягам Украіны. УГД-спецыяліста Алу Стальмакава аштрафавалі на 3700 рублёў. Суд улічыў той факт, што ў Алы на ўтрыманні знаходзяцца двое непаўналетніх дзяцей.

**22.05.2023**

У Оршы міліцыя затрымала 26-гадовага жыхара Мінску Канстанціна Баяндзіна. Верагодна, ён вяртаўся ў Масквы, дзе мае працу. Гэта стала магчымым дзякуючы адзінай базе дадзеных, якой карыстаюцца расейскія і беларускія сілавыя ведамствы.



Пра мужчыну вядома, што ён скончыў журфак БДУ, быў пераможцам конкурса «Містар-журфак» і атрымліваў званне «Студэнт года БДУ». Паводле Orsha.eu, Канстанцін супрацоўнічаў з камандай аднаго з найпапулярнейшых блогераў Беларусі, уладальніка плацінавай кнопкі YouTube Улада Бумагі. Затрымалі Баяндзіна пасьля праверкі тэлефону, але што менавіта там знайшлі — пакуль невядома. Таксама невядома, якую справу завялі на шоўмэна — адміністрацыйную ці крымінальную.

**23.05.2023**

Раніцай 23 траўня ў Наваполацку і Полацку затрымалі вядучага выкладчыка кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў ПДУ Алену Храмцову, кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры гісторыі і турызму ПДУ Віктара Чараўко і супрацоўніцу рэпазітарыя Лідзію Зуеву. Супраць затрыманых сілавікі распачалі адміністрацыйныя справы.

Пакуль вядомыя падрабязнасці толькі што да затрымання Алены Храмцовай. На падставе пастановы у межах расследавання крымінальнай справы «пра экстрэмізм» дома ў выкладчыцы быў праведзеныператрус, канфіскавана аргтэхніка. На жанчыну склалі пратакол паводле артыкула 19.11 КаАП( распаўсюд экстрэмісцкай прадукцыі) за падпіску на тэлеграм-канал «Беларусь галаўнога мозга». У чым вінаваціць астатніх затрыманых, пакуль не вядома.

Гэта ўжо не першы выпадак ціску на выкладчыкаў ПДУ. Дацэнта , кандыдата гістарычных навук Віктара Якубава звольнілі з універсітэту 28 верасня 2021г. Афіцыйная прычына звальнення - «за прагулы», якія ўтварыліся, пакуль выкладчык адбываў адміністрацыйны арышт на 15 сутак, прысуджаны

за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Пад ціскам адміністрацыі ў 2021г. быў вымушаны звольніцца Андрэй Вярыга, старшы выкладчык кафедры архітэктуры і кіраўнік аддзелу дызайну і кіравання брэндам ПДУ (Наваполацк). Напярэдадні ён быў пакараны за «незаконнае пікетаванне» штрафам памерам 20 базавых велічынь і арыштам на 11 сутак.
Гэтаксама, нібыта «за прагулы», з ПДУ быў звольнены прафесар, доктар гістарычных навук, этнограф Уладзімір Лобач. На ягоную думку, звальненне было наўпрост звязанае з уласнай грамадзянскай пазіцыяй, якую ён адкрыта сцвярджаў у сацыяльных сетках у жніўні-верасні 2020г.
Выкладчыкі ПДУ адзначаюць, што нецярпімасць да «іншадумства» стала выразна праяўляцца ў адміністрацыі ПДУ пасля прыходу на пасаду рэктара сенатара Алега Раманава, вядомага прыхільніка «русского мира».

**24.05.2023**
У пачатку красавіка суддзя суда Браслоўскага раёна Аляксандр Вязіцкі разгледзеў адміністрацыйныя справы па ч. 1 арт.24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў)

у дачыненні да вядучага ветэрынарнага ўрача ДЛПУ "Браслаўская раённая ветэрынарная станцыя" Сяргея Мядзведзева і качагара Торфабрыкетнага завода Сяргея Рыбака. Суддзя палічыў мужчын вінаватымі ў тым, што яны без дазволу ўладаў правялі ў інтэрнэце пікетаванне і пакараў парушальнікаў адміністрацыйным арыштам на 10 сутак кожнага.
У судовым паседжанні высветлілася, што Мядзведзеў і Рыбак, у 2020 годзе, у сацыяльнай сетцы «Вконтакте» на сваёй сртаніцы неаднаразова размяшчалі свае фота з бел-чырвона-белым сцягам. Гэтыя дзеянні яны праводзілі без дазволу мясцовага выканкама.
Па перакананні суддзі Вязяцкага, факты правядзення пікетаў і вінаватасць Мядзведзева і Рыбака знайшлі пацвярджэнне ў рапартах начальніка аддзялення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі аддзела ўнутраных спраў Браслаўскага райвыканкама Яўгена Круміна.
Пры прызначэнні пакарання, суддзя не знайшоў законам прадугледжаных абставін, якія змякчаюць і/або абцяжарваюць адміністрацыйную адказнасць за дэвіянтныя паводзіны ў рамках рэалізацыі грамадзянскіх і палітычных правоў.

**24.05.2023**
Наваполацкі гарадскі суд прызнаў жанчыну вінаватай у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў – за падпіску на тэлеграм-канал «Беларусь галаўнога мозга». Учора, 23 траўня дома ў Алены Храмцовай правялі ператрус у межах крымінальнай справы і забралі ўсё аргтэхніку. Падчас размовы ў міліцыі высветлілася, што выкладчыца ПДУ мае статус сведкі ў справе, распачатай следчым камітэтам «за экстрэмізм». Пакуль вядома, што адбываць арышт яна будзе ў наваполацкім ЦІПе (Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў).
Алена Храмцова - вядучы выкладчык кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў ПДУ, мае шэраг навуковых і навукова-метадычных прац, дапамагае ў даследаваннях студэнтам. Яе добра ведаюць у Наваполацку, але не толькі як выкладчыцу.
Васіль Храмцоў, муж спадарыні Алены (заўчасна памёр 11 чэрвеня 2011 г.), быў адным з найвядомейшых наваполацкіх актывістаў. Ён з“яўляўся адным з арганізатараў экалагічных мітынгаў супраць уздзеяння шкоднай вытворчасці ў Наваполацку, быў свядомым беларусам і імкнуўся зацікавіць беларушчынай усіх сяброў і знаёмых, шмат гадоў запар ачольваў наваполацкую суполку БНФ. Некалькі разоў быў арыштаваны за ўдзел у акцыях дэмакратычных сілаў.
Ён стварыў у Наваполацку супольнасць “Усяслаў Чарадзей”, удзельнік якой адраджалі традыцыйную беларускую культуру, арганізоўваў каляндарныя народныя святы – Каляды, Гуканне вясны, Дзяды, Купалле. Традыцыя адзначаць іх у рэгіёне захоўваецца і дагэтуль. Васіль Храмцоў пакінуў па сабе добрую памяць. Таму арышт Алены Храмцовай таксама стаў гучнай падзеяй у Наваполацку.
Усяго, па звестках мясцовых жыхароў, учора ў Наваполацку было затрымана 15 чалавек. Апрача Алены Храмцовай, сілавікі затрымалі яшчэ дваіх супрацоўнікаў ПДУ - кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры гісторыі і турызму ПДУ Віктара Чараўко і супрацоўніцу рэпазіторыя Лідзію Зуеву. Пра лёсы астатніх затрыманых пакуль нічога не вядома.

**25.05.2023**

Суддзя Наваполацкага гарадскога суду Зінаіда Балаболава пастанавіла пакараць некалькі чалавек па так званых «палітычных» адміністрацыйных справах. Не ўсе артыкулы, згодна з якімі людзей прызналі вінаватымі, вядомыя дакладна. Але «стаханаўская» праца Зінаіды Балаболавай уражвае: цягам усяго дня яна судзіла затрыманых учора навапалачанаў, у тым ліку супрацоўнікаў Полацкага дзяржаўнага ўніверстэта. Сярод асуджаных - 73-гадовая кандыдатка тэхнічных навукі, дацэнтка кафедры геадэзіі і геаінфармацыйных сістэм Галіна Шараглазава. Паводле судовай пастановы, жанчыне сталага веку давядзецца 10 сутак правесці за кратамі. Артыкул, паводле якога пакаралі спадарыню, пакуль не вядомы.



На 10 сутак арыштавана і супрацоўніца ПДУ, выкладчыца кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў Алена Храмцова. Суд прызнаў яе вінаватай за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў».
Вядомы мясцовы актывіст Алег Крайко асуджаны адразу паводле двух артыкулаў — 24.23 КаАП (несанкцыянаванае пікетаванне) і 19.11 (распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў). Вырак -- 26 сутак арышту.
За «несанкцыянаванае пікетаванне на 60 базавых велічыняў (2 200 руб.) наваполацкі суд аштрафаваў Ксенію Зуеву, на 30 базавых велічынь (1 100 руб.) аштрафавана Кацярына Швалюга. Таксама пакараная штрафам і Паліна Путро, яе правіна ацэнена судом у 20 базавых велічынь (740 руб.)
Пакуль праваабаронцам паведамілі пра лёсы толькі некаторых асобаў, затрыманых учора ў Полацку. Паводле тамтэйшай інфармацыі, сілавікі затрымалі 23 траўня не менш як 15 чалавек.

**25.05.2023**

Работнікаў найбуйнейшага наваполацкага прыдпрыемства Віктара Кавалеўскага, Вадзіма Уласава, Валерыя Леснікова і Юрыя Гайчанку затрымалі за «распаўсюд экстрэмізму» - за каментары, лайкі і падпіскі на так званыя экстрэмісцкія інтэрнэт- рэсурсы. Паводле спісу МУС, у пералік «экстрэмісцкіх» рэсурсаў унесены чатыры тэлеграм-каналы, створаныя па ініцыятыве работнікаў і прысвечаныя падзеям на «Нафтане», і старонка ў Instagram, прысвечаная працы страйкаму.
Пра небяспеку «экстрэмізму» работнікаў «Нафтана» яшчэ 19 красавіка строга папярэдзіў афіцыйны прафсаюз прадпрыемства. У газеце «Вестник «Нафтана» быў размешчаны пералік «галіновых» рэсурсаў, за падтрымку якіх прадугледжана адміністрацыйная адказнасць. Прафсаюз прадпрыемства настойліва параіў пачысціць свае старонкі ў сацыяльных сетках і месэнджарах.
Якраз тымі днямі на наваполацкіх прадпрыемствах «Нафтан» і «Палімір» адбыліся масавыя затрыманні: больш за 10 чалавек пакаралі арыштамі— ад 10 да 30 сутак, у асноўным за рэпосты (паводле артыкула 19.11 КаАП), а таксама за «несанкцыянаванае пікетаванне» (паводле артыкула 24.23 КаАП).
«Кіраўнікі праводзілі гутаркі ва ўсіх структурных падраздзяленнях, з большасцю размаўлялі нават асабіста. І каб ужо напэўна кожны работнік пачуў і быў у курсе адказнасці, былі раздадзеныя ўлёткі з усёй інфармацыяй. І што вы думаеце? Усё адно засталіся тыя, каму няма справы ні да сябе, ні да завода, ні да сваёй сям'і — яны ўпарта хочуць камусьці штосьці даказаць», — яшчэ праз колькі дзён напісаў «Вестник «Нафтана».
У сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» старонка газеты ўтрымлівае шмат публікацый, якія ганяць прадстаўнікоў дэмакратычнага руху і выстаўляюць падзеі жніўня 2020г. у скрайне негатыўным святле. Такім чынам адміністрацыя прадпрыемства спадзяецца паўплываць на свядомасць работнікаў разам з выкарыстаннем пагрозаў адміністрацыйнымі і крымінальнымі справамі.

**25.05.2023**

У грэка-каталіцкага святара Аляксандра Шаўцова правялі перадтрус у межах крымінальнай справы "пра экстрэмізм" . Па гэтай самай справе сілавікі ладзяцьператрусы на Полаччыне ўжо трэці дзень запар. Сутнасць справы не вядомая, і найбольш падобна, што яна распачатая супраць неакрэсленай колькасці асобаў, каб мець падставы для неабмежаванай колькасціператрусаў. У айца Аляксандра забралі з дому ўсю аргтэхніку.
Аляксандр Шаўцоў з'яўляецца настаяцелем парафіі Святога пакутніка Язафата -- ачольвае ўніяцкую полацкую грамаду на працягу ўжо болей як 10 гадоў. Шмат у чым дзякуючы яму паміж рознымі парафіямі грэка-каталікоў наладжаны добрыя сяброўскія стасункі. Таму звесткі пра затрыманне айца Аляксандра ўзрушыла не толькі полацкіх вернікаў.
Ёсць верагоднасць, што святару будуць закідаць "несанкцыянаванае пікетаванне" праз сацыяльныя сеткі: ягоны фотаздымак ў Фэйсбуку аздоблены так званай "рамкай" з надпісам чырвонымі літарамі на белым фоне "Маліцеся за Беларусь".
Стала вядома, што сёння таксама быў затрыманы ксёндз Андрэй Кулік, пробашч парафіі Унебаўзяцця

Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мёрах.
Ксёндз Андрэй з'яўляецца пробашчам мерскай парафіі з 23 чэрвеня 2019 г. , таксама быў пробашчам парафіі ў Дзісне (да 06.09.2020г.). Ён нарадзіўся на Гарадзеншчыне, але значны час свайго служэння аддаў Віцебшчыне, пасля святарскіх пасвячэнняў атрымаўшы першае накіраванне ў Гарадок. З 21 красавіка 2005г. па 31 мая 2012 г. быў адміністратарам у Падсвіллі. Падчас свайго служэння ў парафіі займаўся завяршэннем будаўніцтва і правядзеннем унутраных работ у новым касцёле, асвячэнне якога адбылося 30 ліпеня 2011 года. Далей была праца ў парафіі св.Уладыслава ў Віцебску (мікрараён Білева), а потым — у парафіі Святога Язафата Кунцэвіча ў Канстанцінаве (Глыбоцкі раён).
З 28 верасня 2014г. па 22 чэрвеня 2019 г. апекаваўся парафіяй Унебаўшэсця Пана ў вёсцы Дзеркаўшчына. Падчас сваёй душпастырскай дзейнасці святар значную ўвагу надаваў рабоце з дзецьмі і моладдзю. Некалькі апошніх гадоў служыў у Мёрах.
Пакуль рыхтаваўся гэты матэрыял, стала вядома пра затрыманне 25 траўня яшчэ аднага каталіцкага святара. На Мершчыне затрымалі Вячаслава Адамовіча, пробашча парафіі Найсвяцейшай Панны Марыі Якая Носіць Скапулярый ў Ідолце.

**26.05.2023**
Судовы працэс праходзіў у Першамайскім райсудзе Віцебска. Суддзя Міхаіл Юрчанка прызнаў Булаўскага вінаватым у адпаведнасці з артыкулам 342-2 Крымінальнага Кодэксу (Неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў). Бок абвінавачвання напярэдадні запрасіў для актывіста пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на 2 з паловай гады ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Суд вырашыў пакараць Булаўскага двума гадамі зняволення.




Паводле матэрыялаў крымінальнай справы, Уладзімір Булаўскі двойчы цягам году прыцягваўся да адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў. У прыватнасці, за парушэнне за парушэнне арт. 24.23 КаАП ён быў асуджаны на 15 сутак за несанкцыянаванае пікетаванне 28 лютага 2022г. - за тое, што выйшаў з жоўта-блакітнай стужкай на адзенні ў цэнтр Віцебску. Пазней на 30 сутак за пікетаванне без дазволу мясцовых уладаў Булаўскі быў асуджаны і 7 ліпеня 2022г. - за фотаздымак групы людзей з бел-чырвона-белым сцягам, размешчаны ў сацыяльных сетках.
Падчас затрыманняў у Булаўскага забіралі мабільныя тэлефоны, і праз гэтыя прылады следства выявіла, што цягам некалькіх гадоў, пачынаючы з 2014г., ён больш за 20 разоў размяшчаў на сваіх старонках у розных сацыяльных сетках «графічныя вырабы з выявамі асобаў і незарэгістраванай сімволікай – бел-чырвона-белым сцягам». З гэтага следства зрабіла высновы, што віцебскі актывіст і арт-менеджэр «меў злачынны намер публічна выражаць свае асабістыя і грамадска-палітычныя інтарэсы». Аднак Булаўскі тлумачыў, што да некаторых сваіх старонак ужо шмат часу не мае доступу, і не можа адказваць за кантэнт, які там мог з“явіцца без ягонага ўдзелу. Што да іншых публікацый, то ён не аспрэчваў, што яны былі зроблены ім асабіста. Але свае віны ў тым, што такім чынам праводзілася пікетаванне, Уладзімір Булаўскі не прызнаў.
Уладзімір Булаўскі, вядомы ў Віцебску арганізатар выступаў беларускіх выканаўцаў і гуртоў, быў затрыманы 14 снежня мінулага году і асуджаны да 15 сутак арышту паводле абвінавачання ў «распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў». Але на волю ён не выйшаў: супраць яго распачалі крымінальную справу і перавялі ў віцебскі СІЗА-2. Падчас знаходжання за кратамі віцебскі актывіст і арт-менеджар даведаўся, што ў яго памёр бацька, аднак на пахаванне яго не адпусцілі. 6 лютага беларуская праваабаронча супольнасць прызнала Уладзіміра Булаўскага палітычным зняволеным.

**26.05.2023**
76-гадовую жанчыну затрымалі раніцай 25 траўня, паведаміў рэсурс @pozirkonline. Гарадскі суд Наваполацку прызнаў спадарыню вінаватай паводле двух артыкулаў – за несанкцыянаванае пікетаванне (арт.24.23 КаАП) і за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» (арт. 19.11 КаАП). Яна аштрафаваная на 80 базавых велічынь (2960 рублёў).
Галіна Захаркіна – былая загадчыца кафедры архітэктуры, мае званне дацэнта. Шмат сваіх даследаванняў яна пасвяціла архітэктурным асаблівасцям беларускіх сядзібаў і гарадской забудовы. Сёлета кафедра архітэктуры, дзе працавала спадарыня Захаркіна, адзначыла 20-годдзе сваёй дзеянасці. З гэтае нагоды Галіна Іванаўна была ўганаравана афіцыйнай падзякай ад універсітэта.
За тры апошнія дні былі затрыманыя некалькі выкладчыкаў ПДУ, у тым ліку дацэнты Сяргей Глазырын і Віктар Чараўко, на 10 сутак асудзілі вядучую выкладчыцу кафедры сусветнай літаратуры і

замежных моў Алену Храмцову і дацэнтку кафедры геадэзіі і геаінфармацыйных сістэм Галіну Шараглазаву.

**26.05.2023**
Аляксандра Шаўцова, настаяцеля грэка-каталіцкай парафіі Святога пакутніка Язафата, суд Полацку і Полацкага раёну прызнаў вінаватым за «распаўсюд экстрэмісцкай інфармацыі». Святара асудзілі паводле артыкула 19.11 КаАП за рэпосты матэрыялаў сайта "Хартыя-97" у сацыяльнай сетцы "ВКонтакте".
Святара полацкай грэка-каталіцкай супольнасці за трымалі ўчора, 25 траўня. У яго дома быў праведзеныператрус, міліцыянты забралі ў айца Аляксандра ўсю аргтэхніку.
Апрача полацкага грэка-каталіцкага святара, на Віцебшчыне учора былі затрыманыя два ксяндзы - Андрэй Кулік, пробашч парафіі Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мёрах, і Вячаслаў Адамовіч, пробашч парафіі Найсвяцейшай Панны Марыі Шкаплернай у вёсцы Ідолта Мёрскага раёну. У рыма-каталіцкіх святароў таксама забралі мабільныя тэлефоны і кампутары.

**28.05.2023**

Суддзя суда Чашніцкага раёна Ірына Кручыніна 12 траўня разгледзела адміністрацыйную справу ў дачыненні да пастара евангельскай царквы г. Новалукомль Аляксандра Зарэцкага. І за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у сацыяльных сетках, пакарала яго арыштам на 15 сутак. Раней, 21 красавіка, тая ж суддзя арыштавала пастара на той жа тэрмін па ч.2 арт. 19.11 (Распаўсюджванне, інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці) КаАП.
Падчас судовага разбіральніцтва суддзя Кручыніна ўстанавіла, што на асабістай старонцы сацыяльнай сеткі Фэйсбук у адкрытым доступе Зарэцкі размясціў і захоўваў фатаграфію сябе з дзіцем на фоне БЧБ-сцяга, якія суправаджаліся графічнымі выявамі лагатыпа TUT.BY, а таксама публікацыю з інтэрнэт-супольнасці «Радыё Свабода», з выявай паходні аранжавага колеру. Усе гэтыя СМІ, уключаных у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У дзеянні пастара суддзя ўбачыла пагрозу для грамадскай бяспекі. Пры гэтым Кручыніна хоць і прызнала наяўнасць змякчальных абставін у справе ў выглядзе прызнання Зарэцкім віны і наяўнасць у яго на ўтрыманні траіх малалетніх дзяцей, тым не менш вынесла максімальнае па артыкуле пакаранне ў выглядзе арышту на 15 сутак і канфіскавала прыналежны пастару тэлефон.

**29.05.2023**
Суддзя суда Аршанскага раёна і г. Оршы Мікалай Драгуноў 18 траўня пастанавіў арыштаваць на 10 сутак Алега Масальскага за нібыта праведзены пікет. Падчас пікету ён выкрыкваў лозунгі “Жыве Беларусь” і “Слава Украіне”.
У судовым паседжанні Масальскі растлумачыў, што днём 7 траўня ўжываў спіртныя напоі. Затым накіраваўся на прыпынак, размешчаны паблізу д.5 па вул.60 год БССР у Оршы, дзе сустрэў раней незнаёмага мужчыну ў ваеннай форме. Алег вырашыў праверыць якое стаўленне мае вайсковец да падзей мае «ў Беларусі і Ўкраіне», стаў выкрыкваць адпаведные лозунгі.
Сведка з ліку вайскоўцаў пацвердзіў, што Масальскі знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, стаў да яго чапляцца, пры гэтым пачаў гучна выкрыкваць апазіцыйныя лозунгі. Па дадзеным факце ён патэлефанаваў у міліцыю.
Пад час суду высветлілася, што правапарушальнік правёў пікет, без атрымання адпаведнага дазволу Аршанскага райвыканкама. Тым самым суддзя палічыў што Масальскі ўчыніў правапарушэнне і павінен быць пакараў арыштам на дзесяць сутак, у межах ч.1 арт. 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) КаАП.

**30.05.2023**
Кваліфікацыйнай камісіяй па пытаннях адвакацкай дзейнасці 29 траўня разгледзела пытанні спынення ліцэнзій на ажыццяўленне адвакацкай дзейнасці. Сябры камісіі прынялі рашэнне спыніць ліцэнзіі на ажыццяўленне адвакацкай дзейнасці ў дачыненні да адвакатаў Віцебскай абласной калегіі адвакатаў Аляксандра Уласевіча і Святланы Якушавай. Лецензіі спынілі ў сувязі са здзяйсненнем імі правін, не сумяшчальных са званнем адваката. На практыцы гэта амаль заўсёды азначае расправа ўладаў з адвакатамі, якія адважыліся абараніць грамадзян, абвінавачаных па палітычных артыкулах.
Дадзеная працэдура з 2021 года стала ўсё часцей ініцыявацца міністрам юстыцыі, які, атрымаўшы нейкія матэрыялы (крыніца якіх часта не раскрываецца), узбуджае дысцыплінарную вытворчасць і

адхіляе адваката ад выканання прафесійных абавязкаў (такое паўнамоцтва ён мае па Законе аб адвакатуры). Як правіла, у загадзе міністра здзяйсненне адвакатам дысцыплінарнай правіннасці ўжо канстатуецца як устаноўлены факт. Гэты загад накіроўваецца для разгляду ў тэрытарыяльную калегію. Раней пытанні дысцыплінарнай адказнасці разглядала дысцыплінарная камісія калегіі. Дысцыплінарныя камісіі БРКА і тэрытарыяльных калегіі існавалі да лістапада 2021 года, аднак пасля ўступлення ў сілу змяненняў у Закон "Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці" іх функцыі передаліся парадам тэрытарыяльных калегій і БРКА (артыкул 22 Закона). Яны ўпаўнаважаны разглядаць узбуджаныя дысцыплінарныя вытворчасці і ажыццяўляць кантроль за выкананнем адвакатамі тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў заканадаўства аб адвакатуры, Правілаў прафесійнай этыкі адваката, статутаў калегій адвакатаў і адвакацкіх бюро, рашэнняў БРКА і тэрытарыяльнай калегій адвакатаў.

## Чэрвень

**01.06.2023**




У маі рашэннем Віцебскага абласнога суда грамадскія аб'яднанне "Віцебскі гарадскі фонд дапамогі ветэранам спорту і перспектыўным спартсменам", "Віцебская абласная федэрацыя хакея", спартыўны клуб "Тыгр" (Полацк) і Віцебскі абласны парусна-маторны клуб "Агра" прымусова ўведзены ў стан ліквідацыі. Ініцыятарам знішчэння аб'яднанняў грамадзян стала кіраўніцтва Упраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама.

«Спартыўны клуб «Тыгр», дзе дзеці школьнага ўзросту займаліся тхэквандо быў адкрыты ў 2009 годзе. Трэнеры клуба за чатырнаццаць гадоў яго існавання прышчапілі любоў да гэтага віду спорту ў некалькіх сотняў маладых беларусаў і беларусак.

Віцебская абласная федэрацыя хакея была зарэгістраваная ў якасці грамадскага аб'яднання ў 2006 годзе. Раней яе ўзначальвалі начальнікі УУС Віцебскага аблвыканкаму. На момант яе ліквідацыі старшынёй федэрацыі з'яўляўся экс-рэктар Віцебскага медуніверсітэта Анатоль Шчасны. На 1 студзеня 2022 года ў федэрацыі налічвалася 78 чалавек.

Грамадскае аб'яднанне "Віцебскі гарадскі фонд дапамогі ветэранам спорту і перспектыўным спартсменам" было зарэгістравана больш за 26 гадоў таму, у снежні 1996 года.

Дарэчы, у офісе арганізацыі 12 траўня 2020 года адбылася сустрэча віцебскіх палітычных актывістаў са старшынём апазіцыйнай партыі "Беларуская сацыял-дэмакратычнага Грамада" Сяргеем Чарачнем. У час сходу палітык пацвердзіў свой намер балатавацца на пасаду прэзідэнта Беларусі і прапанаваў прысутным увайсці ў ініцыятыўную групу па зборы подпісаў для вылучэння яго на пасаду кіраўніка дзяржавы.

Паводле справаздачы аб дзейнасці Віцебскага абласнога парусна-маторнага клуба "Агра" за 2020 год у складзе арганізацыі лічыліся 10 чалавек, грашовых сродкаў клуб не атрымліваў і мерапрыемстваў не праводзіў.

**02.06.2023**

Грэка-каталіцкаму святару Аляксандру Шаўцову давядзецца адбыць за кратамі 45 сутак агулам: да першага арышту на 15 сутак суд Полацку і Полацкага раёну дадаў яшчэ 30, абвінаваціўшы мужчыну паводле артыкулаў 19.11 КаАП (распаўсюд «экстрэмісцкіх матэрыялаў» і 24.23 КаАП (несанкцыянаванае пікетаванне). Першы раз – пасля затрымання іператрусу 25 траўня -- настаяцеля парафіі Святога пакутніка Язафата таксама прызналі вінаватым паводле артыкула 19.11 КаАП за «лайкі» і рэпосты матэрыялаў незалежных СМІ у сацыяльнай сетцы «Вконтакте».

«Гэта азначае, што Шайцоў будзе вызвалены 8-га ліпеня, праз тыдзень пасля найважнейшага фэсту Маці Божай Будслаўскай, апякункі Беларусі», -- падкрэслівае тэлеграм-канал «Хрысціянская візія». Падчас святкаванняў грэка-каталіцкі святар будзе вымушана знаходзіцца за кратамі.

Святар Аляксандр Шаўцоў ачольвае ўніяцкую полацкую грамаду на працягу ўжо болей як 10 гадоў, карыстаецца вялікамі аўтарытэтам у вернікаў. Затрыманне і суд над святаром узрушылі полацкую грамадскасць, людзі сочаць за далейшым развіццём падзеяў вакол айца Аляксандра.

**03.06.2023**

Суддзя суда Дубровенскага раёна Ігар Татаеў 16 мая і 19 мая за распаўсюджванне экстрэмізму ў сацыяльных сетках пастанавіў аштрафаваць на 1110 рублёў індывідуальнуюа прадпрымальніцу з Мінска Ірыну Новік і інжынера-канструктара жыхара Дуброўна Пятра Патлатага.



Судом устаноўлена, што «правапарушальніца» Новік пяць разоў у 2022-23 гадах у сетцы Інтэрнэт з дапамогай мэсэнджэра Telegram, перасылала сваім знаёмым інфармацыю з Telegram-канала "Zerkalo.io навіны", прызнанай рашэннем суда Чыгуначнага раёна г. Гомеля экстрэмісцкімі матэрыяламі.

А «правапарушальнік» Патлаты ў сетцы Інтэрнэт у сацыяльнай сетцы "Facebook", выкарыстоўваючы свой акаунт, падпісаўся і захоўваў у адкрытым доступе інфармацыйную прадукцыю з інтэрнэт-старонкі "Zerkalo.io" прызнаную судом экстрэмісцкімі матэрыяламі.

З гэтых фактаў суддзя Татаеў зрабіў выснову, што Ірына і Пётр вінаватыя ў здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжаным ч.2 арт.19.11 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, і пакараў іх штрафам у памеры 30 б.в. без канфіскацыі тэлефонаў.

**04.06.2023**

Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебску Міхаіл Юрчанка 17 траўня пастанавіў арыштаваць на 15 сутак інжынера Аляксея Касабуцкага за правядзенне віртуальнага пікету ў сацыяльных сетках і за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. У якасці абаронцы ў судзе прысутнічаў адвакат Дзяніс Ястраб, які не змог абараніць канстытуцыйныя правы свайго кліента на свабоду мірных сходаў і распаўсюд інфармацыі.

Згодна пратаколам, якія паступілі ў суд з АУС Першамайскага раёна Віцебска, Аляксей правёў несанкцыянаванае пікетаванне без адпаведнага дазволу ўладаў. Пікет ён правёў, каб выказаць сваё стаўленне да пратэстаў 2020 года. Свае погляды ён выказаў у выглядзе фатаграфій з выявай сцяга бел-чырвона-белага колеру, якую выклаў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы Фэйсбук.

Таксама ў матэрыялах справы меліся доказы таго, што Касабуцкі на сваёй старонцы ў той жа СС Фэйсбук з'яўляўся падпісчыкам на Telegram-каналы "SYMBAL.BY" і "Белсат", якія ўключаны судамі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

У судзе «правапарушальнік» патлумачыў, што сапраўды ён у 2020 годзе ў сацыяльных сетках размяшчаў розныя фота з выявай сябе і іншых грамадзян на фоне пратэстных сімвалаў і сцяга бел-чырвона-белага колеру, таксама быў падпісаны і з'яўляецца ўдзельнікам суполак "SYMBAL.BY" і "Белсат", дзе чытаў інфармацыю. Пасля выбараў забыўся пра свае дзеянні, таму не выйшаў з названых суполак.

Аргументы Касабуцкага і ягоныя абаронцы не пераканалі суддзю Юрчанку ў адсутнасці ў «правапарушальніка» складу адміністрацыйнага правапарушэння. Таму на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП і ч. 2. арт. 19/11 суддзя пакараў інжынера арыштам на 15 сутак і канфіскаваў мабільны тэлефон.

**06.06.2023**

Судовы працэс распачаўся яшчэ 10 красавіка, праходзіў у закрытым рэжыме ў Менскім гарсудзе, але з допускам сваякоў падсуднай. У судовым працэсе былі задзейнічаны дзве суддзі – Любоў Сімахіна і Таццяна Фалькоўская. Апошняя пачынала судзіць Яну Пінчук, яна ж вынесла прысуд – 12 гадоў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму, прызнаўшы дзяўчыну вінаватай паводле пяці артыкулаў Крымінальнага кодэкса, у тым ліку у «стварэнні або кіраўніцтве тэрарыстычнай арганізацыяй.

Віцяблянку Яну Пінчук затрымалі ў Санкт-Пецярбургу 1 лістапада 2021 года ў сувязі з абвяшчэннем у вышук па падазрэнні ў адміністраванні пратэстнага тэлеграм-канала "Віцебск 97%". У жніўні 2022-га дзяўчыну этапавалі з Расіі ў Беларусь, нягледзячы на забарону экстрадыцыі Камітэта па правах чалавека ААН. Паводле следства, дзяўчына пад нікам "Прынцэса Лея" размяшчала паведамленні з "негатыўнай ацэнкаю супрацоўнікаў праваахоўных органаў і органаў дзяржаўнай улады" і публікавала "заклікі да прычынення шкоды міліцыянтам" і "экстрэмісцкія матэрыялы".

Ёй былі прад“яўлены абвінавачванні паводле ч. 3 арт. 130 (распальванне іншай сацыяльнай варожасці); ч. 3 арт. 361 (публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады, гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу, ажыццяўленню дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі); ч. 1 арт. 361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фармавання); ч. 3 арт. 293 (навучанне для ўдзелу ў масавых беспарадках); ч.1 арт. 290-4 (дзейнасць па стварэнні арганізацыі для ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці такой арганізацыяй, або яе часткай ці яе структурнымі падраздзяленнямі).

3 кастрычніка 2022г. беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Яну Пінчук палітычнай зняволенай. Праваабаронцы лічаць крымінальны пераслед ураджэнкі Віцебску палітычна матываваным і

звяртаюць увагу на тое, што такіх справаў у закрытым судовым пасяджэнні груба парушае працэсуальныя правы абвінавачаных і зводзіць да мінімальнай ацэнку праўдзівасці, дастатковасці і дапушчальнасці якіх бы там ні было доказаў абвінавачвання.

**06.06.2023**
17 траўня адбыліся затрыманні супрацоўнікаў Наваполацкай гарадской бальніцы, чацвёра з іх былі асуджаныя паводле арт. 24.23 КаАп і 19.11 КаАП да арыштаў на 10 і 15 сутак. «Хапун» у медычнай установе некаторыя звязваюць з распаўсюджаннем інфармацыі пра палітзняволенага Віктара Бабарыку, які быў дастаўлены з наваполацкай ПК-1 у хірургічнае аддзяленне. Усе справы разбірала суддзя суду Наваполацкага суду Зінаіда Балаболава. Па звестквах Тэлеграм-канала «Белые халаты», усіх асуджаных да арыштуў звольнілі з працы.
Хірург Міхаіл Пачкоўскі і ўролаг Павел Стальмакоў былі асуджаны да 15 сутак арышту паводле арт. 19.11 КаАП («Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць»). Загадчыца аддзялення гінекалогіі Ірына Васільева і фельчар хуткай дапамогі Наталля Первянёнак адбылі па 10 сутак арышту паводле арт. 24.23 КаАП («Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў») за фотаздымкі і «аватаркі» са сцягам Украіны ў сацыяльных сетках.
Між тым, звальненне за прагул паводле працоўнага заканадаўства з"яўляецца далёка не адзіным магчымым дысцыплінарным спагнаннем. Паводле арт. 189 Працоўнага кодэксу, за парушэнне працоўнай дысцыпліны кіраўнік можа абмежавацца заўвагай, вымовай, пазбаўленнем прэміяльных выплат або іх часткі. Звальненне з"яўляецца скрайняй, але не абавязковай мерай уздзеяння на работніка, але выбар спагнання застаецца за кіраўніком установы.
Разумеючы верагоднасць судовых цяжбаў за аднаўленне на працы, кіраўнікі часта ідуць на хітрасць: прапануюць «непажаданым» супрацоўнікам напісаць заяву на сыход па ўласным жаданні пад пагрозай пакінуць негатыўны запіс у працоўнай кніжцы. Вынік, што да Наваполацкай гарадской бальніцы, практычна аднолькавы: звальненне (добраахвотнае ці гвалтоўнае) вядучых адмыслоўцаў пойдзе толькі на шкоду іх цяперашнім або патэнцыйным пацыентам. Бо ў Наваполацку назіраецца такі самы дэфіцыт медычных кадраў, як і па ўсёй Беларусі.

**07.06.2023**
Арцёма, 1 чэрвеня, чацвёрты раз запар змясцілі ў штрафны ізалятар ВК-2 у Бабруйску. Да гэтага ён прабыў там 30 сутак, пасля чаго вярнуўся ў атрад. Перад апошнім памяшканнем у ШІЗА ад Латышава



супрацоўнікі калоніі запатрабавалі прыбраць санвузел, тым самым паспрабаваўшы надаць яму "нізкі статус", аднак Латышаў адмовіўся. Гэта, верагодна, і прычынілася накіраванні ў штрафны ізалятар.
Арцём Латышаў — жыхар Віцебска, працаваў на кандытарскай фабрыцы "Віцьба". Затрыманы 8 верасня 2021 года за перформанс на магіле з выявай спадара Лукашэнкі, а таксама за псаванне банэраў з выявай супрацоўнікаў ДАІ.
Яму прад'явілі абвінавачанні па арт. 341 Крымінальнага кодэкса (Апаганенне збудаванняў) і ч. 2 арт. КК 339 (Хуліганства, учыненае групай асоб). Акрамя яго, у межах крымінальнай справы праходзілі яшчэ тры маладых жанчыны.
25 мая 2022 года суддзя суда Віцебскага раёна Міхаіл Зубеня прыгаварыў Латышава да 4 гадоў і 6 месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. У верасні 2022 года палітвязня этапавалі ў бабруйскую калонію.

**07.06.2023**
Як стала вядома, суд Браслаўскага раёна 22 траўня 2023 года прызнаў экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыяй асабістую старонку ў сацыяльнай сетцы “Вконтакте” грамадскай актывісткі з Браслава Ірыны Баравік.
Раней той жа суд 11 студзеня 2023 года прызнаў экстрэмісцкай прадукцыяй старонку гэтай жанчыны ў сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі”.
На сваіх старонках жанчына адкрыта выказвала сваё стаўленне да ўладааў Беларусі і адгукалася на ўсе значныя падзеі ў жыцці пратэстнага грамадства Беларусі.
Ірына Баравік – грамадская актывістка з Браслава, якая таксама як і ўсе добрасумленныя грамадзяне Беларусі, адрэагавала на тое, што адбылося ў 2020 годзе і ўдзельнічала ў акцыях пратэсту супраць гвалту ўладаў, за гэта яе ўлады затрымлівалі і пераследвалі. Жанчына была вымушаная з’ехаць за

мяжу. Цяпер яна жыве ў Польшчы і працягвае там актыўнасць, удзельнічаючы ў акцыях пратэсту супраць рэжыму Лукашэнкі.

**07.06.2023**
Віцебскага фрылансера-відэааператара ужо чатыры месяцы трымаюць у СІЗА-2, супраць яго высунута абвінавачанне паводле арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса («спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці») за сувязь з недзяржаўным СМІ, прызнаным у Беларусі экстрэмісцкім фарміраваннем. У дзень затрымання, 9 лютага, сілавікі правяліператрусы па месцы прапіскі Лазарава і ў кватэры ягонай жонкі, якая жыла асобна. У абодвух забралі аргтэхніку, але пакуль няма пэўных звестак пра тое, ці па адной крымінальнай справе з мужам затрыманая Таццяна Пыцько.
Жанчыну затрымалі 6 чэрвеня ўвечары. Іх супольную з Лазаравым дачку, якой месяц таму споўніўся год, накіравалі пад нагляд у дзіцячы шпіталь. Дзяўчынкай гатова апекавацца маці затрыманай, але яна жыве ў іншым горадзе і не мае магчымасці хутка прыехаць і забраць унучку. Дваіх старэйшых дзяцей (ад першага мужа) засталіся з родным бацькам.
Які артыкул інкрымінуюць жонцы палітзняволенага, пакуль не вядома. Застаецца верагоднасць, што Таццяну Пыцько адпусцяць на волю праз тры дні – пасля праверкі ў межах крымінальнай справы. Апошні час яна не займалася аніякай грамадскай дзейнасцю, асноўным клопатам жанчыны было выхаванне малой дачкі.
У 2020г. Таццяна Пыцько брала ўдзел у мірных пратэстах і была двойчы аштрафаваная за ўдзел «у несанкцыянаваных мерапрыемствах». Пасля гэтага ёй давялося развітацца з настаўніцкай працай (спадарыня Таццяна выкладала рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школа аграгарадка Акцябрскі Віцебскага раёна).

**07.06.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 29 мая за распаўсюд «экстрэмісцкіх матэрыялаў і пікетаванне ў сацыяльных сетках пастанавіла пакараць арыштам на 7 сутак пробашча парафіі Найсвяцейшай Панны Марыі Якая Носіць Скапапулярны ў Ідолцы Вячаслава Адамовіча.




Згодна з пастановай святар абвінавачваўся па ч. 2 арт. 19.11 ч. 2 (“распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў”) і ч. 1 арт. 24.23 ("удзел у масавых мерапрыемствах") КаАП.
Прычынай пакарання стала тое, што міёрскія міліцыянты ў адной з сацсетак у ксяндза знайшлі падпіску на суполку і старонку са спісу так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў, а ў другой у стужцы профілю знайшлі выяву палатнішча бел-чырвона-белага сцяга з гербам “Пагоня”.

**08.06.2023**
Вядома толькі, што Статкевіч паўгода быў у адзіночнай камеры, а потым, па рашэнні адміністрацыя глыбоцкай калоніі, палітык трапіў у ШІЗА.
«Сёння (допіс ад 15 мая. — «НН») атрымала адказ з калоніі на свае запыты. … Той, хто нічога не ведае пра сваіх родных, мяне зразумее. 36 спагнанняў, з іх 14 — ШІЗА (5 — за апошнія тры месяцы, тэрмін не паведамляюць). Цяпер, імаверна, у ШІЗА таксама альбо толькі выйшаў. Чарговы раз пакараны знаходжаннем паўгода ў той самай адзіночцы 1х3 м, аналагу ПКТ у «звычайнай» калоніі. (Мінулыя паўгода расцягнуліся на 9 месяцаў). Гэта значыць, што калі не ў ШІЗА, то цэлы дзень у каменным мяшку з прагулкай у такім жа каменным мяшку паўгадзіны на дзень. Пазбавілі ўсяго: адзінай пасылкі і спатканняў. Пра тэлефанаванні гаворка нават не ідзе. Лістоў па-ранейшаму няма», — пісала ў сярэдзіне мая яго жонка Марына Адамовіч.
Сітуацыя са Статкевічам не ўнікальная. Няма вестак ад лютага ад Максіма Знака, з 10 сакавіка — ад Сяргея Ціханоўскага, паўтара месяца няма навін пра Віктара Бабарыку ды іншых палітвязняў.

**08.06.2023**
Эканамічнага суда Віцебскай вобласці 30 мая вынес пастанову аб завяршэнні ліквідацыйнай вытворчасці ў дачыненні да Камунальнае вытворчае унітарнае прадпрыемства "Віцебскія лячэбна-працоўныя майстэрні". Такім чынам улады канчаткова закрылі прадпрыемства якое 50 гадоў з'яўлялася цэнтрам па працаўладкаванні і рэабілітацыі для соцень псіханеўралагічных хворых, інвалідаў І і ІІ груп, якія пражывалі ў Віцебскай вобласці. У склад майстэрняў уваходзілі швейны ўчастак, участак тэхнічнага абслугоўвання і цэх па вытворчасці вокнаў і дзвярэй з ПВХ.
Дзяржаўныя майстэрні былі арганізаваны ў 1974 годзе з мэтай правядзення комплексу лячэбна-

вытворчай рэабілітацыі людзей, якія пакутуюць на псіхічныя захворванні і расстройствы. На ім пацыенты праходзілі працатэрапію па накіраванні лечачага ўрача. Гэтае прадпрыемства было сацыяльна значным і праследвала добрыя намеры.
Працатэрапія складалася ў пашыве пасцельнай бялізны, падушак, халатаў для медыцынскіх патрэб (хірургічныя касцюмы, маскі, каўпакі) і спецадзення.
Работнікі прадпрыемства таксама аказвалі паслугі па гідраўлічным прамыванні і апрасоўцы сістэм ацяплення, цеплаабменнікаў, вузлоў кіравання і хімічным прамыванні бойлераў. А яшчэ лячэбна-працоўныя майстэрні выраблялі вокны і дзверы з профіля ПВХ і рабілі іх усталёўку і мантаж.

**09.06.2023**
Гэтымі днямі Наваполацк адзначае сваё 65-годдзе, у праграме анансаваны канцэрты мясцовых выканаўцаў. Напярэдадні, 6-га чэрвеня, адбыліся затрыманні вядомых у горадзе музыкантаў — вакаліста Detroit Hills Аляксея Запасніка і басіста BTTF Арцёма Новікава. У чым звінавацілі абодвух, пакуль не вядома.



Абодва музыкі – працаўнікі ААТ «Нафтан». Заводская шматтыражка «Веснік «Нафтана» не аднойчы распавядала пра іх захапленне музыкай. У музычных колах Арцёма Новікава ведаюць яшчэ і як уладальніка вінтажнай бас-гітары, якую на замову прывезлі з ЗША, прычым гэты інструмент лічыцца найлепшай бас-гістарай у Наваполацку.
Абодва наваполацкія гурты маюць сваіх прыхільнікаў у асяродку мясцовых жыхароў, затрыманне музыкаў шырока абмяркоўваецца ў родным горадзе.

**10.06.2023**
Суддзя Віцебскага абласнога суда Святлана Іванова 1 чэрвеня разгледзела скаргу грамадзянскай актывісткі Надзеі Куканос на рашэнні суда Кастрычніцкага раёна Віцебска аб пакаранні яе арыштам на 15 сутак за распаўсюд у сацыяльных сетках "экстрэмісцкіх" матэрыялаў і супраціўленне работнікам міліцыі. Вынікам разгляду скаргі было не на карысць Куканос. Суддзя Іванова пакінула без змены пастанову суддзі суда Кастрычніцкага раёна, а скаргу "правапарушальніцы" без задавальнення.
Пад час паседжання Надзея Мікалаеўна заявіла аб тым, што не праводзіла не распаўсюджвала экстрэмізму, а таксама не супраціўлялася работнікам міліцыі пры складанні адміністрацыйных пратаколаў.
У скарзе Куканос аспрэчыла законнасць і абгрунтаванасць прынятай па справе пастановы, паколькі адміністрацыйны працэс вёўся работнікамі міліцыі, якім яна заявіла адвод, і ён не быў разгледжаны.
Актывістка патлумачыла суду, як былі сфальсіфікаваныя супрацоўнікамі міліцыі доказы па яе справе. Акрамя таго, было парушана яе права на абарону ў судовым паседжанні, паколькі справа разгледжана ў яе адсутнасць. Зыходзячы з гэтых фактаў яна прасіла абласны суд адмяніць пастанову суда першай інстанцыі, а адміністрацыйную справу спыніць.
Суддзя Іванова пагадзілася з меркаваннем міліцыі, што факты захоўвання Куканос ва «Вконтакте» тэкстаў «Zerkalo.io» і ў «Аднакласнікі» «Афіцыйная група Хартыя97», якія прызнаныя ўладамі экстрэмісцкімі матэрыяламі. Таму яна палічыла вінаватасць Куканос у здзяйсненні адміністрацыйных правапарушэнняў, прадугледжаных арт.24.3, ч.2 арт.19.11 КаАП, даказанай і пакінула пастанову, вынесеную судом першай інстанцыі без змены, а скаргу без задавальнення.

**11.06.2023**
Суддзя суда Глыбоцкага раёна Аляксандр Аляксеенка 29 траўня пастанавіў арыштаваць Наталлю Міцько на 5 сутак за распаўсюд у сацыяльных сетках "экстрэмісцкіх" матэрыялаў і на 7 сутак за пікетаванне ў інтэрнэце.
Прычынай такога пакарання стаў факт выяўлення ў тэлефоне "правапарушальніцы" выявы на інтэрнэт-рэсурсе "Хартыя" "… вершніка на кані са шчытом і мячом (пагоня) на бел-чырвона-белым фоне".
Дадзеную інфармацыю знайшлі работнікі глыбоцкага РАУС, на падставе якой былі складзеныя два пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні.
Суддзя кваліфікаваў гэтыя дзеянні арыштаванай санітаркі па ч.2 арт 19.11 КаАП «як захоўванне з мэтай распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў" і па ч.1 арт.24.23 КаАП, "як парушэнне ўсталяванага парадку правядзення пікетавання, здзейсненае ўдзельнікам такога мерапрыемства».
У канчатковым выніку шляхам поўнага складання двух накладзеных адміністрацыйных спагнанняў,

суддзя Аляксеенка канчаткова вырашыў арыштаваць Міцько тэрмінам на дванаццаць сутак з канфіскацыяй мабільнага тэлефона.

**12.06.2023**
Гэтым разам 30 траўня суддзя Глыбоцкага суда Аляксандр Аляксеенка аштафаваў Алену Шарабайку, жонку вядомага бодзібілдара і фітнес-трэнера Аляксандра Шарабайкі. Сёлета гэта ўжо другі вялікі штраф жанчыне.



Перад гэтым у доме Алены сілавікі правяліператрус. Ён быў звязаны з тым, што каля возера Кагальнае ў цэнтры Глыбокага быў знойдзены нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг.
Судзілі жанчыну па частцы 3 артыкула 24.23 КаАП РБ – парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавых мерапрыемстваў за тое, што ў сеціве сілавікі знайшлі яе фота разам з мужам ля свайго дома на рагу якога вісіць нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг. А лайкнуў гэта фота яшчэ ў 2017 годзе яе муж Аляксандр, які сядзіць зараз у Віцебскім СІЗО за кратамі. Вось такім чынам суджэнцы распаўсюдзілі быццам экстрэмісцкі матэрыял.
Суддзя Аляксеенка пакараў Алену Шарабайку штрафам у памеры 70 базавых велічыняў (2590 беларускіх рублёў), што з'яўляецца для яе непамернай сумай, улічваючы тое, што зараз матэрыяльнае становішча ў сям'і вельмі складанае. Яе муж сядзіць у Віцебскім СІЗА, а яна ледзь знайшла працу ў горадзе за вельмі малы заробак.
Нагадаем, глыбоцкага фітнес-трэнера і бодзібілдара Аляксандра Шарабайку сілавікі затрымалі 13 сакавіка ў Глыбокім разам з жонкай. Спачатку суддзя Глыбоцкага суда Андрэй Тарасевіч асудзіў Аляксандра Шарабайку на 10 сутак, а яго жонцы Алене прызначыў штраф 50 базавых (1850 беларускіх рублёў) па ч. 1 артыкула 24.23 КаАП. Аляксандра судзілі за каментары і лайкі, а Алену за фотаздымак з бел-чырвона-белым сцягам, які вісеў у іх на доме, у сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі”.
А пасля пасля 10 сутак адсідкі ў Глыбоцкім ІЧУ з 24 на 25 сакавіка этапавалі ў Віцебскі СІЗА-2.
Там яму прад'явілі абвінавачванне па частцы 1 артыкула 368 КаАП – абраза Аляксандра Лукашэнкі.
Падтрымаць Аляксандра грашовымі пераводамі, пасылкамі, тэлеграмамі можна па адрасе: СІЗА-2. Гагарына, 2, 210026, Віцебск, Шарабайка Аляксандр Міхайлавіч

**13.06.2023**
Суддзя суда Гарадоцкага раёна Ганна Гурынава 29 траўня за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў сацыяльнай сеткі «Інстаграм» арыштавала на 15 сутак Віктара Стрыгельскага. У рамках адміністрацыйнага закона ў якасці дадатковага пакарання суддзя пастанавіла канфіскаваць у даход дзяржаве мабільны тэлефон, пры гэтым сім-карту загадала вярнуць арыштаванаму.
Згодна з пратаколам агляду тэлефона Стрыгельскага работнікамі Гарадоцкага РАУС былі выяўлены ў ім падпіскі на васьмі рэсурсах: "Simbal.by", "Ploshcha_Peramen", "Bysolfund", "Osb.Bypol", "Stranadlyazhizni", "Charter97.Org", "Zerkalo_io" , «Радыё Свабоды - Беларусь».
У судовым паседжанні «правапарушальнік» ён патлумачыў, што з 2020 года быў зарэгістраваны ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм». Там жа ў яго меліся падпіскі на акаўнты, якія ў цяперашні час прызнаныя судамі "экстрэмісцкімі" матэрыяламі.
Аднак патлумачыў, што, калі ажыццяўляў падпіску на іх, то гэтыя рэсурсы законна існавалі і экстрэмісцкімі не зьяўляліся.
Аднак суддзя Гурынава знайшла ў дзеяннях Віктара склад правапарушэння, прадугледжанага ч.2 арт. 19.11 КаАП, "па прыкметах: захоўванне з мэтай распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў".

**14.06.2023**
Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Наталля Карабліна 31 траўня пастанавіла арыштаваць на 15 сутак жыхара Віцебска Аляксандра Сітава за тое, што ён правёў не дазволенае ўладамі пікетаванне ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм».
Падчас разгляду адміністратыўнай справы суддзя Карабліна высветліла тое, што «правапарушальнік» правёў пікет без дазволу адміністрацыі Першамайскага раёна Віцебска. Таксама і тое, што Сітаў выказваў грамадска-палітычныя інтарэсы, т.б. пратэст супраць вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія прайшлі ў 2020 годзе, і рабіў ён гэта публічна.
Паводле звестак, якія паступілі з мясцовага аддзела міліцыі Аляксандр у адкрытым доступе, размясціў выяву бел-чырвона-белага сцяга, а таксама фота іншых грамадзян на фоне гэтага сцяга.
На думку суддзі Караблінай БЧБ-сімволіка "прыналежыць да сімволікі пратэсту супраць дзейнай

улады ў Рэспубліцы Беларусь".
Суддзя пагадзілася з «сілавікамі», што з кваліфікаваць дзеянні Сітова трэба па ч.1 арт.24.23 КаАП - як парушэнне ўсталяванага парадку правядзення пікетавання, і арыштавала мужчыну на 15 сутак.

**14.06.2023**
Жонку віцебскага відэааператра-фрылансера вінавацяць за стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або за ўдзел у ім. Што стала падставай для абвінавачання, пакуль не вядома. У траўні мінулага году ў



Таццяны Пыцько і Вячаслава Лазарава нарадзілася дачка Ева. Пасля таго, як 6 чэрвеня маці затрымалі, яна знаходзіцца ў дзіцячым шпіталі пад наглядам лекараў, бо бацька дзяўчынкі таксама ў СІЗА.
Гадавалае дзіця ўзята пад апеку дзяржавы, пакуль прыватную апеку не аформяць сваякі.
У 2020-м годзе Таццяну Пыцько судзілі і штрафавалі за ўдзел у мірных шэсцях. Праз гэта яна страціла настаўніцкую працу ў школе. Пасля нараджэння малодшай дачкі займалася выхаваннем яе і дваіх старэйшых дзяцей ад першага шлюбу.
9 лютага, у дзень затрымання яе мужа Вячаслава Лазарава, да Таццяны Пыцько прыйшлі зператрусамі і забралі аргтэхніку. На той момант жонка з мужам ужо некалькі месяцаў жылі асобна, і ператрус у Лазарава праводзілі па месцы ягонага жыхарства. У яго таксама забралі аргтэхніку, а самога змясцілі ў СІЗА. Супраць відэааператара-фрылансера высунута абвінавачанне паводле арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса («спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці») за сувязь з недзяржаўным СМІ, прызнаным у Беларусі экстрэмісцкім фарміраваннем.

**15.06.2023**
Яўген Гуцалаў - той самы аматар бегу на доўгія дыстанцыі, які за 10 дзён «на сваіх дваіх» перасёк Беларусь з поўначы на поўдзень. Яшчэ адно ягонае захапленне – гэта падарожжы. Але апошнія з іх былі вымушаныя: увосень 2021г. ён пакінуў Беларусь, бо супраць яго распачалі крымінальную справу за абразу дзяржаўных сімвалаў. Падставай стала сатырычнае відэа, якое Яўген размясціў у сябу ў Інстаграм. Гуцалава шукаў Следчы камітэт, але мужчына тым часам ужо быў у Турцыі. Тады яго падалі ў міжнародны вышук.
У Турцыі Яўген Гуцалаў часта бываў з 2013-га году, а з 2015-га пачаў арганізоўваць там паходы для турыстаў – вадзіў іх па Лікійскай сцежцы. З 2021 году мужчына пасяліўся ў горадзе Махмутлар, тамсама сустрэў уцекачоў ад вайны з Украіны і сваіх суайчыннікаў-беларусаў, якія пераехалі ў пошуках вольнага жыцця. Калі ў Турцыі здарыўся землятрус, працаваў валанцёрам. Увесь гэты час Гуцалаў меў часовы дазвол на жыхарства.
Калі ж час законнага знаходжання ў Турцыі пачаў падыходзіць да канца, у красавіку гэтага году Яўген вырашыў часова пераехаць у Арменію, а потым вярнуцца ў Турцыю, каб ізноў атрымаць часовы дазвол на жыхарства. Аднак у аэрапорце Ерэвана яго затрымалі, патлумачыўшы, што ён знаходзіцца ў вышуку на тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюзу.
Двое сутак віцяблянін правёў у ізалятары часовага ўтрымання. Параўноўваючы ІЧУ у Арменіі і ў Беларусі (Яўген Гуцалаў не аднойчы трапляў у віцебскі ІЧУ, бо на Радзіме яго арыштоўвалі за несанкцыянаваныя пікетаванні), мужчына адзначае куды больш чалавечнае стаўленне да затрыманых у чужой краіне.
У інтэрв'ю «Радыё Свабода» ён распавёў, што пракуратура Арменіі выдала пастанову яго адпусціць , бо паводле армянскага заканадаўства такія злачынствы, як «знявага дзяржаўных сімвалаў», не караюцца пазбаўленнем волі, як у Беларусі. Дэпартаваць Гуцалава не сталі. Аднак яшчэ больш за месяц ён не мог з“ехаць з Арменіі – аж пакуль не атрымаў паперу ад тамтэйшай Службы нацыянальнай бяспекі, што яго ў аднабаковым парадку здымаюць з вышуку.
Цяпер Яўген Гуцалаў вярнуўся ў Турцыю і зноў займаецца атрыманнем часовага дазволу на жыхарства.

**17.06.2023**
З дапамогай інфармацыі з Банку судовых рашэнняў удалося даведацца падрабязнасці пра дзяўчыну, з якой знялі «пакаяннае» відэа, уключанае ў анімацыйны ролік – ноў-хаў віцебскага тэлеграм-канала, блізкага да сілавікоў. Відэаролік быў змантаваны такім чынам, што замест твараў рэальных людзей глядач бачыць анімаваныя эмадзі. Дзяўчына ў відэаролiку распавядае пра сваю віну: маўляў, карысталася на працы тэрмакубкам за выявай герба «Пагоня» і надпісам «Жыве Беларусь». За гэта яе прызналі вінаватай у несанкцыянаваным пікетаванні і асудзілі да трох сутак арышту.

Месца працы дзяўчыны – Аршанскі льнокамбінат. Паводле яе паказанняў, кубак яна набыла ў краме, і таму не лічыла, што ён можа быць прадметам правапарушэння. Разам з ёй у пакоі працуюць 15 чалавек. Адмыслова свой уласны посуд яна нікому не дэманстравала, але навакольныя маглі заўважыць, што на напоўненым гарачай вадкасцю кубку праступае выява «Пагоні» і лозунг «Жыве Беларусь». Падобна, што работніцу льнокамбіната «здаў» нехта з калегаў: у адміністрацыйнай справе фігуруюць фотаздымкі, на якіх дзяўчына пазнала і сябе, і свой тэрмакубак. 31 траўня дзяўчыну затрымалі супрацоўнікі ГУБАЗіКа, 1 чэрвеня адбыўся суд. Паколькі адпаведнай заявы ў выканкам па дазвол на правядзенне пікетавання не падавалася, суд палічыў, што работніца Аршанскага льнокамбіната правяла несанкцыянаваную масавую акцыю ў асяродку супрацоўнікаў. Паводле артыкула 24.23 КаАП дзяўчыну пакаралі арыштам на трое сутак. «Кубак з выявай герба П. і надпісам Ж.» суд пастанавіў знішчыць.

**17.06.2023**

Як стала вядома, 13 чэрвеня лепельскія міліцыянты затрымалі ўладальніка аграсядзібы "Поўсвіж", музыку і збіральніка фальклору Васіля Шкіндзера.



14 чэрвеня суддзя Лепельскага раённага суда Наталля Сушко арыштавала яго на 15 сутак. Што стала падставай для арышту затрымання і арышту пакуль невядома.

Васіль Шкіндзер вядомы ў сваім раёне і па-за яго межамі сваёй апантанасцю беларушчынай. На сваёй сядзібе ён штогод з узгадненнем з уладамі ладзіў вядомы фэст "Жнівень", куды з'язджаліся беларускія музыкі, мастакі, рамеснікі ды іншыя аматары беларускай культуры. Таксама там праводзіліся мастацкія пленеры, майстар-класы рамеснікаў, выставы ды іншыя цікавыя імпрэзы.

Яшчэ Васіль Шкіндзер захапляецца турызмам і паганствам, з сябрамі ладзіць краяўнаўчыя вандроўкі, удзельнічае ў паганскіх святах і даглядае капішча са статуямі язычніцкіх багоў.

Раней сілавікі ў грамадскага актывіста з Лепельшчыны праводзілі таксама і ператрус, але нічога забароненага не знайшлі.

**17.06.2023**

Суддзя суда Полацкага раёна Яніна Марцулевіч 30 мая аштрафавала на 1110 рублёў выкладчыку Полацкага дзяржуніверсітэта Ганну Нанос за распаўсюд "экстрэмісцкіх" матэрыялаў у сацыяльных сетках. У 2020 годзе "правапарушальніца" была занесена на Дошку гонару ў раздзеле "Гонар універсітэта".

Судом было ўстаноўлена, што Ганна нібыта размясціла і захоўвала ў адкрытым доступе ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» на асабістай старонцы інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, да моманту выяўлення супрацоўнікамі Полацкага РАУС.

Зыходзячы з устаноўленых фактаў і на падставе ч.2 арт. 19.11 КаАП суддзя аштрафавала Нанос у даход дзяржавы на 1110 рублёў, а мабільны тэлефон «правапарушальніцы» пакінула пад арыштам як гарантыю выплаты штрафу.

**18.06.2023**

Пасля хвалі затрыманняў, якая прайшла ў ПДУ 23 траўня больш як дзясятку супрацоўнікаў былі прысуджаны арышты і штрафы па «палітычных» адміністрацыйных артыкулах: арт. 24.23 КаАП (несанкцыянаванае масавае мерапрыемства, пад якім сілавікі цяпер разумеюць размяшчэнне фотаздымкаў у інтэрнэце) і 19.11 КаАП (распаўсюд так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў). Адміністрацыя ВНУ вырашыла пазбавіцца ад «ненадзейных» супрацоўнікаў.

К паведаміў тэлеграм-канал «Позірк», гэтымі днямі рэктар ПДУ Юрый Раманоўскі падпісаў загады на звальненне сакратаркі дэканата гісторыка-філалагічнага факультэта Кацярыны Шаўлюга, выкладчыцы кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў Анастасіі Мазго, выкладчыцы кафедры замежных моў Святланы Панімашчанка, сакратаркі кафедры фізічнага выхавання і спорту Таццяны Чаркасавай. Следам за ёй дабраахвотна падала заяву на звальненне спецыяліст па суправаджэнні навучальнага працэсу кафедры фізічнай культуры і спорту Святлана Ніколіна». Раней было вядома, што адразу па адбыцці адміністрацыйных арыштаў былі звольненыя дацэнт кафедры гісторыі і турызму Віктар Чараўко і дацэнт кафедры канстытуцыйнага права і дзяржаўнага кіравання Сяргей Глазырын. Абодва адбылі «суткі» за распаўсюд так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. Ёсць інфармацыя, што звольнены і яшчэ адзін дацэнт ВНУ - Юрый Кежа. Следчыя ўстанавілі, шт о ён рабіў данаты розным фондам салідарнасці. І хаця выкладчык выплаціў усе належныя па законе сумы з вялікай «кампенсацыяй», на працы яго не пакінулі ўсё адно.

Масавыя звальненні выклікалі шырокі розгалас як у студэнцкім асяродку, так і ў супольнасці выкладчыкаў. Ёсць інфармацыя, што некаторыя загадчыкі кафедраў напісалі заявы, каб іх перавялі ў шэраговыя выкладчыкі, бо яны не хочуць уваходзіць у склад адміністрацыі ўніверсітэта, з якога звальняюць за грамадзянскую пазіцы. і палітычныя погляды.

**19.06.2023**

У Полацку 19 чэрвеня адбыўся суд над грамадскай актывісткай з Верхнядзвінска Валянцінай Болбат. Яе судзіла сумнавядомая суддзя Наваполацкага суда Зінаіда Балаболава, якая раней чатыры разы судзіла Валянціну, двойчы арыштоўвала на 10 сутак і давала вялікія штрафы па артыкуле 19.11 КаАП (распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў).



На Валянціну Болбат 29 красавіка верхнядзвінскімі міліцыянтамі было складзена некалькі пратаколаў па артыкуле 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапаганду такой дзейнасці) і часткі 3 артыкула 24.23 КаАП (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў).
Тады Верхнядзвінскі суд прысудзіў ёй 30 сутак арышту, міліцыянты адразу ў залі суда ўзялі яе пад варту. Але з жанчынай здарыўся гіпертанічны крыз, і яе адвезлі ў лякарню, дзе яна лячылася два тыдні. Валянціна аспрэчыла гэтую пастанову суда ў Віцебскім абласным судзе. 22 траўня суддзя абласнога суда Святлана Іванова адмяніла рашэнне суда Верхнядзвінскага раёна.
Але на гэтым усё не скончылася, справу грамадскай актывісткі перадалі ў Наваполацкі суд, дзе і быў вынесены новы прысуд Валянціне Болбат – 30 сутак арышту. На суд прыйшло яе падтрымаць столькі людзей, што ледзь хапіла ўсім месцаў.
Пакуль верхнядзвінская грамадская дзяячка на волі і зноў разам са сваім адвакатам плануе абскарджваць рашэнне Навапалоцкага суда ў вышэйшай інстанцыі.

**19.06.2023**

У Наваполацкай калоніі №1 адбывае тэрмін палітзняволены Андрэй Аляксандраў -- журналіст і медыяменеджар , асуджаны да 14-ці гадоў пазбаўлення волі адразу па чатырох артыкулах Крымінальнага Кодэксу. 6 кастрычніка 2022 г. яго прызналі вінаватым паводле ч. 2 арт. 342 (Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і падрыхтоўка альбо навучанне такой дзейнасці); ч. 1 арт. 356 (Здрада дзяржаве); ч. 1 арт. 361-1 (Удзел у экстрэмісцкім фарміраванні); ч. 2 арт. 243 (Ухіленне ад выплаты падаткаў і збораў).
Ліставанне з Андрэем Аляксандравым падтрымліваюць перадусім ягоныя сваякі: астатняе карэспандэнцыя найчасцей блакуецца. Са сціплых звестак пра Адяксандрава вядома, што ён вельмі істотна схуднеў, але працягвае займацца фізічнымі практыкаваннямі. Бо спорт быў адным з ягоных самых вялікіх захапленняў праз усё жыццё. Каб не адставаць ад навін, у калоніі ён выпісвае спартыўнае выданне «Прессбол», і гэта практычна адзіная магчымасць атрымліваць адносна аператыўную інфармацыю. Працуе Андрэй Аляксандраў на дрэваапрацоўцы.
Здарылася так, што адбываць пакаранне Андрэя Аляксандрава накіравалі ў горад, дзе ён распачынаў сваю журналісцкую дзейнасць: ён скончыў гістарычна-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту і пачынаў працаваць у Наваполацку, у незалежнай гарадской газеце «Хімік» і на мясцовым гарадскім тэлебачанні. Таму вельмі часта называў Наваполацк сваім родным горадам.
У 2009–2012 гадах Андрэй Аляксандраў быў намеснікам старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ), сёлета прызнанай беларускім КДБ экстрэмісцкім фарміраваннем.Са жніўня да лістапада 2020 году Аляксандраў супрацоўнічаў з краўдфаўндынгавай плятформай BY_help, якая дапамагала выплачваць адміністрацыйныя штрафы асуджаным за ўдзел у мірных пратэстах, гэта лягло ў аснову крымінальнага абвінавачання. Судзілі журналіста і медыяменеджэра ў такс званай «справе БелаПАН». У канцы студзеня 2023 г. асуджанага Андрэя Аляксандрава этапавалі ў наваполацкую ПК № 1. Гэтая калонія вядомая жорсткім стаўленнем да зняволеных. На сённяшні дзень там знаходзяцца 100 палітвязняў, у тым ліку блогер Ігар Лосік, журналіст-фрыленсер Андрэй Кузнечык, да нядаўняга часу там утрымлівалі і экс-прэтэндэнта на ўдзел у мінулых прэзідэнцкіх“ выбарах Віктара Бабарыку. Напрыканцы красавіка, непасрэдна з месца зняволення ён трапіў у Наваполацкі гарадскі шпіталь са слядамі збіцця. Калі інфармацыя пра гэты інцыдэнт трапіла ў незалежныя СМІ, Віктара Бабарыку тэрмінова вывезлі з наваполацкага шпіталю, і дзе ён цяпер знаходзіцца, застаецца не вядомым.

**20.06.2023**

У траўні гэтага году наведнікі народнага мемарыялу, узведзенага ў памяць пра ахвяр сталінізму, расстраляных каля вёскі Хайсы Віцебскага раёну, убачылі скрушную карціну. Невядомыя вандалы паламалі некалькі крыжоў, знішчылі мемарыяльныя шыдьды і ўказальнікі да ямін у лесе, дзе ў 1930-я гады адбываліся расстрэлы так званых «ворагаў народу». Гэтыя факты пацвярджаюцца ўспамінамі мясцовых жыхароў і іх нашчадкаў. Але мемарыялізаваць гэтыя мясціны ўпарта не пагаджаюцца мясцовыя ўлады: яны не заўважаюць існавання месца трагедыі. Цяпер і аддзел міліцыі Віцебскага раёну адмовіўся праводзіць праверку па фактах вандалізму.
Зварот ў міліцыю накіраваў праваабаронца Павел Левінаў. Ён прасіў даць прававую ацэнку дзеянням невядомых, якія папсавалі самаробны мемарыял, створаны ўдзельнікаў ініцыятывы «Хайсы - віцебскія Курапаты» і неабыякавымі грамадзянамі, якія шануюць гістарычную памяць. Адказ Паўлу Левінаву быў кароткі: маўляў, супрацоўнікі міліцыі правялі праверку і не знайшлі падставаў для наступных дзеянняў. Інакш кажучы, Віцебскі РАУС адмовіўся распачынаць адміністрацыйныя або крымінальныя справы па фактах вандалізму ў «віцебскіх Курапатах». Сёлетні выпадак вандалізму – не першы ў гісторыі народнага мемарыялу ў Хайсах. У 2015-м годзе стваральнік ініцыятывы Ян Дзяржаўцаў ужо звяртаўся ў міліцыю Віцебскага раёну з нагоды знікнення некалькіх крыжоў. Тады ён напісаў заву як уласнік маёмасці, якую скралі невядомыя. Была заведзена адміністрацыйная справа, на месца выязджалі супрацоўнікі міліцыі і з іх дапамогай нават удалося знайсці некалькі крыжоў, зламаных і патопленых у балаціне. Аднак вінаватых не сталі шукаць і тады: Яну Дзяржаўцаву далі адказ, што адміністрацыйную справу спыняюць, бо ён панёс надта нязначны матэрыяльны ўрон.

**20.06.2023**




Зараз палітвязень, сузаснавальнік партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» пісьменнік і журналіст Павел Севярынец знаходзіцца ў Шклоўскай калоніі. Але 21 чэрвеня мае адбыцца суд па замене рэжыму ўтрымання і пераводзе ў іншую папрўчую ўстанову. Пра тое, што пераводу з калоніі не пазбегнуць, напісала ў Фэйсбуку маці палітвязня, Таццяна Севярынец: «Паўла пераводзяць на турэмны рэжым. Калі і куды, не ведаем».
Ужо тры гады Павел Севярынец знаходзіцца за кратамі: у маі 2021-га году яму і яшчэ шасці палітвязням у закрытым судовым працэсе прысудзілі ад чатырох да сямі гадоў калоніі. Севярынца прызналі вінаватым паводле ч. 1 артыкула 13 і ч. 2 артыкула 293 Крымінальнага кодэкса (Падрыхтоўка да ўдзелу ў масавых беспарадках) і асудзілі да 7 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Адбываць пакаранне Паўла Севярынца накіравалі Шклоўскую ПК №17. сёлета ў красавіку адміністрацыя прызнала Паўла злосным парушальнікам рэжыму. Тады Яму скарацілі дазволеную колькасць званкоў дадому і грашовых пераводаў, а пазней пазбавілі і працяглага спаткання. Паводле звестак ад родных палітвязня, яго перыядычна караюць знаходжаннем у ПКТ і ШІЗА, дзе ён зусім нядаўна адбыў 5 дзён.
Былыя вязні, якія вызваліліся са Шклоўскай калоніі, распавядаюць пра Паўла Севярынца, што ён заўсёды карыстаецца беларускай мовай, пры магчымасці наведвае царкву, і ахоўнікі пільна сочыць за тым каб ен не займаўся «агітацыяй» іншых зняволеных.

**21.06.2023**

Жанчыну затрымалі 6 чэрвеня, на той час яе муж ужо 4 месяцы знаходзіўся ў віцебскім СІЗА-2. Пасля таго, як туды змясцілі і Таццяну Пыцько, іх аднагадовую дачку забралі пад апеку дзяржавы ў дзіцячы шпіталь, неузабаве яе маюць перавесці ў Дом дзіцяці. Сваякі Таццяны Пыцько збіраюць дакументы дзеля афармлення апякунства над малой. Тым часам стала вядома, што жонку палітзняволенага відэааператара-фрылансера вінавацяць за дапамогу мужу: супраць Вячаслава Лазарава распачата крымінальная справа паводле арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса («спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці») за сувязь з недзяржаўным СМІ, прызнаным у Беларусі экстрэмісцкім фарміраваннем.
Таццяне Пыцько прад“яўлена абвінавачанне паводле 361-1 КК РБ («стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або ўдзел у ім». Ёсць падставы меркаваць, што вядзецца менавіта пра ўдзел: пасля затрымання Вячаслава Лазарава ў следчых апынуўся ягоны відэаархіў, дзе на відэазапісах прысутнічае Таццяна Пыцько. Тых, каго ўдалося ідэнтыфікаваць па здымках, пачалі выклікаць на допыты ў СК і распытваць пра ролю жонкі ў аператарскай працы яе мужа. У сакавіку гэтага году беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Вячаслава Лазарава палітвязнем. 21 чэрвеня праваабаронцы прызналі палітычнай зняволенай і ягоную жонку Таццяну Пыцько. У адпаведнай заяве гаворыцца: «МУС і КДБ у пазасудовым парадку адвольна прызнаюць экстрэмісцкімі групы грамадзян, якія аб'яднаныя грамадскімі

ці палітычнымі інтарэсамі, крытыкуюць дзеянні ўладаў і патрабуюць зменаў у дзяржаве і палітыцы, што яна праводзіць, таксама экстрэмісцкімі фармаваннямі прызнаныя некаторыя СМІ. Гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да адвольнага прыцягнення да крымінальнай адказнасці і пазбаўлення волі іх удзельнікаў і рэспандэнтаў у якасці непрапарцыйнай меры абмежавання права на асацыяцыю і свабоды выказвання меркаванняў». Таццяна Пыцько трапіла ў поле зроку сілавікоў падчас мірных маршаў пратэсту ў верасні 2020г. Яе двойчы штрафавалі «за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах». У выніку жанчына страціла працу: была вымушана сысці са школы ў аграгардку Акцябрскі, дзе выкладала рускую мову і літаратуру. У сакавіку 2022г. яна пабралася з Вячаславам Лазаравым, і апошнім часам займалася выключна выхаваннем дзяцей – наймалодшай Евы Лазаравай і старэйшых сына і дачкі ад першага шлюбу.

**21.06.2023**
Суддзя суда Расонскага раёна Рада Даміціч 6 чэрвеня пастанавіла арыштаваць на 7 сутак генеральнага дырэктара ТАА Алега Несцяровіча. Прычынай пазбаўлення волі «правапарушальніка» стала тое, што ён быў падпісаны на відэахостынг "NEXTA", унесены ўладамі ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Прадпрымальнік у судовым паседжанні патлумачыў, што дастаткова даўно адпісаны ад Telegram-канала "NEXTA" з якога рабіў рэпост нейтральнага зместу сваёй дачкі. На Youtube гэты ж канал падпісаны, але даўно ім не карыстаўся, а адпісацца забыўся.
Таксама ён не ведаў пра тое, што гэтыя каналы ўключаны судамі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
На гэтых падставах Несцяровіч прасіў аб прымяненні да яго адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе штрафу.
Аднак суддзя Даміціч, палічыла доказы, прад'яўленыя работнікамі мясцовага РАУС дастатковымі для таго, каб прызнаць Алега Пятровіча вінаватым у здзяйсненні правапарушэння, прадугледжанага ч.2 арт.19.11 КаАП, і таму падвергла Несцяровіча адміністрацыйнаму арышту на тэрмін сем сутак з канфіскацыяй прыналежнага яму тэлефона.

**21.06.2023**
8 лютага ў абласным судзе Гродна журналіст і адзін з лідараў незалежнага Саюза палякаў Беларусі быў асуджаны да 8 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах ўзмоцненага рэжыму. Яго прызналі



вінаватым паводле арт. 361 Крымінальнага кодэкса («Заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь») і арт. 130 Крымінальнага кодэкса («распальванне варожасці ці варажнечы»).
У абвінавачанні супраць журналіста гаварылася, што Пачобут у медыях назваў агрэсіяй напад СССР на Польшчу ў 1939 годзе. Таксама яму інкрымінавалі заявы ў абарону польскай меншасці ў Беларусі, артыкулы ў Gazeta Wyborcza пра беларускія пратэсты ў 2020-м і тэкст у Magazyn Polski, напісаны ў 2006 годзе і прысвечаны Анатолю Радзівоніку, аднаму з камандзіраў польскага антыкамуністычнага падполля на Гродзеншчыне.
4 кастрычніка 2022 г. КДБ дадаў журналіста ў спіс асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці. Разгляд справы журналіста неаднаразова пераносілі, і да суду ён адбыў за кратамі амаль два гады.

31 сакавіка 2021г. беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Анджэя Пачобута палітычным зняволеным. Гэты статус быў яму нададзены ўжо другі раз: у 2011 г. Гродзенская абласная пракуратура распачала супраць журналіста крымінальную справу за абразу і паклёп на Аляксандра Лукашэнку. Судовы працэс быў закрытым, у выніку Пачобута асудзілі за паклёп да трох гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай на два гады. Абвінавачанне ў абразе Аляксандра Лукашэнкі з журналіста знялі, ён быў апраўданы і вызвалены ў залі суду. Тады Пачобут правёў у СІЗА два месяцы і страціў больш за 20 кілаграмаў вагі. Наваполацкая калонія №1, куды этапавалі Анджэя Пачобута, мае кепскую славу праз жорсткае абыходжанне прадстаўнікоў адміністрацыі са зняволенымі . Тут зараз утрымліваюцца каля сотні палітвязняў У тым ліку журналісты Ігар Лосік , Андрэй Кузнечык і Андрэй Аляксандраў.

**22.06.2023**
Віцебскі музыка і арт-менеджар бедзе адбываць пакаранне ў папраўчай калоніі ў Бабруйску. Пра гэта праваабаронцам паведамілі ягоныя сваякі. Сёлета ў траўні суд Першамайскага раёну Віцебска прызнаў Уладзіміра Булаўскага вінаватым паводле арт. 342-2 Крымінальнага Кодэксу (Неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў). Суддзя Міхаіл Юрчанка

пастанавіў яго пакараць двума гадамі калоніі.
Падставай для крымінальнай справы сталі 10 фотаздымкаў, якія Уладзімір Булаўскі размясціў у сацсетках ВКонтакте и Instagram на працягу 2014- 2021 гадоў. На гэтых здымках былі бел-чырвона-белыя сцягі, і суд расцаніў гэта як правядзенне несанкцыянаванага пікетавання. Раней, на працягу бягучага году, Булаўскі таксма быў асуджаны за несанкцыянаванае пікетаванне. Супраць яго былі распачатыя адміністрацыйныя справы паводле арт. 24.23 КаАП, якія скончыліся для музыкі і артменеджара арыштамі на 15 і 30 сутак. Уладзімір Булаўскі, вядомы ў Віцебску арганізатар выступаў беларускіх выканаўцаў і гуртоў, быў затрыманы 14 снежня мінулага году і асуджаны да 15 сутак арышту паводле абвінавачання ў «распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў». Але на волю ён не выйшаў: супраць яго распачалі крымінальную справу і перавялі ў віцебскі СІЗА-2. Тамсама ён знаходзіўся і пасля суду, пакуль не было вызначана месца, дзе ён мае адбываць пакаранне. 6 лютага 2023 года беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Уладзіміра Булаўскага палітычным зняволеным.

**23.06.2023**
Паводле інфармацыі, атрыманай з праўладных тэлеграм-каналаў, доўгі час 40-гадовы мужчына ў сацыяльных сетках «агітаваў людзей выходзіць на барыкады, пускаць цягнікі пад адхоны, і ладзіць фізічныя расправы над сілавікамі». Палітвязень, з 20 студзеня 2023 года, знаходзіцца ў Віцебскім абласным следчым ізалятары.
У дадзены момант, на Зміцера заведзена крымінальная справа па чатырох артыкулах. Гэта арт. 368 (абраза Лукашэнкі), арт. 369 (Знявага прадстаўніка ўлады), арт. 130 (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці іншай сацыяльнай варожасці або варожасці), арт. 361-4 (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

**23.06.2023**
25 мая на рэсурсе «Зручны горад» была размешчана петыцыя №5619, у якой 55 падпісантаў звярнуліся ў пракуратура Віцебскай вобласці і Дэпартамент выканання пакаранняў МУС прадаставіць грамадскасці інфармацыю пра стан здароўя і месцазнаходжанне вязня Наваполацкай папраўчай калоніі №1 Віктара Бабарыка. Аднак і пракуратура, і Упраўленне ДВП па Віцебскай вобласці па фармальных прычынах ухіліліся адказаць, дзе знаходзіцца палітвязень і што з ім.




Першым на петыцыю адрэагавала пракуратура. Намеснік пракурора Віцебскай вобласці Ігар Белавусаў не стаў разбірацца, па сутнасці, звароту. Ён толькі паведаміў падпісантам аб тым, што на пастаўленыя імі пытанні павінна адказаць кіраўніцтва абласнога УДВП.
Часовы начальніка ўпраўлення ДВП Раман Малаканаў паведаміў грамадзянам аб тым, што іх патрабаванні паведаміць праўду пра Віктара Бабарыка ён не можа. Для таго, каб ён гэта зрабіў, заяўнікамі павінны быць прадстаўлены "дакументы, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы прадстаўляць інтарэсы асуджанага Бабарыка В.Д.". А раз такія дакументы не былі прыкладзеныя да заявы, то міліцэйскі чыноўнік, пакідае зварот без разгляду, па сутнасці.

**24.06.2023**
На сайце МУС у мінулую пятніцу з“явілася папаўненне «Пераліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці». Да «экстрэмісцкага спісу» дадлі адразу 66 асобаў, сярод іх – добра вядомы ў Віцебску Уладзімір Булаўскі, асуджаны паводле артыкула 342-2 Крымінальнага Кодэкса (Неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў).
Уладзімір Булаўскі адбывае пакаранне ў Бабруйскай ПК №2. Ён асуджаны на двух гадоў утрымання ў папраўчай установе ва ўмовах агульнага рэжыму. Прысуд вынес суддзя Міхаіл Юрчанка (суд Першамайскага раёну г.Віцебска)
Булаўскага абвінавацілі за наяўнасць у сацыяльных сетках фотаздымкаў з бел-чырвона-белымі сцягамі, размешчаных тым на працягу 2014- 2021 гадоў. Суд улічыў, што на працягу бягучага году Булаўскі быў двойчы асуджаны па адміністрацыйным артыкуле 24.23 КаАП (парушэнне заканадаўства аб арганізацыі і правядзенні масавых мерапрыемстваў) артыкуле. Першы раз ён быў асуджаны на 15 сутак арышту 28 лютага 2022г. за тое, што выйшаў з жоўта-блакітнай стужкай на адзенні ў цэнтр Віцебску. Пазней, 7 ліпеня 2022г., яго асудзілі да 30 сутак арышту за наяўнасць у сацыяльных сетках тых самых фотаздымкаў з бел-чырвона-белымі сцягамі. Пасля адбыцця арышту здымкі не былі выдаленыя, гэта было кваліфікавана як працяг адміністрацыйнага правапарушэння і стала падставай для

завядзення крымінальнай справы.
На судзе Уладзімір Булаўскі тлумачыў, што падчас ранейшых затрыманняў у яго забіралі мабільныя тэлефоны, і ён страціў доступ да некаторых старонак у сацыяльных сетках. Што да іншых публікацый, то ён не аспрэчваў, што яны былі зроблены ім асабіста. Але свае віны ў тым, што такім чынам праводзілася пікетаванне, Уладзімір Булаўскі не прызнаў. Суддзя Міхаіл Юрчанка падтрымаў выснову следства пра тое, што мужчына «меў злачынны намер публічна выражаць свае асабістыя і грамадска-палітычныя інтарэсы». 6 лютага беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Уладзіміра Булаўскага палітычным зняволеным.

**25.06.2023**
Глыбоцкі суд у асобе суддзі Андрэя Тарасевіча 13 чэрвеня прысудзіў 15 сутак арышту беспрацоўнаму Андрэю Гутару. Яго судзілі паводле двух артыкулаў - частцы 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуючай такую дзейнасць) і частцы 1 артыкула 24.23 КаАП (Парушэнне парадку правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі, пікетавання, іншага масавага мерапрыемства).
Падставай стала тое, што ў сваёй сацыяльнай сетцы “Вконтакте” Андрэй Гутар размясціў дзве публікацыі з выявамі нацыянальнага бел-чырвона-белага сцяга. Паводле суда, ён такім чынам выказаў свае погляды на падзеі грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі, што палічылі пікетаваннем без згоды ўладаў. А таксама пільныя органы ў асобе віцебскіх міліцыянтаў заўважылі на асабістым акаўнце мужчыны ў ютубе так званыя экстрэмісцкія матэрыялы.
За гэта суддзя Глыбоцкага суда Андрэй Тарасевіч прысудзіў беспрацоўнаму, які гадуе малалетняе дзіця, па двух вышэйзгаданых артыкулах 7 і 8 сутак адпаведна, што агулам склала 15 сутак арышту з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння.

**26.06.2023**

У сацыяльных сетках ураджэнкі Вушаччыны міліцыянты заўважылі выявы сцяга Украіны і іншыя малюнкі на тэму расейскага вайсковага нападу, а таксама рэпосты з інфармацыйных рэсурсаў, прызнаных «экстрэмісцкімі». Суддзя суду Полацка і Полацкага раёна Яніна Мацулевіч аштрафавала жанчыну агулам на 120 базавых велічынь, што складае 4 440 рублёў, паводле двух артыкулаў: 24.23 КаАП («незаконнае пікетаванне», штраф 3330 рублёў, або 90 базавых велічынь) і 19.11 КаАП (распаўсюд «экстрэмісцкай» інфармацыйнай прадукцыі).
Жанчына выхоўвае дваіх дзяцей, і тым ліку дашкольніцу Івону – у яе гонар Таццяна Кандрацкая назвала і сетку сваіх крамаў, якія гандлююць кветкамі, цацкамі і іншымі таварамі для падарункаў. Крамы працуюць у Полацку, Наваполацку, Вірхнядзвінску, Мёрах, Вушачах. Таццяна Кандрацкая скончыла юрыдычны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту, добра валодае беларускай мовай. У 2020-м годзе яна запісала свае разважанні пра палітычную сітуацыю ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, дзе казала: «Будзе шмат крыві, шмат слёз, але гэты этап трэба прайсці, каб зрабіць якасны вiток. Не ўсё так проста, не ўсё так лёгка». Гэтае відэа набрала каля 2 тысяч праглядаў.

**27.06.2023**
Гаворка ідзе пра палітвязня Яраслава Казакевіча, які яшчэ ў мінулым годзе зняў на відэа перасоўванне расейскай вайсковай тэхнікі праз Аршанскі чыгуначны вузел.
Адзнятае відэа ён даслаў "экстрэмісцкім" каналам, за што 9 снежня мінулага года быў затрымалі. Напачатку “сілавікі” не ведалі, што ў дадзеным выпадку рабіць, таму заялі на яго адміністратыўную справу, паводлі якой суд арыштаваў Яраслава на 15 сутак.
Але пазней следчыя и суд вырашылі, што адпраўка відэа на "забаронены" канал можа лічыцца ўдзелам у экстрэмісцкай дзейнасці і Казакевіч атрымаў два гады зняволення.
Зараз Яраслаў знаходзіцца ў Віцебскім СІЗО №2.
Лісты падтрымкі трэба дасылаць на адрас: СІЗО-2, вул. Гагарiна, 2, 210026, г. Віцебск. Казакевічу Яраславу Васільевічу.

**27.06.2023**

З 18 лістапада мінулага года жыхар Віцебска адбывае тэрмін у папраўчай калоніі № 9. З таго часу адміністрацыя карнай ўстановы ўвесь час “ціснула” на палітзняволенага. Яго неаднаразова змяшчала ў ШІЗА, а нядаўна супраць яго ўзбудзіла крымінальную справу па ч. 1 арт. 411 (Злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі). У хуткім часе над ім адбудзецца чарговае судзілішча.



Жыхар Віцебска Алег Яфрэменка быў абвінавачаны па артыкуле аб гвалце да супрацоўніка МУС (арт. 364 Крымінальнага кодэксу). Згодна прысуду, ён падчас вулічнага шэсця 13 верасня 2020 года ў горадзе Віцебску зрабіў падсечку міліцыянту — той упаў і падрапаў далоні.

Суддзя суду Першамайскага раёна Віцебску Наталля Карабліна 9 снежня 2020 асудзіла яго да пазбаўлення волі тэрмінам на чатыры з паловай гады з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі агульнага рэжыму.

15 жніўня 2022 года ў судзе Ленінскага раёна Магілёва быў вынесены чарговы прысуд мужчыне, паводле ч. 1 арт. 411 Крымінальнага кодэкса. Суддзя Вікторыя Палякова дадала палітвязню да першага тэрміну, яшчэ адзін год зняволення.

Падтрымайце Алега тэлеграмамі, лістамі і паштоўкамі: ПК № 9, 213410, г. Горкі, вул. Дабралюбава, 16, Алег Віктаравіч Яфрэменка.

**28.06.2023**

Актывістка з Верхнядзвінску спрабавала абскардзіць пастанову, вынесеную 19 чэрвеня суддзёй Наваполацкага суду Зінаідай Балаболавай: тая прысудзіла Валянціне Болбат 30 сутак арышту за парушэнне ч 2. арт. 19.11 КаАП і ч. 3 арт. 24.23 КаАП. Абласны суд скаргу не падтрымаў і пакінуў рашэнне суду першай інстанцыі без зменаў.

Зінаіда Балаболава пакарала адну са найстарэйшых актывістак паводле міліцэйскіх пратаколаў, складзеных 29 красавіка. На старонцы спадарыні Валянціны ў сацыяльнай сетцы «Одноклассники» міліцыянты знайшлі відэа з інтэрнэт- рэсурсу, прызнанага экстрэмісцкім, і гэта было кваліфікавана як распаўсюд экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыі (ч 2. арт. 19.11 КаАП ). Тамсама была знойдзена выява бел-чырвона-белага сцяга, і складальнікі пратаколу расцанілі гэта як правядзенне несанкцыянаванага пікетавання. Паколькі за падобныя правапарушэнні жанчыну судзілі ўжо не аднойчы, яе дзеянні былі кваліфікаваныя як паўторныя (па ч. 3 арт. 24.23 КаАП). Гэта ўжо не першы арышт, прысуджаны вядомай актывістцы з Верхнядзвінску. Умовы, у якіх яе ўтрымлівалі за кратамі, істотна пахіснулі здароўе Валянціны Болбат. Яна перанесла гіпертанічны крыз, мае праблемы з сэрцам, і з тае прычыны некалькі разоў трапляла ў шпіталь пасля знаходжання ў Наваполацкім ЦІПе. Апрача гэтага, жанчына мае запазычанасці па прысуджаных раней адміністрацыйных штрафах. Усяго Валянціну Болбат сёлета судзілі паводле арт.19.11 КаАП і 24.23 КаАП шэсць разоў.

**29.06.2023**

Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Наталля Карабліна 31 траўня пастанавіла арыштаваць на 15 сутак за правядзенне пікетавання ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» жыхара Віцебска працуючага кур'ерам Уладзіміра Казлова. Таксама тая ж суддзя 19 чэрвеня за распаўсюд «экстрэмізму» ў сацыяльных сетках пакарала Уладзіміра такім жа чынам.

Паводле рапарту супрацоўніка 7-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК вынікае, што Казлоў сацыяльнай сеткі на сваёй старонцы размясціў фатаграфіі, якія змяшчалі фота мужчыны на фоне бел-чырвона-белага колеру і з гербам «Пагоня». З гэтага суддзя зрабіла выснову, што «правапарушальнік» публічна выказаў свае погляды на падзеі грамадска-палітычнага жыцця на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Прычым Казлоў правёў пікет без дазволу мясцовых органаў улады.

Таму, суддзя Карабліна кваліфікавала дзеянні мужчыны як адміністрацыйнае парушэнне і ў межах ч.1 арт.24.23 КаАП пастанавіла пакараць Казлова на 15 сутак.

Пры вынясенні рашэння, суддзя, у парушэнні адміністрацыйнага закона, не ўлічыла наяўнасць у «правапарушальніка» змякчальных абставінаў - наяўнасць у яго малалетняга сына.

**29.06.2023**

Былога кандыдата ў прэзідэнты на выбарах 2020 г., сузаснавальніка і сустаршыню аб'яднання "Говори правду" прызналі вінаватым паводле арт. 342 Крымінальнага кодэкса («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх»). Суд Маскоўскага раёна Мінска пакараў Дзмітрыева пазбаўленнем волі на паўтара гады ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.



Паводле следства, відавочная віна Андрэя Дзмітрыева палягае ў тым, што ён «занадта часта ездзіў за мяжу»: маўляў, палітык палітык «599 разоў перасякаў дзяржаўную мяжу Беларусі, з іх 33 — пасля 2020 года», а «наяўнасць кантактаў у Дзмітрыева з прадстаўнікамі Захаду і ЗША можа сведчыць аб каардынацыі яго «палітычнай» дзейнасці з-за мяжы».

28 чэрвеня ён пераведзены з СІЗА-1 у віцебскую ПК №3. На сенняшні дзень у гэтай калоніі цяпер утрымліваюцца 104 палітвязні, сярод якіх юрыст штаба Бабарыкі Максім Знак, праваабаронца Леанід Судаленка, экс-дырэктар БелаПАН Дзмітрый Наважылаў, актывіст Максім Вінярскі і іншыя.

Раней Андрэй Дзмітрыеў ужо быў палітвязнем. У 2010 годзе ён кіраваў выбарчым штабам Уладзіміра Някляева на прэзідэнцкіх выбарах, быў затрыманы 19 снежня 2010 года і змешчаны ў СІЗА КДБ. 3 студзеня 2011 году вызвалены з падпіскай аб нявыездзе. Быў абвінавачаны ў арганізацыі масавых беспарадкаў, пазней у арганізацыі дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, ці ўдзеле у іх, за што суд Фрунзенскага раёна Мінска пакараў Дзмітрыева двума гады пазбаўлення волі ўмоўна з выпрабавальным тэрмінам на 2 гады.

**30.06.2023**

Суддзя суда Гарадоцкага раёна Алена Віхаценка пакарала Аляксандра Баля арыштам тэрмінам на 15 сутак за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у сацыяльных сетках. Адміністрацыйная справа пачалася з таго, што ў аператыўна-дзяжурную службу Гарадоцкага РАУС паступіла паведамленне супрацоўніка памежнага паста ў г. п. Езярышча, які пры аглядзе тэлефона Баля знайшоў у ім падпіскі на каналы, уключаныя ў спіс экстрэмісцкіх.

Міліцыянты склалі пратакол на "правапарушальніка" за тое, што Аляксандр на сваім тэлефоне ў асяроддзі месэнджэра "Тэлеграм" захоўваў інфармацыйную прадукцыю канала "Павел Латушка", якую раней па рашэнні суда была прызнанага экстрэмісцкай.

Суддзя Віхаценка пагадзілася з пазіцыяй работнікаў міліцыі і прыйшла да высновы, што мужчына, учыніў правапарушэнне, г.зн. захоўваў і распаўсюджваў інфармацыю, якая ўключана ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. На гэтай падставе суддзя пакарала арыштам "правапарушальніка" ў рамках ч. 2 арт. 19. 11 КаАП, а таксама канфіскавала ў даход дзяржавы ягоны тэлефон.

## Ліпень

**02.07.2023**



Суддзя Віцебскага абласнога суда Святлана Іванова 2 чэрвеня адхіліла скаргу святара Аляксандра Шаўцова на рашэнне суда Полацкага раёна і г. Полацка. Гэта азначае, што пастанова ад 26 траўня раённага суда застаецца без змены і Шаўцоў будзе вымушаны адбыць 15 арыштаў за распаўсюд у сацыяльных сетках "экстрэмісцкіх" матэрыялаў.

У скарзе Шаўцоў аспрэчваў законнасць і абгрунтаванасць прынятага па яго справе рашэння. Ён паведаміў у абласны суд, што не згодны з вынесеным пакараннем, палічыў яго суровым і несправядлівым. І з улікам усіх абставін справы і ягонай асобы, прасіў замяніць прысуджаны арышт на штраф.

Пры разглядзе справы ў судзе другой інстанцыі быў зачытаны рапарт оперупаўнаважанага аддзела крымінальнага вышуку Полацкага РАУС з якога вынікала, што ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» ў акаўнце святара знаходзілася інфармацыя суполкі «Хартыя 97», якая ўключаная ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. У судзе «правапарушальнік» не адмаўляў гэтага факта.

На думку суддзі Івановай, Полацкі суд правільна расцаніў дзеянні Шаўцова як захоўванне і распаўсюд інфармацыю, змест якой "накіраваны на дэстабілізацыю грамадска-палітычнай абстаноўкі ў грамадстве і дзяржаве, распальванне сацыяльнай варожасці паміж рознымі сацыяльнымі групамі." Таму суд першай інстанцыі правільна ўжыў пакаранне, прадугледжанае ч.2 арт.19.11 КаАП, адміністрацыйны арышт і пры гэтым улічыў змякчальную акалічнасць - наяўнасць у «правапарушальніка» малалетняга дзіцяці.

Суддзя абласнога суда не знайшла парушэнняў працэсуальнага закона, якія перашкодзілі Полацкаму

суду ўсебакова, поўна і аб'ектыўна даследаваць абставіны справы аб адміністрацыйным правапарушэнні, або маглі паўплываць на вынясенне законнай і абгрунтаванай пастановы.
Зыходзячы з гэтых абставін, суддзя Іванова вырашыла, пастанову суддзі суда Полацкага раёна і г. Полацка ад 26 мая 2023 года ў дачыненні да Аляксандра Шаўцова пакінуць без змены, а яго скаргу - без задавальнення.

**03.07.2023**
У папраўчай калоніі №1 (Наваполацк) пазбавілі зняволеных магчымасці тэлефанаваць сваім родным і блізкім. Тым самым адміністрацыя наваполацкай калоніі парушыла законнае права зэкаў, на чатыры тэлефонныя званкі ў месяц і адзін відэазванок праз месэнджэр Skype (Viber). Некаторыя вязні не змаглі паразмаўляць са сваякамі ўжо больш за 20 дзён, што перашкаджае асуджаным падтрымліваць сацыяльныя сувязі і перавыхоўвацца.
Як стала вядома праваабаронцам, у ВК №1, якая знаходзіцца ў прамзоне Наваполацкага НПЗ, вязням адміністрацыя заяўляе, што іх нібыта няма каму вадзіць на званкі, бо частка начальнікаў атрадаў з'ехала на вучобу, а аператыўныя работнікі знаходзяцца ў адпачынках, а замяніць іх нібыта няма каму. А таксама начальнікі кажуць аб тым, што ў будучыні не будуць кампенсаваны дадатковымі магчымасцямі патэлефанаваць дадому, каб аднавіць права на вызначанае законам сацыяльных кантактаў.

**04.07.2023**
30 чэрвеня адбылося чарговае папаўненне спіса экстрэмісцкіх матэрыялаў. На гэты раз у яго трапілі сацыяльныя сеткі сайта “Вольнае Глыбокае”. Старонка ва «Укантакце» «Volnaye Hlybokaye» і Instagram-старонка «Вольное Глубокое». Як вядома, папулярную ў рэгіёне газету “Вольнае Глыбокае” яе заснавальнік Уладзімір Скрабатун закрыў з-за эканамічных праблемаў два гады таму, і з 1 студзеня 2021 года ў Віцебскай вобласці спыніўся яе выпуск.
Газета “Вольнае Глыбокае” была апошнім незалежным друкаваным выданнем у Віцебскай вобласці. Яна праіснавала роўна 26 гадоў і ў лепшыя гады мела тыраж 5 тысяч экзэмпляраў. Заставаўся толькі сайт, але і ён блакаваўся ўладамі некалькі разоў. Апошнім часам навіны ў сацыяльных сетках пачалі набіраць папулярнасць, але і да іх дайшла чарга. Улады вырашылі зрабіць іх экстрэмісцкімі.
Увогуле ў Беларусі назіраецца такая тэндэнцыя, што ўсё, што робіцца не ўладамі па-беларуску ці спрыяе развіццю беларускай гісторыі, культуры, традыцыям, становіцца экстрэмісцкім і вынішчаецца.
Дарэчы, у гэты ж дзень сайт «Будзьма беларусамі» і тэлеграм-канал «budzma.org» таксама прызнаныя экстрэмісцкімі. Гэта цалкам культурніцкі праект, скіраваны на папулярызацыю беларускай гісторыі і сучаснай культуры
Да гэтага спісу дадалі і Telegram-канал і чат «Ушачи», відэазапіс «Ябатек начали задерживать / Фельетоны Лупача».

**04.07.2023**
Суддзя суда Докшыцкага раёна Вячаслаў Елісеенка 22 чэрвеня пастанавіў арыштаваць на 10 сутак механізатара ААТ "Барсучанка" Ігара Пашкевіча. Вяртанне бацькі з кароткатэрміновага зняволення будуць чакаць жонка і чатыры малалетнія дзіцяці.
Суддзя прыняў да ўвагі паведамленне ад работнікаў мясцовага раённага аддзела міліцыі, што Пашкевіч захоўваў у адкрытым доступе на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» лагатып канала «Белсат», які ўключаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
На падставе гэтага суддзя Елісеенка вырашыў згодна ч.2 арт.19.11 КаАП арыштаваць на дзесяць сутак механізатара Пашкевіча і канфіскаваць прыналежны яму мабільны тэлефон з дапамогай, якой было здзейснена адміністрацыйнае правапарушэнне.

**05.07.2023**
Суддзя суда Чашніцкага раёна Таццяна Заруба 20 чэрвеня пакарала арыштам на 15 сутак Ігара Муравіцкага. Па версіі ўладаў "правапарушальнік" правёў у сацыяльных сетках пікет, на які не атрымаў дазволу ў чыноўнікаў мясцовага райвыканкама, а падчас масавага мерапрыемства выказваў свае грамадска-палітычныя інтарэсы.
Згодна з пратаколам паступіўшага ў суд з міліцыі, Муравіцкі ў жніўні 2020 года ў Віцебску сфатаграфаваўся побач з аўтамабілем, пафарбаваным у бел-чырвона-белы колер, на якім быў надпіс "Жыве Беларусь". Але для правядзення масавага мерапрыемства ён не меў дазволу ад кіраўніцтва Чашніцкага райвыканкама.
У судзе «правапарушальнік» патлумачыў, што прызнае факт таго, што ён сапраўды зрабіў фота на фоне «жывемабіля» і выклаў яе сваёй асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы «ВКантакце». Пры гэтым ён не меў мэты на правядзенне пікетавання і публічна выказаць свае палітычныя погляды.

Тым не менш суддзя Заруба пагадзілася з версіяй працаўнікоў мясцовага РАУС і палічыла даказанай віна Муравіцкага ў правядзенні недазволенага ўладамі пікету. На гэтай падставе судом была прынята пастанова арыштаваць мужчыну на 15 сутак за ўчыненне ім правапарушэння, прадугледжанага ч.1 арт. 24.23 КаАП.

**06.07.2023**

Суддзя суда Лёзненскага раёна Аляксей Лапушынскі 19 чэрвеня за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў пастанавіў пакараць штрафам у памеры 1110 рублёў работніка ААТ «Нафтан» жыхара Полацка Мікіту Белавусава, а таксама канфіскаваць прыладу адміністрацыйнага правапарушэння - мабільны тэлефон, які належыў «правапарушальніку».

Наяўнасць у Нікіціным тэлефоне "экстрэмізму" была выяўлена раніцай 17 чэрвеня пагранічнікамі на пагранічным пункце пропуску, размешчаным на 42-м км аўтадарогі Р-21 "Віцебск-Лёзна-Мяжа Расійскай Федэрацыі" каля в. Заольша Лёзненскага раёна. Пра наяўнасць у тэлефоне падпіскі на ТГ канал выдання “Зеркала”, памежнікі паведамілі ў Лёзненскае аддзяленне міліцыі, дзе на Белавусава быў складзены пратакол аб парушэнні патрабаванняў ч.2 арт. 19.11 КаАП.

Суддзя Лапушынскі палічыў падпіску Белавусава на інтэрнэт-старонку сацыяльнай сеткі "Instagram" з назвай "zerkalo_io" "распаўсюджваннем экстрэмісцкіх матэрыялаў" і пастанавіў аштрафаваць мужчыны на 1110 рублёў.

**06.07.2023**

Суддзя суду Наваполацка Сняжана Калінічэнка, 30 траўня вынесла прысуд мясцовай жыхарцы Кацярыне Леў. Улады вінавацілі яе ў абразе прадстаўнікоў улады паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса. За гэта суд пакараў жанчыну пазбаўленнем волі тэрмінам на два гады і штрафам ў 3 700 рублёў. У чаканні суда Кацярына правяла 4 месяцы ў Віцебскім абласным ізалятары.

У судовым працэсе абражанымі прадстаўнікамі ўлады выступілі намеснік начальніка УУС Мінскага аблвыканкама Віталь Казлоў, кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска Раман Мельнік, а таксама першы намеснік начальніка ГУУС Мінгарвыканкама Ігар Падвойскі.

Гэтая тройца трапіла ў скандал, калі ў лютым 2022 года «Кіберпартызаны» апублікавалі зліў іх размовы з верасня 2020 года. Тэлефонная гутарка Падвойскага, Мельніка і Казлова стала доказам таго, што міліцыя паказвае суддзям, якія рашэнні выносіць удзельнікам мірных пратэстаў.

Пасля апублікавання роліка з запісам у тэлеграм-канале “Кіберслівы", пад ім пакінулі водгукі больш за два дзясяткі чалавек, сярод якіх апынулася і асуджаная Леў.

**07.07.2023**



Паводле ініцыятывы Шклоўскай калоніі №17, дзе палітвязень адбываў пакаранне, 23 чэрвеня палітзняволенаму змянілі рэжым утрымання. Па рашэнні Шклоўскага райсуду ён павінны адбыць наступныя тры гады ў турме. Перавесці Севярынца на новае месца зняволення мусілі цягам 10-ці дзён, але сваякі нічога не ведаюць пра ягоны лёс.

На думку маці палітвязня, Таццяны Севярынец, непасрэдна перад этапам ён мог трапіць у ШІЗА, дзе забаронена перапіска. Такім чынам з ім маглі абысціся ў ПК-17, дзе яшчэ ў красавіку зняволенага палітыка, журналіста і літаратара паставілі на ўлік як злоснага парушальніка рэжыму. Следам пачаліся захады ўціску: скарацілі дазволеную колькасць званкоў дадому і грашовых пераводаў, а пазней пазбавілі і працяглага спаткання. Неўзабаве адміністрацыя калоніі звярнулася ў суд, каб рэжым утрымання стаў яшчэ больш жорсткі – турэмны. Паводле заканадаўства, менавіта з калоніі мусілі б паведаміць, куды пераводзяць іхнага былога вязня. Але родныя не атрымалі паведамленняў ні з ПК-17, ні ад самога Паўла.

7 чэрвеня 2020г. Севярынца затрымалі і абвінавацілі ў «падрыхтоўцы масавых беспарадкаў». 25 траўня 2021 г. яму прысудзілі сем гадоў калоніі ва ўмовах строгага рэжыму. Па рашэнні Шклоўскага райсуду ўтрыманне ў калоніі на бліжэйшыя тры гады зменена на турэмнае зняволенне.

**08.07.2023**

Суддзя суд Наваполацка Зінаіда Балаболава 24 траўня пастанавіла аштрафаваць на 1110 рублёў за распаўсюд «экстрэмізму» мясцовую жыхарку Кацярыну Шаўлюгу.

Згодна з пратаколам, які паступіў з мясцовага АУС, «правапарушальніца», знаходзячыся ў сябе дома ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» размясціла ў сябе ў акаўнце інфармацыйную прадукцыю «Зер-

кала.Навіны». Гэты СМІ раней быў уключаны ўладамі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Суддзя Балаболава пагадзілася з меркаваннем міліцыі, а менавита з тым, што Шаўлюга распаўсюдзіла экстрэмісцкія матэрыялы і кіруючыся ч.2 арт.19.11 КаАП, аштрафавала жанчыну ў памеры 30 базавых велічыняў без канфіскацыі тэлефона.

**08.07.2023**
Экс-прэтэндэнт у прэзідэнты, былы старшыня праўлення Беплгазпрамбанка Віктар Бабарыка ўтрымліваецца ў памяшканні камернага тыпу папраўчай калоніі №1 (Наваполацк). Яго стан здароўя здавальняючы, аднаўляецца пасля атрыманых траўмаў.
Пра Віктара Бабарыку, асуджанага на 14 гадоў калоніі, нічога не вядома два з паловай месяца. Мяркуючы па наяўнай інфармацыі, у ноч з 24 на 25 красавіка яго шпіталізавалі ў бальніцу Наваполацка. Цяпер стаўленне да яго з боку адміністрацыі калоніі нармальнае, «прэсаваць» Віктара Бабарыку баяцца з прычыны арганізаванай дэмакратычнай супольнасцю інфармацыйнай кампаніі ў ягоную падтрымку, як заяўляюць у аб'яднанні.

**09.07.2023**

Суддзя Наваполацкага суда Зінаіда Балаболава 24 мая за падпіску аштрафавала на 740 рублёў асістэнтку кафедры тэхналогіі і абсталявання перапрацоўкі нафты і газу ПДУ Паліну Путро.
У пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэнні значылася, што Путро ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» публічна размясціла матэрыялы інфармацыйнага рэсурсу «МАЯ КРАІНА БЕЛАРУСЬ», якія раней улады ўключылі ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні выкладчыца ВНУ прызнала сваю віну і не настойвала на даследаванні доказаў па справе.
Суддзя Болоболова палічыла, што гэтага дастаткова для таго, каб абвінаваціць маладую жанчыну ў парушэнні патрабаванняў ч.2 арт.19.11 КаАП, аштрафавала яе на суму раўную 20 базавых велічынь і канфіскавала ў даход дзяржавы тэлефонны апарат, які належыў Паліне.

**10.07.2023**
Пра тое, што зняволенага палітыка, літаратара і журналіста накіравалі на бліжэйшыя тры гады ў гарадзенскую турму, стала вядома з ліста, дасланага жонцы Вользе. Больш як два тыдні сваякі не ведалі пра лёс палітвязня, якога 23 чэрвеня асудзілі да змены рэжыму ўтрымання.
"Апошні раз я бачыла Паўла на званку ў канцы сакавіка, пасля некалькіх пасадак у ШЫЗА ў яго пачаліся праблемы са здароўем, пасля яму далі тры месяцы ПКТ і вось цяпер пераводзяць на турэмны рэжым", -- пісала Вольга Севярынец на сваёй старонцы ў Фэйсбуку.
Змена рэжыму ўтрымання была ініцыяваная кіраўніцтвам Шклоўскай калоніі, куды Паўла Севярынца адправілі адбываць пакаранне - 7 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцнена рэжыму. Суд Шклоўскага раёна падтрымаў прапанову адміністрацыі ПК 17 перавесці палітвязня ў турму на 3 гады.
Павел Севярынец быў затрыманы 7 чэрвеня 2020г. і амаль праз год, 25 траўня 2021 г. суд прызнаў яго вінаватым у "падрыхтоўцы масавых беспарадкаў".

**10.07.2023**
Суддзя суда Верхнядзвінскага раёна Таццяна Кукліна 31 сакавіка арыштавала на 10 сутак дальнабойшчыка Аляксандра Каваленку, у віну якому было пастаўлена праведзенне масавага мерапрыемства. Па версіі суда "правапарушальнік" размесціў на пярэдняй панэлі кабіны аўтамабіля вымпел з выявай сцяга бел-чырвона-белага колеру і гербам "Пагоня". Паведамленне ў міліцыю аб правапарушэнні паступіла з Віцебскай мытні.
У судовым паседжанні мужчына растлумачыў, што сапраўды ён на аўтамабілі «MERSEDES» прыехаў з Латвіі на пункт пропуску пункт пропуску Грыгораўшчына (Патэрніекі).
Пры наглядзе ў кабіне аўтамабіля інспектарам мытні быў знойдзены вымпел з гербам "Пагоня". Пра тое, што "злачынная" сімволіка знаходзіцца ў кабіне аўтамабіля «правапарушальнік» не ведаў. Але супраць дзейнай улады ён ніколі не выступаў.
Тым не менш на думку суддзі Куклінай кіроўца правёў не дазволенае ўладамі пікетаванне, якое было звязана з выказваннем грамадска-палітычных інтарэсаў і праходзіла з выкарыстаннем пратэстнай сімволікі.
Зыходзячы з гэтых фактаў і на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП суддзя пастанавіла арыштаваць Каваленку

тэрмінам на 10 сутак.

**12.07.2023**
Паводле допіса ў Фэйсбуку ягонай жонкі Яніны, палітзняволенага мінулай ноччу даставілі з гарадзенскай турмы ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы хуткай дапамогі, дзе ён сканаў «пры нявысветленых абставінах». З падрабязнасцяў пакуль вядома толькі тое, што ў бальніцу палітвязень трапіў ужо непрытомным, яму пачалі рабіць аперацыю, падчас якой у пацыента спынілася сэрца. Пра стан здароўя Алеся Пушкіна апошнім часам мала ведалі нават найбліжэйшыя сваякі: лістоў ад яго не было з красавіка. У тых апошніх допісах ён скардзіўся на боль у нырках і згадваў, што дужа хутка страціў каля 20 кг вагі.
Падчас пратэстаў супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у 2020 годзе яго моцна збілі і кінулі на некалькі сутак на Акрэсціна.
Другі раз паводле крымінальнага абвінавачання Алеся Пушкіна асудзілі да 5 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму. 30 сакавіка 2022 года суд прызнаў яго вінаватым у рэабілітацыі нацызму (артыкул 130-1 КК) і здзеку з дзяржаўных сімвалаў (артыкул 370 КК). Прычынай пераследу стала карціна – партрэт удзельніка антысавецкага супраціву Яўгена Жыхара. На той час, калі супраць Пушкіна распачыналі крымінальную справу, ён знаходзіўся ва Украіне, і мог бы пазбегнуць арышту. Аднак мастак свядома вярнуўся ў Беларусь, дзе быў асуджаны і накіравны адбываць пакаранне у папраўчую калонію № 22 ў Івацэвічах. У жніўні 2022 года стала вядома, што адміністрацыя папраўчай установы змясціла палітзняволенага мастака на 5 месяцаў у памяшканне камернага тыпу. Неззабаве адміністрацыя калоніі звярнулася ў суд, каб перавесці Алеся Пушкіна на турэмны рэжым. Пажаданне кіраўніцтва ПК №22 было задаволена: палітвязня этапавалі ў гарадзенскую турму № 1, дзе ен мусіў бы правесці паўтара гады. Каб не смерць, якая вызваліла Алеся Пушкіна назаўсёды. Зрэшты, вольным ён быў заўжды: у сваіх творах і ў сваёй грамадзянскай пазіцыі.

**12.07.2023**


Суддзя суда Лёзненскага раёна Алена Шарэц 7 чэрвеня за распаўсюджванне “экстрэмісцкіх матэрыялаў” пастанавіла арыштаваць на пяць сутак жыхара Віцебска Антона Марозава.
Парушэнне заканадаўства было выяўлена супрацоўнікамі АУС Лёзненскага раёна на 42-ім км. аўтадарогі "Віцебск-Лёзна, мяжа РФ", калі пры праверцы дакументаў і тэлефона Марозава яны знайшлі падпіску на тэлеграм-каналы з назвай "Zerkalo.io навіны" і "Эканоміка Беларусі". Больш за тое ў тэлефоне «сілавікі» знайшлі фотаздымкі шчыта з гербам "Пагоня" і незарэгістраваную бчб-сімволіку, якія ўлады лічаць экстрэмісцкімі.
У судовым паседжанні мужчына не адмаўляўся ад наяўнасці падпіскі на ТГ-каналы і фатаграфій у тэлефоне з «пратэстнай сімволікай».
Зыходзячы з устаноўленых у судзе фактаў распаўсюджвання "экстрэмізму" і на падставе ч.2 арт. 19.11 КаАП суддзя Шарэц пастанавіла пакараць Марозава арыштам на 5 сутак і канфіскаваць у даход дзяржавы яго мабільны тэлефон.

**13.07.2023**
20 чэрвеня ў судзе Докшыцкага раёну разбіралі справу мясцовага рамесніка, у якога на старонцы ў «Одноклассниках» міліцыянты заўважылі «лагатып тэлеканала «Б», а таксама рэпост з інтэрнэт-рэсурса, таксама прызнанага ў Беларусі экстрэмісцкім. Суддзя Вячаслаў Елісеенка пакараў Віктара Сіўцэвіча арыштам на 10 сутак.
Сіўцэвіч быў затрыманы напярэдадні, у Докшыцкім РАУС правялі агляд ягонага тэлефона і выявілі так званыя «экстрэмісцкія матэрыялы». Суд расцаніў іх наяўнасць на старонцы ў «Одноклассниках» як распаўсюд і парушэнне ч. 2 арт. 19.11 КаАП РБ – (распаўсюд, выраб, захоўванне інфармацыйнай прадукцыі, якая ўтрымлівае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуе такую дзейнасць). За гэта мужчыну прысудзілі 10 сутак арышту.

**14.07.2023**
Суддзя суда Глыбоцкага раёна Аляксандр Аляксеенка 30 траўня пакараў адміністрацыйным арыштам на 12 сутак індывідуальнага прадпрымальніка з Глыбокага Валерыя Ермачэнка. Па версіі ўладаў ён правёў у сацыяльных сетках не дазволенае ўладамі пікетаванне і распаўсюдзіў «экстрэмісцкія» матэрыялы.

У судовым паседжанні Ермачонак прызнаўся, што ён на сваіх акаўнтах у сацыяльных сетках «Аднакласнікі» і «Укантакце» размясціў і доўга захоўваў публікацыі з лагатыпамі беларускага бел-чырвона-белага і ўкраінскага жоўта-сіняга сцягоў, узятых з інфармацыйных рэсурсаў, якія ўлады лічаць экстрэмісцкімі.
Грунтуючыся на інфармацыі, прадстаўленай з РАУС Глыбоскага раёна і прызнаннях самога «правапарушальніка» суддзя Аляксеенка прыйшоў да высновы, што Валерый здзяйсніў адміністрацыйныя правапарушэнні, прадугледжаныя ч.2 арт.19.11 і ч.1 арт.24.23 КаАП.
Таму судзьдзя вырашыў арыштаваць мужчыну на 12 сутак: за распаўсюд «экстрэмісцкіх» 5 сутак і 7 сутак за праведзены недазволены ўладамі пікета у сацыяльных сетках.

**14.07.2023**



«Пакаяннае відэа» са Станіславам Ганчаровым па мянушцы «Тэрор-машына» было апублікавана на адным тэлеграм-каналаў, блізкіх да ГУБАЗіКа. Затрыманы тлумачыць, што не мае ніякага дачынення да «апазіцыі», і што падставай для затрымання нібыта сталі татуіроўкі – сілавікі ўбачылі ў іх прапаганду нацызму. Паводле Ганчарова, татуіроўкі ён зрабіў у раннім юнацтве, некаторыя з іх ужо «забіў», каб не правакаваць міліцыю, ад астатніх меркаваў пазбавіцца пазней, бо толькі выйшаў з-пад арышту: у 2017г. ён быў асуджаны да 7 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. І з пакараннем тады было не ўсе так проста.
У 2016г. Станіслава Ганчарова затрымалі па вяртанні з Украіны: з 2014 г. ён браў удзел у баявых дзеяннях у складзе батальёна «Азоў». На момант затрымання яму было 20 гадоў, і падставай судовага разбіральніцтва сталі падзеі таго перыяду, калі ён яшчэ быў падлеткам. Паводле тагачаснага афіцыйнага паведамлення МУС, « у кастрычніку 2013г. Разам з іншымі футбольнымі фанатамі ў Оршы ён змушаў дваіх падлеткаў адмовіцца ад антыфашыстоўскіх поглядаў і прадыманстраваць нацысцкае прывітанне. Гэта працэс быў зняты на відэакамеру і выкладзены ў інтэрнэт». Пазней да гэтага абвінавачанне дадалі распальванне расавай нянавісці, рабаўніцтва, распаўсюд парнаграфіі. І ўсё гэта – у складзе групы падлеткаў з радыкальнымі поглядамі.
Распавядаючы пра судовы працэс над Станіславам Ганчаровым, дзяржаўныя медыя падкрэслівалі факт ягонага ўдзелу у батальёне «Азоў», суадносячы гэта з падтрымкай нацысцкай ідэалогіі. Тагачасны міністр МУС Ігар Шуневіч казаў, што Ганчароў «ішоў пад нумарам адзін у спісе тых, хто падлягае затрыманню ў выпадку вяртання ў Беларусь». У 2018 г. кіраўнік ГУБАЗіКа Мікалай Карпянкоў згадваў, што каля 40 беларусаў, якія ваявалі на баку «Правага сектара» і іншых фарміраванняў, не захочуць вяртацца дадому, бо «у Беларусі супраць іх распачатыя крымінальныя справы за здачынствы, якія яны здзейснілі раней – хуліганства, крадзяжы, махлярства і іншыя».
Насамрэч, добраахвотнікаў, хто вярнуўся ў Беларусь, вельмі мала. Бо ўсяго толькі міфам з"яўляецца тое, нібыта ў РБ аднолькава караюць удзельнікаў баявых дзеянняў на баку іншай дзяржавы. Тыя , хто ваяваў за «ЛДНР», спакойна перамяшчаліся паміж краінамі і нават раздавалі інтэрв"ю журналістам. Праўда, для траіх зладзілі паказальныя суды, але дваім далі невялікія тэрміны – па два гады зняволення, а трэці вярнуўся ва Украіну адразу пасля суду.

**14.07.2023**

Віцяблянін, якога асудзілі за падсечку міліцыянту падчас мірных маршаў 2020г., цяпер адбывае пакаранне ў Горацкай калоніі №9. У снежні 2020г. суд Першамайскага раёна г. Віцебска пакараў яго чатырма з паловай гадамі пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Пазней суд Ленінскага раёна Магілёва прызнаў палітвязня парушальнікам рэжыму ўтрымання і за нібыта непадпарадкаванне адміністрацыі папраўчай установы прысудзіў яшчэ год калоніі. Цяпер яго зноў вінавацяць у сістэматычных парушэннях паводле ч. 1 арт. 411 Крымінальнага Кодэкса – гэта ўжо другая справа, вынікам якой мае стаць пагаршэнне ўмоваў адбыцця пакарання.
Раней палітвязню ўжо ўзмацнялі рэжым — у верасні 2021 г. Магілеўскай ПК №15, дзе ён адбываў прысуджаны тэрмін, Алега Яфрэменку перавялі ў турму №4 г. Магілёва. Вядома, што адміністрацыя магілёўскай турмы рэгулярна змяшчала палітвязня ў ШІЗА.
У лістападзе 2022г. Яфрэменку перавялі ў Горацкую ПК №9. Адміністрацыя цісне на палітвязня і тут: яго неаднаразова змяшчалі ў ШІЗА, а нядаўна распачалі чарговую справу на нібыта непадпарадкаванне патрабаванням кіраўніцтва калоніі. Палітвязню зноў пагражае перавод ва ўмовы турэмнага зняволення.
Першапачатковая правіна Алега Яфрэменкі палягала ў тым, што ён зрабіў падсечку міліцыянту, той

паваліўся і падрапаў далоні. Свае віны Яфрэменка не адмаўляў, а падчас судовага працэсу нават папрасіў прабачэння ў супрацоўніка міліцыі. Той запатрабаваў грашовай кампенсацыі маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў. Суд задаволіў гэтае патрабаванне, прызнаўшы Яфрэменку вінаватым у злачынстве паводле артыкулу 364 Крымінальнага Кодэкса («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»).

**17.07.2023**
Роберт Тампала (Robert Tąpała) асуджаны да трох гадоў калоніі па двух крымінальных артыкулах - па арт. 368 (абраза прэзідэнта) і 369 КК (абраза прадстаўніка ўлады). Пра справу грамадзяніна Польшчы стала вядома чарговага абнаўлення спіса "асоб, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці".
Роберт Тампала жыў у Беларусі і працаваў менэджарам па агульных пытаннях ААТ "ОрионСвит" – дыстрыб"ютарскай кампаніяй, якая займаецца пастаўкамі кандытарскіх вырабаў у гандлёвыя сеткі. У тым ліку распаўсюджвае вырабы расейскіх брэндаў у "Евроопт", "Корону", "Соседи", "АЛМИ", "ГИППО". Падрабязнасцяў, у чым канкрэтна звінавацілі Роберта Тампалу, не вядомыя. Як толькі навіна пра асуджанага грамадзяніна Польшчы з"явілася з беларускіх незалежныхСМІ, яе неўзабаве перадрукавалі польскія калегі. У медыях Польшчы выйшлі тэксты з загалоўкамі «У Беларусі асудзілі паляка за абразу Лукашэнкі. Ен трапіў у калонію», «Лукашэнка помсціць палякам. Дрэнныя навіны з Беларусі», Рэжым Лукашэнкі пакараў яшчэ аднаго паляка. Ён «абразіў» дыктатара».

**17.07.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 17 траўня за пікетаванне і распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у сацыяльных сетках пастанавіла арыштаваць на 6 сутак электраманцёра з Міёр Уладзіміра Граковіча.
У судзе «правапарушальнік» не адмаўляў таго, што на яго інтэрнэт-старонках у «Інстаграм» і «Аднакласніках» захоўваў «фотаздымак несанкцыянаванага масавага мерапрыемства з выявай палотнішчаў бел-чырвона-белых сцягоў».
Суддзя Яскевіч прыняла пазіцыю працаўнікоў міліцыю і палічыла даказаным, што Уладзімір здзейсніў адміністрацыйныя правапарушэнні, прадугледжаных ч.2 арт.19.11 і ч.1 арт.24.23 КаАП. А менавіта захоўваў і распаўсюджваў інфармацыйную прадукцыю, уключаную ўладамі "ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў", і парушыў парадак правядзення пікетавання.
За падобныя дзеі суд пакараў Граковіча арыштам на шэсць сутак - па трое сутак за кожнае "правапарушэнне", але без канфіскацыі тэлефона.

**18.07.2023**
Паводле заявы пракурора Оршы і Аршанскага раёна суд разгледзеў грамадзянскую справу пра прызнанне экстрэмісцкімі матэрыяламі інфармацыйную прадукцыю групы «Орша Льнуха». Копію рашэння суд Оршы і Аршанскага раёна накіраваў у Міністэрства інфаомацыі, каь гэтую групу ўключылі ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Такі адгарытм уключэння ў дадзены спіс па цяперашніх часах з"яўляецца дастаткова рэдкім. Як правіла, суполкі ў сацсетках і мэсэнджарах прызнаюцца «экстрэмісцкімі» па ўказцы «зверху», і судовыя працэсы праходзяць зусім не там, дзе «стваралі экстрэмісцкі кантэнт», а ў іншых абласцях Беларусі. Аршанская пракуратура прадэманстравала пільнасць па ўласнай ініцыятыве. Паводле судовай пастановы, група «Орша Льнуха» прызнана «экстрэмісцкай», бо матэрыялы, што там публікаваліся, «утрымлівалі прыкметы дзейнасці, накіраванай на арганізацыю і ажыццяўленне масавых беспарадкаў, актыўны ўдзел у іх», заклікі да правядзення несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў. Таксама там былі заўважаны «сістэматычныя публікацыі экстрэмісцкай інфармацыі, рэпосты інфамацыйнага кантэнту іншых Тэлеграм-каналаў, раней прызнаных экстрэмісцкімі».
Публікуючы артыкул пра прызнанне «экстрэмісцкім» чарговага рэсурсу, «Аршанская газета» палохае адміністрацыйнай адказнасцю за распаўсюд інфармацыі з гэтай і іншых падобных груп. І рэкамендуе не праяўляць «залішнюю цікаўнасць», каб пазбегнуць «сур'ёзных праблем».

**19.07.2023**

Як стала вядома, суддзя Пастаўскага суда Наталля Жукава пакарала жыхарку Пастаўшчыны В. паводле часткі 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюд, выраб, захоўванне перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапаганду такой дзейнасці) дваццаццю пяццю базавымі велічынямі штрафу. Гэта складае 925 беларускіх рублёў. Да таго ж яна пастанавіла канфіскаваць сродак здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння - мабільны тэлефон Redmi NOTE-9.

У віну жанчыне ставіліся рэпосты ў сацыяльнай сетцы "Аднакласнікі" матэрыялаў Праваабарончага цэнтра "Вясна", "Настоящая Беларусь", "Страна для жизни" і групы "Ябацькі на Х". Усе згаданыя старонкі і групы з красавіка па чэрвень гэтага года ўключаныя ўладамі ў так званы спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Да таго ж жанчыну абвінавацілі ў распаўсюдзе "экстрэмісцкіх" лагатыпаў "Радыё Свабода", "TUT.BY", "Белсат", "МКБ" (Мая краіна Беларусь) усё ў той жа сацыяльнай сетцы "Аднакласнікі".
Усе гэтыя парушэнні выявілі міліцыянты падчас так званага маніторынгу сацыяльных сетак Глабальнай сеткі Інтэрнэт 5 чэрвеня. Праз 10 дзён, 15 чэрвеня, жанчыну асудзілі.

**20.07.2023**




Кацярына Леў з Наваполацку асуджана па арт. 369 КК за абразу прадстаўніка ўлады да двух гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі і штрафу. Прысуд выносіла суддзя Наваполацкага гарадскога сулу Сняжана Калінічэнка. Белруская праваабарончая супольнасць прызнала дзяўчыну палітычнай зняволенай 17 ліпеня. На два тыдні раней беларускія праваабаронцы прызналі палітвязнем ураджэнца вёскі Ксты Канстанціна Ступнікава. Яму прысудзілі 2 гады пазбаўленне волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Вырак агучыў суддзя Міхаіл Зубеня ў судзе Віцебскага раёну. Да арышту Канстанцін Ступнікаў працаваў аператарам-наладчыкам. Быў затрыманы 26 красавіка 2023г. падчас хатняга бытавога канфлікту, на які была выклікана міліцыя. Па версіі абвінавачання Ступнікаў, знаходзячыся ў цвярозым стане, пры супрацоўніках міліцыі выказаўся ў дачыненні да Лукашэнкі ў непаважлівай форме, выкарыстаўшы лаянку. За гэта і быў затрыманы і асуджаны паводле арт. 368 Крымінальнага кодэксу (абраза Лукашэнкі). Кацярыну Леў затрымалі і асудзілі за каментары ў інтэрнэце. Абражанымі сябе прызналі намеснік начальніка УУС Мінскага аблвыканкамуВіталь Казлоў, кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёну Мінску Раман Мельнік і першы намеснік начальніка ГУУС Мінгарвыканкама Ігар Падвойскі. Размовы гэтых чыноўнікаў з верасня 2020 года былі выкладзеныя ў агульны доступ «Кіберпартызанамі» і сталі сведчаннем таго, як міліцыя кіруе суддзямі пры вынясенні рашэнняў у дачыненні ўдзельнікаў мірных маршаў. Дзяўчыну затрымалі на пачатку лютага 2023 года, да суду яе трымалі ў СІЗА. Апрача пакарання зняволеннем, суд заабавязаў яе спрлаціць штраф памерам 3 700 рублёў.

**20.07.2023**

У канцы чэрвеня раённы суд у Бешанковічах прысудзіў штраф Ганне Гудоўскай. Жанчыну прызналі вінаватай «за распаўсюд экстрэмізму» паводле ч. 2 арт. 19.11 КаАП- за рэпосты відэаматэрыялаў, прызнаных у Беларусі экстрэміскімі. Метадыстку Бешанковіцкага Дома рамёстваў аштрафавалі на 925 рублёў (25 базавых велічынь).
Ганна Гудоўская - вядомая ў Бешанковічах майстрыха, удзельніца клуба «Скарбонка». Яна дасканала валодае многімі тэхнікамі дэкаратыўны-прыкладнога мастацтва: жанчына займаецца і ганчарствам, і чаканкай, і роспісам па дрэве, робіць маляванкі – дэкаратыўныя дываны. А самае галоўнае – навучае гэтаму маладое пакаленне мясцовых жыхароў, бо ніводнае раённае свята не абыходзіцца без яе майстар-класаў.
Цяпер з невялікага заробку – а ў сферы культуры яны зусім не вялікія – Ганна Гудоўская мусіць сплаціць вялікі штраф.

**20.07.2023**



Суддзя суда Першамайскага раёна Міхаіл Юрчанка 11 траўня за правядзенне не санкцыянаванага ўладамі пікетавання ў сацыяльных сетках аштрафаваў на 2220 рублёў маці траіх дзяцей Крысціну Буланаву.
Суддзя Юрчанка палічыў устаноўленым, што Крысціна правяла несанкцыянаванае пікетаванне без адпаведнага дазволу адміністрацыі Першамайскага раёна Віцебска. Гэтую ўпэўненасць ён абгрунтаваў тым, што жанчына ва «Укантакце» і «Інстаграм» размясціла і дэманстравала фатаграфіі і відэафайлы з выявай сябе і грамадзян на пратэстных акцыях супраць вынікаў выбараў прэзідэнта краіны, якія прайшлі ў 2020 годзе, а таксама плакатаў і сцяга бел-чырвона-белага колеру. Таму дзеянні «правапарушальніцы» суддзя кваліфікаваў як удзел у недазволеным уладамі пікеце і на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП пакараў Буланаву штрафам у памеры 60 базавых велічыняў.

**21.07.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 30 траўня, за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у сацыяльных сетках аштрафавала на 370 рублёў намесніка дэкана факультэта інфармацыйных тэхналогій Полацкага дзяржуніверсітэта Марыю Дэканаву.
Падчас судовага разбору суддзя высветліла, што «правапарушальніца» была карыстальнікам сацыяльнай сеткі «УКантакце» і выкарыстоўваючы мабільны тэлефон публічна размясціла ў сваім акаўнце інфармацыйную прадукцыю "МАЯ КРАІНА БЕЛАРУСЬ", уключаную ўладамі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Суддзя Болоболова палічыла гэтага дастатковым, каб на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакараць Дэканаву штрафам ў памеры дзесяці базавых велічынь, без канфіскацыі тэлефоннага апарату.

**22.07.2023**
Суддзя суда Сенненскага раёна Людміла Талай, 29 чэрвеня, за актыўнасць у сацыяльных сетках па распаўсюджванні «экстрэмісцкіх» матэрыялаў аштрафавала педагога-арганізатара віцебскай сярэдняй школы №28 Караліну Звярынскую. Раней яе справа значылася ў раскладзе суда Першамайскага раёна Віцебска, аднак яго перадалі па месцы рэгістрацыі педагога - у Сенненскі раён.
«Правапарушальніцу» выявілі сенненскія міліцыянты, калі яны праводзілі маніторынг сацыяльнай сеткі Інстаграм. Аказалася, што педагог была падпісана на інфармацыйны рэсурс з назвай "Радыё Свабода - Беларусь", які ўлады ў снежні 2021 года ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
На падставе пратакола і прызнання віны самой настаўніцай, суддзя Талай, у межах ч.2 арт.19.11 КаАП, аштрафавала Звярынскую на 370 рублёў без канфіскацыі тэлефоннага апарата.

**23.07.2023**
У судзе Дубровенскага раёна 15 чэрвеня за распаўсюд «экстрэмізму» ў сацыяльных сетках пакаралі штрафамі чатырох беларускіх жанчын: Вольгу Лексакаву, Вікторыю Кілянкову, Святлану Маталыгіну і Наталлю Бараўнёву.
Так, суддзя Марыя Цыклінская на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергла Вольгу Лексакаву адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу ў 407 рублёў, а Святлану Маталыгіну на 370 рублёў.
Суддзя Ігар Татаеў па тым жа «экстрэмісткім» артыкуле пакараў штрафамі Вікторыю Кілянкову - 1110 рублёў, а Наталлю Бараўнёву на 370 рублёў.
Ва ўсе ўдзельніц квартэта “правапарушальніц” судом не былі канфіскаваныя тэлефонныя апараты.
**23.07.2023**

Шматдзетную маці Вікторыю Казун будзе судзіць паводле артыкула 19.11 (распаўсюд інфармацыйнай прадукцыі, прызнанай экстрэмісцкай) суддзя Талачынскага райсуду Наталля Барысавец. Калегу Вікторыі па працы ў Талачынскім лягсасе Дзмітрыя Васіленку – суддзя таго ж суду Ірына Котава.
Вдмітрыю Васіленку 39 гадоў, у Талачынскім лягсасе ён працуе лесніком і вальшчыкам лесу. Сваю працу мужчына відавочна любіць: у сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» шмат фотак у форменным адзенні работніка лясной гаспадаркі. Любіць сваю працу і Вікторыя Казун. Пра гэта яна распавядала карэспандэнту абласной газеты «Витебские вести» - яна стала гераіняй артыкула «Как совместить воспитание троих детей и работу помощника лесничего, знает Виктория Казун, которая уже 16 лет трудится в Толочинском лесхозе», апублікаванага напярэдадні свята 8 сакавіка ў 2021 годзе. У тым самым артыкуле ёсць інфармацыя, што яе муж з’яўляецца галоўным ляснічым Талачынскага лягсаса, і пазнаёміліся яны на працы. У Фэйсбуку Вікторыя Казун вядзе свой уласны блог, дзе распавядае і пра працу, і пра сваіх траіх дзяцей.

**24.07.2023**
Такі штраф прысудзіў браслаўчанцы, маці дваіх непаўналетніх дзяцей Ірыне Лібік суд Браслаўскага раёна. Жанчыну судзіў суддзя Аляксандр Вязіцкі па частцы 1 артыкула 24.23 КаАП (Парушэнне парадку правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі, пікетавання, іншага масавага мерапрыемства).
Нагодай паслужыла тое, што Ірына Лібік размясціла ў сацыяльнай сетцы “Одноклассники” тры відэазапісы з выявай нацыянальнага бел-чырвона-белага сцяга. Гэта суд Браслаўскага раёна палічыў несанкцыянаваным пікетам, бо Браслаўскі райвыканкам дазволу на гэта не даваў.
На судовым пасяджэнні жанчына прызнала віну часткова. Браслаўскі суд прысудзіў Ірыне Лібік за гэта 30 базавых велічыняў штрафу, што складае 1110 беларускіх рублёў.

У пастанове суда адзначаецца, што Ірына Лібік працавала прадаўцом крамы "Разета-мэбля". Як вядома, яна ж была і дырэктарам мэблевай крамы ТАА "Разета-мэбля", якая з мінулага года знаходзіцца ў стане ліквідацыі.

**24.07.2023**

Суддзя суда Талачынскага раёна Наталля Барысавец за правядзенне не дазволенага ўладамі пікетавання ў сацыяльных сетках аштрафавала на 2590 рублёў электраманцёра Віталя Шалупіна.
Пры судовым разглядзе суддзя Барысавец прыняла версію міліцыі, адлюстраваную ў пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэнні. У пратаколе было зафіксавана, што «правапарушальнік» у парушэнне парадку правядзення масавых мерапрыемстваў, з мэтай выказвання сваіх асабістых поглядаў на падзеі грамадска-палітычнага жыцця, ажыццявіў пікетаванне без адпаведнага дазволу Талачынскага райвыканкама.
Пікетаванне выявілася ў тым, што Шалупін у сацыяльнай сетцы "Facebook" размясціў выяву бел-чырвона-белых палос.
Наяўнасць гэтага факта суддзя Барысавец палічыла дастатковай для таго, каб аштрафаваць мужчыну па ч. 1 арт. 24.23 ч.1 КаАП на суму 2590 рублёў.

**25.07.2023**

Пра выпадак, калі падлетка, што не мае бацькоў, прызналі малалетнім злачынцам і накіравалі ў спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову, напісала раённая газета «Чырвоны прамень». У артыкуле робіцца акцэнт на тое, што дзіця вырасла непаслухмяным і «ступіла на слізкі шлях», але толькі мімаходзь згадваецца, што пад дзяржаўнай апекай хлопец знаходзіўся з ранняга маленства --з 2011г., і за 12 гадоў ні сацыяльныя ўстановы, ні школа, ні прыёмныя сем’і не змаглі выхаваць яго належным чынам. Таксама толькі згадкі адпаведных артыкулаў Крымінальнага кодэксу даюць чытачу зразумець (а не абазнаны чытач проста не зверне на гэта ўвагі), што падлетак, які знаходзіўся пад апекай дзяржавы, стаў ахвярай сэксуальнага гвалту.
Ці знайшлі і пакаралі гвалтаўнікоў, газета не паведамляе, згадваючы, што «у дачыненні да непаўналетняга былі здзейснены ўчынкі, якія ўтрымліваюць прыкметы крымінальнага злачынства, і ён быў прызнаны пацярпелым па крымінальных справах па ч.1 арт.168 КК РБ (дзеянні сэксуальнага характару з асобай, якая не дасягнула 16-гадовага ўзросту) і па ч.1 арт. 169 КК РБ ( распусныя дзеянні, здзейсненыя паўналетняй асобай у дачыненні да асобы, якая не дасягнула 16-гадовага ўзросту).
Няма ў артыкуле і тлумачэнняў, што стала прычынай учынкаў падлетка, якія кваліфікуюцца як «выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў з удзелам непаўналетняга» (ч.1 арт 343 КК РБ). Верагодна, падлетка змушалі да гэтага не названыя гвалтаўнікі, загадзя ведаючы, што іхная ахвяра не дасягнула ўзросту, з якога наступае крымінальная адказнасць.
Затое газета падрабязна апісвае, што хлопец змяніў дзве прыёмныя сям’і, што ён збягаў са школы, паводзіў сябе «вызывающе», што ўцякаў і ад прыёмных бацькоў, а часам вяртаўся дахаты ў стане алкагольнага ап“янення. Нагадаем, вядзецца пра падлетка, якому не было і 14 гадоў, і за выхаванне якога адказвала дзяржава, бо ў 2011 ягоных біялагічных бацькоў пазбавілі бацькоўскіх правоў. Дапытлівы чытач зразумее, што артыкул «Раскажам, чаму суд Чашніцкага раёну накіраваў падлетка ў адмысловую лячэбна-выхаваўчую станову» - гэта аповед пра фіаска дзяржаўнай сістэмы выхавання, а не пра «кепскага хлопчыка» са складанай спадчыннасцю. Дзяржава не справілася са ўзятай на сябе роляй выхаваццеля і абаронцы дзіцяці, якое стала ахвярай сэксуальнага гвалту, атрымала маральныя траўмы, і яны наўпрост паўплывалі на паводзіны падлетка. Аднак газета сцвярджае, што хлопец быў звычайны хуліган і сам вінаваты ў тым, што яго накіравалі ў спецустанову.

**25.07.2023**

Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 ліпеня пастанавіла арыштаваць на 15 сутак Сяргея Крупкіна. На думку суддзі мужчына вінаваты ў распаўсюджванні "экстрэмізму" ў сацыяльных сетках.
У судзе высветлілася, што Крупкін, як карыстальнік сацыяльнай сеткі "УКантакце", быў падпісаны на канал "Радыё Свабода-Беларусь", інтэрнэт-старонкі "Мая Краіна Беларусь" і "STOP LUKA", а таксама быў сябрам ў суполках "Наш край", "Хартыя'97", "Дрэнныя навіны Беларусь" і "Краіна для жыцця". Усе гэтыя інфармацыйныя рэсурсы ўлады раней залічылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні «правапарушальнік» віну не прызнаў, пры гэтым не адмаўляў таго, што на ягонай старонцы ва «УКантакце» меліся пералічаныя СМІ, але ён не лічыць, іх экстрэмісцкімі.
Апраўданні Сяргея суддзя Болоболава палічыла непераканаўчымі і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП

пакарала яго арыштам тэрмінам на пятнаццаць сутак з «канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння, без канфіскацыі прылад і сродкаў здзяйснення правапарушэння».

**25.07.2023**
Жонка палітвязня Марына Адамовіч паведаміла на сваёй старонцы ў Фэйсбуку, што ёйпа пошце вярнулі ліст, напісаны да мужа. На ім пазнака «адмова ад атрымання». Падобна, ад атрымання карэспандэнцыі адмовіўся не сам адрасат, а кіраўніцтва Глыбоцкай калоніі №13, дзе ўтрымліваюць зняволенага апазіцыйнага палітыка. Пяць з паловай месяцаў жонцы не даходзяць лісты ад Статкевіча, і яна нічога не ведае ні пра стан ягонага здароўя, ні пра ўмовы ўтрымання. Цяпер у калоніі вырашылі «ізаляваць» ад лістоў з волі і палітвязня.
У сярэдзіне траўня Марына Адамовіч атрымала адказ адміністрацыі ПК 13 пра тое, што Мікалая Статкевіча змясцілі на паўгода ў адзіночную камеру. У глыбоцкай калоніі зняволены палітык знаходзіцца з канца чэрвеня мінулага года. З таго часу яго рэгулярна змяшчалі ў ШЫЗА – яму выпісалі не менш за 36 спагнанняў. Палітыка трымаюць за кратамі ўжо больш за 3 гады. 14 снежня 2021г. Мікалаю Статкевічу быў вынесены прысуд: 14 гадоў зняволення ў калоніі асаблівага рэжыму паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (Арганізацыя масавых беспарадкаў). 4 лістапада 2022 г. МУС уключыла Мікалая Статкевіча ў "Пералік асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці".Гэта адбілася на ўмовах утрымання палітвязня: яго пазбавілі перадач і спатканняў.

**26.07.2023**

Менскім гарадскім судзе з 17 красавіка нібыта судзяць у межах арт. 361-2 (Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці) КК жыхара Пастаў Віцебскай вобласці палітвязня Дзмітрыя Селядцова. Старшынюе на працэсе суддзя Зяньковіч Валянціна.
Паводле інфармацыі, атрыманай праз праўладныя тэлеграм-каналы, 43-гадовы абвінавачаны быў затрыманы ў сярэдзіне лютага бягучага года па месцы жыхарства разам з жонкай за "фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці".
Падчас следства Селядцову і яго жонцы Марыне было прад'яўленае абвінавачванне ў тым, што яны сістэматычна ажыццяўлялі грашовыя пераводы ў «экстрэмісцкі» фонд "Байсол".
У выпадку, калі ў судзе будзе даказана іх дачыненне да ўчынення злачынства, супругам пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў са штрафам.

**27.07.2023**
У судзе Горацкага раёна 25 ліпеня палітвязня ўжо другі раз асудзілі па ч. 1 арт. 411 Крымінальнага кодэкса (злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы). Суддзя Алена Вараб’ёва прызначыла Алегу яшчэ адзін год зняволення. Раней палітвязню ўжо ўзмацнялі рэжым: у верасні 2021 года з калоніі, дзе ён адбываў тэрмін за падсечку міліцыянту, Алега перавялі на турэмны рэжым у Магілёў, а летась дадалі год калоніі за "непадпарадкаванне" адміністрацыі магілёўскай турмы.
Віцяблянін Алег Яфрэменка ўжо трэці год знаходзіцца за кратамі. 9 снежня 2020 г. яго асудзілі за гвалт у дачыненні да супрацоўніка міліцыі (арт. 364 Крымінальнага кодэкса). Падчас вулічнага шэсця 13 верасня 2020 г. Яфрэменка зрабіў падсечку міліцыянту, той упаў і падрапаў далоні. Суд Першамайскага раёна г.Віцебска па караў яго чатырма з паловай гадамі пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Адбываць тэрмін яго накіравалі ў магілёўскую калонію № 15.
Праз некалькі месяцаў ўтрымання ў калоніі яму ўзмацнілі пакаранне і перавялі на турэмны рэжым. Ініцыятарам узбуджэння крымінальнай справы па ч. 1 арт. 411 стала адміністрацыя магілёўскай турмы № 4. Суддзя суду Ленінскага раёна Магілёва Вікторыя Палякова 15 жніўня 2022 года прысудзіла Яфрэменку ў дадатак да чатырох з паловай гадоў калоніі яшчэ год у зняволенні.
З 18 лістапада 2022 года Алег пачаў адбываць тэрмін у папраўчай калоніі № 9 у Горках. Па інфармацыі праваабаронцаў, адміністрацыя ўстановы ўвесь час ціснула на Алега. Яго неаднаразова змяшчалі ў ШІЗА, а потым зноў распачалі крымінальную справу па ч. 1 арт. 411 Крымінальнага Кодэкса.
25 ліпеня справу Яфрэменкі разглядала суддзя Горацкага раёна Алена Вараб’ёва. Яна прызнала палітвязня вінаватым і прысудзіла яму яшчэ адзін год пазбаўлення волі. Алега Яфрэменку ўжо перавялі ў магілёўскую турму № 4.

**27.07.2023**
Суддзя суда Докшыцкага раёна Вяеслаў Елісеенка за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у

сацыяльных сетках пакараў сарака гадзінамі грамадскіх прац кіроўца філіяла «Докшыцыводаканал» Валерыя Шылько, якому ў 2023 годзе ўлады прысвоілі ганаровае званне «Лепшы работнік транспарту».
У судзе высветлілася, што "правапарушальнік" распаўсюджваў слоўнае абазначэнне каналаў "Белсат" і "Краіна для жыцця", якія рашэннем суда Цэнтральнага раёна Мінска ад 4 сакавіка 2022 года былі залічаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
На падставе прызнання віны самага перадавога работніка суддзя Елісеенка ў рамках ч.2 арт.19.11 КаАП падвергнуў Шылько адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе грамадскіх работ і канфіскаваў прыналежны яму тэлефонны апарат.

**28.07.2023**

У Віцебскім раённым судзе 21 чэрвеня асудзілі палітзняволенага Канстанціна Ступнікава паводле ч. 1 арт. 368 (Абраза Лукашэнкі) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Міхаіл Зубеня прызначыў Канстанціну два гады пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.
Як паведаміў мужчына на судзе, 25 красавіка 2023 года ён адзначаў Радаўніцу разам з маці, сястрою і яе мужам. Кампанія шмат выпіла, пасля чаго жанчына выклікала на яго міліцыю. Паводле меркавання суду, Канстанцін у прысутнасці міліцыянтаў нецэнзурна выказваўся ў бок Лукашэнкі. Да суда Канстанцін утрымліваўся пад вартай.
Канстанціну 28 гадоў. Ён жанаты, працаваў аператарам-наладчыкам, стала пражываў у Маскве.

**28.07.2023**



Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 11 ліпеня за праведзены без дазволу ўладаў пікет пастанавіла арыштаваць на 15 сутак механіка ўстаноўкі ААТ "Нафтан" Іллю Двойрына. Аднак у судовае паседжанне мужчына не з'явіўся, завочна віну прызнаў, хадайнічаў аб разглядзе адміністрацыйнай справы ў яго адсутнасць.
У судзе быў агучаны змест пратакола аб адміністрацыйным правапарушэнні, складзены ў мясцовым аддзяленні ў міліцыі, у якім «правапарушальнік» распавёў пра тое, што ён увесну 2023 года вырабіў улёткі з выявай прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і тэкстам антываеннага характару, і 16 траўня расклеіў іх на прыпынку грамадскага транспарту ў Наваполацку.
Тым самым, на думку суддзі Балаболавай, Ілля, без адпаведнага дазволу Наваполацкага гарвыканкама, правёў «несанкцыянаванае пікетаванне, выказваючы грамадска-палітычныя, асабістыя і іншыя інтарэсы, шляхам размяшчэння ўлёткі з выявай Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Пуціна У.У. і тэкстам на палітычную тэматыку».
Таму, суддзя на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП падвергла Двойрына да адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе арышту тэрмінам на пятнаццаць сутак, і тэрмін адбыцця арышту трэба будзе вылічваць з даты яго фактычнага затрымання.

**29.07.2023**

Затрыманне адбылося 28 ліпеня. 75-гадовы грамадскі актывіст і вернік, Барыс Хамайда выправіўся ў Росіцу, каб узяць удзел у пілігрымцы, прысвечанай росіцкім мучанікам, святарам марыянам Юрыю Кашыру і Антонію Ляшчэвічу, якія 80 гадоў таму, у лютым 1943г., былі спаленыя ў мясцовым касцёле разам з парафіянамі. З Віцебска да Бігосава спадар Барыс ехаў дызелем, каб прайсці пехам апошнія 10 км. Але яго затрымалі памежнікі.
Паводле відавочцаў, памежнікі праходзілі па дызелі, правяраючы пашпарты ў пасажыраў (пасёлак Бігосава знаходзіцца на беларуска-латышскім памежжы). Увагу памежнікаў прыцягнула вокладка пашпарту Барыса Хамайды, на якой была намалявана Пагоня. Уладальнік пашпарту патлумачыў, што Пагоня – гэта афіцыйны сімвал, размешчаны на гербе Віцебскай вобласці. Аднак як толькі актывіст выйшаў з вагона ў Бігосаве, яго тут жа затрымалі трое міліцыянтаў. Меркавана, што яго адвезлі ў Верхнядзвінскі РАУС. Сувязі з Барысам Хамайдам пакуль няма, найверагодней, яго пакінулі пад вартай.

**30.07.2023**
Суддзя суда Верхнядзвінскага раёна Таццяна Кукліна 11 ліпеня за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у сацыяльных сетках арыштавала на 15 сутак мясцовага прадпрымальніка Вячаслава

Дэмбоўскага. Судовае паседжанне прайшло без удзелу «правапарушальніка», хаця ў міліцыі з пратаколам аб адміністрацыйным правапарушэнні ён быў згодны.
У судовым паседжанні высветлілася, што згодна з рапартам інспектара Міёрскага РАУС, падчас маніторынгу інфармацыі сацыяльнай сеткі «Аднакласнікі» ў асабістым профілі Вячаслава меліся спасылкі інтэрнэт-супольнасцяў "STOP LUKA" і "МАЯ КРАІНА БЕЛАРУСЬ", якія ўключаны ўладамі ў рэспубліканскія.
Пасля даследвання ўсіх пісьмовых матэрыялаў, суддзя Кукліна прыйшла да высновы, што віна Дэмбоўскага даказана ў здзяйсненні ім правапарушэння, прадугледжанага ч.2 арт.19.11 КаАП і пастанавіла арыштаваць яго на 15 сутак, з моманту яго фактычнага затрымання.

**31.07.2023**



Грамадскую актывістку з Верхнядзвінска Валянціну Болбат раніцай 31 ліпеня міліцыянты забралі з дому. Яна павінна адседзець прысуджаныя ёй раней 30 сутак, і, хутчэй за ўсё, гэта будзе ў Віцебскім ІЧУ.
Нагадаем, на Валянціну Болбат яшчэ 29 красавіка верхнядзвінскімі міліцыянтамі было складзена некалькі пратаколаў па артыкуле 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапаганду такой дзейнасці) і частцы 3 артыкула 24.23 КаАП (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў).
Тады Верхнядзвінскі суд прысудзіў ёй 30 сутак арышту, міліцыянты адразу ў зале суда ўзялі яе пад варту. Але з жанчынай здарыўся гіпертанічны крыз, і яе адвезлі ў лякарню, дзе яна лячылася два тыдні.
Валянціна аспрэчыла гэтую пастанову суда ў Віцебскім абласным судзе. 22 траўня суддзя абласнога суда Святлана Іванова адмяніла рашэнне суда Верхнядзвінскага раёна.
Але на гэтым усё не скончылася, справу грамадскай актывісткі перадалі ў Наваполацкі суд, і 19 чэрвеня ў будынку Полацкага суда Валянціну Болбат засудзілі зноў. Прысуд выносіла сумнавядомая суддзя Наваполацкага суда Зінаіда Балаболава, якая і прызначыла ёй 30 сутак арышту.
Валянціна Болбат абскарджвала гэтую пастанову, але ўсё аказалася безвынікова, і зараз яна мусіць адседзець прысуджаныя ёй гэтыя 30 сутак.
Усяго грамадскую актывістку з Верхнядзвінска сёлета судзілі паводле арт.19.11 КаАП і 24.23 КаАП шэсць разоў.

**31.07.2023**
Суддзя Докшыцкага раёна Вячаслаў Елісеенка 17 ліпеня пастанавіў арыштаваць на 15 сутак мясцовага жыхара Аляксандра Касцюка, які на думку ўладаў распаўсюджваў у сацыяльных сетках інфармацыйныя матэрыялы экстрэмісцкага зместу.
З пратаколу міліцыі, зачытанага ў судовым паседжанні, вынікала, што «правапарушальнік» на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» доўгі час захоўваў і распаўсюджваў публікацыі інфармацыйнага рэсурсу «Зеркало», які ўлады ў 2022 годзе ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Судзьдзя Елісеенка пагадзілася з сабранымі супрацоўнікамі мясцовага РАУС доказамі віны Касцюка і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала яго арыштам на пятнаццаць сутак без канфіскацыі тэлефона.

**31.07.2023**
Палітвязня журналіста і аднаго з лідэраў Саюза палякаў у Беларусі Анджэя Пачобута, па рашэнню кіраўніцтва ПК №1, змясцілі ў ШІЗА. І гэта ўжо другі раз пасля пераводу ў Наваполацкую калонію. Таксама да палітвязня не пускаюць адваката, а ў ШІЗА ён утрымліваецца без лекаў.
Пра гэта паведамляе «Народная воля» са спасылкай на жонку асуджанага журналіста. «Што на сёньняшні дзень я ведаю пра мужа? Увогуле, нічога. Акрамя таго, што развіваюцца падзеі па найгоршым сцэнары, калі чалавек проста знікае ў калоніі без якіх-небудзь вестак. Прыбыўшы месяц таму ў калонію Наваполацка, Анджэй паведаміў пра гэта ў лісце. Таксама ён паспеў паведаміць, што адразу ж у карантыне яго абвясцілі «злосным парушальнікам» і пазбавілі перадачы і спатканні».

## Жнівень

**01.08.2023**




У чым 75-гадовага актывіста звінавацiў Верхнядзвiнскi раённы суд, застаецца невядомым. Пра адміністрацыйны артыкул, паводле якога ён быў пакараны, пасля арышту можна будзе даведацца ад толькі ад самога Барыса Хамайды. Але падставай для затрымання найстарэйшага віцебскага актывіста стала вокладка пашпарта з малюнкам Пагонт, якую не ўпадабалі памежнікі ў дызель-цягніку Полацк-Бігосава. У Бігосаве Барыс Хамайда меркаваў далучыцца да пілігрымкі ў Росіцу, але памежнікі, якія правяралі дакументы ў пасажыраў, затрымалі актывіста, як толькі ён выйшаў з цягніка. Такім чынам у Росіцу, дзе вернікі 28 ліпеня аддавалі пашану мучанікам-святарам Юрыю Кашыру і Антонію Ляшчэвічу, якія нацысты спалілі ў касцёле разам з прыхаджанамі, Барыс Хамайда так і не трапіў. Ён не першы раз бярэ ўдзел у пілігрымках, і раней вокладка ягонага пашпарта не выклікала пытанняў падчас праверкі ў памежнай зоне (станцыя Бігосава – апошні чыгуначны прыпынак на беларускім баку, праз некалькі кіламетраў пачынаецца тэрыторыя Латвіі). Да суду 31 ліпеня актывіста трымалі ў Верхнядзвінскім РАУС, адбываць астатнія 12 сутак арышту ён, найверагодней, будзе ў наваполацкім ЦІПе. Існуе даўняя практыка менавіта ў Наваполацку ўтрымліваць тых, каго пакаралі адміністрацыйнымі арыштамі ў Внрхнядзвінскім раёне. Прычым ў міліцыі адразу папярэдзілі, што перадачы «палітычным» перадаваць не будуць, бо гэта «не паложана». Дакумент, дзе замацаваны такія правілы, вядома ж, не паказалі.

**01.08.2023**

Суддзя суда Шаркаўшчынскага раёна Аксана Табола 19 ліпеня за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў пакарала арыштам на пяць сутак мясцовага жыхара і шматдзетнага бацьку Уладзіміра Рынкевіча.

У судзе было ўстаноўлена, што Уладзімір размяшчаў, захоўваў і доўгі час распаўсюджваў у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» інфармацыю інтэрнэт-супольнасцяў "STOP LUKA" і "Белсат", якія ўлады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Пры вынясенні пакарання, суддзя Табола прыняла ў разлік, што «правапарушальнік» шчыра раскаяўся, а таксама тое, што ў яго на ўтрыманні маюцца малалетнія дзяцей.

Тым не менш, суд на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергнуў Рынкевіча адміністрацыйнаму арышту на тэрмін 5 сутак, але тэлефон вырашыў не канфіскоўваць у даход дзяржавы

**02.08.2023**

Як стала вядома, яшчэ ў пачатку траўня глыбоцкія міліцыянты амаль апоўначы (23.35) затрымалі дачку журналіста Змітра Лупача Святлану. У той дзень яна адпачывала на Глыбоччыне разам з сябрамі, міліцыянты прыехалі ў самы разгар адпачынку і спачатку затрымалі ўсіх, але пасля выпусцілі і пакінулі ў міліцыі адну Святлану.

Суддзя Глыбоцкага суда Андрэй Тарасевіч 3 траўня пакараў яе спачатку 10 суткамі па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП за распаўсюд так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў у сацыяльных сетках і мэсэнджарах. Пасля гэтага над ёй быў яшчэ адзін суд, падчас якога дзяўчыне прысудзілі яшчэ за гэта і 25 базавых велічыняў штрафу. Але на гэтым улады не спыніліся і перавялі Святлану Лупач у Віцебскае СІЗА, ёй інкрымінуюць крымінальны артыкул 342 - Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаюцца з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады або пацягнулі парушэнне працы транспарту, прадпрыемстваў, устаноў або арганізацый, або актыўны ўдзел у такіх дзеяннях пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства.

Паводле гэтага артыкулу людзей караюць арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

Напрыканцы ліпеня родныя разам з адвакатам Святланы спрабавалі аспрэчыць у абласным судзе яе затрыманне і ўзяцце пад варту. Судовае пасяджэнне па гэтай справе было закрытым і праходзіла ў судзе Першамайскага раёна Віцебска. Суддзя Алена Жук пакінула скаргу без задавальнення.

У адваката Святланы Лупач узялі падпіску аб неразгалошванні, таму пра справу мала што вядома. Але лісты да родных час ад часу ад яе даходзяць.

**03.08.2023**

Суддзя Дубровенскага раёна Марыя Цыклінская 15 чэрвеня за падпіску на "экстрэмісцкія" інфармацыйныя рэсурсы ў сацыяльных сетках пастанавіла аштрафавала на 370 рублёў мясцовую жыхарку маці траіх малалетніх дзяцей Святлану Маталыгіну.

У судовым паседжанні быў усталяваны факт таго, што «правапарушальніца» з дапамогай тэлефона з

2020 года ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» мела падпіску на інфармацыйную прадукцыю ў дзвюх групах уключаных у Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Міліцыя выявіла гэтую інфармацыю падчас маніторынгу інфармацыйных рэсурсаў у Інтэрнеце.
Прызнанне сваёй віны і зробленага для суддзі Цыклінскай было дастаткова, каб пакараць Святлану, на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП, штрафам у памеры 10 базавых велічыняў.

**04.08.2023**
У судзе Глыбоцкага раёна 20 снежня 2022 года асудзілі Аляксея Азарку паводле арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Андрэй Тарасевіч прызначыў Аляксею два гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу (“хатняй хіміі”) і штраф 60 базавых велічыняў (1920 рублёў). 7 сакавіка 2023 года Віцебскі абласны суд узмацніў прысуд пасля апеляцыйнага пратэсту пракурора.
Аляксея асудзілі за абразлівыя інтэрнэт-каментары ў тэлеграм-канале ў бок двух прадстаўнікоў улады. Як вынікае з тэкста пастановы, адна з лексемаў у каментарах Аляксея была “рожа”.
Аднак пасля абвяшчэння прысуду пракурор Глыбоцкага раёна В. падаў апеляцыйны пратэст у абласны суд на рашэнне суда Глыбоцкага раёну. Яму дапамог абгрунтаваць апеляцыйны пратэст намеснік начальніка аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці.
Не так даўно стала вядома пра тое, што Віцебскі абласны суд адмяніў рашэнне суда Глыбоцкага раёну і змяніў Аляксею два гады “хатняй хіміі” на два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму і штраф 60 базавых велічыняў (1920 рублёў).

**04.08.2023**

Трэцяга жніўня праваабаронцы апублікавалі сумесную заяву праваабарончых арганізацый Беларусі аб прызнанні палітзняволенымі яшчэ 14 чалавек, якія праходзяць па крымінальнай справе 342 (Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак або актыўны ўдзел у іх) ды іншых. Сярод іх і глыбачанка Святлана Лупач.
Нагадаем, дзяўчыну затрымалі ў Глыбокім у пачатку траўня. Суддзя Глыбоцкага суда Андрэй Тарасевіч пакараў яе спачатку 10 суткамі па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП за распаўсюд так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў у сацыяльных сетках і мэсэнджарах. Пасля гэтага над ёй быў яшчэ адзін суд, падчас якога Святлане прысудзілі яшчэ 25 базавых велічыняў штрафу.
А пасля гэтага Святлану Лупач перавялі ў Віцебскае СІЗА, дзе ёй прад’явілі абвінавачванні па крымінальным артыкуле 342 (Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаюцца з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады або пацягнулі парушэнне працы транспарту, прадпрыемстваў, устаноў або арганізацый, або актыўны ўдзел у такіх дзеяннях пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства).
Адказнасць паводле гэтага артыкулу прадугледжвае арышт або абмежаванне волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

**06.08.2023**
Суддзя Глыбоцкага раёна Аляксандр Аляксеенка 5 чэрвеня пастанавіў пакараць арыштам на 10 сутак былую настаўніцу Празарокскай СШ 66-гадовую Алену Кішкурну, якая ў сацыяльных сетках распаўсюдзіла «экстрэмісцкія» матэрыялы ўзятыя ёю на пяці інфармацыйных рэсурсах.
У судовым паседжанні Алена Вацлаваўна не аспрэчвала факту наяўнасці ў яе старонкі ў сацыяльнай сетцы «УКантакце», і тое, што на гэтай старонцы былі змешчаныя матэрыялы, уключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. У судзе было таксама ўстаноўлена, што гэтая інфармацыя была выдаленая ёю яшчэ ў 2021 годзе.
Тым не меньш, на падставе прызнання віны «правапарушальніцы» і выкарыстоўваючы ч.2 арт.19.11 КаАП суддзя Аляксеенка падвергнуў педагога арышту тэрмінам на дзесяць сутак і канфіскаваў у пенсіянеркі ў даход дзяржавы сістэмны блок персанальнага камп'ютара.

**08.08.2023**
Ірына Пярцова – адна з удзельніц палітычных перфомансаў, за якія 20 траўня 2022г. былі асуджаны чацвёра жыхароў Віцебска. Усе яны атрымалі розны тэрмін зняволення, Ірына Пярцова – найменшы. Суддзя Віцебскага раённага суду Міхаіл Зубеня прызнаў жанчыну вінаватай паводле ч. 2 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (Хуліганства, здзейсненае групай асобаў), і з улікам таго, што ў яе ёсць малое дзіця, асудзіў да двух гадоў пазбаўлення волі ў калоніі. Яна ўжо выйшла на волю, але высветлілася,

што яна вінаватая зноў – за тое, што не выдаліла з тэлефона здымкі пра пратэстныя падзеі 2020 г. Пасля затрымання ў верасні 2021 г. сілавікі забралі ў Ірыны Пярцовай тэлефон. У чэрвені 2023г., калі жанчына ўжо выйшла на волю па сканчэнні пакарання па крымінальнай справе, яе прызналі вінаватай паводле адміністрацыйнага артыкула 24.23 КаАП. Быў складзены пратакол пра тое, што ў сетцы «ВКонтакте» знайшлі фотаздымкі падзеяў жніўня-верасня 2020г. У судзе Першамайскага раёна суддзя Наталля Караблiна аштрафавала Ірыну Пярцову на 1850 рублёў.

**08.08.2023**
Чашніцкі суд у асобе суддзі А.С. Смірновай прысудзіў былому прадпрымальніку, цяпер беспрацоўнаму, Уладзіміру Бакурыну 15 сутак арышту за падпіскі на так званыя экстрэмісцкія групы ў сацыяльнай сетцы “Вконтакте” і лайкі на іх матэрыялы.
Мужчыну судзілі 25 ліпеня па частцы 2 артыкула. 19.11 КаАП РБ (Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць).
Маніторылі старонкі Уладзіміра Бакурына ў сацыяльных сетках мясцовыя міліцыянты з Чашніцкага РАУС.
На судзе мужчына тлумачыў, што быў падпісаны на прызнаныя цяпер уладамі групы экстрэмісцкімі яшчэ задоўга да іх прызнання такімі. Пры гэтым ён зазначыў, што згубіў паролі да сваёй старонкі ў сацыяльнай сетцы “Вконтакте” і ўжо больш за паўтары гады ёй не карыстаўся.
Довады мужчыны, што ён не ведаў пра тое, што гэтыя групы былі ўнесеныя ў спісы экстрэмісцкіх матэрыялаў, суд не прыняў да ўвагі. Чашніцкі суд тлумачыў гэта тым, што так званы спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў знаходзіцца ў свабодным доступе і кожны ахвотны можа з ім азнаёміцца. Яшчэ суддзя Смірнова звярнула ўвагу на тое, што мужчына не выдаліў гэтыя падпіскі ці ўвогуле старонку, таму вінаваты.
Яна палічыла яго дзеянні адміністрацыйным правапарушэннем, якое адносіцца да катэгорыі грубых адміністрацыйных правапарушэнняў і накіравана на дэстабілізацыю грамадска-палітычнай абстаноўкі ў грамадстве і дзяржаве.
Чашніцкі суд арыштаваў Уладзіміра Бакурына на 15 сутак і канфіскаваў прадмет адміністрацыйнага правапарушэння. Гэтым, як напісана ў пастанове Чашніцкага суда, будуць дасягнутыя мэты адміністрацыйнай адказнасці, якія выяўляюцца ў выхаванні фізічнай асобы, якая ўчыніла адміністрацыйнае правапарушэнне, а таксама папярэджанні здзяйснення новых правапарушэнняў як самой фізічнай асобай, якая ўчыніла такое правапарушэнне, так і іншымі фізічнымі асобамі.
Вось так, на першы погляд, бяскрыўднымі падпіскамі ці лайкамі тых матэрыялаў, якія ўлады зрабілі экстрэмісцкімі, людзі нават не ўяўляюць, што могуць дэстабілізаваць грамадска-палітычную абстаноўку ў грамадстве і дзяржаве. А ўлады ў сваю чаргу лічаць падобныя суды выхаваўчым працэсам і запужваннем такім чынам іншых жыхароў Беларусі.

**09.08.2023**
Вінаватай паводле ч.2 арт.19.11 КаАП прызналі Вольгу Кубарскую, маці чацьвярых дзяцей. На яе старонцы ў сацыяльнай сетцы міліцыянты знайшли рэпосты з адной з суполак, прызнаных у Беларуси экстрэмісцкімі. Суддзя Алеся Саян пакарала жанчыну штрафам у памеры 1110 рублёў. Таксама суд пастанавіў канфіскаваць тэлефон Кубарскай.
Суддзя Алеся Саян, якая прызнала жанчыну вінаватай, працуе на гэтай пасадзе з 2022 г. Да таго, каб апрануць судзейскую мантыю, яна ішла шмат гадоў. Саян скончыла факультэт правазнаўства Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсіта імя А.Куляшова і прыйшла працаваць у Талачынскі раённы суд кансультантам.
Праз некалькі год яе прызначылі вядучым спецыялістам, і толькі ў верасні мінулага году Алеся Саян стала суддзёй – ёй быў прысвоены найніжэйшы 5-ты кваліфікацыйны клас.
Суддзя Саян не была датычнай да масавай карнай кампаніі ў 2020-м годзе, калі пасля прэзідэнцкіх выбараў судовыя справы ішлі проста валам, не спрычынілася яна і да пазнейшай хвалі судоў у 2021-годзе. Аднак сёлета ёй давялося засведчыць адданасць сістэме, аштрафаваўшы шматдзетную маці.
Вольга Кубарская працуе ў бьюці-сферы, выхоўвае трох сыноў і дачку.

**09.08.2023**
Суддзя суда Аршанскага раёна і Оршы Мікалай Драгуноў 27 ліпеня за правядзенне пікету ў сацыяльных сетках пастанавіў аштрафаваць на 1110 рублёў аршанку Інгу Тыльчык.
У судзе было ўстаноўлена, што «правапарушальніца», з 14 лістапада 2020 года па 18 ліпеня 2023 года ў парушэнне парадку правядзення пікетавання, з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных настрояў, прыняла ўдзел у масавым мерапрыемстве.

Гэта выявілася ў тым, што Інга была сфатаграфаваная на фоне палотнішча выкананага ў тонах бел-чырвона-белага колеру, пры гэтым яна не атрымала дазволу мясцовага кіраўніцтва Аршанскі раённы выканаўчы камітэт.
Пры гэтым, у судзе Тыльчык прызнала сябе вінаватай, у зробленым шчыра раскаялася, ад даследавання доказаў па справе адмовілася.
На падставе прызнанняў і кіруючыся ч. 1 арт. 24.23 КаАП суддзя Драгуноў падвергнуў жанчыну адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў суме 1110 рублёў.

**10.08.2023**

Суддзя Глыбоцкага суда Аляксандр Аляксеенка прысудзіў маладой жанчыне з Глыбокага Надзеі Маліноўскай 25 ліпеня штраф памерам 4440 беларускіх рублёў і канфіскаваў тэлефон “Samsung A41”.
Жанчыну абвінавацілі па двух артыкулах – частцы 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуючай такую дзейнасць) і частцы 1 арт. 24.23 КаАП (Парушэнне парадку правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі, пікетавання, іншага масавага мерапрыемства). Па першым артыкуле Надзеі прысудзілі 25 базавых велічыняў штрафу, па другім – 95, што агулам склала 120 базавых велічыняў.
Яе вінавацілі ў тым, што пры адміністраванні сацыяльных сетак “Вольнага Глыбокага” яна рабіла рэпосты матэрыялаў прызнанага ўладамі экстрэмісцкім фармаваннем польскага тэлекагнала “Белсат”, а таксама размясціла выяву “Пагоні”, бел-чырвона-белага сцяга і надпісу “Жыве Беларусь”. Апошняе ўлады расцанілі як пікет, які прайшоў без дазволу Глыбоцкага райвыканкама.
Нагадаем, прадукцыя старонкі “Вольнае Глыбокае” ў сацыяльнай сетцы Instagram і ў “Вконтакте” былі прызнаныя экстрэмісцкімі 26 чэрвеня 2023 года па рашэнні Глыбоцкага суда.
Газета “Вольнае Глыбокае” па эканамічных прычынах спыніла сваё існаванне напрыканцы 2020 года і з 2021 года ўжо не выходзіла. Адзінае незалежнае друкаванае выданне праіснавала ў рэгіёне 26 год. У кастрычніку 2021 года пракуратура Віцебскай вобласці абмяжоўвала доступ да сайта vglybokaye.by. Цяпер, відаць, дайшла чарга і да сацыяльных сетак выдання.

**10.08.2023**

Штраф Вікторыі Казун, маці траіх дзяцей, 21 ліпеня прысудзіла суддзя Талачынскага райсуду Наталля Барысавец. У той самы дзень у Талачынскам райсудзе была асуджана да такога самага штрафу яшчэ адна жанчына з трыма дзецьмі – Вольга Кубарская. Яе судзіла Алеся Саян, якая толькі нядаўна пачала кар“еру суддзі. Абедзьвюх жанчын аштрафавалі з распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў – рэпосты ў сацыяльных сетках з інтэрнэт-рэсурсаў, якія ў Беларусі прызаныя «экстрэмісцкімі».
Вікторыя Казун, згодна з матэрыяламі адміністрацыйнай справы, распачатай паводле ч.2 арт 19.11 КаАП, мела на сваёй старонцы ў «Одноклассниках» паведамленні аднаго са СМІ, прызнанага «экстрэмісцкім». За гэта суд аштрафаваў яе на 30 базавых велічынь.
Два гады таму Вікторыя Казун была гераіняй артыкула «Как совместить воспитание троих детей и работу помощника лесничего, знает Виктория Казун, которая уже 16 лет трудится в Толочинском лесхозе». Артыкул быў надрукаваны ў абласной газеце «Витебские вести» напярэдадні 8 сакавіка. У ім жанчына распавядае, што рана засталася без маці, скончыла Полацкі дзяржаўны лясны каледж, на працы ў Талачынскім лясгасе пазнаёмілася з будучым мужам, і цяпер у сям“і выхоўваюцца трое дзяцей (16, 9 і 6 гадоў на дадзены момант).
Згодна з рашэннем суду, шматдзетная сям“я мусіць выдаткаваць са свайго невялікага бюджэту 1110 рулёў на пагашэнне штрафу, а таксама суддзя Наталля Барысавец пастанавіла канфіскаваць тэлефон у Вікторыі Казун.

**11.08.2023**

Суддзя суду Першамайскага раёна Юрый Урбан 4 жніўня пакараў 23-гадовага Паўла Дунаева за здзек над дзяржаўнымі сімваламі паводле арт. 370 Крымінальнага кодэкса. Суд прызначыў маладому чалавеку кару ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін два гады.
Следчыя змаглі раскрыць супрацпраўныя дзеянні Дунаева з дапамогай камер назірання, якія размешчаны ў шматлікіх месцах Віцебска.
Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, абвінавачаны ноччу 21 красавіка 2022 года Павел сарваў дзяржаўны сцяг, які быў усталяваны на будынку крамы “Веста”. Затым ён дэманстратыўна перасоўваўся з ім у руках па вуліцах горада, пашкодзіўшы пры гэтым яго наверша. Урэшце юнак кінуў сцяг на зямлю на тэрыторыі адной з гарадскіх ўстаноў аховы здароўя і сышоў дамоў.

**11.08.2023**




Суддзя суда Наваполацка Таццяна Хрыпач 27 ліпеня пастанавіла за правядзенне недазволенага ўладамі пікета ў сацыяльных сетках арыштаваць на 13 сутак апаратчыка палімерызацыі цэха №102 ААТ "Нафтан" завода "Палімір" бегуна на доўгія дыстанцыі Андрэя Беразоўскага.
У судовым паседжанні было ўстаноўлена, што «правапарушальнік» у парушэнні закона без Наваполацкага гарвыканкама, выказваў грамадска-палітычныя, асабістыя і іншыя інтарэсы, шляхам апублікавання ў агульным доступе на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы "Фэйсбук" для азнаямлення іншымі карыстальнікамі фатаграфіі сябе і выявы з надпісам «Слава Украіне» на фоне сіне-жоўтага колеру.
У судовым паседжанні Беразоўскі прызнаў, што з 24.02.2022 да 21.07.2023, з дапамогай мабільнага тэлефона, падлучанага да сеткі Інтэрнэт, на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы здзейсніў разумнае яму дзеянне.
Зыходзячы з прад'яўленых работнікамі міліцыі доказаў і прызнанняў самога Беразоўскага, суддзя Хрыпач прыйшла да высновы, што ён ажыццявіў пікетаванне ў парушэнне ўстаноўленага парадку яго правядзення і пастанавіла ў адпаведнасці з ч.1 арт.24.23 КаАП пакараць мужчыну арыштам на 13 сутак.

**12.08.2023**

Паводле праваабаронцаў, затрыманне, меркавана, адбылося 11 жніўня. Вольга Брыцікава, былая старшыня незалежнага прафсаюзу ААТ «Нафтан», была на лецішчы калі па яе прыехалі супрацоўнікі АМАПу. Абодвух затрымалі ў межах крымінальнай справы паводле ч. 2 арт. 361 Крымінальнага кодэкса (Заклікі да санкцый, іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі). У 2020 г. Вольга Брыцікава, якая кіравала незалежным прафсаюзам на ААТ «Нафтан», у мінулым годзе адбыла 75 сутак за кратамі – ей прысудзілі 5 арыштаў за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне. Падчас арышту яна абвяшчала галадоўку на знак пратэсту.
З таго часу ўжо было зразумела, што сілавікі не пакінуць актывістку ў спакоі, аднак з’язджаць з Беларусі Брыцікава прынцыпова адмовілася.
Да 2020-га году жанчына працавала на «Нафтане», аднак у снежні яе звольнілі: загад аб звальненні быў выдадзены ў сувязі з «пазбаўленнем доступу да дзяржаўнай таямніцы».Аляксандр Кухаронак - адзін з самых першых, хто ў 2020 годзе абвясціў стачку на прадпрыемстве. Супрацоўнікі АМАПу затрымалі яго разам з жонкай. У сям“і гадуюцца двое непаўналетніх дзяцей. Ці адпусцілі іх маці, пакуль не вядома.
Аляксандра Кухаронка таксама арыштоўвалі па адміністрацыйнай справе – у 2021 годзе ён адбыў 20 сутак арышту. За ўдзел у запісе відэаролік з заклікам галасаваць на платформе «Голас» яго абвінавацілі ў правядзенні несанкцыянаванай акцыі (арт. 24.23 КаАП).

**13.08.2023**

Валанцеры прааналізавалі працу суда Першамайскага раёна Віцебска і высветлілі, што суддзя Наталля Карабліна толькі за адзін дзень 26 чэрвеня асудзіла 5 чалавек па палітычных адміністрацыйных справах. Усіх прызнала вінаватымі і пастанавіла накіраваць пад арышт на тэрміны ад 10 да 15 сутак. Агулам атрымалася 65 сутак зняволення, прычым паводле «гендэрнага падыходу» суддзя накіроўвала за краты мужчын на 15 сутак, а жанчын – на 10.
Бізнес-аналітыка ААТ «Кераміка» Наталля Карабліна прызнала вінаватым ў распаўсюдзе «экстрэмісцкіх» інфармацыйных матэрыялаў ( ч. 2 арт.19.11 КаАП) і пакарала 15-цю суткамі арышту. На такі самы тэрмін арышту паводле таго самага артыкула суддзя Карабліна асудзіла інжынера – карыстальніка сацыяльнай сеткі «Одноклассники», як таксама меў на сваёй старонцы рэпосты з інтэрнэт-рэсурсаў, прызнаных «экстрэмісцкімі».
З пастановамі пра 10 сутак арышту трапілі ў ІЧУ пасля суду ў Наталлі Караблінай дзве жанчыны: інжынер-канструктар ААТ «Кераміка» і мантажніца радыёапаратуры. Абедзве таксама былі прызнаныя вінаватымі ў распаўсюдзе «экстрэмісцкіх» матэрыялаў на ўласных старонках у «Одноклассниках».
Ва ўсіх чатырох пастановах суддзя падкрэслівала, што наяўнасць рэпостаў, пра якія падсудныя даўно забыліся, бо зрабілі іх яшчэ да таго, як згаданыя інтэрнэт-рэсурсы былі залічаны ў «экстрэмісцкія», сведчыць пра памкненне да дэстабілізацыі грамадства і накіраваныя супраць дзейнай улады.

Пэўным выключэннем стала справа тэхніка-канструктара ААТ «Кераміка», у тэлефоне якога супрацоўнікі міліцыі знайшлі фотаздымкі з бел-чырвона-белым сцягам. Падчас працэсу падсудны не прызнаў сябе вінаватым. Ен патлумачыў, што яму вельмі падабаецца ўласная выява на дадзеным здымку, і менавіта таму ен размясціў гэты здымак у «Одноклассниках». Наталля Карабліна расцаніла гэта як несанкцыянаванае пікетаванне «з мэтай выражэння сваіх грамадска-палітычных поглядаў або пратэсту». Паводле арт. 24.23 КаАП мужчына таксама быў асуджаны да 15-ці сутак арышту. Наталля Карабліна судзіць людзей па палітычных адміністрацыйных артыкулах ужо не першы год, і падобныя справы ёй давяралі яшчэ да пратэстных падзеяў 2020-га . З часоў мінулай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі жанчына вынесла некалькі карных прысудаў і па палітычных крымінальных справах: па арт. 341 КК (Апаганьванне зудаванняў і псаванне маёмасці), арт. 364 КК (Гвалт або пагроза гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў), арт. 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады). Па гэтых артыкулах яна прысудзіла жыхарам Віцебска агулам 12 гадоў пазбаўлення волі.

**14.08.2023**




Праваабаронцам стала вядома, што Вольгу Брыцікаву, былую старшыю незалежнага прафсаюзу ААТ «Нафтан», вінавацяць паводле ч. 1 арт. 361 КК РБ (Публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады, або гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, або здрадзе дзяржаве, або здзяйснення акта тэрарызму або дыверсіі, або ажыццяўлення дзеянняў, накіраваных на парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, або здзяйснення іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, у тым ліку на прымяненне мер абмежавальнага характару (санкцый) у дачыненні да Рэспублікі Беларусь). Аляксандра Кухаронка вінавацяць паводле таго ж артыкула, але па каторай частцы – звестак няма. Вольгу Брыцікаву і Аляксандра Кухаронка затрымалі 11 жніўня. Кухаронак быў затрыманы ў вёсцы Росіца Верхнядзвінскага раёна, там АМАПаўцы правяліператрус, а таксама пеатрусы прайшлі на кватэры Кухаронка і ў ягоных бацькоў у Наваполацку. Спачатку разам з ім была затрыманая і жонка, але пазней яе адпусцілі. Аляксандр Кухаронак быў адным з першых работнікаў «Нафтана», якія падтрымалі стачку на прадпрыемстве. У 2021 годзе ён адбыў 20 сутак арышту за ўдзел у запісе відэаролік з заклікам галасаваць на платформе «Голас» -- яго абвінавацілі ў правядзенні несанкцыянаванай акцыі (паводле арт. 24.23 КаАП). Вольга Брыцікава, у якой таксама правяліператрус, летась адбыла за кратамі 75 сутак. Ёй прысудзілі 5 арыштаў запар за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне. Падчас арышту яна абвяшчала галадоўку на знак пратэсту.
Паводле ч.1 арт. 361 КК РБ жанчыне пагражае арышт або пазбаўленне волі на тэрмін да 3-х гадоў.

15.08.2023

Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 18 ліпеня пастанавіла арыштаваць на 13 сутак работніка ААТ «Нафтан» Сяргея Шалавіна, за тое, што ён у сацыяльнай сетцы распаўсюджваў «экстрэмісцкія» матэрыялы. Адміністрацыйная справа бела разгледжана без удзелу «правапарушальніка».

У матэрыялах справы значыцца, што Сяргей на сваёй персанальнай старонцы ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» у раздзеле «Фота» ад жніўня 2020 года захоўваў фатаграфіі з лагатыпам «NEXTA», уключаным у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Улічваючы толькі гэты адзіны факт, суддзя Балаболава прыйшла да высновы, што ў дзеяннях мужчыны змяшчаецца склад адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага ч.2 арт.19.11 КаАП.

З-за таго, што «экстрэміст» завочна прызнаў сваю віну суд пастанавіў арыштаваць Шалавіна толькі на трынаццаць, а тэрмін адбыцця арышту вылічваць з даты яго фактычнага затрымання.

**16.08.2023**

Суддзя суда Талачынскага раёна Алеся Саян 21 ліпеня за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у сацыяльнай сетцы пакарала штрафам у памеры 1110 рублёў мясцовую жыхарку маці двух дзяцей Насту Іванову.

У судзе мясцовыя работнікі міліцыі прад'явілі доказы таго, што Іванова з 2018 па 6 ліпеня 2023 года ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» захоўвала і распаўсюджвала інфармацыйнаю прадукцыю - інтэрнэт-старонку з назвай «Symbalby», уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

І хаця «правапарушальніца» не прызнала віну, суддзя Саян пастанавіла на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП пакараць яе штрафам у даход дзяржавы ў памеры 30 базавых велічыняў з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння і сродка ўчынення правапарушэння - мабільнага тэлефона.

**16.08.2023**

Жыхара г. Барані Віталя Шмата асудзілі да 15 сутак арышту за тое, што ён у нецвярозым стане выгукнуў «Жыве Беларусь!». Суддзя Мікалай Драгуноў прызнаў гэта несанкцыянаваным пікетаваннем і пакараў мужчыну паводле ч.1 арт. 24.23 КаАП. Тлумачэнні падсуднага пра тое, што такім чынам ён выражаў любоў да сваёй дзяржавы, суд назваў не адпаведнымі рэчаіснасці. Якім чынам суддзя ў гэтым пераканаўся, застаецца загадкай.
Гісторыя, якая скончылася судом, пачыналася вельмі проста. Увечары з 5 на 6 жніўня жыхар Барані адпачываў у вулічнай кавярні (філіяле кавярні «Замкавае) каля былога калегіума езуітаў. Адпачынак суправаджаўся ўжываннем алкаголю, і бліжэй да поўначы нецвярозы грамадзянін, не стрымаўшы паўнаты пачуццяў, выгукнуў «Жыве Беларусь!». Гэта пачуў міліцэйскі патруль, міліцыянта склалі рапарт свайму кіраўніцтву і атрымалі загад затрымаць грамадзяніна, што і адбылося ў панядзелак 7 жніўня.
Суд адбыўся на наступны дзень. Суддзя вынес пастанову, абапіраючыся на сведчанні міліцыянтаў і складзеныя імі ж дакументы: рапарт, пратакол пра адміністрайцыйнае правапарушэнне, пратакол пра затрыманне за згаданае правапарушэнне. Дзеля падмацавання сваёй пазіцыі суд запытаўся ў Аршанскім райвыканкаме, ці падаваў нецвярозы грамадзянін заяўку на правядзенне пікетавання ў вулічнай кавярні. Атрымаўшы адмоўны адказ, суддзя вынес пастанову пра арышт. У пастанове асобна падкрэслена, што абвінавачаны і раней быў неаднаразова прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку «за аналагічнае правапарушэнне».
Падобны інцыдэнт суддзя Мікалай Драгуноў разбіраў 18 траўня гэтага году. Тады за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне ён прысудзіў 10 сутак арышту жыхару Оршы. Той таксама быў нецвярозы, калі на аўтобусным прыпынку крыкнуў «Жыве Беларусь!» і «Слава Украіне». Тым разам ініцыятарам адміністрацыйнай справы быў чалавек у вайсковай форме, да якога нецвярозы аршанец звярнуўся з пытаннем пра стаўленне вайскоўцаў да вайны ва Украіне – ён патэлефанаваў у міліцыю і паскардзіўся на «апазіцыйныя лозунгі».

**18.08.2023**

Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Наталля Карабліна 29 чэрвеня за ўпадабаную публікацыю на «экстрэмісцкім» інфармацыйным рэсурсе пастанавіла арыштаваць на 12 сутак віцебскага газаэлектразваршчыка Ігара Філімонава.
У судзе высветліўся факт таго, што мужчына ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» распаўсюджваў інфармацыю, апублікаваную ў групе «Люстэрка», якую ўлады ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Распаўсюджванне выявілася ў тым, што Ігар насупраць некаторых публікацый пакідаў пазнаку "Падабаецца".
На думку суддзі Караблінай наяўнасць у адкрытым доступе працяглы час на старонцы «правапарушальніка» матэрыялаў, прызнаных судом экстрэмісцкай прадукцыяй, мелі на мэце дэстабілізаваць існуючыя грамадскія адносіны і былі накіраваныя супраць дзейнай улады.
На думку суддзі ў Філімонава былі змякчальная акалічнасці - наяўнасць двух малалетніх дзяцей. Улічваючы гэтыя абставіны, суд пастанавіў у рамках ч.2 арт. 19.11 арыштаваць мужчыну на 12 сутак.

**18.08.2023**

Пра гэта зняволены журналіст і актывіст польскай меншасці ў Беларусі напісаў у адным з лістоў дадому. У наваполацкую ПК№1 ен трапіў у канцы траўня. Яго размеркавалі туды адбываць пакаранне, прысуджанае паводле арт. 361 Крымінальнага кодэкса (Заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь), арт. 130 Крымінальнага кодэкса (Распальванне варожасці ці варажнечы). 8 лютага 2023 г. суддзя Гродзенскага абласнога суду Дзмітрый Бубенчык прысудзіў Анджэю Пачобуту восем гадоў зняволення ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.
Прычынай пакарання, як вынікае з ліста з калоніі, стала адмова ад працы, якую, паводле Пачобута, немагчыма выканаць. Як было вядома праваабаронцам, у калоніі журналіст працаваў на ачыстцы правадоў – здабываў медзь. Пачобут мае сур’ёзныя праблемы са здароўем. Аднак, калі спачатку фельчар адмовілася падпісаць медыцынскую даведку пра тое, што Анджэй па стане здароўя можа ўтрымлівацца ва ўмовах памяшкання камернага тыпу (ПКТ) ( пры аглядзе быў зафіксаваны зрыў рытму сэрца і ціск 190/140), то на наступны дзень прыйшоў іншы медык, урач-тэрапеўт, і падпісаў даведку.
Незадоўга да гэтага да гэтага ў наваполацкай папраўчай калоніі Анджэй Пачобут правёў 30 сутак у штрафным ізалятары, куды яго змясцілі адразу з каранціну пасля этапавання.

**19.08.2023**



Беларуская праваабарончая супольнасць прызнала жыхара Расонаў палітычным зняволеным 18 жніўня. Мужчыну затрымалі сёлета 9 чэрвеня і вінавацяць паводле арт. 342- 2 Крымінальнага кодэкса (Неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў) і арт. 368 Крымінальнага кодэкса (Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Машарскага ўтрымліваюць у Віцебскім СІЗА-2.Судовы працэс паводле крымінальнага абвінавачвання будзе весці суддзя суду Полацка і Полацкага раёна Уладзімір Бясецкі. Арт. 342- 2 Крымінальнага кодэкса апошнім часам прымяняюць у дачыненні да тых, хто цягам году здзейсніў некалькі адміністрацыйных правапарушэнняў і пасля судоў «не выправіўся». Мікалая Машарскага каралі паводле «палітычных» адміністрацыйных артыкулаў некалькі разоў. Так, сёлета 24 студзеня ён быў затрыманы і асуджаны да 25 сутак арышту паводле арт. 24.23 КаАП за нібыта правядзенне несанкцыянаванага пікетавання ( на яго склалі два пратаколы па гэтым артыкуле). Арышт мужчына адбываў у Наваполацкім ЦІПе.

У сакавіку 2022 г. Машарскаму прысудзілі арышт на 20 сутак за заклікі да ўдзелу ў акцыі пратэсту 27 лютага (гэтаксама паводле арт. 24.23 КаАП) Суд над ім прайшоў, пакуль мужчына знаходзіўся ў Расіі – спавяшчэнне пра яго ён атрымаў на Вайбер. Мікалай Машарскі адказаў, што знаходзіцца за межамі краіны, і зможа вырнуцца толькі праз 10 дзён. Аднак суддзя Расонскага райсуду Рада Дамініч 16 сакавіка разгледзела справу Машарскага ў ягоную адсутнасць, а ў пастанове адзначыла, што мужчына «быў належным чынам апавешчаны пра час і месца разгляду справы» і што «Машарскім падчас падрыхтоўкі справы аб адміністрацыйным правапарушэнні да разгляду заўваг і тлумачэнняў наконт зместу пратаколу не зроблена». Хоць Мікалай фізічна не мог азнаёміцца з матэрыяламі справы. Праз дзень пасля вяртання ў Беларусь Мікалая затрымалі дома пяцёра сілавікоў у бронекамізэльках.
Першы адміністрацыйны пратакол на Машарскага склалі за «пікетаванне» ў Дзень Незалежнасці Беларусі 3 ліпеня 2021 г. Позна ўвечары Мікалай з сям'ёй выйшлі на галоўную плошчу, каб паглядзець на салют, і ён выгукнуў «Жыве Беларусь». Непадалёк стаялі міліцыянты, Мужчыну жорстка затрымалі, паваліўшы на зямлю.
Акрамя пратакола паводле артыкула 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў) на мужчыну склалі пратакол паводле арт. 24.3 КаАП за «непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі» падчас затрымання. Суддзя Расонскага райсуду Алена Елавая прызнала яго вінаватым і пастанавіла арыштаваць Машарскага паводле двух пратаколаў на 15 сутак. Увесь арышт мужчына правёў у адзіночнай камеры наваполацкага ЦІПа, дзе падчас надглядаў і на шпацыры яго вадзілі ў кайданках.
Пазней адміністрацыйны пратакол быў складзены і на ягоную жонку як на ўдзельніцу несанкцыянаванага пікета. Яна працавала фельчаркай хуткай дапамогі, і суд над ей вырашылі праводзіць публічна ў лякарні перад усімі работнікамі. Суддзя Алена Елавая публічна асуджала Мікалая і нават казала, што ёй трэба з ім разводзіцца.

**19.08.2023**

Суддзя суда Наваполацка Сняжана Калінічэнка 2 жніўня за падпіску на пяць «экстрэмісцкіх» каналаў у Youtube пастанавіла арыштаваць на 15 сутак мясцовага жыхара ІП Аляксандра Жыхарава.
Згодна з пратаколам, "правапарушальнік" размеціў і захоўваў на сваёй персанальнай старонцы ў сетцы "Youtube.com", спасылкі на каналы "NEXTA Live", "Belsat NEWS", "Euroradio Live", "Рэальная Беларусь", "Краіна для жыцця». Гэтыя каналы ў розныя часы ўладамі былі ўключаны ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні Жыхараў віну не прызнаў, спаслаўшыся на тое, што ён не ведаў пра тое,што каналы былі прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі.
Аднак гэтая акалічнасць не падзейнічала на суд, які палічыў, што Аляксандр здзейсніў правапарушэнне ў рамках ч.2 арт. 19.11 КаАП. Зыходзячы з гэтага судзьдзя Калінічэнка пастанавіла арыштаваць мужчыну на 15 сутак.

**20.08.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 10 жніўня за захоўванне і распаўсюд у сацыяльных сетках публікацый «экстрэмісцкага» характару вырашыла арыштаваць на 7 сутак жыхара Міёра Юрыя Варанько.

У судовым паседжанні Юры прызнаў факт знаходжання ў яго профілі ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм» публікацый і відэапрадукцыі, прызнанай рашэннямі судоў экстрэмісцкай.
На падставе прызнання сваёй віны і датычнасці ў здзяйсненні правапарушэння прадугледжанай ч.2 арт. 19.11 КаАП, суддзя Яскевіч пакарала Варанько адміністрацыйным арыштам на сем сутак, без канфіскацыі ягонага асабістага тэлефона.

**20.08.2023**

Зою Баранаву вінавацяць паводле ч.1 арт. 368 КК РБ (абраза прэзідэнта Рэспублікі Бедарусь) і паводе арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады). Факты абразаў сілавікі знайшлі, вывучаючы старонкі пенсіянеркі ў сацыяльных сетках. Суд над жанчынай адбудзецца 29 жніўня ў Шумілінскім райсудзе, яе справу даручана разглядаць суддзі Алене Сініцкай. У студзені 2023г. сілавікі звярнулі ўвагу на старонкі пенсіянеркі ў сацыяльных сетках: там яны знайшлі падпіскі на «экстрэмісцкія» інфармацыйныя рэсурсы, рэпосты з іх, а таксама выявы бел-чырвона-белых сцягоў і «Пагоні», перадрукаваныя з розных крыніц карыкатуры на Лукашэнку і Пуціна. Дома ў жанчыны правялі ператрус, у яе забралі мабільны тэлефон. 3-га верасня Зоі Баранавай споўніцца 65 гадоў. Як кажуць яе знаёмыя, жанчына заўсёды вызначалася прынцыповасцю, уважліва сачыла за палітычнымі падзеямі і добра разбіралася ў гісторыі (школьным настаўнікам гісторыі быў яе бацька).

**21.08.2023**

Суддзя суд Браслаўскага раёна Аляксандр Вязіцкі 31 ліпеня прыняў рашэнне арыштаваць на 10 сутак кіроўцы-міжнародніка Дзмітрыя Жарскага, які на думку суддзі распаўсюджваў у сацыяльных сетках экстрэмісцкія матэрыялы. На разгляд адміністратыўнай справы “правапарушальнік” не зьявіўся.
Суд устанавіў, што Жарскі захоўваў з мэтай распаўсюджвання інфармацыйную прадукцыю экстрэмісцкага зместу, якая знаходзілася старонках сацыяльнай сеткі "Instagram" з назвай "NEXTA" і "Charter97.org".
Суддзя Вязіцкі прыняў рашэнне зыходзячы з таго, што вінаватасць мужчыны ў здзяйсненні правапарушэння пацвярджаецца рапартам супрацоўніка Браслаўскага РАУС. У выніку ён прыйшоў да меркавання аб тым, што Зміцер здзейсніў правапарушэнне, вызначанае ў ч.2 арт.19.11 і ў рамках гэтага артыкула пастанавіў арыштаваць кіроўцу-міжнародніка на дзесяць сутак і канфіскаваць у даход дзяржавы яго тэлефон.

**22.08.2023**

Суддзя суд Пастаўскага раёна Анатоль Карытка 23 чэрвеня за распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў арыштаваў на 7 сутак мясцовага 42-гадовага жыхара Дзяніса Цыбульскага. Раней Цыбульскі затрымліваўся ў межах крымінальнай справы за ўдзел у пратэстах у Менску.
Пры разглядзе у судзе адміністрацыйнай справы мясцовыя міліцыянеры прадаставілі доказы таго, што ў сваім профілі сацыяльнай сеткі «Аднакласнікі», Дзяніс распаўсюдзіў інфармацыйную прадукцыю з інтэрнэт-рэсурсу "Хартыя'97%", уключаную ўладамі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні «правапарушальнік» віну ў здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння не прызнаў. Ён патлумачыў, што выкладзеныя ў пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэнні акалічнасці не адпавядаюць рэчаіснасці, паколькі прагледзець у Інтэрнэце названыя рэсурсы не ўяўляецца магчымым. Але не адмаўляў, што спасылкі на "Хартыя'97%", маглі знаходзіліся на ягонай старонцы ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі».
Тым не менш, суддзя Карытка палічыў, што мужчына распаўсюджваў «экстрэмізм» у сацыяльных сетках і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергнуў Цыбульскага арышту на сем сутак і канфіскаваў у даход дзяржавы тэлефонны апарат, які яму належыў.

**22.08.2023**

У наваполацкай калоніі ён адбывае пакаранне, прысуджанае паводле ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (Удзел у масавых беспарадках) і арт. 342 Крымінальнага кодэкса ( Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх). Лянкевіча асудзілі за гэта да 5 з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Кіраўніцтва ўстановы ініцыявала судовы працэс дзеля вырашэння пытання наконт пераводу хлопца 2001г.н. на турэмны рэжым. Суд прызначаны на 5 верасня.
Ягор Лянкевіч – жыхар Менска. Ен быў затрыманы 9 снежня 2021 г. за ўдзел у пратэстах 2020г. У сакавіку 2022г. беларуская праваабарончая супольнасць прызнала яго палітвязнем. Суд над Ягорам Лянкевічам адбыўся праз чатыры месяцы пасля затрымання ў у судзе Маскоўскага раёна. 3 чэрвеня 2022 г. хлопец адбывае пакаранне ў наваполацкай ПК № 1. Тады ж, у чэрвені 2022г. КДБ уключыў палітвязня ў спіс "асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці".

**23.08.2023**

Суддзя суда Браслаўскага раёна Вольга Пракопчык 5 ліпеня пастанавіла арыштаваць на 10 сутак жыхара Мінска Андрэя Круглова якому ўлады паставілі ў віну распаўсюджванне ў сацыяльных сетках "экстрэмісцкіх" матэрыялаў.

У судзе быў агучаны пратакол адміністрацыйнага правапарушэння, з якога вынікала, што Андрэй быў падпісаны на шэраг YouTube-каналаў з назвамі "NEXTA" і "Zerkalo.io", якія ў розны час судамі былі ўключаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

З рапарту супрацоўніка мясцовай міліцыі правапарушэнне было знойдзена падчас нясення службы па ахове грамадскага парадку шляхам візуальнага агляду тэлефона правапарушальніка.

Суд пры прызначэнні пакарання ўлічыў, што «правапарушальнік» шчыра раскаяўся прызнаў віну і тое, што ў яго на ўтрыманні знаходзіцца малалетняе дзіця.

Таму, суддзя Пракопчык знайшла віну Круглова даказанай у межах ч.2 арт.19.11 КаАП і прызначала пакаранне толькі роўнае дзвюм трацінам ад максімальнага, г.зн. 10 сутак арышту.

**23.08.2023**



Інцыдэнт адбыўся 21 жніўня, паведаміў @pozirkonline. 22 жніўня Грудніцкі мусіў выйсці на працу -- ён працуе стаматолагам-тэрапеўтам у навапалацкай паліклініцы №4, але пацыенты на прыём не трапілі. Разам з Аляксандрам была затрымана і ягоная жока Алла. Яны разам вярталіся з Літвы ад сына.

Праваабаронцы мяркуюць, што затрыманне магло здарыцца праз тое, што ў мужа і жонкі знайшлі ў тэлефонах падпіскі на так званыя экстрэмісцкія інфармацыйныя рэсурсы. Бо тэлефоны грамадзян Беларусі пільна правяраюць на беларускім памежжы.

Цалкам верагодна, што асабістыя дадзеныя Аляксандра Грудніцкага ёсць у базе «Беспарадкі» - адмысловай базе МУС, у якую ўносяць усіх, хто быў затрыманы за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Вядома, што ў ліпені 2011 г. Грудніцкі браў удзел у маўклівых пратэстах у Наваполацку, быў затрыманы і асуджаны да штрафа памерам 20 базавых велічынь.

**24.08.2023**

Суддзя суда Наваполацка Сняжана Калінічэнка 10 жніўня пастанавіла за падпіску на два «экстрэмісцкія» каналы арыштаваць на 15 сутак камплектоўшчыцу вырабаў і інструмента цэха № 021 ААТ «Нафтан» Ніну Барысаву.

Паводле матэрыялаў справы, мясцовыя супрацоўнікі міліцыі выявілі, што на сваёй персанальнай старонцы ў сацыяльнай сетцы «Facebook» «правапарушальніца» размясціла экстрэмісцкія матэрыялы са спасылкай на каналы «Радыё Свабода», «Белсат TV».

У судовым паседжанні Барысава сваю віну не прызнала, указаўшы аб тым, што ў 2017 года зарэгістравала ў сацыяльнай сетцы «Facebook» старонку і не памятае, калі ажыццявіла падпіску на каналы «Радыё Свабода» і «БЕЛСАТ TV», але пэўнай мэты не пераследвала . Аб тым, што названыя каналы былі прызнаныя экстрэмісцкімі ёй было вядома, аднак после таго больш названым дадаткам не карысталася.

Аднак гэтыя тлумачэнні не пераканалі суддзю Калінічэнку і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП яна пакарала жанчыну адміністрацыйным арышта на пятнаццаць сутак.

**25.08.2023**

Судья суда Віцебскага раёна Міхаіл Зубеня 10 жніўня за захоўванне і распаўсюджванне публікацый, якія ўлады вызначылі як экстрэмісцкія, пакараў арыштам на 13 сутак Фурката Рызаева.

У судовым паседжанні былі агучаныя матэрыялы справы, з якіх вынікае, што Фуркат на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» захоўваў і распаўсюджваў матэрыялы з інфармацыйных рэсурсаў "STOP LUKA" і "Вадзіцелі 97".

У судзе Рызаеў вінаватым сябе не прызнаў, указаўшы, што ён не ведаў, што матэрыялы, выяўленыя на яго старонцы ў сацыяльнай сетцы, былі прызнаныя судамі экстрэмісцкімі.

Тым не менш, суддзя Зубеня прызнаў мужчыну вінаватым і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакараў яго арыштам на трынаццаць сутак і канфіскаваў у даход дзяржавы мабільны тэлефон, які належыў яму.

**26.08.2023**

Суддзя суда Наваполацка Сняжана Калінічэнка 10 жніўня пастанавіла арыштаваць на 20 сутак мясцовую прадпрымальніцу ўладальніцу Студыі касцюміраванай выявы MAGIC WOOD Алену Зуброву. На думку суддзі, яна правяла ў сацыяльных сетках не дазволены ўладамі пікет і віртуальна распаўсюдзіла «экстрэмісцкія» матэрыялы.
У судзе былі агучаныя доказы таго, што Зуброва нібыта на сваёй персанальнай старонцы ў сетцы «Facebook» мела спасылку на канал «Радыё Свабода». Там жа прысутнічала выява паходні аранжавага колеру, якая ўключана ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Таксама па версіі суда Алена правяла без дазволу Наваполацкага гарвыканкама пікет у «Facebook», які складаўся ў тым, што яна змясціла ў сацыяльнай сетцы сваю фатаграфію на фоне сіне-жоўтага сцяга Украіны.
«Правапарушальніца» ў судовым паседжанні віну не прызнала, але не адмаўляла таго, што мае ў сацыяльнай сетцы «Facebook» сваю старонку, якую карыстала для зносін і абмену фатаграфіямі.
Аднак, суддзя Калінічэнка вырашыла, што ў дзеяннях Зубровай змяшчаецца склад адміністрацыйных правапарушэнняў, прадугледжаных ч.2 арт.19.11, ч.1 арт.24.23 КаАП.
На падставе гэтага суддзя за распаўсюд «экстрэмізму» пакарала прадпрымальніцу арыштам на тэрмін 15 сутак, а за пікетаванне - на 10 сутак.

**29.08.2023**
Суддзя суда Полацкага раёна і г. Полацка Уладзімір Бясецкі 16 жніўня за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў у сацыяльных сетках і недазволенае ўладамі пікетаванне арыштаваў на 25 сутак жыхара аграгарадка Гараны, бацьку траіх непаўналетніх дзяцей, які працуе будаўнікам у маскоўскай кампаніі Вадзіма Берднікава.
Затрыманне «правапарушальніка» адбылося пасля таго, як ягоны сусед Пётр Дударонак данёс у міліцыю аб тым, што на назе ў Берднікава ёсць татуіроўка ў выглядзе герба «Пагоня».
Пры затрыманні Берднікава было ўстаноўлена, што ў яго сапраўды на ікры правай нагі ёсць татуіроўка з выявай герба "Пагоня".
Суд палічыў, што мужчына парушыў Закон "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь". Г. зн. ён у грамадскім месцы, у прысутнасці грамадзян дэманстраваў татуіроўку ў выглядзе герба "Пагоня", чым без дазволу ўладаў выказваў свае грамадска-палітычныя погляды.
Пры разглядзе справы ў судзе, таксама было ўстаноўлена, што Вадзім у сацыяльнай сетцы «УКантакце» на сваёй старонцы, 10 снежня 2020 г. размясціў і захоўваў інфармацыю, якая змяшчае лагатып «TUT.BY», які ўлады ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Гэтыя два факты далі падставы сцвярджаць суддзі Бясецкаму, што ў дзеяннях Берднікава ўтрымліваецца склад адміністрацыйных правапарушэнняў, прадугледжаных ч.1 арт.24.23 і ч.2 арт.19.11 КаАП РБ. Таму суд вырашыў пакараць мужчыну арыштам: за пікетаванне - на 15 сутак, а за распаўсюджванне «экстрэмізму» - на 10 сутак.
У выніковай пастанове, шляхам складання, улады канчаткова вызначылі для Берднікава спагнанне ў выглядзе арышту тэрмінам на 25 сутак.

**30.08.2023**
Пра гэта падчас акцыі салідарнасці ў Беластоку расказаў намеснік старшыні Саюзу палякаў Беларусі Марэк Занеўскі. Паводле Занеўскага, да Пачобута, які адбывае пакаранне ў Наваполацкай ПК-1, не пускаюць адваката, да яго і ад яго не даходзяць лісты, яму не даюць яму лекаў, патрэбных штодня. Найбольшая праблема на сёння — гэта адсутнасць інфармацыі, бо мы ня ведаем, дзе ён цяпер, у якім ён стане і што наагул там з ім дзеецца», - сказаў намеснік старшыні Саюзу палякаў Беларусі.
Як стала вядома ў сярэдзіне жніўня, Анджэя Пачобута на паўгода змясцілі ў ПКТ у наваполацкай калоніі - пра гэта зняволены журналіст і актывіст польскай меншасці ў Беларусі паспеў паведаміць у адным з лістоў дадому. Прычынай пакарання, як вынікае з ліста з калоніі, стала адмова ад працы, якую, паводле Пачобута, немагчыма выканаць. Паводле звестак BelPol, адміністрацыя калоніі накіравала яго на ўборку прыбіральні. Гэта непрымальна для большасці зняволеных, бо аўтаматычна вядзе да набыцця «нізкага сацыяльнага статусу!. Пачобут адмовіўся, за што й атрымаў спагнанне у выглядзе 6-ці месяцаў у ПКТ.
У наваполацкую ПК №1 Анджэй Пачобут трапіў у канцы траўня. Яго размеркавалі туды адбываць пакаранне, прысуджанае паводле арт. 361 Крымінальнага кодэкса (Заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь арт. 130 Крымінальнага кодэкса (Распальванне варожасці ці варажнечы). 8 лютага 2023 г. суддзя Гродзенскага абласнога суду Дзмітрый Бубенчык прысудзіў Анджэю Пачобуту восем гадоў зняволення ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.
Анджэй Пачобут быў затрыманы 25 сакавіка 2021 г. у Гродне па так званай «польскай справе» разам

з іншымі актывістамі Саюзу палякаў Беларусі. За артыкул пра напад СССР на Польшчу ў верасні 1939-га Анджэя Пачобута абвінавацілі ў «распальванні варожасці па нацыянальнай прыкмеце». У публікацыі Пачобут назваў агрэсіяй напад СССР на Польшчу 17 верасня 1939 года. Таксама ў матэрыялах крымінальнай справы фігуравалі заявы журналіста ў абарону польскай меншасці ў Беларусі, артыкул пра падаўленне беларускіх пратэстаў у 2020 годзе і тэкст ад 2006 года пра аднаго з камандзіраў польскага антыкамуністычнага падполля на Гродзеншчыне.
Свае віны журналіст не прызнаў, праз апеляцыйную скаргу ен спрабаваў аспрэчыць прысуд у Вярхоўным судзе. 26 траўня суддзя Вярхоўнага суда Беларусі Ігар Любавіцкі адхіліў апеляцыйную скаргу Анджэя Пачобута, разгляд скаргі адбыўся ў закрытым рэжыме.

**30.08.2023**
Сталі вядомыя падрабязнасці яго затрымання, якое адбылося 16 жніўня ( паводле ранейшых звестак, Грудніцкі быў затрыманы 21 жніўня). У той дзень лекар з жонкай вярнуліся з замежнага падарожжа, куды выправіліся ў самым пачатку жніўня. 22-га жніўня Аляксандр Грудніцкі мусіў выйсці на працу пасля адпачынку, аднак пацыенты яго не дачакаліся, бо на той час ён ужо знаходзіўся пад арыштам.
Грудніцкага затрымалі 16 жніўня ў 11 гадзін, супрацоўнікі міліцыі прагледзелі ягоны тэлефон і склалі на мужчыну адміністрацыйны пратакол за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. 17 жніўня суддзя Наваполацкага гарадскога суду Зінаіда Балаболава прызнала Грудніцкага вінаватым за размяшчэнне на сваёй старонцы ў Instagram фотаздымка, дзе ен зняты на фоне украінскага і грузінскага сцягоў. У судзе Грудніцкі па тлумачыў, што захоўваў гэты здымак на памяць пра наведванне Грузіі ў 2021г., і што намеру праводзіць несанкцыянаваны пікет, размяшчаючы гэтае фота, ен не меў. Але суддзя Балаболава расцаніла гэта менавіта як несанкцыянаванае пікетаванне і паводле ч.1 арт. 24.23 КаАП прысудзіла мужчыну арышт на 15 сутак, пастанавіўшы адлічваць час арышту з моманту затрымання.
Грудніцкі трапіў за краты, а сілавікі тым часам знайшлі ў ягоным тэлефоне падставы для яшчэ аднаго адміністрацыйнага абвінавачання. 18 жніўня Зінаіда Балаболава асудзіла лекара-стаматолага яшчэ раз, цяпер паводле ч.2 арт.19.11 КаАП. Яна прызнала Грудніцкага вінаватым за тое, што на сваёй старонцы ў «Аднакласніках» ён размясціў інфармацыйную прадукцыю аднаго з інтэрнэт-рэсурсаў, прызнаную экстрэмісцкай. Суддзя вынесла пастанову пакараць мужчыну арыштам на 15 сутак, які мае распачацца «з моманту затрымання» без указання даты.
Праваабаронцы не выключаюць, што Аляксандра Грудніцкага могуць затрымаць адразу ж, як ён выйдзе пасля першага арышту, і зноў змясціць за краты на 15 сутак.

**31.08.2023**
Да трох гадоў абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу асуджаны Сяргей Белагалоў, цяпер ужо былы кіраўнік справамі Шумілінскага райвыканкама. Яго справу разбірала старшыня Шумілінскага райсуда Інна Грабоўская. 10 жніўня 2023г. былы чыноўнік прызнаны вінаватым паводле ч.2 арт. 428 Крымінальнага Кодэкса ( невыкананне службовай асобай сваіх службовых абавязкаў і недобрасумленнае стаўленне да працы, якія прывялі да смерці чалавека па неасціярожнасці). Згодна з судовай пастановай, Сяргей Белагалоў пазбаўлены права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых і адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў на працягу трох гадоў. Таксама суд пастанавіў спагнаць з Шумілінскага райвыканкама 40 тысяч рублёў у якасці кампенсацыі на карысць пацярпелай ( дачкі загінулай) , выдаткі на юрыдычную дапамогу у суме 300 рублёў, а таксама дзяржаўную пошліну ў памеры 111 рублёў.
Уласна на Сяргея Белагалова суд усклаў больш сціплыя грашовыя спагнанні: ён мусіць аплаціць выдаткі пацярпелай на юрыдычную дапамогу ( 950 рублёў) і судовыя выдаткі (249 рублёў 82 кап.). У заклад пагашэння выдаткаў арыштаваны аўтамабіль былога чыноўніка.
Інцыдэнт, у выніку якога загінула жанчына, здарыўся мінулай зімой напярэдадні новага году. Ахвяра здарэння выправілася ў краму Еўраопт, і, як паказалі здымкі відэакамер, набыла там пакет віна. Далей яна скіравалася да закінутага будынка весавой, што знаходзіцца на балансе Шумілінскага райвыканкама. Будынак уяўляе сабой дзве сценкі, дах і падлогу з платформай для ўзважвання машын. У падлозе запраектавана адтуліна для пранікнення ў падвал, закрытая паржавелай бляхай. Будынак не быў прызнаны небяспечным, не меў агароджы, і жанчына правалілася ў падвал.
Трывогу забіў муж загінулай, калі ранкам не знайшоў яе дома. Мужчына зрабіў выснову, што жонка ўвечары выправілася ў краму, але дахаты не вярнулася. Ён патэлефанаваў дачцэ, тая выклікала міліцыю. Загінулую жанчыну знайшлі ў падвале весавой. Эксперты ўстанавілі, што яна звалілася галавой уніз у падвальнае памяшканне глыбінёй 1, 57 м. і ўдарылася галавой аб лёд, бо на падлозе падвала была замерзлая вада глыбінёй 15 см. Самастойна выбрацца з бетоннай пасткі жанчына не змагла, і смерць наступіла ад агульнага пераахаладжвання арганізма.

Віну Сяргея Белагалова суд убачыў у тым, што на пасадзе кіраўніка справамі Шумілінскага райвыканкама ён не зрабіў належных захадаў, каб будынак весавой быў прызнаны патэнцыйна небяспечным, і ўваход туды быў закрыты для староннiх асобаў.
На момант разбору справы ў судзе Белагалоў ужо не працаваў у райвыканкаме – ён звольніўся неўзабаве пасля трагічнага здарэння і ўладкаваўся менеджарам па забеспячэнні на шумілінскае ААТ «Венстрой». Цікава, што на афіцыйным сайце Шумілінскага аблвыканкама пасада кіраўніка справамі Шумілінскага райвыканкама значыцца вакантнай, але прозвішча Белагалова ў гэтай якасці яшчэ фігуруе ў графіку прыёму грамадзян. Прычым апошняя дата прыёму – 22.08.2023г., на той час былы чыноўнік ужо даўно працаваў у іншым месцы.

**31.08.2023**
Наваполацкага лекара-стаматолага Аляксандра Грудніцкага двойчы асудзілі на 15 сутак, ягоную жонку двойчы аштрафавалі. Сям’ю затрымалі 16 жніўня, калі Грудніцкія вярнуліся з замежнага падарожжа. На наступны дзень адбыліся суды: суддзя Наваполацкага гарадскога суду Зінаіда Балаболава прызнала Аляксандра Грудніцкага вінаватым паводле ч.1 арт. 24.23 КаАП і вынесла пастанову пра арышт на 15 сутак. Аллу Грудніцкую суддзя Балаболава аштрафавала на суму 1110 рублёў паводле ч.2 арт 19.11 КаАП за «распаўсюд экстрэмісцкай інфармацыі». І пастанавіла накласці арышт на два мабільныя тэлефоны ў якасці закладу.
Суддзя прызнала Аллу Грудніцкую вінаватай за тое, што ў яе Instagram супрацоўнікі міліцыі знайшлі падпіску на старонку замежнага СМІ, прызнанага ў Рэспубліцы Беларусь экстрэмісцкім. Свае віны з судзе жанчына не прызнала, патлумачыўшы, што яна не мела намеру распаўсюджваць адтуль інфармацыю.

## Верасень

**01.09.2023**



Суддзя суда Сенненскага раёна Іна Досава 6 ліпеня за распаўсюд "экстрэмізму" ў сацыяльных сетках і правядзенне масавае мерапрыемства аштрафавала на 1850 рублёў мясцовага жыхара Паўла Якубовіча.
У судзе былі агучаныя абвінавачванні, у тым, што Якубовіч на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы “Вконтакте” быў падпісаны на шэраг публікацыі, якія раней судамі былі ўключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Таксама з матэрыялаў адміністрацыйнай справы вынікала, што ў сацыяльнай сетцы “Facebook”, паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за правядзенне пікету, мужчына прыняў удзел у несанкцыянаваным пікетаванні з выкарыстаннем «графічных выяў бел-чырвона-белых палотнаў і герба пагоня». .
Зыходзячы з гэтых фактаў, суддзя Досава пастанавіла, на падставе ч.2 арт. 19.11 КаАП падвергнуць Якубовічу штрафу ў суме 740 рублёў і па ч.3 арт. 24.23 КаАП аштрафаваць на 1480 рублёў.
Канчаткова, шляхам частковага складання накладзеных адміністрацыйных спагнанняў, суд пастанавіў пакараць Якубовіча штрафам у даход дзяржавы ў суме 1850 рублёў.

**02.09.2023**
Суддзя суда Расонскага раёна Рада Дамініч 14 жніўня пастанавіла пакараць штрафам у памеры 333 рублёў палітвязня Мікалая Машарскага за тое, што ён у сацыяльных сетках распаўсюдзіў публікацыі, якія змяшчалі нацысцкую атрыбутыку і сімволіку (ч.1 арт.19.10 КаАП). Адміністрацыйная справа была разгледжана без удзелу Мікалая, які зараз утрымліваецца ў Віцебскім абласным следчым ізалятары па абвінавачанні ў падрыхтоўцы асоб для ўдзелу ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак (ч.2 арт. 342) і абразе прэзідэнта (ч.1 арт. 368) КК РБ.
Згодна з матэрыяламі адміністрацыйнай справы, 23 траўня на яго старонцы ў сацыяльнай сетцы “Facebook” супрацошнікамі міліцыі былі знойдзены выявы, у якіх, паводле лінгвістычнага заключэння, былі выкарыстаны нацысцкая атрыбутыка і сімволіка для стварэння адназначна адмоўных вобразаў Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, а таксама намесніка старшыні Савета бяспекі РФ Дзмітрыя Мядзведзева.
На размешчаных выявах гэтыя кіраўнікі Расіі былі паказаны ідэнтычнымі вайскоўцам нацыянал-сацыялістычнай Германіі. Такім чынам “правапарушальнік” намякаў на тое, што Пуцін і Мядзведзеў здзяйсняюць ваенныя злачынствы і злачынствы супраць чалавечнасці.
Пры складанні пратакола аб адміністрацыйным правапарушэнні палітвязень віну ў здзяйсненні правіны не прызнаў.
Тым не менш, суддзя Дамініч палічыла, што Машарскі, праз выявы Пуціна і Мядзведзева, публічна

прадэманстраваў і распаўсюдзіў нацысцкую сімволіку і аштрафавала яго на 333 рублі, якія ён павінен пералічыць у бюджэт беларускай дзяржавы.

**03.09.2023**

Паўла Нявыгласа, які ў жніўні 2020-га толькі скончыў школу, асудзілі да 1 года 2 месяцаў калоніі. Суд над ім распачаўся толькі сёлета ў ліпені. За гэты час хлопец паспеў стаць студэнтам БНТУ (факультэт інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі). Суддзя Расонскага райсуду Алена Елавая прызнала хлопца вінаватым паводле арт. 293 ч. 3 Крымінальнага кодэкса (Масавыя беспарадкі) за тое, што ў жніўні 2020-га ён апублікаваў ў Telegram звесткі пра тое, як вырабіць «кактэйль Молатава». Судовы працэс праходзіў у закрытым рэжыме. Зараз хлопец спрабуе абскардзіць прысуд у Віцебскім абласным судзе, пасяджэнне прызначана на 12 верасня.

Не чакаючы вынікаў абласнога суду, гісторыю пра непоўнагадовага (у 2020 г.) хлопца выклала газета «Витебские вести». У артыкуле «Житель Витебской области наказан за подстрекательство к участию в массовых беспорядках» сцвярджаецца, што ён «для обучения и подготовки интернет-пользователей к участию в массовых беспорядках, сопровождающихся причинением вреда, а также вооруженным сопротивлением сотрудникам правоохранительных органов» размяшчаў у шэрагу чатаў «информацию о составе, изготовлении и применении коктейля Молотова». Гэтая інфармацыя засталася ў мэсэнджары, хаця хлопец выдаліў свой тагачасны акаўнт у Telegram .

Найверагодней, што хлопца затрымалі ў красавіку гэтага году: з таго часу ён перастаў з“яўляцца ў сацыяльных сетках.

Што да ранейшых падзеяў, то вядома, што Павел Нявыглас быў затрыманы 14 ліпеня 2020г. у Менску падчас пратэстаў супраць адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам на пост прэзідэнта Віктара Бабарыкі. Як непоўнагадовага, яго адпусцілі з аддзела міліцыі Савецкага раёна.

**05.09.2023**

Стаў вядомы працяг гісторыі ціску на сям’ю Грудніцкіх. Наваполацкага лекара-стаматолага Аляксандра Грудніцкага двойчы асудзілі на 15 сутак, ягоную жонку Аллу Грудніцкую двойчы аштрафавалі. Прычым апошні штраф, які прысудзіла суддзя Наваполацкага гарсуду Зінаіда Балаболава, складае ажно 3700 рублёў – 100 базавых велічынь. Апрача гэтага, у жанчыны забралі два тэлефоны – у заклад, каб змусіць яе сплаціць абодва штрафы, агульная сума якіх – 4810 рублёў.

22 жніўня Аллу Грудніцкую прызналі вінаватай у «несанкцыянаваным пікетаванні». Паводле міліцэйскага пратакола, «пікетаванне» заключалася ў тым, што жанчына размясціла ў сацыяльнай сетцы «Одноклассники» фотаздымак белага сабачкі ў камбінезоне чырвонага колера. Пад фотаздымкам быў подпіс «Жыве Беларусь!!!!! Насілію нет!!!». Суд Наваполацка ў асобе суддзі Зінаіды Балаболавай прызнаў жанчыну вінаватай паводле ч.1 арт. 24.23 КаАП.

За 5 дзён да таго, 17 жніўня, Балаболава аштрафавала Аллу Грудніцкую паводле ч.2 арт 19.11 КаАП за «распаўсюд экстрэмісцкай інфармацыі» -- за тое, што ў яе Instagram супрацоўнікі міліцыі знайшлі падпіску на старонку замежнага СМІ, прызнанага ў Рэспубліцы Беларусь экстрэмісцкім. Свае віны жанчына не прызнала ні на адным, ні на другім судовым працэсе.

Лекар-стаматолаг Аляксандр Грудніцкі 17 жніўня быў асуджаны Зінаідай Балаболавай да арышту на 15 сутак паводле ч.1 арт. 24.23 КаАП. Назаўтра, 18 жніўня, суддзя Балаболава сноў асудзіла мужчыну на 14 сутак – ужо «за распаўсюд экстрэмізму», паводле ч.2 арт. 19.11 КаАП. Другі арышт ён мае адбыць па сканчэнні першага.

Сілавікі затрымалі сям’ю Грудніцкіх 16 жніўня, калі муж і жонка вярнуліся ў Беларусь з замежнага падарожжа. Пад увагу міліцыянтаў яны трапілі яшчэ падчас знаходжання за мяжой – 11 жніўня. Прынамсі, гэтая дата пазначана ў пратаколах, дзе напісана, што супрацоўнікі «праводзілі маніторынг сеткі інтэрнэт» і знайшлі падставы для адміністрацыйных спраў.

**06.09.2023**

Суддзя суда Докшыцкага раёна Вячаслаў Елісеенка 27 ліпеня за распаўсюд «экстэмісцкіх» публікацый у сацыяльных сетках арыштаваў на 7 сутак жыхара Докшыцкага раёна Аляксандра Лінніка.

Згодна з пратаколам, які паступіў у суд з мясцовага аддзела міліцыі, Аляксандр у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» на сваёй старонцы меў лагатып канала «Белсат», які раней быў прызнаны ўладамі экстрэмісцкімі матэрыяламі У судовым паседжанні мужчына прызнаў факт рэгістрацыі свайго акаўнта ў сацыяльнай сетцы і наяўнасці ў ім «экстрэмізму».

Прыняўшы прызнанне правапарушальніка як доказ віны, суддзя Елісенка, на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП, прызначыў Лінніку пакаранне ў выглядзе арышту на тэрмін сем сутак без канфіскацыі прыналежнага яму тэлефона.

**06.09.2023**



Працэс у Віцебскім абласным судзе праходзіць у закрытым рэжыме – такі парадак у Беларусі стаў звыклым, калі разбіраюць справы «аб экстрэмізме», тым болей, з удзелам журналістаў. Супраць відэааператара Вячаслава Лазарава высунута абвінавачанне паводле ч. 2 арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса РБ (спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці, здзейсненае паўторна альбо групай асоб па папярэдняй змове), супраць Таццяны Пыцько — паводле ч. 1 арт. 361-4 КК (вярбоўка, уцягненне асобы ў экстрэмісцкую дзейнасць, навучанне ці іншае спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці). Крымінальныя справы супраць мужа і жонкі, аб"яднаныя разам, разглядае суддзя Яўген Буруноў.
Суд над мужам і жонкай распачаўся 5 верасня, на сёння, 6 верасня, у судовы працэс запрошаны сведкі. Паводле следства, Вячаслаў Лазараў меў дачыненне да замежнага СМІ, прызнанага ў Беларусі экстрэмісцкім фарміраваннем, і ўцягнуў у свае дзеянні жонку, Таццяну Пыцько.
З 9 лютага Лазараў знаходзіцца ў Віцебскім СІЗА. Яго затрымалі пасляператрусу па месцы прапіскі, следчы камітэт атрымаў доступ да ягонай аргтэхнікі – ноўтбука, відэакамеры, мабільных тэлефонаў. У той самы дзень ператрус быў праведзены па месцы прапіскі ягонай жонкі, у яе таксама забралі аргтэхніку, аднак Таццяна Пыцько яшчэ некалькі месяцаў заставалася на волі. Яе затрымалі 6 чэрвеня пасля чарговага ператрусу. Без маці засталася іх агульная з Вячаславам дачка, якой на той час толькі споўніўся 1 год і 1 месяц. Некаторы час дзяўчынка знаходзілася ў дзіцячай лякарні, потым апеку над ёй афармілі сваякі Таццяны. Двое старэйшых дзяцей Таццяны ад першага шлюбу засталіся з родным бацькам.
Праваабарончая супольнасць прызнае Вячаслава Лазарава і Таццяну Пыцько палітычнымі зняволенымі. Таксама ў Камітэце па правах чалавека ААН чакае разгляду зарэгістраваная пад нумарам 3884/2020 скарга Вячаслава Лазарава. Падставай для скаргі было рашэнне суддзі суду Наваполацка Зінаіды Балаболавай, якая ў траўні 2019г. пакарала штрафамі відэааператара і журналістку Алену Шабуню за «незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ» (ч.2. арт. 22.9КаАП). Для абароны сваіх прафесійных і грамадзянскіх правоў Вячаслаў Лазараў абскардзіў рашэнне суду Наваполацку ў Віцебскім абласным і Вярхоўным судах. Але суды вышэйшай інстанцыі адмовіліся абараніць яго правы, якія гарантаваныя дзейнай беларускай Канстытуцыяй і арт. 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

**07.09.2023**

Суддзя суда Наваполацка Віталь Лапко 11 жніўня за падпіску на «экстрэмісцкі» Youtube-канал пастанавіў арыштаваць на 13 сутак мясцовую жыхарку Валянціну Кавалёву.
Згодна з матэрыяламі адміністрацыйнай справы Кавалёва на персанальнай старонцы ў Youtube пад сваім імем захоўвала ў выглядзе спасылкі на канал "Рэальная Беларусь", матэрыялы, якія суд у 2021 годзе ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні жанчына віну ў здзейсненым правапарушэнні не прызнала і патлумачыла, што, знаходзячыся на лецішчы, перадала свой мабільны тэлефон сын, які, на яе думку, мог падпісацца на забаронены ўладамі відэаканал.
Зыходзячы з унутранай перакананасці, што менавіта сама Кавалёва падпісалася на "Рэальную Беларусь", суддзя Лапко вырашыў на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакараць яе арыштам на 13 сутак без канфіскацыі тэлефона.

**08.09.2023**

Справу Сяргея Мацюка, слесара ААТ «Узмёнскі край», разбірала старшыня Мёрскага раённага суда Ірына Яскевіч. 1 верасня яна прысудзіла мужчыну 2 сутак арышту паводле ч.2 арт 19.11 КаАП за дзве публікацыі ў Telegram, якія адсачылі супрацоўнікі абласнога ГУБАЗіК.
Паводле пратаколаў, якія сталі асноўным доказам у судзе, Сяргей Мацюк змясціў у Telegram рэпосты з двух інтэрнэт-рэсурсаў, інфармацыйная прадукцыя якіх прызнаная ў Беларусі «экстрэмісцкай». Падсудны не аспрэчваў таго факту, што старонка ў Telegram, дзе з"явіліся публікацыі, належыць яму асабіста, і рэпосты рабіў ён. З улікам гэтага прызнання і таго, што раней да адміністрацыйнай адказнасці Сяргея Мацюка не прыцягвалі, Ірына Яскевіч пастанавіла пакараць падсуднага арыштам на 5 сутак.
Старшыня Мёрскага суду часта разбірае «палітычныя» справы: два тыдні таму арыштам на 7 сутак яна пакарала жыхара Мёраў Юрыя Варанько, 17 траўня да 7 сутак арышту ёй быў асуджаны электраманцёр Уладзімір Гаковіч, 29 траўня на 7 сутак быў асуджаны ксёндз з Ідолты Вячаслаў Адамовіч.

У красавіку Ірына Яскевіч асудзіла на 7 сутак працаўніка мясакамбіната Яўгена Бурака і пакарала штрафамі мясцовых жыхарак Тамару Масленік і швачку Людмілу Лазоўскую. Усё гэта – пакаранні, прысуджаныя за апошнія месяцы толькі за распаўсюд так званых «экстрэмісцкіх матэрыялаў».
Вядомая Ірына Яскевіч яшчэ й тым, што за каментары ў інтэрнэце асудзіла на 2 гады калоніі настаўніцу-пенсіянерку Эму Сцепулёнак
прызнаўшы яе вінаватай паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэкса: арт. 368 (Абраза Лукашэнкі) і арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады).

**09.09.2023**

«Лічым недапушчальным утрыманне пад вартай Вольгі Брыцікавай, Аляксандра Кухаронка і Аляксандра Балонкіна, абвінавачаных па арт. 361 КК (заклікі да мер абмежавальнага характару (санкцый), іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь)», -- гаворыцца ў адмысловай заяве беларускай праваабарончай супольнасці.
Вольгу Брыцікаву і Аляксандра Кухаронка затрымалі 11 жніўня пасля ператрусаў па месцы жыхарства і ў іншых памяшканнях, якія ім належаць.
Да 2020-га году Брыцікава працавала на «Нафтане», аднак у снежні яе звольнілі: загад аб звальненні быў выдадзены ў сувязі з «пазбаўленнем доступу да дзяржаўнай таямніцы». Неўзабаве яе абралі кіраўніцай незалежнага прафсаюза на ААТ «Нафтан». У мінулым годзе жанчына адбыла 75 сутак за кратамі – ей прысудзілі 5 арыштаў за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне. Падчас арышту яна абвяшчала галадоўку на знак пратэсту.
Аляксандр Кухаронак – адзін з самых першых, хто ў 2020 годзе абвясціў стачку на прадпрыемстве. Яго таксама арыштоўвалі па адміністрацыйнай справе – у 2021 годзе ён адбыў 20 сутак арышту паводле арт. 24.23 КаАП.
Аляксандр Балонкін быў намеснікам старшыні арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП) работнікаў на ААТ «Нафтан». Яго звольнілі з прадпрыемства ў 2021 годзе нібыта за прагулы, хаця мужчына не мог выйсці на працу з аб“ектыўных прычын – ён адбываў 15-суткавы арышт, прысуджаны яму за нібыта распаўсюд «экстрэмісцкай» інфармацыйнай прадукцыі. На прадпрыемстве ён адпрацаваў больш за 19 гадоў. Сёлета ў жніўні ён быў затрыманы неўзабаве пасля Брыцікавай і Кухаронка.

**09.09.2023**



Вядомага краязнаўцу і былога малалетняга вязня канцлагера Антона Бубала будуць судзіць у Верхнядзвінску 11 верасня. Судовае пасяджэнне будзе весці суддзя Людміла Каваленка. Сёлета гэта ўжо другі суд над краязнаўцам, раней мужчыну судзілі 24 студзеня. Суд Верхнядзвінскага раёна аштарафаў яго на 20 базавых велічыняў (740 беларускіх рублёў) з канфіскацыяй мабільнага тэлефона. Падставай стала тое, што міліцыянты знайшлі ў яго сацыяльнай сетцы “Фэйсбук” інфармацыю, якая ўключаная ў спіс так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў. Прыцягвалі яго да адказнасці па “народным артыкуле” - па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП.
Антон Бубала - ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна, паэт, грамадскі дзеяч, актыўны турыст, стваральнік Верхнядзвінскага гісторыка-краязнаўчага музея, былы старшы навуковы супрацоўнік, чалавек незвычайнага таленту і розуму. Так калісьці пра яго пісала мясцовая раёнка.
Як стала вядома, у панядзелак, 11 верасня, разам з Антонам Бубалам будуць судзіць за так званы экстрэмізм яшчэ траіх верхнядзвінцаў – Наталлю Лакотку, Валера Туранка, Анатоля Селівончыка. Таксама вядома пра вобшукі ў горадзе, у тым ліку ў Сяргея Бут-Гусаіма.
Падобна на тое, што на гэтым тыдні ў Верхнядзвінску быў “хапун”.

**10.09.2023**

Усіх пяцярых затрымлі 31 жніўня ў перыяд з 16.20 да 19.50 і назаўтра асудзілі ў Талачынскім райсудзе. Паводле банка судовых рашэнняў, судовая працэсы вяла суддзя Алеся Саян, усіх падсудных яна прызнала вінаватымі паводле ч.2 арт. 19.11 КаАП за падпіскі ў «Одноклассниках» на інтэрнэт-рэсурсы, інфармацыя якіх прызнаная ў Беларусі «экстрэмісцкай» інфармацыйнай прадукцыяй.
Траіх мужчын суддзя Алеся Саян асудзіла да арышту на 10 сутак, дваіх – на 9 сутак. Ва ўсіх пяцярых канфіскаваныя мабільныя тэлефоны. Так, бывае, робіцца, калі за адміністрацыйнае правапарушэнне прысуджаны штраф, і тэлефон забіраюць у якасці закладу – гарантыі, што чалавек заплаціць суму, на якую яго вырашыў пакараць суд. У дадзеным выпадку у пяці жыхароў Талачына тэлефоны проста

забралі.
Як сцвярджаецца ў адной з віцебскіх суполак у Фэйсбуку, у раскладзе суда на 1 верасня былі анансаваныя тры працэсы, дзе мусціў адбыцца разгляд адміністрацыйных справаў паводле ч.2 арт.19.11 КаАП. У ліку падсудных была заўважана Таццяна Пабяржына – бібліятэкарка, кіраўніца жаночага клуба, старшыня райкаму прафсаюзу работнікаў культуры. Апрача яе, суддзя Алеся Саян разбірала справы Віктара Лапацінскага і Уладзіміра Казакевіча. Апошні, верагодна,згаданы ў адной з пяці пастановаў, апублікаваных у банку судовых рашэнняў.

**11.09.2023**

Справу Івана Шаўчэнкі разбіраў суддзя Лёзненскага суда Аляксей Лапушынскі. Dіцябляніна затрымалі на мяжы з Расейскай Федэрацыяй – на памежным пераходзе Завольша, што ў Лёзненскім раёне -- і склалі пратакол пасля праверкі мабільнага тэлефона. Суд, у выніку якога жыхара Віцебска аштрафавалі на 20 базавых велічынь ( 1110 рублёў), адбыўся 25 жніўня.
Паводле рашэння суду, Іван Шаўчэнка прызнаны вінаватым паводле ч.2 арт. 19.11 за тое, што распаўсюдзіў праз свой акаўнт у Telegram інфармацыйную прадукцыю, прызнаную «экстрэмісцкай». Паводле матэрыялаў адміністрацыйнай справы, падсудны падчас знаходжання на плошчы 17 верасня ў Глыбокім распаўсюдзіў 5 спасылак на розныя «экстрэмісцкія» інтэрнэт- рэсурсы. Іван Шаўчэнка хадайнічаў, каб справу разбіралі без ягонай прысутнасці. Суд пагадзіўся і «выпісаў» віцябляніну вялікі штраф з канфіскацыяй тэлефона.
Праверкі тэлефонаў на беларуска-расейскім памежжы сталі апошнім часам звыклай з“явай. Да прыкладу, у чэрвені гэтага году там былі затрыманыя «за распаўсюд экстрэмізму» не менш 13-ці чалавек. Толькі ў Лёзне па ч.2 арт. 19.11 былі асуджаныя 7 чалавек: чацвярым прысудзілі «суткі», астатнім – штрафы. Дакладна такое самае пакаранне – штраф памерам 30 базавых велічынь з канфіскацыяй тэлефона – суддзя Аляксей Лапушынскі прысудзіў 19 чэрвеня работніку ААТ «Нафтан» Мікіту Белавусаву. Падзеі развіваліся па падобным сцэнары: на памежным пункце пропуску, размешчаным на 42-м км аўтадарогі Р-21 "Віцебск-Лёзна-Мяжа Расейскай Федэрацыі" памежнікі прагледзелі тэлефон і паведамілі ў Лёзненскі РАУС пра наяўнасць «экстрэмісцкіх» падпісак. Там склалі пратакол.

**11.09.2023**

28 жніўня старшыня Мёрскага райсуду Ірына Яскевіч асудзіла жыхара Дзісны Дзмітрыя Шавякова да штрафу памерам 20 базавых велічыняў (740 рублёў), прызнаўшы яго вінаватым паводле арт. 23.4 КаАП (Несанкцыянаваны доступ да кампутарнай інфармацыі). Дзмітрый Шавякоў – пастар евангельскай царквы «Возрождение».
У банку судовых рашэнняў сутнасць правапарушэння выкладзена каротка і без падрабязнасцяў: Шавякоў «неаднаразова здзейсніў несанкцыянаваны доступ да інфармацыі, якая захоўваецца ў кампутарнай сістэме, сетцы і на машынных носьбітах з парушэннем сістэмы абароны» аднаго з мясцовых ААТ.
Дзмітрый Шавякоў зарэгістраваны індывідуальным прадпрымальнікам у сферы перакладчыцкай дзейнасці і сакратарскіх паслугаў. Вядома, што ён цікавіцца мясцовым краязнаўствам і неаднаразова браў удзел у розных праектах, у тым ліку ініцыяваных мясцовымі уладамі, накіраванымі на захаванне гістарычнай спадчыны ў Дзісне. Таксама часта бярэ ўдзел у дабрачынных акцыях па падтрымцы дзіцячых установаў і ўстановаў, якія апякуюцца нямоглымі людзьмі і людзьмі сталага веку.

**12.09.2023**

Суддзя суда Талачынскага раёну Алеся Саян 1 верасня пастанавіла арыштаваць на 10 сутак рамшчыка Мікалая Крупскага. Па ўнутранай перакананасці суддзі, віна яго складалася ў тым, што «правапарушальнік» распаўсюдзіў у сацыяльных сетках «экстрэмісцкія» матэрыялы.
Падчас судовага разбору стала вядома, што Крупскі, з 2021 года быў падпісаны ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» на «экстрэмісцкую» групу «Хартыя’97». На сваю старонку заходзіць з выкарыстаннем наўтбука сужыцелькі.
У судзе Мікалай віну сваю прызнаў і патлумачыў, што сачыў апошнія два гады за падзеямі, якія адбываліся ў Беларусі, выкарыстоўваючы інфармацыйны рэсурс «Хартыя97».
Узяўшы да ўвагі прызнанне Крупскага, суддзя Саян, на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП арыштавала яго на дзесяць сутак. З-за таго, што мужчына здзейсніў правапарушэнне з дапамогай службовага ноўтбука сваёй сужыцелькі, таму ён не быў канфіскаваны на карысць дзяржавы.

**13.09.2023**

Суддзя суду Аршанскага раёна і г. Оршы Святлана Кузьмічонак 30 жніўня за падпіску ў сацыяльнай сетцы на “экстрэмісцкія” рэсурсы арыштавала на 7 сутак жыхара Оршы Аляксея Іванова.
Згодна з пратаколам агляду тэлефона і фотатабліц работнік міліцыі ўстанавіў наяўнасць у сацыяльнай сетцы “Інстаграм” на старонцы Іванова інфармацыйнай прадукцыі з выявай лагатыпа «Simbol.by», якую на той момант прагледзелі 78 чалавек. У 2022 годзе гэтая прадукцыя ўладамі была змешчана ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні Аляксей прызнаўся ў тым, што сапраўды, ён, на сваёй старонцы ў “Інстаграме” захоўваў і распаўсюджваў інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Аднак ужо цягам двух гадоў не карыстаецца гэтай старонкай.
Тым не менш, суддзя Кузьмічонак, на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пастанавіў арыштаваць Іванова тэрмінам на сем сутак.

**14.09.2023**



Глыбоцкага актывіста, фітнес-трэнера і бодзібілдара судзіў у Глыбокім два дні 13-14 верасня суддзя Андрэй Тарасевіч. Ён вядомы сваімі палітычнымі прысудамі, яго імя ўнесенае ў санкцыйныя спісы.
Тэрмін паўтара года агульнага рэжыму падчас суда запрасіў і пракурор Глыбоцкага раёна Валерый Дайлідзёнак. З улікам таго, што Аляксандр адседзеў у Віцебскім СІЗА некалькі месяцаў, яму застанецца сядзець каля 8 месяцаў.
Аляксандра Шарабайку абвінавачвалі па частцы першай артыкула 368 (абраза Лукашэнкі).
Нягледзячы на татальны страх у беларускім грамадстве, на судовае пасяджэнне ўсё ж прыйшло некалькі чалавек падтрымаць свайго земляка і актывіста.
Нагадаем, Аляксандра Шарабайку затрымалі 13 сакавіка ў Глыбокім. Спачатку суддзя Глыбоцкага суда Андрэй Тарасевіч асудзіў Аляксандра Шарабайку на 10 сутак па ч. 1 артыкула 24.23 КаАП за каментары і лайкі ў інтэрнэце. А пасля 10 сутак адседкі ў Глыбоцкім ІЧУ з 24 на 25 сакавіка міліцыянты этапавалі яго ў Віцебскі СІЗА-2. Там яму і прад’явілі абвінавачванне па крымінальным артыкуле – частцы 1 артыкула 368 КаАП (абраза Аляксандра Лукашэнкі).

**15.09.2023**

Суддзя суда Талачынскага раёна Алеся Саян 1 верасня за распаўсюджванне матэрыялаў, прылічаную ўладамі да катэгоры «экстрэмісцкіх», аштрафавала загадчыцу аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі Талачыну Таццяну Пабяржыну.
Падчас суда нібыта было ўстаноўлена, што Таццяна ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» мела падпіскі на інфармацыйныя рэсурсы «Люстэрка» і «Белсат». Жанчына прызнала гэты факт і сваю віну ў распаўсюдзе “экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Зыходзячы з даказанасці і датычнасці Пабяржынай да ўчынення адміністрацыйнага правапарушэння ў рамках ч. 2 арт. 19.11 КаАП, суддзя Саян пастанавіла аштрафаваць бібліятэкара на 1110 рублёў і канфіскавала ёй тэлефон.

**16.09.2023**

Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 8 верасня прыняла пастанову пакараць арыштам на 15 сутак Мікалая Юрцэвіча за тое, што ён правёў у сацыяльнай сетцы пікетаванне, на якое не атрымаў дазвол ад мясцовага гарадскога выканкама.
Згодна з пратаколам, работнік міліцыі падчас агляду тэлефона, які належаў Юрчанку, выявіў у сацсетцы «Вконтакте» на ўліковым запісе мужчыны «Фатаграфіі» ягоную выяву ў ваеннай касцы, а ніжэй выяву ў выглядзе бел-чырвона-белага сцяга з гербам «Пагоня». Гэтыя фотавыявы былі размешчаны ва ўладальнікам Дзень беларускай воінскай славы - 8 верасня 2012 года. Таксама міліцыянер выявіў фотаздымак, на якім намаляваны бел-чырвона-белы сцяг, які вісіць на сцяне.
Суд узяў на веру доказы віны Юрчанкі ў правядзенні пікету, прадстаўленыя мясцовым РАУС. І судзьдзя Балаболава на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП пакарала Мікалая арыштам тэрмінам на пятнаццаць сутак.

**17.09.2023**

Суддзя суда Гарадоцкага раёна Ганна Гурынава арыштавала грамадзяніна Расійскай федэрацыі Віктара Мішчанку на двое сутак за тое, што ён правёў пікетаванне ў Гарадку без дазволу мясцовага райвыканкама.

Згодна з пратаколам аб адміністрацыйным правапарушэнні, Віктар хадзіў па горадзе ў кепцы з выявай герба "Пагоня" і паласой бел-чырвона-белага колеру. Суду ён растлумачыў, што сапраўды гэта рабіў, бо не ведаў пра тое, што публічная дэманстрацыя сімволікі, намаляванай на яго галаўным уборы ў спалучэнні з БЧБ-стужкай, з'яўляецца выказваннем сваіх грамадска-палітычных поглядаў, т.б. з'яўляецца пікетам, які праводзіцца незаконна.
Суддзя Гурынава не пагадзілася з ахоўнай аргументацыяй Мішчанкі і на падставе ч. 1 арт. 24.23 КаАП пакарала мужчыну арыштам на двое сутак. А рэчавы доказ - кепку з выявай герба "Пагоня" і бел-чырвона-белага сцяга, пастанавіла пакінуць пры справе на ўвесь тэрмін яго захоўвання, г.зн. на працягу трох гадоў.

**18.09.2023**
Суддзя суд Віцебскага раёна Міхаіл Зубеня 28 жніўня пакараў штрафам у памеры 740 рублёў жыхарку абласнога цэнтра Алену Базванаву, якая па версіі ўладаў займалася распаўсюджваннем экстрэмісцкіх публікацый у сацыяльнай сетцы.
Паводле матэрыялаў адміністрацыйнай справы Алена, выкарыстоўваючы свой тэлефон на прыналежнай ёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм» захоўвала з мэтай распаўсюджвання «экстрэмісцкія» матэрыялы, якія былі размешчаны на інтэрнэт-старонцы інфармацыйнага рэсурсу «Люстэрка».
Будучы апытанай у судовым паседжанні, жанчына і маці малалетняга дзіцяці, вінаватай сябе прызнала часткова.
Прымаючы да ўвагі доказы, прадстаўленыя аддзелам міліцыі, суддзя Зубеня, на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП, падвергнуў Базванаву штрафаванню ў даход дзяржавы ў памеры 740 рублёў, з канфіскацыяй тэлефона , які належыць «правапарушальніцы».

**19.09.2023**

40-гадовага жыхара Віцебска прызналі вінаватым у абразе Аляксандра Лукашэнкі (ч. 1 арт. 368 КК), абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК), садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці (ч.1 арт.361-1 КК) і фінансаванні дзейнасці экстрэмісцкага фармавання (арт. 361-2 КК). Суд над ім праходзіў у Віцебскім абласным судзе, 31-га жніўня суддзя Аляксандр Абашын пастанавіў пакараць Дзмітрыя Загалаўца трыма з паловай гадамі пазбаўлення волі агульнага рэжыму. Загалаўца затрымалі 20 студзеня 2023 г. -- спачатку на яго склалі пратакол за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» паводле ч. 2 арт.19.11 КаАП, але на волю ён ужо не выйшаў: сілавікі даследавалі ягоны тэлефон і распачалі крымінальную справу. Дзмітрыя Загалаўца перавялі ў СІЗА №2 Віцебска, і там ёе знаходзіцца дагэтуль. У чым вінавацяць мужчыну, стала вядома з паведамленняў праўладных тэлеграмканалаў -- нібыта ён у інтэрнэце “агітаваў людзей выходзіць на барыкады, пускаць цягнікі пад адхоны і ладзіць фізічныя расправы над сілавікамі”.
Па сукупнасці прад’яўленых абвінавачванняў Дзмітрый Загалавец пакараны пазбаўленнем волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму тэрмінам на тры гады і шэсць месяцаў. 23 чэрвеня праваабарончая супольнасць прызнала яго палітычным зняволеным.

**20.09.2023**
Старшыня суда Глыбоцкага раёна суддзя Алена Кот 8 верасня пастанавіла арыштаваць на 10 сутак Руслана Рагоўскага за тое, што ён без дазволу мясцовага райвыканкама правёў масавае мерапрыемства - пікетаванне ў сацыяльнай сетцы.
У судзе пацвердзіўся факт таго, што мужчына размясціў у сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» публікацыю з выявай футболкі чорнага колеру, на якой меліся надпіс «Беларусь» і выява бел-чырвона-белага сцяга з гербам «Пагоня». Акрамя гэтага, там жа знаходзіўся фота самога Рагоўскага з надзетай футболкай белага колеру з выявай герба «Пагоня». На гэтую дэманстрацыю вопраткі, якую суд прыраўнаваў да пікету, Руслан не меў дазвол ад кіраўніцтва Глыбоцкага райвыканкаму.
Таму суддзя Кот, кіруючыся ч.1 арт.24.23 КаАП, арыштавала мужчыну 10 сутак.

**20.09.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 11 верасня за падпіску на 9 інфармацыйных «экстрэмісцкіх» рэсурсаў вырашыла пакараць арыштам на 15 сутак сябра грамадскай арганізацыі "Беларускае таварыства інвалідаў" Сяргея Крупкіна.
У судовым паседжанні Сяргей указаў на тое, што ён у сацыяльнай сетцы «Фэйсбук» на сваёй асабістай

старонцы меў падпіскі на суполкі: «Ведай народ праўду», «Свабодная Беларусь», «Protest», «За Еўрапейскую Беларусь», «Беларусь за сумленныя выбары», «Народны прысуд», «Стачкам ААТ «Беларуськалій», «Салідарнасць з Хартыя-97», а таксама ў сетцы «YouTube» быў падпісаны на канал «NEXTA». З дапамогай гэтых інфармацыйных рэсурсаў, прызнаных уладамі "экстрэмісцкімі" матэрыяламі, ён перыядычна знаёміўся з навінамі.
Пры прызначэнні пакарання суддзя Болоболова знайшла змякчальную акалічнасць - прызнанне мужчынам сваёй віны, і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергла Крупкіна максімальна магчымым пакараннем па названым артыкуле - арыштам на 15 сутак.

**21.09.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 верасня за распаўсюджванне «экстрэмізму» ў сацыяльнай сетцы аштрафавала на 1110 рублёў мясцовую жыхарку Вольгу Драздову.
У судзе высветлілася, што Вольга на сваёй старонцы ў сетцы «УКантакце» мела спасылку на інтэрнэт-старонку з назвай «Zerkalo.io», а таксама яе лагатып, якія судамі былі ўключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. У судзе «правапарушальніца» прызналася ў здзейсненым і заявіла пра сваю віну.
Улічваючы прызнанне віны, як асноўнага доказу правапарушэння, суддзя Балаболава, на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала Драздову штрафам у памеры 1110 рублёў.

**22.09.2023**
Суддзя суда Талачынскага раёна Алеся Саян 8 верасня за падпіску ў сацыяльнай сетцы на “экстрэмісцкі” інфармацыйны рэсурс у рамках адміністрацыйнай вытворчасці аштрафавала на 1110 рулёў кантралёра-касіра Анжаліку Сушчую.
У судзе Анжэла прызналася ў тым, што яна з 2018 года ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» была падпісаная на старонку замежнага ТБ «Белсат», якую пазней суд прызнаў экстрэмісцкімі матэрыяламі і быў унесены ў адпаведны рэспубліканскі спіс. У судовым паседжанні «правапарушальніца» з агаворкамі прызнала сваю віну ў здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння.
Тым не менш, суддзя Саян палічыла факт распаўсюджвання экстрэмізму даказаным і на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП пакарала Сушчую штрафам у даход дзяржавы ў суме 1110 рублёў, а таксама канфіскавала тэлефон, як сродак здзейсненага правапарушэння.
**23.09.2023**
Былой жонкі вядомага віцебскага актывіста Сяргея Каваленкі ўжо не было ў Беларусі, калі суддзя Першамайскага райсуду Міхаіл Юрчанка аштрафаваў жанчыну на 2590 руб. за фотаздымкі з пратэстаў 2020г., размешчаныя на яе старонцы ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте». Ён прызнаў Алену Каваленку вінаватай у «несанкцыянаваным пікетаванні» паводле арт. 24.23 КаАП.
За непасрэдны ўдзел у пратэстных падзеях яе ўжо штрафавалі ў верасні 2020г. Той самы суддзя Міхаіл Юрчанка прызнаў жанчыну вінаватай у «парушэнні парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў» і аштрафаваў яе на 10 базавых велічынь ( на той час – 270 рублёў).
Таксама Алену Каваленку прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці ў 2014 годзе: яе аштрафавалі на 10 базавых велічынь за Гэткае пакаранне жанчыне прысудзілі за ўдзел у пікеце супраць удзелу ў мясцовых выбарах, які адбыўся 22 сакавіка ў Віцебску.
У апошнія гады Алена Каваленка паведамляла ў сваіх сацыяльных сетках пра рэгулярныя візіты сілавікоў іператрусы, якія праводзіліся ў яе па месцы жыхарства і па месцы жыхарства маці Сяргея Каваленкі.
Віцебскі актывіст, шырока вядомы тым, што ў 2010г. вывесіў бел-чырвона-белы сцяг на гарадскую навагоднюю ёлку на Плошчы Перамогі, ужо некалькі гадоў жыве ў Варшаве, дзе ладзіць акцыі ў падтрымку Зянона Пазняка і супраць «новай апазіцыі» - Святланы Ціханоўскай, Сяргея Латушкі і гд.

**24.09.2023**
Суддзя суда Першамайскага раёна г. Віцебска Міхаіл Юрчанка 13 верасня за распаўсюджванне ў сацыяльнай сетцы экстрэмісцкіх матэрыялаў пастанавіў пакараць арыштам на 7 сутак інжынера-праграміста Аляксея Сядзяку.
У судовым паседжанні было ўстаноўлена, што Аляксей у 2020 годзе ў сацыяльнай сетцы “УКантакце” размясціў на сваёй старонцы відэазапісы, раней апублікаваныя ў суполцы «TUT.BY», якія раней улады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Правапарушальнік указаў, што ў пратэстнай дзейнасці супраць дзяржавы не ўдзельнічаў, і цяпер выдаліў названую прадукцыю.
Грунтуючыся на матэрыялах справы і на тлумачэннях мужчыны, суддзя Юрчанка ў межах ч.2 арт.19.11 КаАП пакараў Сядзяку адміністрацыйным арыштам на 7 сутак.

**25.09.2023**



Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 14 верасня за «экстрэмізм» у сацыяльных сетках пастанавіла арыштаваць на 15 сутак фельчара-лабаранта мікрабіялагічнай лабараторыі ДУ «Наваполацкі гарадскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» Генадзя Вазьміцеля. Вядома, што ён вылучаўся ў 2016 годзе ў якасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў ад апазіцыйнай Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада).

Згодна з пратаколам, які паступіў з мясцовага АУС у суд, Генадзь у сацыяльнай сетцы «Facebook», у раздзеле «Падпіскі» захоўваў інфармацыю суполак экстрэмісцкага характару: «Чай з малінавым варэннем», «charter97.org», «Фонд салідарнасці BYSOL/Belarus solidarity foundation » і «Тактычная група Беларусь». Гэтыя інфармацыйныя крыніцы раней уладамі былі ўключаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Суддзя Болоболова ў судовым працэсе ацаніла ўсе наяўныя доказы і прыйшла да ўнутранай перакананасці, што віна Вазьміцеля даказанай цалкам і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пастанавіла пакараць мужчыну адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 15 сутак.

**26.09.2023**

Сямейную пару абвінавацілі ў спрыянні экстрэмісцкай дзейнасці. Відэаапэратара-фрылансера Вячаслава Лазарава асудзілі паводле ч. 2 арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса да пяці з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму, Таццяну Пыцько — паводле ч. 1 арт. 361-4 КК да трох гадоў агульнага рэжыму. Абвяшчэнне прысуду ў Віцебскім абласным судзе прайшло ў закрытым рэжыме – як і ўвесь судовы працэс.

Суддзя Віцебскага абласнога суду Яўген Будуноў прызнаў падсудных вінаватымі за ўзаемадачыненні з тэлеканалам «Белсат», прызнаным беларускімі ўладамі экстрэмісцкім фармаваннем: Вячаслава -- за відэаматэрыялы, паказаныя на тэлеканале, Таццяну -- за тое, што дапамагала мужу падчас здымак. Беларуская праваабарончая супольнасць лічыць абодвух сужэнцаў палітычнымі зняволенымі.

Відэаапэратар- фрылансер Вячаслаў Лазараў быў затрыманы 9 лютага 2023 года ў Віцебску пасляператрусу па месцы рэгістрацыі. У яго забралі мабільныя тэлефоны і відэакамеру. Таксама сілавікі правяліператрусы ў кватэры, якую здымаў Лазараў, і па месцы рэгістрацыі ягонай жонкі Таццяны Пыцько, адтуль забралі ноўтбук і два тэлефоны. Жонку відэаапэратара-фрылансера затрымалі 6 чэрвеня 2023 года — пасля чарговага ператрусу ў яе кватэры.

На момант затрымання Таццяна Пыцько была ў адпачынку па догляду за дзіцем - гадавала агульную з Вячаславам дачку, якой тады быў 1 год і 1 месяц. Сацыяльная служба забрала дзяўчынку, яе спачатку змясцілі ў дзіцячую абласную лякарню, потым над ёй афармілі апеку сваякі Таццяны. Двое старэйшых дзяцей жанчыны ад першага шлюбу знаходзяцца з родным бацькам. У Вячаслава Лазарава на волі засталася састарэлая маці, жанчына мае інваліднасць і з цяжкасцю перасоўваецца – у яе праблемы з суставамі. Сын збіраў грошы на платную аперацыю для яе, аднак следчы камітэт дагэтуль не вярнуў грашовыя сродкі, забраныя падчас ператрусу.

29 жніўня Вячаславу Лазараву споўнілася 47 гадоў, дзень нарадзінаў ён сустрэў у віцебскім СІЗА-2. Тамсама 26 верасня сустрэне свае 39 гадоў і Таццяна Пыцько. У абодвух ёсць час, каб абскардзіць прысуд абласнога суду.

**27.09.2023**

Суддзя суда Сенненскага раёна Наталля Барысавец 6 верасня за праведзенае пікетаванне, не дазволенае ўладамі, аштрафавала на 2220 рублёў зваршчыка Вячаслава Яхнавецкага.

У судзе высветлілася, што мужчына 31 жніўня правёў пікет непасрэдна ў будынку мясцовай міліцыі. Гэты палітычны акт ён ажыццявіў без адпаведнага дазволу кіраўніцтва Сенненскага райвыканкама. Масавае мерапрыемства складалася ў тым, што Вячаслаў публічна дэманстраваў пашпарт, на якім была апранутая вокладка выявай герба "Пагоня" памерам 5,5 х 4,4 см.

Вывучыўшы матэрыялы справы, суддзя Барысавец прыйшла да высновы, што ў дзеяннях Яхнавецкага прысутнічац склад адміністрацыйнага правапарушэння і на падставе ч.1 арт. 24.23 КаАП пакарала яго штрафам у памеры 60 базавых велічыняў у суме 2 220 рублёў.

**28.09.2023**

27 верасня суддзя суда Аршанскага раёну і г. Оршы Юлія Вяршыніна прызнала 63-гадовую Вольгу Стаброўскую вінаватай паводле ч. 1 арт. 368 Крымінальнага Кодэкса за каментар у «Одноклассниках», расцэнены як «абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Па матэрыялах судовай справы, Стаброўская ў 2021 годзе ў сацыяльнай сетцы «Одноклассники» паставіла «клас» і пакінула кароткі каментар да чужога паста, у якім суд убачыў абразу Аляксандра Лукашэнкі.
Вольга Стаброўская мае інваліднасць па слыху. Да выхаду на пенсію яна працавала ў Аршанскай друкарні. Першапачаткова ўвагу сілавікоў прыцягнулі падпіскі жанчыны на так званыя «экстрэмісцкія» інтэрнэт- рэсурсы і «падабайкі» пад матэрыяламі, у якіх асуджаецца палітыка дзейных уладаў. Пасля затрымання следчыя пачалі больш уважліва вывучаць кантэнт яе сацыяльных сетак і знайшлі падставы для крымінальнай справы.

**28.09.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава за распаўсюд у сацыяльнай сетцы «экстрэмісцкіх» публікацый пакарала арыштам на 15 сутак Аляксандра Якаўлева.
Паводле матэрыялаў адміністрацыйнай справы, Якаўлеў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» меў спасылку на інтэрнэт-супольнасць з назвай «STOP LUKA», якую ўлады раней унеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Работнікі мясцовага аддзялення міліцыі сцвярджалі, што яны выявілі факт таго, што мужчына паставіў у раздзеле стужкі навін адзнаку-лайк «Клас» пад запісам экстрэмісцкай супольнасці «STOP LUKA», таксама выявілі падобныя адзнакі пад усімі запісамі дэструктыўнага характару.
У судовым паседжанні Аляксандр прызнаў сваю віну, не адмаўляў таго, што на яго старонцы ў сетцы «Аднакласнікі» з 2015 года мелася падобная інфармацыя, аднак, ён не меў на мэце распаўсюджваць экстрэмісцкія матэрыялы.
Суддзя Болоболова палічыла, што прызнанне віны "правапарушальнікам" з'яўляецца дастатковай умовай для таго, каб пакараць Якаўлева арыштам на 15 сутак у рамках ч.2 арт.19.11 КаАП. Пры гэтым суддзя абрала максімальны тэрмін знаходжання Якаўлева пад арыштам нягледзячы на тое, што на ягоным утрыманні знаходзяцца малалетнія дзеці, што з'яўляецца змякчальным віну і пакаранне абставінамі.

**29.09.2023**
Суддзя суда Докшыцкага раёна Вячаслаў Елісеенка 11 верасня за распаўсюд «экстрэмізму» ў сацыяльных сетках пастанавіў арыштаваць тэрмінам на 10 сутак мясцовага жыхара бацьку двух малалетніх дзяцей Валерыя Яцкоўскага.

У судзе стала вядома, што мужчына ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» захоўваў выявы герба «Пагоня» і незарэгістраваную бчб-сімволіку, а таксама лагатыпы інфармацыйных рэсурсаў TUT.BY і «Хартыя 97». Усе гэтыя выявы раней судамі былі занесены ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Суддзі Елісеенкі было дастаткова прызнання віны «правапарушальнікам» і рапарту супрацоўнікаў мясцовага РАУС, каб на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергнуць Яцкоўскага адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе арышту на тэрмін дзесяць сутак з «канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння і без канфіскацыі прылад і сродкаў здзяйснення адміністрацый правапарушэнні».

**29.09.2023**



28 верасня ў Наваполацкім гарадскім судзе 53-гадовага работніка "Нафтана" Іллю Двойрына прызналі вінаватым паводле ч. 1 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (хуліганства). Суддзя Віталь Лапко пакараў мужчыну пазбаўленннем волі на адзін год умоўна.Інцыдэнт, які разбіраў суд, здарыўся 1 ліпеня. Гаспадар машыны, на капоце і бакавінах якой былі намаляваныя вялікія літары «Z», звярнуўся з заявай ў міліцыю наконт нанесеных пашкоджанняў, нанесеных транспартнаму сродку. Лабавое шкло машыны была абліта белай фарбай. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі за гэта жыхара Наваполацка Іллю Двойрына. Праваабаронцы звярнулі ўвагу на дзве адметныя дэталі: аўтамабіль належаў вядомаму прарасейскаму актывісту Сяргею Юдаеву і быў прыпаркаваны каля наваполацкага гарадскога аддзела міліцыі.

Відэа затрымання Іллі Двойрына было размешчана ў афіцыйных тэлеграм-каналах, супраць яго распачалі крымінальную справу. Па месцы жыхарства падазраванага правялі ператрус, а таксама былі затрыманыя чацвёра ягоных сваякоў – сын, нявестка, жонка і брат. У іх таксама адбыліся ператрусы, усіх чацвярых адвезлі ў ГАУС, але пасля праверкі тэлефонаў на «экстрэмісцкія падпіскі» жонку і

брата адпусцілі. На сына і ягоную жонку склалі пратаколы за падпіскі на інтэрнэт рэсурсы, інфармацыйнай прадукцыя якіх прызнана экстрэмісцкай, абодвум прысудзілі па 15 сутак арышту.Іллю Двойрына пакаралі паводле адміністрацыйнага артыкула 24.23 – за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне: у судзе быў агучаны пратакол, паводле якога Двойрын прызнаў, што ўвесну 2023 года ён вырабіў улёткі з выявай прэзідэнта Расеі Уладзіміра Пуціна і тэкстам антываеннага характару, і 16 траўня расклеіў іх на прыпынку грамадскага транспарту ў Наваполацку. Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава пастанавіла пакараць мужчыну 15-цю суткамі арышту. На той момант ён ужо знаходзіўся пад вартай. Іллю Двойрына ўтрымлівалі за кратамі з моманту затрымання ў ліпені да суду ў канцы верасня. Пасля абвяшчэння прысуду ён быў вызвалены ў судовай залі.
Праваабаронцам вядома, што пад увагу сілавікоў Ілля Двойрын трапіў яшчэ ў 2020г. - яго затрымлівалаі за ўдзел у пратэстах супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў.

**30.09.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 19 верасня за распаўсюд у сацыяльных сетках «экстрэмісцкіх» публікацый пакарала арыштам на 15 сутак Аляксея Дзегцярова.

Пры апытанні ў судовым паседжанні мужчына прызнаўся ў тым, што ў сетцы «Аднакласнікі» завёў старонку даступную для прагляду іншым грамадзянам, дзе меў на ёй розныя падпіскі і публікацыі, у тым ліку з экстрэмісцкіх суполак «Zerkalo.io», «Радыё свабоды», «Еўрарадыё» – Навіны Беларусі» і «TUT.BY».

Суддзя Болоболова ў судовым працэсе ацаніла ўсе наяўныя доказы і прыйшла да ўнутранай перакананасці, што віна Дзегцярова даказаная цалкам і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пастанавіла пакараць мужчыну адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 15 сутак.

## Кастрычнік

**01.10.2023**
Суддзя суда Бешанковіцкага раёна Кацярына Мацкевіч 15 верасня за ухіленне ад ўзгодненага з уладамі маршруту хрэснага ходу аштрафавала на 740 рублёў памочніка благачыннага па будаўніцтве цэрккваў Храма святога прарока Іллі мясцовага жыхара Мікалая Бондара.
Улетку група з дзесяці чалавек прайшла шэсцем па сельскай дарозе ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці. Сама імпрэза была ўзгодненая распараджэннем Гарадзенскага аблвыканкама ад 28 чэрвеня 2023 года, але магчыма, удзельнікі па уласнаму жаданню змянілі маршрут ходу, тым самым яны парушылі патрабаванне Закона «Аб масавых мерапрыемствах». На судзе святар віну за свае дзеянні не прызнаў.
Тым не менш суддзя Мацкевіч пастанавіла на падставе ч.2 арт.24.23 КаАП пакараць Бондара штрафам у даход дзяржавы ў памеры 20 базавых велічыняў у суме 740 рублёў.

**03.10.2023**



Суддзя і старшыня суда Лёзненскага раёна Алена Шарэц 13 верасня за распаўсюджванне "экстрэмізму" ў сацыяльнай сетцы пакарала грамадскімі праца на тэрмін 20 гадзін і канфіскавала тэлефон у маладога жыхара аграгарадка Дабрамыслі Іллю Самохіна.
У судзе высветлілася, што малады чалавек на пасце інтэрнэт-старонкі "Радыё Свабода" сацыяльнай сеткі «Instagram» распаўсюдзіў "экстрэмізм" шляхам адзнакі "Мне падабаецца". Раней адзначаную публікацыю ўлады прызналі экстрэмісцкімі матэрыяламі. У судовым паседжанні Ілля віну прызнаў, абставінаў, указаных у пратаколе, не аспрэчваў.
Прымаючы даказанасць віны, суддзя Шарэц на падставе ч.2 арт. 19.11 КаАП падвергла Самахіна адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе грамадскіх работ на тэрмін 20 гадзін і канфіскаваць тэлефон, які належыць «правапарушальніку».

**04.10.2023**
Суддзя суда Сенненскага Іна Досава 27 ліпеня за абразу следчага Сенненскага РАСК прыгаварыла мясцовага жыхара інваліда 2 групы Паўла Якубовіча да двух гадоў абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу, да штрафу ў памеры 1850 рублёў і канфіскацыі камп'ютара.
Падчас разгляду матэрыялаў крымінальнай справы стала вядома тое, што прычынай абразы старшага следчага Сенненскага раённага аддзела следчага камітэта маёра юстыцыі Аляксандра Гарнака стаў

дрэнны настрой Паўла, які настаў пасля таго, як ён даведаўся пра неспрыяльныя вынікі аналізаў па сваім захворванні. Знаходзячыся ў прыгнечаным стане асуджаны ў сацыяльнай сетцы ў «Вконтакте» ў адной з груп, напісаў абразлівы каментар у адрас аднаго з працаўнікаў мясцовага следчага воргана. Наконт гэтага каментара была распачата справа па арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады) КК РБ і быў вынесыны судом карны вырак.
Вядома, што Паўла цягам бягучага года два разы судзілі па адміністрацыйных артыкулах. А менавіта, 3 красавіка суддзя Людміла Талай за фотаздымкі з БЧБ-сцягам ва СС «Вконтакте» аштрафавала яго на 370 рублёў, а 6 ліпеня суддзя Іна Досава за падпіску на «экстрэмісцкі» канал у тым жа «Вконтакте» і публікацыю БЧБ-малюнкаў у «Фэйсбуку» пакарала штрафам у памеры 1850 рублёў.

**05.10.2023**
Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Міхаіл Юрчанка 13 верасня за падпіску на "экстрэмісцкі" паблік пастанавіў аштрафаваць грамадзянку РФ Наталлю Куксёнак, якая жыве ў Віцебску. Гэта другая ў гэтым годзе адміністрацыйная справа, разгледжаная з нагоды распаўсюджвання “экстрэмізму” ў дачыненні да Куксёнак. Першая справа была разгледжана напрыканцы жніўня тым жа суддём Юрчанка.
У судовым паседжанні было абвешчана, што факт супрацьпраўных дзеянняў з боку Наталлі быў устаноўлены працаўнікамі міліцыі ў будынку Упраўлення ўнутраных справаў Віцебскага аблвыканкама.
Згодна з адміністрацыйным пратаколам, маладая жанчына ў сацыяльнай сетцы "Інстаграм" выкарыстоўваючы свой рахунак была падпісана на канал "NEXTA", які адным з судоў Мінска быў уключаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Куксёнак у судовым паседжанні сваю вінаватасць у здзяйсненні ёю правапарушэння не прызнала, адмаўляла намер на распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Такая пазіцыя правапарушальніцы не паўплывала на ўпэўненасць суддзі Юрчанкі ў тым, што Куксёнак здзейсніла правапарушэнне і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакараў яе штрафам у памеры 740 рублёў.

**05.10.2023**
Роўна праз тыдзень пасля таго, як 53-гадовага работніка “Нафтана” Іллю Двойрына прызналі вінаватым паводле ч. 1 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (хуліганства) за аблітую белай фарбай машыну прарасейскага актывіста і пакаралі пазбаўленнем волі на адзін год умоўна, ён зноў апынуўся ў пастарунку, а потым у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў.
Мужчыну, паводле звестак праваабаронцаў, затрымалі на рабочым месцы. Паводле якога артыкула яму прысудзілі новы арышт на 15 сутак, пакуль не вядома.Інцыдэнт з аўтамабілем, які належаў вядомаму прарасейскаму актывісту Сяргею Юдаеву і быў прыпаркаваны каля наваполацкага гарадскога аддзела міліцыі, здарыўся 1 ліпеня гэтага года. Ілля Двойрын быў затрыманы і змешчаны пад варту. Пакуль мужчына знаходзіўся за кратамі, яго прызналі вінаватым паводле адміністрацыйнага артыкула 24.23 – за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне. У судзе быў агучаны пратакол, паводле якога Двойрын прызнаў, што ўвесну 2023 года ён вырабіў улёткі з выявай прэзідэнта Расеі Уладзіміра Пуціна і тэкстам антываеннага характару, і 16 траўня расклеіў іх на прыпынку грамадскага транспарту ў Наваполацку. Суддзя Наваполацкага суду Зінаіда Балаболава пастанавіла пакараць мужчыну 15-цю суткамі арышту. Тады ж, у ліпені, дома ў Іллі Двойрына быў праведзены ператрус, таксама сілавікі правялі ператрусы па месцы жыхарства ягоных блізкіх сваякоў - сына, нявесткі, жонкі і брата. Пасля праверкі тэлефонаў на «экстрэмісцкія падпіскі» жонку і брата адпусцілі, а на сына і ягоную жонку склалі пратаколы за падпіскі на інтэрнэт- рэсурсы, інфармацыйная прадукцыя якіх прызнана экстрэмісцкай. Ім абодвум таксама прысудзілі па 15 сутак арышту. Пад увагу сілавых структураў Ілля Двойрын трапіў яшчэ ў 2020г. - яго затрымлівалаі за ўдзел у пратэстах супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў.

**05.10.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 21 верасня за распаўсюджванне "экстрэмізму" ў сацыяльнай сетцы пастанавіла аштрафаваць на 1110 рублёў мясцовую жыхарку Ірыну Нікіціну.
У судзе быў агучаны пратакол адміністрацыйнага правапарушэння, з якога вынікае, што Ірына са сваёй кватэры ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» распаўсюдзіла спасылку з назвай «Афіцыйная група Хартыі'97», якую ўлады лічаць экстрэмісцкімі матэрыяламі. У судовым паседжанні жанчына толькі часткова прызнала сваю віну.
Але гэтага прызнання было дастаткова для суддзі Балаболавай, каб яна на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала Нікіціну штрафам у даход дзяржавы ў памеры 1110 рублёў без канфіскацыі, якая належыць ёй тэлефона, на які быў накладзены арышт у якасці гарантыі выплаты прызначанага штрафу.

**06.10.2023**

Суддзя суда Верхнядзвінскага раёна Таццяна Кукліна 26 верасня за падпіскі на «экстрэмісцкія» інтэрнэт-супольнасці пакарала арыштам на 7 сутак рамесніка Паўла Кавалевіча.

Пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні, які супрацоўнікі міліцыі передавілі ў суд, утрымліваў звесткі аб тым, што Павел меў падпіску на суполкі “NEXTA” і “Стачка ААТ “Нафтан”, у сацыяльнай сетцы “ВКонтакте”, якія ўлады залічылі да экстрэмісцкіх матэрыялаў.

У судовым паседжанні мужчына сваю віну прызнаў цалкам. Патлумачыў, што меў падпіску супольнасці, дзе перачытваў навіны і глядзеў трансляцыі гульнявых матчаў па футболе. Пасля прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці па ч.1 арт.23.34 КаАП выдаліў усе сацыяльныя сеткі і месэнджэры. Год таму аднавіў сваю асабістую старонку ў сацыяльнай сетцы “ВКонтакте”. І не ведаў аб тым, што пасля аднаўлення выдаленага профіля на асабістай старонцы захавалася падпіска на супольнасць "Стачка ААТ "Нафтан".

Але суддзя Кукліна палічыла, што ў дзеяннях Паўла Кавалевіча ўтрымліваецца склад правапарушэння, якое адносіцца да катэгоры грубых адміністрацыйных правапарушэнняў і накіравана на дэстабілізацыю грамадска-палітычнай абстаноўкі ў грамадстве і дзяржаве. І на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергла яго арышту на тэрмін 7 сутак без канфіскацыі прыналежнага яму тэлефона.

**06.10.2023**

Суддзя суда Кастрычніцкага раёна Віцебска Сяргей Будрэвіч 4 кастрычніка вынес прысуд мясцоваму жыхару Сяргею Бельскаму, абвінаваціўшы яго ў абразе Аляксандра Лукашэнкі (ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса). Суд пакараў мужчыну пазбаўленнем волі на тэрмін 2,5 гады з адбываннем прызначанага пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму.

Згодна з матэрыяламі справы, Сяргей Бельскі 6 ліпеня 2023 года, нібыта нападпітку, “знаходзячыся ў грамадскім месцы – у салоне тралейбуса, які рухаўся па маршруце №12, пры праездзе па праспекце Фрунзе ў горадзе Віцебску ў прысутнасці сведак, у сувязі з наяўнымі ў яго палітычнымі і ідэалагічнымі поглядамі, публічна абразіў, гэта значыць прынізіў гонар і годнасць асобы Лукашэнкі, прамовіўшы неаднаразова выказванні ў яго адрас, якія ўтрымлівалі негатыўную ацэнку і мелі ненарматыўную форму маўленчага выказвання, прыніжалі аўтарытэт, гонар і годнасць асобы”.

Кантралёр грамадскага транспарту, які правяраў квіткі ў пасажыраў, выклікаў міліцыю.

**06.10.2023**

Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 28 верасня за падпіску на тры «экстрэмісцкія» інфармацыйныя рэсурсы арыштавала на трое сутак работніка ААТ «Нафтана» Дзянісу Філітарыну.

У судовым паседжанні было агучана, што ў Дзяніса ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», дзе ў раздзеле падпіскі працаўнік аддзела 7-га ўпраўлення ГУБАЗіК выявіў падпіскі на старонку «STOP LUKA», суполку «Наш край» і групу «Анлайн-платформа голас». Гэтыя інфармацыйныя рэсурсы раней судамі былі аднесены да экстрэмісцкіх матэрыялаў.

У судзе "правапарушальнік" прызнаў, што ён сапраўды меў на сваёй старонцы ў СС розныя падпіскі і публікацыі, у тым ліку з рэсурсаў "STOP LUKA", "Наш край" і "Анлайн-платформа голас".

Суддзя Балаболава ўлічыла, што Філітарын прызнаў віну і мае на ўтрыманні двух непаўналетніх дзяцей і кіруючыся ч.2 арт. 19.11 КаАП пастанавіла арыштаваць мужчыну на трое сутак без канфіскацыі прыналежных яму гаджэтаў.

**07.10.2023**




Міхаіл Кумпінь усё жыццё працаваў у сельскай гаспадарцы, быў героем публікацый у раённай газеце, а ў 2022 г. яго ўганаравалі званнем «Чалавек года Браслаўшчыны». За адну-адзіную падпіску ў СС «Одноклассники», інфармацыйная прадукцыя якой прызнана экстрэмісцкімі матэрыяламі, 62-гадовага кіраўніка аддзялення СПК «Маяк» асудзілі да 7 сутак арышту. Таксама суддзя Аляксандр Вязіцкі пастанавіў канфіскаваць тэлефон асуджанага.

У Міхаіла Кумпіня некалькі старонак у «Одноклассниках», і толькі на адной з іх–якой мужчына даўно не карыстаецца, сярод груп была знойдзена тая, што стала прадметам судовага разбіральніцтва. Сілавікі заўважылі «крамольную» падпіску 2 жніўня, праз тыдзень яны прыехалі да вяскоўца дадому, забралі яго ў пастарунак, дзе склалі пратакол пра адміністрайцыйнае правапарушэнне па ч.2 арт.19.11 КаАП. Праз некалькі гадзін Міхаіла Кумпіня адпусцілі,

суд над ім адбыўся яшчэ праз месяц–7 верасня. Мужчына цалкам прызнаў сваю віну, аднак суд палічыў, што пакараць сталага чалавека і заслужанага работніка можна толькі арыштам.

Міхаіл Кумпінь адпрацаваў у СПК «Маяк» 40 гадоў. Адразу пасля службы ў войску прыйшоў рабіць кіроўцам, потым трактарыстам, у 1991 г. яго прызначылі інжынерам аддзялення №2, а з 2013г. Ён кіраваў гэтай структурай. Можна лічыць, узорная біяграфія беларускага працаўніка сельскай гаспадаркі. Але былыя заслугі суд «ацаніў» у трое сутак зняволення: суддзя Вязіцкі прысудзіў Кумпіню 7 сутак арышту, хаця раней за падобныя правапарушэнні «даваў» абвінавачаным па 10 сутак арышту.

**09.10.2023**
Паводле судовай пастановы, Валер Яцкоўскі «захоўваў у адкрытым доступе з мэтай распаўсюду» інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў - «выяву лагатыпа у выглядзе шчыта з гербам П. І незарэгістраванай бел-чырвона-белай сімволікай» і некалькі лагатыпаў інфармацыйных рэсурсаў, таксама прызнаных экстрэмісцкімі матэрыяламі. Старшыня Дошыцкага райсуда Вячаслаў Елісеенка прысудзіў вяскоўцу 10 сутак арышту, прызнаўшы яго вінаватым паводле ч.2 арт.19.11 КаАП.
Суд над Валерам Яцкоўскім адбыўся 11 верасня, падчас судовага працэсу ён не адмаўляў, што падпіскі на групы інфармацыйных рэсурсаў, прызнаных экстрэмісцкімі, насамрэч захоўваліся на ягонай старонцы з «Аднакласніках». Іх знайшлі міліцыянты падчас маніторынгу сацыяльных сетак. Цяпер Яцкоўскі абмежаваў доступ да сваёй старонкі ў сацыяльных сетках. Пакаранне ў выглядзе 10 сутак адміністрацыйнага арышту старшыня Докшыцкага суду абраў, спаслаўшыся на змякчальныя акалічнасці – у прыватнасці, на тое, што Валер Яцкоўскі з“яўляецца бацькам двух непаўналетніх дзяцей.

**10.10.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 верасня за распаўсюджванне "экстрэмізму" ў сацыяльных сетках пастанавіла арыштаваць на 15 сутак мясцовую жыхарку Алену Марцанюк.
У судзе былі агучаныя два пратаколы аб адміністрацыйным парушэнні, з якіх вынікала, што Алена на сваёй старонцы ў сетцы «YouTube» мела спасылку на канал «Euroradio Live», а ў СС «Укантакце» спасылку на інтэрнэт-старонку «Zerkalo.io», а таксама лагатып "Zerkalo.io". Усе гэтыя інфармацыйныя рэсурсы и выява раней уладамі былі ўключаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні жанчына віну прызнала часткова, не адмаўляла таго, што на яе старонках у сацыяльных сетках «ВКонтакте» і «YouTube» былі названыя падпіскі, але не лічыць, што яна такім чынам распаўсюджвала экстрэмісцкія матэрыялы. Пра тое, што суполкі прызнаныя экстрэмісцкімі, ёй таксама не было вядома.
Аднак судзьдзя Балаболава не прыняла тлумачэньня Марцанюка і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала яе арыштам на пятнаццаць сутак.

**12.10.2023**
Штрафам у памеры 20-ці базавых велічынь (740 рублёў) суддзя аршанскага суда Мікалай Драгуноў пакараў мясцовага жыхара, 33-гадовага Захара Гудаса. Мужчыну прызналі вінаватым паводле ч.2 арт. 19.11 КаАП за тое, што ў ягоным тэлефоне ў Instagram былі знойдзены падпіскі на групы, уключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Суд над Захарам Гудасам адбыўся 27 верасня. Праз два дні суддзя таго ж суда Юлія Хаткевіч асудзіла яшчэ аднаго аршанца, прызнаўшы яго вінаватым паводле ч.1 арт 24.23. За тое, што ў Instagram у мужчыны знайшлі выяву герба Пагоня, як выкладзена ў судовым рашэнні, «выкананую з танах бел-чырвона-белага колеру», яго асудзілі да 15 сутак арышту. Таксама з судовага рашэння вынікае, што змест старонкі аршанца ў Instagram даследавалі супрацоўнікі аддзела міліцыі Чыгуначнага раёна Віцебска.

**13.10.2023**
Суддзя суда Аршанскага раёна Зміцер Разумовіч 5 кастрычніка за распаўсюджванне «экстрэмізму» ў сацыяльных медыя арыштавала на 7 сутак мясцовую жыхарку вартаўніка Алену Енушэўскую. У тым жа судзе рознымі суддзямі за "экстрэмізм" тройчы быў пакараны арыштам на агульны тэрмін - 23 сутак, ахоўнік крамы Сяргей Валькові́ч. Для пакарання суддзі выкарыстоўвалі ч.2 арт.19.11 КаАП Рэспублікі Беларусь.
У судзе было выяўлена, што Енушэўская сацыяльная сетка «УКантакце» была падпісаная на шэраг аршанскіх інфармацыйных каналаў, якія ўлады аднеслі да экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Згодна з пратаколам агляду фотатабліц, Вальковіч у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» работнікі міліцыі ўстанавілі, што ён быў падпісаны на шэраг інфармацыйных рэсурсаў «экстрэмісцкай» накіраванасці.

**14.10.2023**



Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 верасня за распаўсюд «экстрэмісцкіх матэрыялаў» у сацыяльных медыя пакарала арыштам на 15 сутак апаратчыка цэха 103 завода «Палімір» Андрэя Шкірэнку.
Падчас судовага разбору Андрэй пацвердзіў, што ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм» ён меў падпіску на суполкі «Рабочы Рух» і «Баста!», а ў «Фэйсбуку» на суполку «Фонд салідарнасці BYSOL/Belarus solidarity foundation». Пра тое, што гэтыя суполкі прызнаныя ўладамі экстрэмісцкімі, яму не было вядома. Таму мужчына віну ў распаўсюджванні экстрэмізму не прызнаў, ад дачы тлумачэнняў адмовіўся.
Улічваючы ўсе абставіны адміністрацыйнай справы, суддзя Балаболава на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пастанавіла арыштаваць Шкірэнку на пятнаццаць сутак.

**15.10.2023**

Улады, 4 кастрычніка, асуджанага да 1 года і 2 месяцаў гадам калоніі былога студэнта БНТУ Паўла Нявыгласа, які ў 2020-м апублікаваў звесткі, як вырабляць "кактэйль Молатава", унеслі ў спіс тэрарыстаў. Гэта 22-гі жыхар Віцебскай вобласці, якога ўлады зацвердзілі датычным да тэрарыстычнай дзейнасці.
Паўла Нявыгласа, які ў жніўні 2020-га толькі скончыў школу, асудзілі да 14 месяцаў калоніі. Суд над ім распачаўся толькі сёлета ў ліпені. За гэты час хлопец паспеў стаць студэнтам БНТУ (факультэт інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі).
Суддзя Расонскага райсуду Алена Елавая прызнала хлопца вінаватым паводле арт. 293 ч. 3 Крымінальнага кодэкса (Масавыя беспарадкі) за тое, што ў жніўні 2020-га ён апублікаваў у Telegram звесткі пра тое, як вырабіць «кактэйль Молатава».
Судовы працэс праходзіў у закрытым рэжыме. 12 верасня малады чалавек спрабаваў абскардзіць прысуд у Віцебскім абласным судзе. Але апеляцыйны разгляд стравы не змяніў меру пакарання, якую прызначыў Паўлу суд першай інстанцыі.

**16.10.2023**

Суддзя суда Аршанскага раёна Дзмітрый Разумовіч 4 кастрычніка вынес прысуд ІП Аляксею Цыпілеву, абвінавачанаму ў абразе А. Лукашэнкі паводле ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса.
Шматдзетнага бацьку (дзецям 3,4 і 5 год) Аляксея Цыпілева затрымалі па месцы жыхарства ў пасёлку Высокае Аршансага раёна 3 жніўня 2023 года і да суда змясцілі пад варту ў СІЗА Віцебска.
Па матэрыялах справы, Аляксей напрыканцы лютага 2023 года размясціў у тэлеграм-групе "Лухтавікінгі" абразлівы каментар самым прынізіў гонар і годнасць кіраўніка беларускай дзяржавы. Паўторна прадпрымальнік абразіў Лукашэнку ў сакавіку бягучага года. За гэтыя ўчынкі суд прызначыў Цыпілеву пазбаўленне волі тэрмінам на два гады з адбыццём пакарання ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Маёмасць прадпрымальніка: аўтамабілі і будаўнічую тэхніку рашэннем суду засталіся пакінутыя пад арыштам.
Каб падтрымаць Аляксея, трэба накіраваць паштоўкі і лісты на адрас: СІЗА-2 вул. Гагарына, 2, 210026, г. Віцебск, Віцбская вобласць, Аляксею Юр'евічу Цыпілёву.

**17.10.2023**

Як стала вядома, 4 кастрычніка суддзя Докшыцкага суда Вячаслаў Елісеенка прысудзіў па дванаццаць і чатырнаццаць сутак арышту двум жыхарам Докшыцкага раёна, якія з'яўляюцца супрацоўнікамі мясцовых крамаў. Жыхар горада Докшыцы Дзмітрый Слаўк атрымаў 12 сутак арышту, а жыхар гарадскога пасёлка Бягомль Міхаіл Надыкта – 14 сутак.
Абодвух судзіў 4 кастрычніка па частцы 1 артыкула 24.23 КаАП РБ (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) адзін і той жа сумнавядомы суддзя Вячаслаў Елісеенка, які ўключаны ў санкцыйны спіс з-за вынясення палітычна-матываваных прысудаў.
Абодвум мужчынам ставілася ў віну, што яны без дазволу Докшыцкага райвыканкама быццам правялі адзіночны пікет з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў. А заключаўся ён у тым,

што кожны з вышэйзгаданых жыхароў Докшыцкага раёна размясціў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” свае фотаздымкі з выявай нацыянальнага бел-чырвона-белага сцяга з сімвалам “Пагоні”. Гэтую так званую крамолу выявілі супрацоўнікі Докшыцкага РАУС, якія і затрымалі Дзмітрыя Слаўка і Міхаіла Надыкту і склалі на іх пратаколы.
У судзе мужчыны прызналі сваю віну, але ўсё адно атрымалі суткі арышту – 12 і 14 сутак адпаведна. Праўда, мабільныя тэлефоны ў іх докшыцкі суд не канфіскаваў.

**19.10.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 11 кастрычніка за праявы «экстрэмізму» і правядзенне недазволенага пікету ў сацыяльнай сетцы пакарала арыштам на 30 сутак кіроўцы далёкіх рэйсаў наваполачаніна Дзмітрыя Тарбеева.
У судзе былі агучаныя факты, якія выкрываюць Зміцера ў тым, што ў сацыяльнай сетцы «Instagram» меў спасылкі на канал «Радыё Свабода», інтэрнэт-старонку «Belsat», а таксама размяшчаў лагатыпы «БЕЛСАТ», «Краіна для жыцця» і «Радыё свабода - Беларусь». Усе гэтыя інтэрнэт-рэсурсы раней улады ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Акрамя таго, суд палічыў даказаным праведзеным мужчынам пікетаванне ў «Instagram» праз публікацыю фатаграфій, якія змяшчаюць выявы з сімволікай бел-чырвона-белага колеру.
Прыняўшы да ўвагі даказанасць віны і датычнасці Тарбоева ў здзяйсненні двух правапарушэнняў і кіруючыся ч.2 арт.19.11 КаАП і ч.1 арт.24.23 КаАП суддзя Балаболава пакарала Дзмітрыя за кожнае правапарушэнне арыштам па 15 сутак і склаўшы іх пастанавіла ўтрымліваць яго трыццаць сутак пад вартай.

**20.10.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 верасня за захоўванне ў сацыяльнай сетцы спасылку на «экстрэмісцкі» інфармацыйны канал пастанавіла арыштаваць на 15 сутак інжынер-канструктара завода «Палімір» Ірыну Баранаву.
Пры апытанні ў судзе Ірына ўказвала на тое, што яна сапраўды ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» мела асабістую старонку, дзе ёсць падпіска на суполку «Zerkalo.io». Пра тое, што названая супольнасць прызнана ўладамі прызнана экстрэмісцкай, ёй было вядома.
Гэтага прызнання Баранавай суддзёй Балаболавай было ўспрынята як доказ дачынення і вінаватасці «правапарушальніцы» ў распаўсюджванні экстрэмізму і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергла маладую жанчыну спагнанню ў выглядзе арышту тэрмінам на пятнаццаць сутак.

**21.10.2023**
19 кастрычніка жанчыну выклікаў на размову супрацоўнік Кастрычніцкага РАУС Віцебска Уладзіслаў Шышкавец. У выніку аб 11-й гадзіне на жанчыну склалі пратакол «за распаўсюд экстрэмісцкай інфармацыі» (па ч. 2 арт. 19.11 КаАП) — на яе старонках у сацсетках знайшлі спасылкі амаль трохгадовай даўніны на інфармацыйныя рэсурсы, якія цяпер прызнаныя «экстрэмісцкімі». Аднак у суд Людмілу Камінскую не накіравалі ні ў той самы дзень, ні на наступны. Пасля ночы ў ізалятары часовага ўтрымання яе зноў прывезлі ў райаддзел міліцыі і склалі яшчэ адзін пратакол па тым самым артыкуле. 20 кастрычніка жанчына збіралася адзначыць 60-гадовы юбілей. І яна цалкам магла б гэта зрабіць, каб суд прызначыў ёй штраф і адпусціў дадому. Але віцебская міліцыя праявіла сябе з найгоршага боку: на Людмілу Камінскую склалі другі пратакол за два дні і кінулі за краты на ўсе выходныя».
Пад увагу супрацоўнікаў міліцыі спадарыня Людміла трапіла не ўпершыню: яна была адной з шасці жанчын, якіх затрымалі ў студзені 2021 года ў прыгарадным лесе падчас заняткаў са скандынаўскімі палкамі. Міліцыянты вырашылі, што спадарыні, пераважна пенсійнага веку, выправіліся ў лес праводзіць несанкцыянаваную акцыю.

**23.10.2023**

Суддзя суда Аршанскага раёна і Оршы Святлана Кузьмічонак за падпіскі на «экстрэмісцкія» інфармацыйны рэсурсы ў сацыяльных сетках арыштавала на 15 сутак Сяргея Вальковіча. Гэта чацвёрты арышт былога работніка міліцыі запар. Сумарны тэрмін арыштаў ужо дасягнуў 37 сутак.
Падчас суда высветлілася, што Сяргей быў падпісаны ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» на каналы «Мая Краіна Беларусь», «Радыё Свабода» і «Белсат». Раней беларускімі ўладамі гэтыя крыніцы інфармацыі былі ўключаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

У судовым паседжанні мужчына сваю віну прызнаў цалкам, ад даследавання доказаў па справе адмовіўся.
У выніку, на падставе прызнання Вальковічам сваёй датычнасці і вінаватасці ў здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння, суддзя Кузьмічонак кіруючыся ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала былога міліцыянта арыштам тэрмінам на пятнаццаць сутак без канфіскацыі прылад і сродкаў правапарушэння.

**24.10.2023**

Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 верасня за распаўсюджванне «экстрэмізму» ў сацыяльных сетках пастанавіла арыштаваць на 15 сутак удзельніка валанцёрскага атрада «Сэрца Паліміра» работніка аддзела КІПиА гэтага прадпрыемства Юрыя Лінкевіча.
Пры апытанні ў судовым паседжанні мужчына прызнаўся ў тым, што ён на відэахостынгу "YouTube" меў падпіскі на каналы "Краіна для жыцця", "NEXTA Live". Тамака ён знаёміўся з навінамі. Пра тое, што названыя суполкі прызнаныя ўладамі экстрэмісцкімі, яму было вядома.
Для вынясення адміністрацыйнага спагнання для суддзі Балаболавай было дастаткова прызнання Лінкевіча. І таму яна на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала мужчыну арыштам тэрмінам на пятнаццаць сутак.

**25.10.2023**

Суддзя суда Аршанскага раёна і Оршы Святлана Кузьмічонак 9 кастрычніка за правядзенне несанкцыянаванага мясцовымі ўладамі пікетавання ў сацыяльнай сетцы арыштавала на 7 сутак мясцовую жыхарку Алену Енушэўскую, якая працуе вартаўніком на адным з прадпрыемстваў горада.
Згодна з пратаколам агляду, які паступіў у суд з мясцовага РАУС вынікае, што падчас прагляду тэлефона работнік міліцыі знайшоў на старонцы Янушэўскай у сацыяльнай сетцы «УКантакце» выявай сцяга бел-чырвона-белага колеру, герба «Пагоня» і лозунг «Жыве Беларусь».
Па запыце суда ўлады паведамілі аб тым, што ў перыяд з 22.08.2020 па 21.09.2023 кіраўніцтвам Аршанскага райвыканкама заяў на правядзенне якіх-небудзь масавых мерапрыемстваў не паступала, і дазволаў на іх правядзенне не выдавалася.
У судовым паседжанні Алена вінаватай сябе прызнала часткова. І патлумачыла, што ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» мелася яе асабістая старонка, на якой яна размясціла выяву БЧБ-сцяга.
Прызнанне гэтага факта суддзі Кузьмічонак было дастаткова, каб на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП пакараць Енушэўскую арыштам на тэрмін сем сутак.

**28.10.2023**

Суддзя суда Чашніцкага раёна Ганна Смірнова 27 кастрычніка за распаўсюджванне “экстрэмізму” і правядзенне масавага мерапрыемства ў сацыяльнай сетцы пакарала штрафам у памеры 1850 рублёў ксяндза Мікалай Ліпскі, які служыць у касцёле Святой Марыі Магдалены ў Навалукомлі Чашніцкага раёна.
У судовым паседжанні высветлілася, што Мікалай доўгі час у сацыяльных сетках быў падпісаны на інфармацыйныя рэсурсы, якія ўлады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Акрамя таго, работнікі мясцовага раённага аддзялення міліцыі выявілі ў святара розныя выявы бел-чырвона-белага сцяга, які ўлады лічаць сімвалам выказвання грамадзянамі сваіх грамадска палітычных поглядаў. А згодна з дзейным заканадаўствам дэманстрацыя фатаграфій БЧБ-сцяга ў сацыяльных сетках без дазволу ўладаў прыраўнена да правядзення незаконнага пікету.
Зыходзячы з фактычных матэрыялаў справы суддзя Смірнова на падставе ч.2. ст. 19.11 і ч.1 арт. 24.23 КаАП аштрафавала ксяндза Мікалая Ліпскага ў даход дзяржавы на агульную суму 1850 рублёў і канфіскавала ягоны тэлефонны апарат.

**28.10.2023**

Стала вядома, што справы прынамсі трох затрыманых разбірала 18 кастрычніка «знакамітая» суддзя Наваполацкага гарадскога суда Зінаіда Балаболава. Напярэдадні некалькі чалавек трапілі пад міліцэйскі «хапун» проста на прахадной, допіс пра гэта 17 кастрычніка размясціў адзін з прыватных Тэлеграм-каналаў, які сочыць за навінамі «Нафтана». Колькасць затрыманых там не была ўказана, але на сённяшні дзень вядома прынамсі пра трох пакараных арыштамі.
Двум «нафтанаўцам» Балаболава прысудзіла па 13 сутак арышту за наяўнасць на старонках ў «Одноклассниках» адной або некалькіх «экстрэмісцкіх» спасылак. Яшчэ аднаго калегу арыштавалі на 15 сутак за рэпосты з трох «экстрэмісцкіх крыніц». Усе трое асуджаны паводле ч. 2 арт. 19.11 КаАП.
Паводле міліцэйскіх пратаколаў, міліцыянты заўважылі прыкметы правапарушэння месяц таму, 15 верасня, але практычна месяц чакалі зручнага моманту – напэўна, каб затрымаць усіх трох чалавек за адзін раз.

Яшчэ аднаго работніка «Нафтана» суд прызнаў вінаватым у «несанкцыянаваным пікетаванні» паводле арт. 24.23 КаАП. Непасрэдна ў дзень затрымання на ягонай старонцы «ВКонтакте» знайшлі фотаздымкі з бел-чырвона-белымі сцягамі і надпісам «Белорусский протест: цепи без солидарности». Сваё віны падсудны не прызнаў.

**29.10.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 верасня за распаўсюджванне ў відэахостынгу і сацыяльнай сетцы інфармацыі «экстрэмісцкага» зместу пакарала арыштам на 15 сутак працаўніцу завода «Палімір» Алену Марцанюк.
У судовым паседжанні быў зачытаны пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні, у якім значылася, што Алена на сваёй старонцы мела на YouTube-канале спасылку на інфарэсурс «Euroradio Live». Акрамя таго, яна ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» была падпісаная на старонку «Zerkalo.io», а таксама ў яе меўся лагатып «Zerkalo.io».
Судом устаноўлена, што гэтыя рэсурсы ўлады лічаць экстрэмісцкімі і звесткі аб іх размешчаны ў рэспубліканскім спісе экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судзе "правапарушальніца" віну прызнала часткова, не адмаўляла таго, што на яе старонках у сацыяльных сетках "ВКонтакте" і "YouTube" меліся агучаныя падпіскі, але яна не лічыць, што такім чынам распаўсюджвала экстрэмісцкія матэрыялы.
Аднак суддзі Балаболавай было дастаткова прадстаўленым работнікамі міліцыі доказаў у здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння і на падставе ч.2 арт. 19.11 КаАП пастанавіла пакараць Марцанюк арыштам на 15 сутак.

**30.10.2023**
Суддзя суда Лёзненскага раёна Аляксей Лапушынскі за распаўсюджванне "экстрэмізму" ў сацыяльнай сетцы пакараў штрафам у памеры 999 рублёў работніцу сталічнай гандлёвай сеткі Кацярыну Крывічэнку. Па просьбе жанчыны разбіральніцтва адміністрацыйнай справы прайшло ў яе адсутнасць.
У судзе быў зачытаны пратакол, які паступіў з мясцовага аддзялення міліцыі, у якім гаварылася аб тым, што Алена ў сацыяльнай сетцы "Instagram" захоўвала інфармацыю з канала "Мая краіна Беларусь". Гэты канал раней рашэннем суда Чыгуначнага раёна Гомеля быў унесены ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
«Правапарушальніца хадайнічала аб разглядзе справы ў яе адсутнасць. Тым самым яна пазбавілася магчымасці абараніць сваё права пад час суда.
Нягледзячы на гэта, суддзя Лапушынскі на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пастанавіў пакараць Крывічэнку штрафам у даход дзяржавы ў суме 999 рублёў, а таксама канфіскаваў мабільны тэлефон, які ёй належаў.

**31.10.2023**



Жыхар Наваполацка быў пакараны адным годам разбаўлення волі ўмоўна. 28 верасня ў Наваполацкім гарадскім судзе 53-гадовага работніка “Нафтана” Іллю Двойрына прызналі вінаватым паводле ч. 1 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (хуліганства). Суддзя Віталь Лапко пакараў мужчыну за інцыдэнт, які здарыўся 1 ліпеня: паводле абвінавачання, Ілля Двойрын запэцкаў белай фарбай лабавое шкло машыны, на капоце і бакавінах якой былі намаляваныя вялікія літары «Z». Беларуская праваабарончая супольнасць заявіла, што лічыць Двойрына былым палітычным зняволеным: ён не меў гэтага статусу падчас утрымання за кратамі, але ягоная справа відавочна мае прыкметы палітычнай.
Праваабаронцы патрабуюць рэабілітацыі Іллі Двойрына па крымінальнай справе з кампенсацыяй усіх відаў шкоды, нанесенай адвольным асуджэннем і пазбаўленнем волі.
За свае перакананні Двойрын быў некалькі разоў абвінавачаны і ў адпаведнасці з адміністрацыйным заканадаўствам. Пад увагу сілавікоў мужчына трапіў яшчэ ў 2020г. - яго затрымлівалаі за ўдзел у пратэстах супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў.
Пасля затрымання за запэцканы аўтамабіль, які належаў вядомаму прарасейскаму актывісту Сяргею Юдаеву, Дома ў Двойрына правяліператрус, а праз 10 дзён асудзілі паводле арт. 24.23 за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне. У судзе быў агучаны пратакол, паводле якога Двойрын прызнаў, што

ўвесну 2023 года ён вырабіў улёткі з выявай прэзідэнта Расеі Уладзіміра Пуціна і тэкстам антываеннага характару, і 16 траўня расклеіў іх на прыпынку грамадскага транспарту ў Наваполацку. Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава пастанавіла пакараць мужчыну 15-цю суткамі арышту. Роўна праз тыдзень пасля таго, як Іллю Двойрына вызвалілі ў зале суду пасля разбіральніцтва па крымінальнай справе, ён быў зноў затрыманы. Яго прызналі вінаватым у распаўсюдзе так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў і асудзілі на 15 сутак.

## Лістапад

**01.11.2023**
Суддзя суда Браслаўскага раёна Аляксандр Вязіцкі 9 кастрычніка за распаўсюд «экстрэмісцкай» інфармацыі ў сацыяльных сетках пакараў адміністрацыйным арыштам на 10 сутак машыніста Пятра Ластоўскага.
Судовым паседжанні быў зачытаны пратакол адміністрацыйнага правапарушэння, у якім супрацоўнікі міліцыі паведамлялі аб тым, што Аляксандр у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» размяшчаў і захоўваў інфармацыю, якую суды ў нядаўнім мінулым залічылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Прыняўшы як доказ датычнасці здзяйснення правапарушэння прызнання віны, суддзя Вязіцкі на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакараў Ластоўскага арыштам тэрмінам на 10 сутак. Акрамя таго, суддзя ўлічыў, што ў якасці сродку здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння мужчына выкарыстаў прыналежны яму мабільны тэлефон, і канфіскаваў у бязвыплатную ўласнасць дзяржавы гаджэт «правапарушальніка».

**04.11.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 27 кастрычніка за правядзенне несанкцыянаванага ўладамі пікетавання пакарала адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 13 сутак шматдзетнага бацьку Дзмітрыя Старажова.
Пры апытанні ў судовым пасяджэнні Дзмітрый указаў, што ў сацыяльнай сетцы «Instagram» сваёй асабістай старонцы ў верасні 2021 года размясціў публікацыю, якая змяшчае фатаграфію яго і траіх мужчын, да якой ён замацаваў хэштэг «#жывебеларусьСабраліся!»
Разгледзеўшы ўсе доказы, суддзя прыйшла да думкі, што мужчына гэтай публікацыяй хацеў паказаць сваю цікавасць да падзей і грамадскага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь, нават тады, калі ў кастрычніку 2023 года сваю публікацыю выдаліў.
Зыходзячы з наяўных пераканаўчых доказаў віны «правапарушальніка» суддзя Болоболова на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП пастанавіла арыштаваць Старажова тэрмінам на трынаццаць сутак.

**05.11.2023**
Затрыманне адбылося 3 лістапада, у той самы дзень сужонцаў асудзілі – Аляксандра Цырыкава паводле арт. 24.23 КаАП (несанкцыянаванае пікетаванне), яго жонку Ніну – паводле ч. 2 арт. 19.11 КаАП (распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў). Паколькі мужчына ўэл другі дзень не з‘‘яўляецца ў сацсетках, можна меркаваць, што ён пад арыштам.
Аляксандра Цырыкава судзіла суддзя Расонскага райсуду Алена Елавая, Ніну Цырыкаву – суддзя Рада Дамініч.
Пастар царквы ХВЕ «Благодать» - індывідуальны прадпрымальнік. Менавіта ў гэтай якасці яго згадвала на сваіх старонках раённая газета «Голас Расоншчыны», калі пісала пра яго як мецэната і ўдзельніка рознага кшталту дабрачынных мерапрыемстваў. Яго жонка працуе гандляркай у краме. У пары трое дарослых дзяцей, летась Аляксандр і Ніна Цырыкавы адзначылі срэбнае вяселле.

**05.11.2023**
Суддзя суда Глыбоцкага раёна Аляксандр Аляксеенка 23 кастрычніка за распаўсюджванне "экстрэмісцкіх" матэрыялаў у сацыяльнай сетцы пакараў арыштам тэрмінам на 10 сутак мясцовага жыхара непрацуючага Аляксандра Барана.
У судовым паседжанні Аляксандр сваю віну ў здзяйсненні ўказанага адміністрацыйнага правапарушэння прызнаў часткова, наяўныя па справе доказы не аспрэчваў, указаў, што зарэгістраваны ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі», дзе ў сваёй старонцы размясціў, лайкаючы публікацыі з рэсурсаў ТБ «Белсат» і «Орша97% ». Названыя публікацыі размяшчаў у сацыяльных сетках па месцы свайго жыхарства.
Праверыўшы і даследаваўшы прыведзеныя доказы, суддзя Аляксеенка прыйшоў да высновы, што дачыненне і віна Барана даказана і на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП пастанавіў арыштаваць мужчыну на дзесяць сутак.

**07.11.2023**



Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 7 верасня за распаўсюджванне ў сацыяльнай сетцы публікацый «экстрэмісцкай» скіраванасці пакарала арыштам на 15 сутак інжынера-канструктара ААТ «Нафтан» завода «Палімір» Аляксея Стому. У судовым паседжанні мужчына віну прызнаў, не адмаўляў таго, што на ягонай персанальнай старонцы ў сацыяльнай сетцы «Twitter» мелася падпіска на суполку «Tribuna.com Беларусь». Таксама ён паведаміў аб тым, што гэтая супольнасць прызнаная ўладамі экстрэмісцкім матэрыялам, яму не было вядома.

Прызнанне «правапарушальнікам сваёй віны і датычнасці да распаўсюджвання «экстрэмізму» суддзі Балаболавай было дастаткова, каб на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергнуць Стому да адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе арышту тэрмінам на пятнаццаць сутак.

**07.11.2023**

Рашэннем адміністрацыі папраўчай калоніі № 9 (г. Горкі) праваабаронцу лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру Алеся Бяляцкага змясцілі ў ПКТ. Што стала падставай ізаляцыі палітвязня і за якія парушэнні рэжыму адбыцця пакарання стане вядома, калі ўлады дазволяць яму сустрэцца з адвакатам. Пра гэта паведаміла ягоная жонка Наталля Пінчук падчас выступу на Сусветным форуме за дэмакратыю ў Страсбургу.

Нагадаем, пра тое, што ў сакавіку 2023 года Нобелеўскага лаўрэата і кіраўніка праваабарончага цэнтра "Вясна" Алеся Бяляцкага прыгаварылі да 10 гадоў калоніі.

2 траўня 2023 года стала вядома, што праваабаронцу Алеся Бяляцкага перавялі з СІЗА-1 у папраўчую калонію № 9 у Горках. Тамака ён працаваў на дрэваапрацоўцы. Цяпер стала вядома, што па надуманых прычынах яго ізалявалі ў ПКТ і не даюць сустрэцца з адвакатам.

**08.11.2023**

Суддзя суда Лепельскага раёна Дзмітрый Васюк 23 кастрычніка за правядзенне несанкцыянаванага ўладамі пікетавання і распаўсюджванне "экстрэмізму" ў сацыяльнай сетцы пакараў у выглядзе адміністрацыйнага арышту тэрмінам на 11 сутак цырульніцу і адміністратара Евангельскай царквы 65-гадовую Вольгу Мадатаву.

У судзе быў агучаны пратакол мясцовага РАУС, у якім было напісана, што Вольга без дазволу кіраўніцтва Лепельскага райвыканкама правяла пікетаванне з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў. Гэта выявілася ў тым, што яна на асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы «Фэйсбук» была падпісаная на групу, на лагіне якой размешчана «пратэстная сімволіка» - бел-чырвона-белы сцяг і выява вершніка на кані з мячом і шчытом у руках.

Акрамя таго, там жа ў раздзеле "ўсе адзнакі "падабаецца" захоўвала з мэтай распаўсюджвання інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў".

Суддзя Васюк палічыў, што матэрыяламі, якія паступілі з міліцыі, даказана віна і дачыненне да здзяйснення Мадатавай улічаных ёй правапарушэнняў.

І на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП і ч.2 арт.19.11КаАП суддзя пакараў жанчыну на дзесяць сутак па кожным артыкуле. Шляхам частковага складання канчаткова вызначыў ёй спагнанне ў выглядзе арышту на тэрмін у 11 сутак.

**09.11.2023**

Суддзя суда Талачынскага раёна Алеся Саян 1 верасня за распаўсюджванне ў сацыяльнай сетцы публікацый экстрэмісцкага зместу пакарала арыштам на 10 сутак беспрацоўнага Уладзіміра Казакевіча.

У судовым паседжанні мужчына не адмаўляў, што ён з 2019 года ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» ў сваім акаўнце захоўваў для распаўсюджвання інфармацыйныя матэрыялы рэсурсаў «Радыё Свабода» і «Люстэрка», якія ўлады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

На падставе прызнання «правапарушальнікам» сваёй віны суддзя Саян на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП пастанавіла падвергнуць Казакевіча спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на тэрмін дзесяць сутак, а таксама канфіскавала ў даход дзяржавы ягоны мабільны тэлефон.

**11.11.2023**



Пра гэта паведаміла «Хрысціянская візія». Паводле звестак рэсурсу, затрыманага 6 лістапада пастара чашніцкай царквы ХВЕ прызналі вінаватым у распаўсюдзе так званай «экстрэмісцкай» інфармацыйнай прадукцыі паводле ч.2 арт.19.11. Суд пакараў святара 10-ю суткамі арышту.
Аляксандра Плотнікава затрымалі 6 лістапада. За некалькі дзён да гэтага быў затрыманы Аляксандр Цырыкаў, пастар царквы ХВЕ ў Расонах. Цырыкава затрымалі разам з жонкай Нінай. Пазней стала вядома, што яе судзілі паводле ч. 2 арт. 19.11 КаАП (распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў), мужа-святара - паводле арт. 24.23 КаАП (несанкцыянаванае пікетаванне).

**12.11.2023**
Суддзя суда Талачынскага раёна Алеся Саян за распаўсюджванне публікацый экстрэмісцкага зместу пастанавіў аштрафаваць на 740 рублёў слесара-рамонтніка інваліда 3-й групы Віктара Лацінскага. У 2012 годзе Віктар Уладзіміравіч быў сябрам участковай выбарчай камісіі ад жыхароў в. Рэчкі.
У судовым паседжанні быў агучаны факт таго, што Віктар у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі», выкарыстоўваючы свой рахунак са жніўня 2020 года захоўваў публікацыі, атрыманыя з інтэрнэт-старонкі «Афіцыйная група Хартыя’97». Раней гэтая група ўладамі была ўключаная ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. У судовым паседжанні мужчына віну і дачыненне прызнаў часткова.
Гэтага прызнання для суддзі Саян было дастаткова для таго, каб на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП пакараць Лапцінскага штрафам у суме 740 рублёў і канфіскаваць у даход дзяржавы належны яму тэлефонны апарат.

**13.11.2023**
Суддзя суда Чашніцкага раёна Васіль Коваль 26 кастрычніка за распаўсюджванне ў сацыяльнай сетцы “экстрэмісцкіх” публікацый пакараў штрафам у памеры 1110 рублёў урача-тэрапеўта Новалукомльскай цэнтральнай раённай бальніцы Валянціну Залескую.
Згодна з пратаколам аб адміністрацыйным правапарушэнне, які паступіў у суд з мясцовага РАУС, Валянціна размясціла і захоўвала ў свабодным доступе на сваёй персанальнай старонцы ў сацыяльнай сетцы «Facebook» з інфармацыю інфармацыю з трох супольнасцяў, якія ўлады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні «правапарушальніца» віну ў здзейсненым правапарушэнні прызнала, і патлумачыла, што мела старонку ў сацыяльнай сетцы і там жа ставіла адзнакі «падабаецца» на розныя групы, аднак не ведала, што яны прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі.
Довады вінаватай у распаўсюдзе «экстрэмізму» не пераканалі суддзю Коваля і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП ён аштрафаваў Залескую ў даход дзяржавы на суму ў 1110 рублёў.

**14.11.2023**
Жыхарка Паставаў, асуджаная на два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму, вызвалілася па сцячэнні тэрміна пакарання ў лістападзе мінулага году. Па вызваленні ёй быў прызначаны прэвентыўны нагляд на адзін год. 13 лістапада суддзя Пастаўскага раённага суду Наталля Жукава працягнула жанчыне прэвентыўны нагляд яшчэ на два гады.
У красавіку 2021г. Ірыну Паляніну асудзілі за тое, што у снежні 2021г. года жанчына размясціла абразлівы каментар у сацыяльнай сетцы пад фотаздымкам начальніка Пастаўскага РАУС Аляксандра Рыбакова ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Дома ў Палянінай сілавікі правялі агляд, падчас якога знайшлі некалькі патронаў ад малакаліберной вінтоўкі. Жанчына тлумачыла, што яны належалі яе бацьку-нябожчыку, але яе прызналі вінаватай і ў незаконным захоўванні зброі і боепрыпасаў.
Шляхам частковага складання пакаранняў: паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса (Абраза прадстаўніка ўлады) і арт. 295 Крымінальнага кодэкса (Незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў) Ірыну Палякову асудзілі да двух гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Ірына Паляніна адбывала тэрмін у жаночай калоніі № 24 (Зарэчча, Рэчыцкі раён).
27 траўня 2021 г. беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Ірыну Паляніну палітычнай зняволенай. 11 лістапада 2022 года, за дзесяць дзён да выхаду з калоніі, яе ўключылі ў спіс асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці.

**15.11.2023**



Суддзя суда Кастрычніцкага раёна Віцебска Уладзімір Царыкаў 2 лістапада за распаўсюд “экстрэмісцкіх” публікацый у сацыяльнай сетцы паўторна арыштаваў на 15 сутак «Чалавек года Віцебшчыны — 2014», загадчыца аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі абласной бальніцы Аляксандра Ганчарова. Суддзя суда Віцебскага абласнога суда Святлана Іванова 10 лістапада разгледзела скаргу доктара ў апеляцыйным парадку пакінула яе без задавальнення, а пастанову суда першай інстанцыі без змены.

Першы раз Аляксандр быў затрыманы па адміністрацыйнай справе па распаўсюджванні "экстрэмізму" 11 кастрычніка і неўзабаве па рашэнні суда Кастрычніцкага раёна на падставе ч.2. ст. 19/11 быў пакараны адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 15 сутак.

Пры паўторнай праверцы работнікамі міліцыі гаджэтаў Ганчарова імі быў складзены яшчэ адны пратакол па адміністрацыйным правапарушэнні, звязаным з распаўсюджваннем "экстрэмізму" ў Інтэрнеце. На падставе гэтага пратаколу судзьдзя Царыкаў пастанавіў пакараць доктара арыштам яшчэ на 15 сутак. Суддзя Вітаблсуда Іванова, якая не знайшла парушэнняў у рашэнні ніжэйстаячага суда, пакінула скаргу Аляксандра без задавальнення.

**16.11.2023**

Суддзя суда Аршанскага раёна Юлія Вяршыніна 9 лістапада за падпіску ў сацыяльнай сетцы на "экстрэмісцкія" інфармацыйныя рэсурсы пастанавіла арыштаваць на 15 сутак прыёмшчыка цягнікоў ст. Орша Ігара Туранскага.

Падчас разбору ў судзе мужчына прызнаў сваё дачыненне і віну ў тым, што ён працяглы час у сацыяльнай сетцы “Instagram” быў падпісаны на розныя СМІ і суполкі, такія як “Радыё Свабода”, “Люстэрка”, “Белсат”, “Еўрарадыё” і суполку пра татуіроўкі «bodi of belarus». Ігар растлумачыў суду, што не ведаў аб тым, гэтыя інфармацыйныя прадукты раней уладамі былі ўключаны ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Пры вынясенні пакарання суддзя Вяршыніна ўлічыла прызнанне "правапарушальнікам" віны і наяўнасць у яго на ўтрыманні малалетняга дзіцяці. І на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пастанавіла максімальна пакараць Турынскага на 15 сутак і канфіскавала ў даход дзяржавы, які належыць яму тэлефонны апарат.

**17.11.2023**

Ягор Маціенка, зарэгістраваны ў садаводчым таварыстве «Аўтамабіліст», быў асуджаны 2 лістапада: суддзя суду горада Оршы і Аршанскага раёну Юлія Вяршыніна прызнала яго вінаватым паводле ч.2 арт.19.11 КаАП РБ (Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая ўтрымлівае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуе такую дзеянасць». Суд вырашыў канфіскаваць у жыхара Аршаншчыны і мабільны тэлефон – як сродак здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння.

У судовым пасяджэнні разглядаліся два пратаколы, складзеныя на Ягора Маціенку. Паводле першага, мужчына быў падпісаны ў Instagram на старонку, прызнаную экстрэмісцкімі матэрыяламі, а таксама вёў перапіску з адміністратарам гэтай старонкі. Паводле другога, Маціенка быў падпісаны на групу ў Telegram, таксама прызнаную экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыяй.

У судзе ён прызнаў гэтыя факты, патлумачыўшы, што не ведаў пра тое, што дадзеныя інтэрнэт-рэсурсы ўключаны ў адпаведны пералік МУС. Суддзя не прыняла да ўвагі аргіментацыю падсуднага і вырашыла, што беспрацоўны Ягор Мацвіенка, які мае базавую адукацыю, меў на мэце распаўсюджваць экстрэмісцкія матэрыялы, дзеля чаго і захоўваў іх у сваім тэлефоне Nokia. Гэты тэлефон па рашэнні суду ў яго забралі.

**19.11.2023**

Суддзя суда Глыбоцкага раёна Аляксандр Аляксеенка працягвае глыбачан караць штрафамі і суткамі па “народным артыкуле”.

19 кастрычніка ён пакараў 20 базавымі велічынямі штрафу (740 беларускіх рублёў) прыбіральшчыцу з Глыбокага за тое, што яна ў сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” на сваёй старонцы размясціла інфармацыйную прадукцыю з сайта “Зеркало”, якую ўлады ўнеслі ў так званы спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Судзілі глыбачанку па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапаганду такой дзейнасці).

У судзе жанчына сваю віну прызнала. Тэлефон у яе не канфіскавалі.
Праз некалькі дзён, 23 кастрычніка, усё той жа суддзя Аляксандр Аляксеенка асудзіў непрацуючага глыбачаніна па тым жа артыкуле – частка 2 19.11 КаАП. Мужчыну вінавацілі ў тым, што ён таксама на сваёй старонцы размясціў матэрыялы з некалькіх рэсурсаў, якія ўлады прызналі "экстрэмісцкімі". Да таго ж яму ставілі яшчэ ў віну, што ён размясціў выяву факела аранжавага колеру (лагатып "Радыё Свабоды"), якая таксама прызнаная ўладамі экстрэмісцкім матэрыялам.
Глыбачанін таксама ў судзе прызнаў сваю віну, тэлефон у яго не канфіскавалі, і прызначаны тэрмін арышту ён ужо адседзеў.

**20.11.2023**



Як стала вядома, 30 кастрычніка суддзя Глыбоцкага суда Аляксандр Аляксеенка пакараў 10 суткамі глыбачаніна Сяргея Троцкага, начальніка гаспадарчага аддзела Глыбоцкага філіяла РУП "Віцебскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры" паводле часткі 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапаганду такой дзейнасці).
Пакаралі мужчыну за тое, што ён на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках "Аднакласнікі" размясціў "экстрэмісцкі матэрыял", які ўлады праз Барысаўскі суд уключылі ў так званы спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. А таксама прадукцыю Youtube-канала, якую ўжо суд Мінскага раёна прызнаў "экстрэмісцкай".
У судзе Троцкі прызнаў сваю віну часткова, але ўсё адно суддзя Глыбоцкага суда пакараў яго 10 суткамі арышту. Мабільны тэлефон не быў канфіскаваны, яго вярнулі ўладальніку. Але пасады начальніка гаспадарчага аддзела Глыбоцкага філіяла РУП "Віцебскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры" малады чалавек быў пазбаўлены.

**21.11.2023**

Суддзя суда Глыбоцкага раёна Андрэй Тарасевіч 8 лістапада за распаўсюд у сацыяльнай сетцы публікацый «экстрэмісцкай» скіраванасці пастанавіў арыштаваць на 10 сутак Зміцера Бажкова.
У судовым паседжанні Зміцер прызнаўся ў зробленым правапарушэнні і прызнаў сваё да яго дачыненне і віну. З яго слоў стала вядома, што ён быў зарэгістраваны ў сацыяльнай сетцы «Facebook» знаходзілася ў адкрытым доступе інфармацыйная прадукцыя інтэрнэт-рэсурсаў «БелСат» і «Радыё Свабода». Ён растлумачыў суду, што не ведаў, што гэтыя рэсурсы ўлады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Грунтуючыся на прызнаннях «правапарушальніка» і кіруючыся ч.2 арт.19.11 КаАП суддзя Тарасевіч пакараў Бажкова арыштам на тэрмін у дзесяць сутак і канфіскаваў у даход дзяржавы ягоны тэлефон.

**22.11.2023**

17 лістапада суд Пастаўскага раёна прызнаў жанчыну вінаватай паводле ч.2 арт. 19.11 КаАП : у яе сацыяльных сетках міліцыянты знайшлі рэпосты з некалькіх інфармацыйных рэсурсаў, прызнаных МУС экстрэмісцкай інфармацыйнай прадукцыяй. За некалькі дзён да таго, 13 лістапада, Ірыне Палянінай быў працягнуты прэвентыўны нагляд яшчэ на два гады – пасля першага году па вызваленні з калоніі.
У красавіку 2021г. жыхарку Паставаў асудзілі за тое, што у снежні таго ж года яна размясціла абразлівы каментар у сацыяльнай сетцы пад фотаздымкам начальніка Пастаўскага РАУС Аляксандра Рыбакова ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Дома ў Палянінай сілавікі правялі агляд, падчас якога знайшлі некалькі патронаў ад малакаліберная вінтоўкі. Жанчына тлумачыла, што яны належалі яе бацьку-нябожчыку, але яе прызналі вінаватай і ў незаконным захоўванні зброі і боепрыпасаў.
Шляхам частковага складання пакаранняў: паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса (Абраза прадстаўніка ўлады) і арт. 295 Крымінальнага кодэкса (Незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў) Ірыну Палякову асудзілі да двух гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Ірына Паляніна адбывала тэрмін у жаночай калоніі № 24 (Зарэчча, Рэчыцкі раён).
27 траўня 2021 г. беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Ірыну Паляніну палітычнай зняволенай. 11 лістапада 2022 года, за дзесяць дзён да выхаду з калоніі, яе ўключылі ў спіс асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці.

**23.11.2023**

Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебску Наталля Карабліна 26 кастрычніка за распаўсюд у мэсэнджэры публікацыі «экстрэмісцкага» зместу пакарала штрафам у памеры 1110 рублёў індывідуальнага прадпрымальніка Сяргея Канцавога.
У судзе Сяргей прызнаўся ў тым, што ён быў зарэгістраваны ў мэсэнджэры Тэлеграм і ў telegram-групе размясціў інфармацыйную прадукцыю суполак Белсат, Нехта, “Радыё Свабода”. Ён растлумачыў, што на момант размяшчэння гэтая інфармацыйная прадукцыя не з'яўлялася экстрэмісцкай і з-за гэтага своечасова яе не выдаліў.
Тым не менш, суддзя Карабліна палічыла, што прадпрымальнік учыніў правапарушэнне, прадугледжанае ч.2 арт.19.11 КаАП і пастанавіла аштрафаваць Канцавога ў даход дзяржавы на 30 базавых велічынь на суму 1 110 рублёў без канфіскацыі сродку ўчынення адміністрацыйнага правапарушэння. Пры вынясенні пакарання суддзя ўлічыла, што на ўтрыманні "правапарушальніка" знаходзяцца трое дзяцей.

**24.11.2023**

Суддзя суда Верхнядзвінскага раёна Таццяна Кукліна 3 лістапада за распаўсюджванне ў сацыяльнай сетцы відэаматэрыялаў «экстрэмісцкага» зместу аштрафавала на 1110 рублёў 64-гадовую Наталлю Афанасенка.
У судзе было ўсталяванае дачыненне і вінаватасць Наталлі Уладзіміраўны да таго, што яна ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» размясціла відэазапіс Ютуб-канала «Радыё Свабода» і інтэрнэт-сайта групы «Хартыя 97». У сакавіку 2022 года судамі гэтыя інфармацыйныя рэсурсы білі ўнесены ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Грунтуючыся на прызнанні віны і кіруючыся ч.2 арт.19.11 КаАП, суддзя Кукліна пастанавіла прызначыць Афанасенка штраф памерам 30 базавых велічынь на суму 1110 рублёў.

**25.11.2023**



Суддзя суда Дубровенскага раёна Ігар Татаеў 17 лістапада за падпіску ў сацыяльных сетках на «экстрэмісцкія» матэрыялы пакарала арыштам на адныя суткі кантралёра-касіра крамы «Капяечка» Таццяну Кароль.
У судзе стала вядома, што Таццяна тры гады была падпісаная ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» інтэрнэт-супольнасць з назвай «STOP LUKA» і старонку «Усё аб Дуброўна». Раней гэтыя інфармацыйныя СМІ ўладамі былі прызнаны экстрэмісцкімі і занесены ў адпаведны дзяржаўны рэестр забароненых.
«Правапарушальніца» ў судовым паседжанні віну прызнала цалкам, ад даследавання доказаў адмовілася.
Суддзя Татаеў палічыў віну і дачыненне маладой жанчыны даказанымі і на падставе ч. 2 арт.19.11 КаАП пастанавіў арыштаваць Кароль на адны суткі.

**26.11.2023**

У Шумілінскім райсудзе 8 лістапада быў асуджаны жыхар Віцебска, прадпрымальнік Аляксей Пярцоў. Ён прызнаны вінаватым за тое, што на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» захоўваў выявы «белай сняжынкі на блакітным фоне» ( лагатып канала «ПЛАТФОРМА ГОЛОС НОВОСТИ») і «выяву шэрага кубка на зяленым коле, у цэнтры якога ёсць малюнак маліны белага колера» ( лагатым канала «Чай з малінавым варэннем»). Гэтае мастацкае апісанне выкладзена ў судовым рашэнні, гучаным старшынёй Шумілінскага райсуду Іннай Грабоўскай, нядаўна прызначанай на гэтую пасаду і пераведзенай у райцэнтр з віцебскага суда Кастрычніцкага раёна.
У пратаколе, складзеным міліцыянтамі, значылася, што жыхар Віцебска захоўваў гэтыя выявы «з мэтай распаўсюду. Аляксей Пярцоў прызнаў сваю віну і не аспрэчваў доказаў, прадастаўленых сілавікамі. Суддзя пакарала мужчыну штрафам памерам 20 базавых велічынь (740 рублёў).

**29.11.2023**

Накладзены арышт на маёмасць праваабаронцы і рэдактара Аршанскага незалежнага сайта Ігара Казмерчака. Падставай для такога рашэння паслужыла крымінальная справа за абразу Лукашэнкі (ч.1 арт 368 КК), узбуджаная яшчэ ў 2022 годзе. Тады ж Ігара абвясцілі ў міждзяржаўны вышук, а ягоныя фотаздымкі з’явіліся на стэндах "Іх расшуквае міліцыя".
Пра арышт кватэры праваабаронца даведаўся выпадкова, калі на ягоны беларускі адрас прыйшоў ліст

з Віцебскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру. Рашэнне прынятае на падставе пастановы Аршанскага аддзела Следчага камітэта, датаванага 13 лістапада. Нагадаем, што Ігар Казмерчак з'ехаў з краіны яшчэ ў 2021 годзе.

**29.11.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч за падпіску ў сацыяльнай сетцы на «экстрэмісцкае» СМІ пастанавіла арыштаваць на трое сутак галоўны ветурача раёна Аляксандра Кезіка.
У судовым паседжанні Аляксандр віну прызнаў і растлумачыў, што не аспрэчвае факта падпіскі ў сацыяльнай сетцы «Instagram» на інфармацыйны рэсурс «Люстэрка», які ўлады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Суддзя Яскевіч прыняла да ўвагі прызнанне віны, наяўнасць у «правапарушальніка» сталага месца працы і тое, што ў яго ёсць непаўналетняя дачка і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала Кезіка адміністрацыйным арыштам на 3 сутак.

## Снежань

**01.12.2023**
У чацвер, 30 лістапада, прадстаўнікі адной праваахоўных структур прыйшлі ў будынак Віцебскай ТРК, правялі ператрус у кабінеце галоўнага рэжысёра Сяргея Арлова, пасля чаго яго затрымалі. Яшчэ адзін ператрус быў праведзены па месту жыхарства затрыманага. Што прычынілася цікавасці следчых органаў да персоны галоўнага рэдактара дзяржкампаніі ўлады пакуль не паведамілі.
Сяргей Арлоў – дырэктар тэлеканалу «6ТВК» і арганізатар рэгіянальнага тэлеканалу «Віцебск». Акрамя таго, стваральнік шматлікіх дакументальных фільмаў і праграмаў. Найбольш вядомая ягоная стужка «Еўфрасіння Полацкая», а ягоны цыкл «Сямейны альбом» стаў пераможцам Міжнароднага каталіцкага фестывалю хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграмаў «Magnificat».
Сяргей – акадэмік Еўразійскай акадэміі тэлебачання і радыё. Быў арганізатарам тэлемарафону для збору сродкаў на аднаўленне Свята-Пакроўскага кафедральнага сабору.

**02.12.2023**

У апошні дзень лістапада стала вядома пра затрыманні Анатоля Трубкіна і Інэссы Ворыхавай. 66-гадоваму Анатолю Трубкіну, бацьку Аляксея Трубкіна, які з 2006 года жыве ў Польшчы, 1 снежня прысудзілі арышт, не зважаючы на стан ягонага здароўя: ён інвалід па зроку, хварэе на дыябет, а нядаўна перанёс інсульт. Напярэдадні сілавікі правілі перагрус у ягонай кватэры, з 30 лістапада мужчына знаходзіцца за кратамі. Пра тое, у чым менавіта яго звінавацілі, звестак пакуль няма.
Інэссу Ворыхаву, маці Маргарыты Ворыхавай, дарадцы Святланы Ціханоўскай па сацыяльнай палітыцы, таксама асудзілі на 15 сутак. Пра гэта паведаміў блізкі да сілавікоў тэлеграм-канал «Книга ГУ"БАЗА"», зазначыўшы, што да арышту яе асудзілі « у якасці папярэджання за рассылкі і рэпосты». Праваабаронцы мяркуюць, што вядзецца пра артыкул 10.11 КаАП (распаўсюд інфармацыі, прызнанай «экстрэмісцкай»).
Інэсу Ворыхаву таксама затрымалі 30 лістапада, паводле яе знаёмых, жанчыну затрымлівалі АМАП проста на працы. Каля чатырох гадзін яе дапытвалі і складалі пратакол, потым завезлі ў Наваполацкі ЦІП. Суд над жанчынай адбыўся 1 снежня.

**03.12.2023**
Суддзя Віцебскага абласнога суда Наталля Рошчына 17 лістапада разглядзела апеляцыйную скаргу Аляксандра Шарабайкі на прысуд суддзя суда Глыбоцкага раёна Андрэя Тарасевіча па арт. 368 Крымінальнага кодэкса (Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Суддзя Рошчына пакаранне Аляксандру 1,5 гады пазбаўленне волі аставіла без змены, а скаргу без задавальнення. Аляксандра Шарабайку затрымалі ў Глыбокім. Ён вядомы бодзібілдар. Раней мужчына затрымліваўся за ўдзел у акцыях пратэсту. Але 16 сакавіка 2023 года ўлады яго зноў арыштавалі за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» і пакаралі адміністрацыйным арыштам на 10 сутак. Аднак пасля адбыцця арышта Шарабайка не выйшаў на волю і быў пераведзены ў СІЗА з-за таго, што ў дачыненні да яго была заведзеная крымінальная справа за нібыта абразу А. Лукашэнкі. 14 верасня 2023 года суд Глыбоцкага раёна прызнаў спартсмена вінаватым у абразе кіраўніка беларускай дзяржавы і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі 1 год і 6 месяцаў калоніі з агульным рэжымам адбывання пакарання. Прыгавор вынес Андрэй Тарасевіч. Цяпер прысуд набыў законную моц і неўзабаве Шарабайку адправяць ў адну з беларускіх калоній. З улікам таго, што Аляксандр больш за 8 месяцаў утрымліваўся ў СІЗА, яму

засталося знаходзіцца ў зняволенні каля шасці месяцаў.

**04.12.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 24 лістапада за распаўсюд «экстрэмісцкіх» публікацый у сацыяльнай сетцы пастанавіла арыштаваць на чацвёра сутак беспрацоўнага мясцовага жыхара былога начальніка аддзела рэалізацыі і маркетынгу Міёрскага мясакамбіната Анатоля Мізера. У судовым паседжанні Анатоль віну прызнаў і патлумачыў, што не аспрэчвае факту знаходжання ў яго профілі ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» інфармацыйнай прадукцыі, прызнанай рашэннем суда экстрэмісцкай. Пры гэтым прасіў суддзю пры вынясенні рашэння ўлічыць, што названая інфармацыя ім была размешчана ў той момант, калі яна не была прызнана ўладамі экстрэмісцкай і таму выпадкова адзначыў, як упадабаную. Тым не менш, суддзя Яскевіч на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакарала Мізэра адміністрацыйным арыштам тэрмінам на чацвёра сутак. Пры вынясенні пастановы яна ўлічыла, што «правапарушальнік» мае на ўтрыманні непаўналетняга сына.

**05.12.2023**
Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Наталля Карабліна 16 лістапада за захоўванне ў сацыяльнай сетцы «экстрэмісцкую» інфармацыйную прадукцыю пакарала штрафам у памеры 925 рублёў лекара з Віцебску Антонаву.
У судовым паседжанні «правапарушальніца» прызнала віну ў здзяйсненні адміністрацыйнай правінасці і паведаміла суду, што была зарэгістраваная ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» некалькі гадоў таму і ў асабістым акаўнце размясціла публікацыі суполкі «TUT.BY». Аднак на момант размяшчэння гэтая інфармацыйная прадукцыя не з'яўлялася экстрэмісцкай. Па гэтай прычыне яна не выдаліла яе, бо забылася пра падпіскі. Па гэтай прычыне ў зробленым раскаялася. Зыходзячы з прызнання віны і раскаяння, а таксама з таго, што жанчына на ўтрыманні мае малалетняе дзіця, суддзя Карабліна на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пастанавіла падвергнуць лекара Антонаву адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў даход дзяржавы ў памеры 25 базавых велічынь на суму 925 рублёў.

**06.12.2023**
Як стала вядома, 20 лістапада ў Глыбокім судзілі ўраджэнку Прыморскага краю Расіі, якая ўжо шмат год жыве ў Беларусі, Алену Крыўко. Суддзя Аляксандр Аляксеенка судзіў 61-гадовую жанчыну па двух артыкулах - частцы 1 артыкула 24.23 КаАП РБ (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) і па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП РБ (Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць). У віну ёй ставілася тое, што яна на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” размясціла, то бок лайкнула, некалькі матэрыялаў з недзяржаўных СМІ, якія ўлады ўключылі ў так званы спіс “экстрэмістаў”. Алену Крыўко абвінавацілі і ў адзіночным пікеце без дазволу глыбоцкіх уладаў, бо яна ў адкрытым доступе ўсё ў той жа сетцы размясціла і захоўвала публікацыю з выявай нацыянальнага сцяга белчырвона-белага колеру. Такім чынам жанчына, па меркаванні ўладаў, выказала асабістыя погляды на падзеі грамадска-палітычнага жыцця ў краіне.
Паводле часткі 2 артыкула 19.11 КаАП РБ суддзя Аляксеенка прысудзіў глыбачанцы 5 сутак арышту, а па частцы 1 артыкула 24.23 КаАП РБ – 3 сутак, што агулам склала 8 сутак арышту. Тэлефон у Алены Крыўко суд не канфіскаваў.

**06.12.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 22 лістапада за падпіску ў сацыяльных сетках на "экстрэмісцкі" інфармацыйны рэсурс пакарала штрафам у памеры 740 рублёў работніцу міёрскай бальніцы Алену Шук. У судзе стала вядома аб тым, што Алена ў сваім асабістым профілі сацыяльнай сеткі "Instagram" размясціла і захоўвала з мэтай распаўсюджвання публікацыі з інфарэсурса "Люстэрка"». Раней гэта інтэрнэтвыданне ўлады ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні жанчына віну прызнала і пакаялася ў зробленым. Улічваючы гэта, суддзя Яскевіч, на падставе ч.2 арт.19.11 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, пакарала Шук штрафам у даход дзяржавы ў памеры дваццаці базавых велічыняў, што складае 740 рублёў.

**07.12.2023**



Суддзя суда Глыбоцкага раёна Алена Кот 22 лістапада за распаўсюд у сацыяльнай сетцы публікацый "экстрэмісцкага" зместу пастанавіла аштрафаваць на 925 рублёў работніцу мясцовага фізкультурна-аздараўленчага цэнтра Юлію Храпавіцкую. У судзе Юлія пацвердзіла, што яна сацыяльнай сеткі «Аднакласнікі» доўгі час была падпісаная на тры інфармацыйныя рэсурсы, якія раней улады палічылі экстрэмісцкімі. У судовым паседжанні маладая жанчына цалкам прызнала сваю віну.
Суддзя кваліфікавала дзеянні маці дваіх малалетніх дзяцей, як "захоўванне з мэтай распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў".Таму суддзя Кот на падставе прызнання датычнасці да супрацьпраўнай дзейнасці прымяніла да Храпавіцкай ч. 2 арт. 19.11 КаАП, і пакарала яе штрафам у даход дзяржавы ў памеры 25 базавых велічыняў, што склала 925 рублёў.

**07.12.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 22 лістапада за падпіску ў сацыяльных сетках на "экстрэмісцкі" інфармацыйны рэсурс пакарала штрафам у памеры 740 рублёў работніцу міёрскай бальніцы Валянціну Развадоўскую. У судзе стала вядома аб тым, што Валянціна сваім асабістым профілі сацыяльнай сеткі "Instagram" размясціла і захоўвала з мэтай распаўсюджвання публікацыі з інфарэсурса "Люстэрка"». Раней гэта інтэрнэт-выданне ўлады ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У судовым паседжанні жанчына віну прызнала і пакаялася ў зробленым. Улічваючы яшчэ і тое, што «парушальніца» мае на ўтрыманні непаўналетнюю дачку, суддзя Яскевіч, на падставе ч.2 арт.19.11 КоАП, пакарала Развадоўскую штрафам у даход дзяржавы ў памеры дваццаці базавых велічыняў, што складае 740 рублёў.

**07.12.2023**
Зміцер Лупач, вядомы незалежны журналіст, вымушана пераехаў у Польшчу, бо ў Беларусі яго пераследвалі за прафесійную дзейнасць. Кватэра, у якой ён жыў да ад"езду, даўно стаіць пустая. 6 снежня сілавікі прыйшлі туды з пeратрусам, трапіўшы ўнутр з дапамогай супрацоўнікаў МНС: тыя падняліся па «пажарнай» лесвіцы на балкон, адчынілі балконныя дзверы і такім чынам трапілі ў жытло Змітра Лупача.
Журналіст не ведае, што шукалі ў ягонай кватэры і ці знайшлі нешта з таго, што магло зацікавіць міліцыянтаў або следчых. У межах якой справы праводзіўся ператрус, Лупач не ведае таксама – пра здарэнне ён даведаўся ад сведак, якія назіралі пранікненне ў ягоную кватэру. Таксама сведкі паведамілі, што кватэра апячатаная. Апошні раз вератрус у кватэры Змітра Лупача праводзілі ў 2021 годзе - непасрэдна перад тым, як ён пакінуў Беларусь. Тады ж журналіст быў затрыманы на трое сутак - 8 ліпеня сілавікі забралі яго з санаторыя "Пліса", дзе той адпачываў. Усё гэта адбывалася ў межах крымінальнай справы, дзе Лупач меў статус падазраванага: яму паведамілі, што справа паводле ч. 1 арт. 130 Крымінальнага кодэкса (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці або розні), распачатая з прычыны з"яўлення відэаароліка ў тэлеграм-канале "Глубокое для жизни". У гэтым відэа, на думку міліцыі, быццам бы ўтрымліваюцца выказванні, якія заклікаюць да гвалтоўных дзеянняў на адрас сілавікоў. У публікаванні гэтага відэаароліка падазравалі Лупача і яшчэ некалькіх грамадскіх актывістаў з Докшыц і Глыбокага, якіх таксама трымалі пад вартай 72 гадзіны.

**08.12.2023**
Суддзя суда Дубровенскага раёна Ігар Татаеў 29 лістапада за падпіску ў сацыяльнай сетцы на «экстрэмісцкую» супольнасць пастанавіў арыштаваць на адныя суткі бацьку чатырох непаўналетніх дзяцей трактарыста-машыніста Сяргея Каўбасава. У судовым паседжанні Сяргей прызнаўся ў тым, што ён пачынаючы з 2017 года ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» быў падпісаны на старонку інфармацыйнага рэсурсу «Усё аб Дуброўна», які рашэннем суда ў кастрычніку 2023 быў уключаны ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Мужчына віну прызнаў поўнасцю, ад даследавання доказаў адмовіўся.
Суддзя Татаеў узважыўшы ўсе доказы па справе прыйшоў да меркавання, што Каўбасаў здзейсніў правапарушэнне ў рамках ч.2 арт.19.11 КаАП і пакараў яго арыштам тэрмінам на адныя суткі.

**09.12.2023**
Суддзя суда Глыбоцкага раёна Аляксандр Аляксеенка 28 лістапада за лайкі ў сацыяльнай сетцы пад

«экстрэмісцкімі» публікацыямі арыштаваў на 8 сутак глыбоцкага працоўнага ўраджэнец Камсамольскага раёна Хабараўскага краю Расіі Арцёма Крыўко. У судовым паседжанні Арцём прызнаў сваю віну ў здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння прызнаў і ўказаў, што ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» абазначаў лайкамі публікацыі на інтэрнэт-рэсурсы «Белсат» і «Радыё Свабода». Раней гэтыя інфармацыйныя публікацыі ўлады змясцілі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
З улікам таго, што «правапарушальнік» шчыра раскаяўся і мае на ўтрыманні двух малалетніх дзяцей, суддзя Аляксеенка на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП пакараў Крыўко арыштам тэрмінам на восем сутак.

**12.12.2023**



Як стала вядома, напрыканцы лістапада Глыбоцкі суд у асобе суддзі Алены Кот па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуючай такую дзейнасць) судзіў шматдзетную маці Іну Юргель. Яна паходзіць з Украіны, нарадзілася ў Валнавасе, зараз жыве ў Беларусі, у Глыбоцкім раёне, і гадуе траіх дзяцей.
Жанчыну абвінавацілі ў тым, што яна на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” размясціла інфармацыйную прадукцыю, якую ўлады Беларусі ўключылі ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, а таксама міліцыянты на яе старонцы заўважылі лагатып Nexta.
Іна Юргель у судзе прызнала сваю віну. Суддзя суда Глыбоцкага раёна Алена Кот прысудзіла жанчыне 20 базавых велічыняў штрафу, што складае 740 беларускіх рублёў.

**13.12.2023**

Суддзя суда Аршанскага раёна і Оршы Мікалай Драгуноў 30 лістапада за падпіску ў сацыяльных сетках на «экстрэмісцкі» канал пакараў штрафам у 740 рублёў прыёмшчыцу цягнікоў на чыгуначную станцыі «Орша» Галіну Капітонаву. У судовым паседжанні Галіна прызналася ў тым, што яна далей за адзін год была падпісаная ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» на канал «stop luka», якую ўлады ўключылі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Улічваючы тое, што жанчына прызнала сваю віну і мае на ўтрыманні непаўналетняга дзіцяці суддзя Драгуноў на падставе ч.2. ст. 19.11 КаАП пастанавіў аштрафаваць Капітонава ў даход дзяржавы. Памеры 25 базавых велічыняў усуме 925 рублёў без канфіскацыі гармат і сродкаў правапарушэння.

**13.12.2023**

Пра затрыманне пастара Аляксандра Герасімовіча і царкоўнага служку Вадзіма Сафонава, а таксама пра тое, што ім, найверагодней, інкрымінаваны распаўсюд так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў, паведаміла «Хрысціянская візія». Тэлеграм-канал паведамляе, што на мінулым тыдні ў наваполацкіх цэрквах праводзілі прыверку, іншых падрабязнасцяў пра гэта пакуль няма.Суд над Герасімовічам і Сафонавым адбыўся 12 снежня. Абодва асуджаныя – шматдзетныя бацькі, у сям“і Аляксандра выхоўваецца 7 дзяцей, у сям“і Вадзіма -трое.
«Царква Царства Божага» дзейнічае ў Наваполацку з 1993 г., у яе ўваходзяць каля 100 вернікаў, каля 50 дзяцей наведваюць нядзельную школу. Аляксандр Герасімовіч з“яўляецца пастарам царквы больш за 20 гадоў.

**14.12.2023**

Суддзя суда Аршанскага раёна і Оршы Мікалай Драгуноў 5 снежня за захоўванне ў сацыяльнай сетцы «экстрэмісцкіх» публікацый арыштаваў на 8 сутак мясцовага жыхара бацькі двух непаўналетніх дзяцей беспрацоўнага Уладзіміра Мяжуева. У судовым паседжанні Уладзімір прызнаў сваю вінаватасць у тым, што ён сапраўды ў сацыяльнай сетцы «Facebook» захоўваў у адкрытым доступе, інтэрнэт-старонку з назвай «Наш Дом». Раней інфармацыйная прадукцыя гэтага выдання ўлады ўнеслі ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
Абараняючыся ў судзе, мужчына сцвярджаў, што не ведаў, што "Наш Дом" з'яўляецца экстрэмісцкім і таму, ён не выдаліў яе са сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы.
На думку суддзі Драгунава ў дзеяннях Мяжуева меліся ўсе прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння і на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП пакараў яго арыштам тэрмінам на 8 сутак.

**15.12.2023**

Суддзя суда Браслаўскага раёна Аляксандр Вязіцкі 30 лістапада за распаўсюд у сацыяльнай сетцы інфармацыйныя матэрыялы «экстрэмісцкага» характару арыштаваў на 10 сутак пакавальніка-фасоўшчыка, бацьку трох малалетніх дзяцей Аляксандра Шаршнёва. У судовым пасяджэнні Аляксандр віну сваю прызнаў часткова, растлумачыў, што сапраўды ў 2020 годзе, выкарыстоўваючы мабільны тэлефон, які належыць яму, каб сачыць за бягучымі навінамі размясціў у сваім асабістым профілі ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» публікацыі з інфармацыйных рэсурсаў "Zerkalo.io" і "ЧП Беларусь". Пры гэтым мэты распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкай накіраванасці не меў.
Тым не меньш, грунтуючыся на ўнутранай перакананасці суддзя Вязіцкі на падставе ч.2 арт. 19.11 КаАП сваёй пастановай арыштаваў Шаршнёва на дзесяць сутак і канфіскаваў у даход дзяржавы тэлефонны апарат, які належыў “правапарушальніку”.

**17.12.2023**

Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Міхаіл Юрчанка за прапаганду нацысцкай сімволікі пастанавіў арыштаваць на 15 сутак рабочага з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй Вадзіма Пыльскага. У судовым паседжанні Вадзім патлумачыў, некалькі год таму зарэгістраваў свой акавунт у сацыяльнай сетцы “Вконтакте”. У ім ён апублікаваў фатаграфіі, на якіх намалявана выявы нацысцкай арганізацыі ва Украіне, і на якіх былі бачная фашысцкая сімволіка - эмблема СС (лігатура ў выглядзе здвоенай руны "зіг"). Такім чынам ён спрабаваў выказаць сваё негатыўнае стаўленне да «ўкраінскіх неанацыстаў».Суд аднёс дзеянні Пыльскага «…да катэгорыі грубых, накіраванага на дэстабілізацыю становішча ў грамадстве і дзяржаве, абставіны яго здзяйснення, з улікам маральных прынцыпаў, якія склаліся ў грамадстве, звязаных з памяццю ахвяраў Другой сусветнай вайны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».
Таму, суддзя Юрчанка ўгледзеў у дзеяннях Пыльскага ўсе прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння ў рамках ч. 1 арт. 19.10 КаАП і пакараў яго арыштам на 15 сутак.

**22.12.2023**

Суддзя суду Віцебскага раёна Міхаіл Зубеня 6 снежня за абразу прадстаўніка ўлады пазбавіў волі на адзін год і шэсць месяцаў 38-гадовага Сяргея Зайцава. Акрамя таго Зайцаў павінен выплаціць штраф у даход дзяржавы ў памеры 3700 рублёў.
У прысудзе запісана пра тое, што Сяргей напісаў у тэлеграм-канале, які прызнаны "экстрэмісцкім", два абразлівых каментары пра прадстаўнікоў ўлады, таму здзейсніў злачынства ў рамках арт. 369 Крымінальнага кодэкса.
Згодна версіі абвінавачвання, Зайцаў, знаходзячыся на тэрыторыі Расіі, у Telegram-канале, які прызнаны "экстрэмісцкім", размясціў тэкст, які змяшчаў негатыўную ацэнку дзьвум работнікам міліцыі. Таксама абвінавачаны пакінуў аналагічную абразы калі мужчына знаходзіўся і на тэрыторыі Віцебскага раёна.
На судзе Сяргей прызнаў віну, але адзначыў, што не ведаў пра тое, што пацярпелыя з'яўляюцца прадстаўнікамі ўлады.
Каб падтрымаць вязня лістамі, трэба пісаць на адрас: СІЗА-2, Гагарына, 2, 210026, Віцебск, Сяргею Георгіевічу Зайцаву.

**24.12.2023**
«Хапун» адбыўся ноччу з 21 на 22 снежня: затрымалі 7 чалавек. Міліцыянты ўрываліся ў кватэры, рабіліператрусы і забіралі людзей. На сённяшні дзень чацвера затрыманых ўжо асуджаныя на 15 сутак – гэта сямейныя пары Рулевічаў і Зінкевічаў. Элеанора Зінкевіч – дырэктарка музейнай установы. Мясцовыя жыхары распавядаюць, што яшчэ трое з тых, у каго правядлі начныяператрусы, пакуль на волі. Але яны таксама маюць позвы ў суд. За што асудзілі тых, хто трапіў за краты адразу пасля затрымання, невядома. Адзіная версія – распаўсюд так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. Прычым усе, хто трапіў пад «хапун», - людзі абсалютна апалітычныя, а дырэктарка Музея традыцыйнай культуры і іх родных дык і ўвогуле адкрытая прыхільніца дзяржаўнай ідэалогіі. Далейшы лёс музейных супрацоўнікаў невядомы, найхотчэй, іх зволяць, мяркуюць у Браславе. Адкрытыс застаецца пытанне, дзе ў такім выпадку браць адмыслоўцаў на вызваленыя пасады. Хіба што набраць у штат першых-лепшых, і тады музей будзе працаваць проста як будынак, куды за квіткі ходзяць наведнікі, а ўся навуковая і даследчыцкая дзейнасць установы будзе спыненыя. Жыхары Браслава таксама адзначаюць, што практыка начных затрыманняў у райцэнтры ўжо не новая.

Так мясцовыя міліцыянты рабілі і раней, бо іх асноўная мэта – запалохванне людзей, каб яны жылі ў страху, што да таксама прыйдуць у любы момант.

**26.12.2023**

Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 24 лістапада за распаўсюд «экстрэмізму» ў супольнасцях кросплатформавага месэнджара пакарала адміністрацыйным арыштам на 15 сутак Андрэя Баравіцкага.

У судовым паседжанні Андрэй не адмаўляў, што ён увосень 2020 года выкарыстоўваючы акаўнт у мэсэнджэры «Telegram» распаўсюджваў інфармацыйную прадукцыю з каналаў «Баста» і «Хопіць Баяцца! – Тацццяна Мартынава», сярод падпісчыкаў тэлеграм-канала «Полацк/Наваполацк/Краіна для жыцця/Чат /Свабоду Сяргею Ціханоўскаму///Полацк Краіна для Жыцця». Гэтыя каналы ўлады ўключылі рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Улічваючы прызнанне віны і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП суддзя Балаболава пастанавіла арыштаваць Баравіцкага кароткім пазбаўленнем волі на пятнаццаць сутак.

**27.12.2023**



Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Міхаіл Юрчанка 6 снежня за распаўсюджванне публікацый "экстрэмісцкай" накіраванасці пакараў штрафам у памеры 740 рублёў грамадзянку Расіі вядучага дзяржэксперта Ніну Жураву.

У судовым паседжанні была агучаная інфармацыя аб тым, што Ніна выкарыстоўваючы свой акавунт у сацыяльнай сетцы «Instagram» стала падпісчыкам «экстрэмісцкіх» суполак «Радыё Свабода», «Люстэрка» і «Белсат». Аднак «правапарушальніца» сваю вінаватасць не прызнала, адмаўляла намер на распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Тым не менш суддзя Юрчанка ўгледзеў у дзеяннях Журавай правапарушэнне і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП падвергнуў яе спагнанню ў выглядзе штрафу ў даход дзяржавы ў памеры 740 рублёў. Арышт на тэлефон, які належыць Журава, суддзя пакінуў у сіле ў якасці забеспячэння выканання пастановы.

**28.12.2023**

Як стала вядома, 11 снежня суддзя мёрскага суда Ірына Яскевіч асудзіла сталяра-станочніка з Мёраў Аляксандра Мацура. У сябе на радзіме ён яшчэ вядомы як разьбяр па дрэве, які робіць прыгожыя карціны ды іншыя вырабы з дрэва. Пра яго нават пісала мясцовая раёнка “Міёрскія навіны”. Але гэта было некалькі год таму, а зараз мужчыну судзілі па “народным артыкуле” - частцы 2 артыкула 19.11 КаАП РБ (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць). Падставай завядзення мёрскімі міліцыянтамі адміністрацыйнай справы на Аляксандра Мацура стала захоўванне на яго асабістай адкрытай старонцы ў сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” відэа тэлеканала “Белсат” і яго лагатыпу. Падчас судовага пасяджэння Мацур віну прызнаў, але ад дачы тлумачэнняў адмовіўся і пацвердзіў тлумачэнні, дадзеныя мёрскім міліцыянтам пры апытанні.

Так як у Аляксандра Мацура ёсць непаўнагадовая дачка, ён не прыцягваўся раней да адміністрацыйнай адказнасці і мае пастаяннае месца працы – гэта паўплывала на рашэнне суддзі Ірыны Яскевіч. Яна прызначыла яму толькі 5 сутак арышту без канфіскацыі мабільнага тэлефона Redmi, з якога быццам было ўчынена адміністрацыйнае парушэнне.

**29.12.2023**

Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 24 лістапада за правядзенне несанкцыянаванага ўладамі масавага мерапрыемства пакарала штрафам у памеры 2590 рублёў мясцовую жыхарку Ганну Кандзякову. У судзе стала вядома, што Ганна, пачынаючы са жніўня 2020 года бесперапынна, на працягу 39 месяцаў, правяла несанкцыянаванае пікетаванне без адпаведнага дазволу Наваполацкага гарвыканкама.

На думку работнікаў міліцыі жанчына, праз публікацыю на тэлеграм-канале “Наваполацк і Полацак 97%” тэксту “Варта трымаць сябе ў руках… Мы пераможам. Мы зможам. Няхай ахвяры гэтай рэвалюцыі не будуць марныя. Жыве Беларусь!», выказала свае палітычныя погляды.

Прыняўшы ў якасці прызнання віны з боку Кандзяковай за доказ праведеннага пікетавання і на падставе ч.1 арт.24.23 КаАП суддзя Балаболава пастанавіла спагнаць у даход дзяржавы штраф у памеры сямідзесяці базавых велічынь, што складае 2590 рублёў.

**29.12.2023**
Суддзя суда Міёрскага раёна Ірына Яскевіч 5 снежня за распаўсюд «экстрэмізму» ў сацыяльнай сетцы пастанавіла пакараць штрафам у памеры 925 рублёў дырэктара мясцовай ЖКГ Ігара Войтава. Раней «правапарушальнік» цягам 22 гадоў узначальваў Міёрскае аддзяленне Дэпартамента аховы МУС РБ, за што мае медаль «За бездакорную службу» трэцяй ступені. У судовай пастанове запісана, што Ігар Іванавіч у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» захоўваў інфармацыйную прадукцыю - відэаролікі «Белсата» з адпаведным лагатыпам гэтага ТБ. Раней улады ўключылі прадукцыю гэтага канала ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.
На судовым паседжанні Войтаў не прысутнічаў, аднак, паводле дадзеных, якія паступілі з мясцовага аддзялення міліцыі, ён пацвердзіў дачыненне да здзейсненага правапарушэння і прызнаў віну.
Таму суддзя Яскевіч на падставе ч. 2 арт. 19.11 КаАП падвергла Войтава адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў даход дзяржавы ў памеры 925 рублёў.

**30.12.2023**
Суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава 24 лістапада за распаўсюд у мэсэнджэры «экстрэмісцкай» інфармацыі пакарала адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 10 сутак мясцовага прадпрымальніка Яўгена Паўлюшына.
У судзе Яўген прызнаў факт рэгістрацыі ў мэсэнджэры «Telegram» і што з вясны 2020 года ён з'яўляўся актыўным удзельнікам розных тэлеграм-каналаў Полацкага рэгіёну, у тым ліку і тэлеграм-канале «Полацак/Наваполацк/Краіна для жыцця/Чат /Свабоду Сяргею Ціханоўскаму ///Полацак Краіна для Жыцця», дзе меў зносіны з аднадумцамі, выкладваў і перасылаў розныя інфармацыйныя матэрыялы, малюнкі і фатаграфіі. Там жа мужчына распаўсюджваў публікацыі, уключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, у тым ліку з «Радыё Свабода», якое мае лагатып з выявай паходні аранжавага колеру.
З улікам прызнання віны і на падставе ч.2 арт.19.11 КаАП суддзя Болоболова падвергла Паўлюшына адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе арышту тэрмінам на дзесяць сутак.

**30.12.2023**
Суддзя суда Першамайскага раёна Віцебска Наталля Карабліна за правядзенне пікетавання ў сацыяльнай сетцы без дазволу мясцовых пакарала штрафам у памеры 3700 рублёў жыхара «паўночнай сталіцы» Аляксандра Павалоцкага.
У судзе было агучана, што Аляксандр у сацыяльнай сетцы «Інстаграм» правёў несанкцыянаваны пікет без адпаведнага дазволу адміністрацыі Першамайскага раёна. На думку работнікаў міліцыі, мужчына выказаў грамадска-палітычныя погляды, шляхам дэманстрацыі ў сваім акаўнце сваёй фатаграфіі на фоне сцяга бел-чырвона-белага колеру. У судовае паседжаньне “правапарушальнік” не зьявіўся, хаця пра час і месца разгляду справы паведамлена належным чынам.
Тым не менш, без прысутнасці на працэсе Павалоцкага, парушаючы яго права на абарону, суддзя Карабліна пастанавіла аштрафаваць яго на максімальную суму, прадугледжаную ч. 1 арт. 24.23 КаАП, у памеры сто базавых велічыняў, што цяпер складае 3700 рублёў.

**31.12.2023**


30 лістапада суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава пакарала штрафамі і арыштам за «экстрэмізм» і «пікет» ў сацыяльных сетках чатырох жыхарак Наваполацка.
Самы буйны штраф у памеры 3700 рублёў атрымала Надзея Рагозіна. Яна, паводле версіі ўладаў, правяла несанкцыянаваны пікет без дазволу Наваполацкага гарвыканкама. Гэта выявілася ў тым, што маладая жанчына на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм» пад імем «rogozina_nadia» азнаёміла карыстальнікаў відэафайлаў і фотаздымкаў з размешчанай на іх сімволікай бел-чырвона-белага колеру. За распаўсюджванне публікацый «экстрэмісцкага» зместу суддзя Болоболова прысудзіла два штрафа памеры 1110 рублёў.
Стаматолагу «нафтанаўскай» паліклінікі Вользе Малевіч за тое, што яна ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» за спасылку на канал з назвай «Радыё Свабода - Беларусь». А Наталле Басуевай, таму што, яна ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм» была падпісаная на інфармацыйны рэсурс «Радыё Свабода», а таксама на інтэрнэт-старонку з назвай «zerkalo_io».
Яшчэ адну жанчыну Балаболава пакарала арыштам на 10 сутак. Гэта Алена Шкірэнка, у віну якой суддзя паставіла захоўванне ў «Інстаграм» спасылкі на паблік страйкаму «Страйкам ААТ «Нафтан»».

Выдадзена праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
У выданьні выкарстоўваюцца матэрыялы,
апублікаваныя сайтамvitebskspring.org і іншымі інтэрнэт-рэсурсамі.
*Для вольнага распаўсюду*